Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»

# Людзі навукі нашага краю

***Біябібліяграфічны даведнік***

2-е выданне, дапрацаванае
і дапоўненае

Кобрын
2020

УДК 016:001(476.7)(092)
ББК 91.9:72(4Беи)
Л93

Серыя заснавана ў 2017 годзе

***Складальнік:***
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
цэнтральнай раённай бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры
«Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» *С. Д. Курачук*

Л93 **Людзі навукі нашага краю** : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – 197 с. : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

Даведнік знаёміць з жыццёвым і творчым шляхам дзеячаў навукі, якія нарадзіліся, жылі ў кобрынскім краі, а таксама вылучыліся сваім талентам і здольнасцю ў іншых краінах. Выданне прадстаўляе імёны, якія маюць сусветнае і агульнабеларускае значэнне. Ёсць інфармацыя пра маладых навукоўцаў, якія толькі пачынаюць свой шлях у навуку.
Для шырокага кола чытачоў.

**УДК 016:001(476.7)(092)**
**ББК 91.9:72(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2020

# ПРАДМОВА

Гісторыя Кобрыншчыны пераканаўча сведчыць, што ва ўсе стагоддзі тут жылі людзі, якія валодалі глыбокімі ведамі, талентам, працавітасцю, здзяйснялі выдатныя навуковыя адкрыцці. Кобрынскі раён - радзіма многіх навукоўцаў, вядомых у нашай краіне і за яе межамі. Іх імёны назаўсёды застануцца ў гісторыі нашага краю, у гісторыі Беларусі, а некаторыя – і ўсяго свету.

У 2017 годзе, які быў аб’яўлены ў Рэспубліцы Беларусь Годам навукі, Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай быў выдадзены біябібліяграфічны даведнік «Людзі навукі нашага краю». У 2020 годзе падрыхтавана 2-е выданне, дапрацаванае і дапоўненае.

Біябібліяграфічны даведнік «Людзі навукі нашага краю» складаецца з даследаванняў жыццёвага і творчага шляху дзеячаў навукі, якія нарадзіліся, жылі на Кобрыншчыне, а таксама вылучыліся сваім талентам і здольнасцю ў іншых краінах. Выданне прадстаўляе імёны, якія маюць сусветнае і агульнабеларускае значэнне. Ёсць інфармацыя пра маладых навукоўцаў, якія толькі пачынаюць свой шлях у навуку.

Паказальнік дапаможа ўдакладніць звесткі пра навукоўцаў краю, прыгадаць людзей, лёс якіх паяднаны з навукай. Гэта свайго роду міні-энцыклапедыя з інфармацыяй пра цэлы шэраг навукоўцаў кобрынскай зямлі - людзей, якія выявілі сябе ў розных галінах навукі. Гэта людзі розных прафесій і нават розных эпох, якіх аб’ядноўвае тое, што ўсе яны – ураджэнцы зямлі кобрынскай ці ў нейкі час жылі, працавалі, вучыліся ў гэтым краі. Кожны з іх дасягнуў поспехаў: нехта дабіўся вядомасці ў сваёй краіне, нехта – далёка за яе межамі. Кожны прайшоў сваёй дарогай, у кожнага адметны жыццёвы шлях. Некаторыя з іх дасягнулі самых вяршынь: сталі акадэмікамі, сапраўднымі аўтарытэтамі ў той ці іншай галіне навукі, іншым было наканавана жыццё, насычанае навуковым пошукам і адкрыццямі.

Але для кожнага кобрынскі край - часцінка душы, малая радзіма. Таму нашы героі хоць аднойчы, але прызнаваліся ў любові да сваёй зямлі, зычылі ёй росквіту і дабрабыту.

«*Кобрын быў, ёсць і застаецца для мяне галоўным горадам дзяцінства. Маё сэрца звязана навечна з Кобрыншчынай, Брэстчынай… Па ўсёй Беларусі няма прыгажэйшага месца! Таму хачу пажадаць Кобрыну… шчасця, дабрабыту і росквіту кобрынскай зямлі і яе людзям!*» – такое віншаванне з Днём горада даслаў прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, вядомы дзяржаўны і грамадскі дзеяч, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Міхаіл Іванавіч Дзямчук, ураджэнец вёскі Дзевяткі Кобрынскага раёна.

«*Няхай асвятляе ваш жыццёвы шлях вечная крыніца натхнення - любоў да зямлі, на якой вырас, да яе звычаяў і традыцый, да людзей - шчырых і ветлівых, працавітых і адказных за сваю справу… Няхай квітнее наш родны Кобрын, мацуецца жыватворнай энергіяй жыхароў, поўніцца гонарам за добрыя справы і дасягненні!*» - словы ўдзячнасці ад доктара філалагічных навук, прафесара, лінгвіста, педагога, журналіста, малой радзімай якога з’яўляецца вёска Хадынічы, Віктара Іванавіча Іўчанкава.

«*Кабрынчане па праву могуць ганарыцца сваім любімым горадам і той роллю, якую яны адыгралі ў развіцці Брэстчыны і ўсёй Беларусі. … Галоўная каштоўнасць*

*нашай любімай Кобрыншчыны - гэта людзі. Светлыя і добрыя, мужныя і моцныя, руплівыя і працавітыя, клапатлівыя і любячыя, мудрыя і годныя»,* - упэўнены ўраджэнец вёскі Лелікава Іван Паўлавіч Панасюк, кандыдат філасофскіх навук, старшыня праўлення беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў гонар святой Еўфрасінні Полацкай.

Выданне не прэтэндуе на паўнату, але гэта значны па аб'ёму і зместу паказальнік. Складзены на аснове фондаў Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі з выкарыстаннем даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі і ўключае асобныя выданні, артыкулы, змешчаныя ў энцыклапедыях, кнігах, зборніках, часопісах і газетах, краязнаўчых папках, матэрыялы, апублікаваныя ў бібліяграфічным бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку». Выкарыстоўвалася база даных «Навукоўцы Беларусі», якая з'яўляецца нацыянальным праектам у рамках сусветнай сістэмы інфармацыі пра навуковых работнікаў. Уключаны матэрыялы, дадзеныя нашымі землякамі-навукоўцамі, іх сваякамі, краязнаўцамі.

Матэрыял у даведніку размешчаны ў алфавітным парадку персаналій. Інфармацыя пра кожнага навукоўца прадстаўлена ў выглядзе біяграфічнага артыкула, фатаграфіі, шырока прадстаўлена бібліяграфія: спісы крыніц аб жыцці і дзейнасці і спісы прац навукоўцаў. Амаль усе апісанні суправаджаюцца анатацыямі даведачнага характару. Мова бібліяграфічных апісанняў адпавядае мове выданняў. Анатацыі прыведзены на мове анатаванага дакумента. Дарэчы, у аснову некаторых тэкставых даведак пакладзены падрыхтаваныя раней бібліяграфічныя паказальнікі бібліятэкі. Прадстаўлены таксама артыкулы пра навукоўцаў Кобрыншчыны, апублікаваныя ў СМІ ў рамках краязнаўчага біябібліяграфічнага праекта цэнтральнай раённай бібліятэкі «Славутыя імёны маёй малой радзімы». Адбор крыніц завершаны ў снежні 2020 года.

Даведачна-дапаможны апарат выдання ўключае імянны і геаграфічны паказальнікі, якія значна аблягчаюць знаходжанне матэрыялаў пра навукоўцаў; алфавітны спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў біябібліяграфічны даведнік.

Дапаможнік разлічаны на самае шырокае кола чытачоў – жыхароў і гасцей Кобрыншчыны, усіх, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю. Ён будзе цікавы краязнаўцам, гісторыкам, экскурсаводам, супрацоўнікам бібліятэк, карыстальнікам усіх узростаў і заняткаў.

Асаблівую актуальнасць біябібліяграфічнаму даведніку «Людзі навукі нашага краю» надае той факт, што ён выдадзены ў Год малой радзімы ў Беларусі.

# НАВУКОЎЦЫ КОБРЫНСКАГА КРАЮ

**Выхадцы з Кобрыншчыны ўнеслі велізарны ўклад не толькі ў айчынную, але і сусветную навуку**

## АЛОН (РАГАЗНІЦКІ) ГЕДАЛІЯ



**АЛОН Гдалія** (народжаны Рагазніцкі) (1901-1950) - ізраільскі гісторык, даследнік Талмуда і гісторыі эпохі Другога Храма. У ліку першых студэнтаў, якія запісаліся на факультэт габрэйскіх даследаванняў у Габрэйскім універсітэце, адкрытым у Іерусаліме на гары Скопус у 1925 годзе, быў малады чалавек, які стаў пасля вядомым пад імем Гдалія (Гедалія) Алон.

Гдалія нарадзіўся ў 1901 годзе ў Кобрыне ў сям'і равіна Нахмана Рагазніцкага і насіў першапачаткова прозвішча Рагазніцкі. Вучыўся ў некалькіх іешывах, у тым ліку (з 1913) у вядомай Слабодскай іешыве.

Пасля Першай сусветнай вайны знаёмства з сучаснай габрэйскай навуковай думкай XIX стагоддзя прывяло Г. Алона на шлях самастойных гістарычных даследаванняў, якімі ён займаўся, выкарыстоўваючы любую магчымасць. У 1917 годзе вярнуўся ў Кобрын. Пасля апублікавання Дэкларацыі Бальфура (1917) заняўся сіяністкай дзейнасцю, заснаваў у сваім горадзе школу нацыянальна-рэлігійнага тыпу пад назвай «Хеўрон» з выкладаннем на іўрыце.

У 1922 годзе Гедалія Алон закончыў сярэднюю школу на ідышы ў Вене. У 1924 годзе ён адправіўся ў Берлін, дзе на працягу года наведваў равінскую семінарыю Хільдэсхеймера, адначасова слухаючы курсы ў Берлінскім універсітэце.

Калі ж Алон даведаўся, што навука, вывучэнню якой ён аддаваўся, з гэтага часу даступная для габрэяў на гары Скопус, то, не губляючы часу, адправіўся ў Эрэц-Ісраэль. У 1926 годзе пасяліўся ў Іерусаліме і быў у ліку першых выпускнікоў Габрэйскага ўніверсітэта (1931). Тут Алон цалкам пагрузіўся і ў даследаванні Талмуда, і ў класічную гісторыю, стаўшы, па выразе аднаго з яго настаўнікаў, «гісторыкам да кончыкаў пазногцяў».

Служыў Г. Алон у Хагане, у 1936 годзе быў камандзірам роты. Падчас вайны за незалежнасць удзельнічаў у баях за Іерусалім. У Іерусаліме Алон пражыў у амаль спартанскай суровасці. Пакінутыя яму дзесяцігоддзі жыцця цалкам прысвяціў навуцы.

Ён выкладаў Талмуд і габрэйскую гісторыю ў Габрэйскім універсітэце і адначасова апублікаваў значную колькасць артыкулаў, наватарскіх па духу і метадалогіі, набыўшы рэпутацыю шырока эрудыраванага навукоўца, які не пабаяўся зірнуць крытычным вокам на даўно сталыя гістарычныя канцэпцыі. Некаторыя яго працы праклалі новы шлях у даследаванні габрэйскай гісторыі, асабліва эпохі Другога храма і Талмуда. Шэраг яго кніг перакладзены на англійскую мову.

У сакавіку 1950 года Алон нечакана памёр.

Смерць Гдалія Алона ўсхвалявала акадэмічныя кругі, якія добра разумелі, што не далі навукоўцу прызнання, якога ён заслугоўваў. Але ва ўсёй паўнаце страту Алона навуковая грамадскасць ацаніла толькі тады, калі зразумела, што ён так і не апублікаваў свае працы.

Але засталася група адданых вучняў, блізкіх калег, якія знаходзіліся пад моцным уплывам выдатнага гісторыка, засталіся шчодра раскіданыя па розных публікацыях ідэі, запісы лекцый, якія навуковец склаў незадоўга да смерці, але не паспеў падрыхтаваць да публікацыі. Іх выданне з'явілася на іўрыце праз пяць гадоў пасля смерці Г. Алона.




У 1957-1958 гадах быў апублікаваны двухтомны збор навуковых прац Алона «Даследаванні гісторыі габрэйскага народа ў эпоху Другога храма і ў эпоху Мішны і Гемары».

У 1953 годзе Алон першым удастоены самай прэстыжнай у краіне Дзяржаўнай прэміі Ізраіля за сваю манаграфію «Толдот ха-иехудим бе-Эрец-Исраэль би-ткуфат ха-Мишна ве-ха-Талмуд», якая была выдадзена пасмяротна (1953-1956; у рускім перакладзе «История евреев Эрец-Исраэль в Талмудическую эпоху», Іерусалім, выдавецтва «Бібліятэка-Алія», 1994).

**Аллон**, **Г**. История евреев Эрец-Исраэль в талмудическую эпоху [Электронный ресурс] / Гедалия Аллон // Esxatos. – Режим доступа: http://esxatos.com/allon-istoriya-evreev-erec-israel-v-talmudicheskuyu-epohu. – Дата доступа: 22.03.2018.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Коваленя, А.** Они родились на белорусской земле **/** Александр Коваленя // Рэспубліка. – 2001. – 13 студзеня.

Самой престижной в стране Государственной премии Израиля первым был удостоен видный ученый-историк Гдалий Аллон (Рогозницкий) из Кобрина.

**115 гадоў** з дня нараджэння Алон Гдалія (1901) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 8.

**Аллон (Рогозницкий) Гдалия** [Электронный ресурс] // Электронная еврейская энциклопедия. - Режим доступа: http://www. eleven. co.il/ article/10149. – Дата доступа: 22.03.2018.

# АМЕЛЬЯНЮК ГЕОРГІЙ ГЕОРГІЕВІЧ

**АМЕЛЬЯНЮК Георгій Георгіевіч** - кандыдат біялагічных навук (1992), доктар юрыдычных навук (2005), прафесар.



Нарадзіўся 10 снежня 1966 года ў горадзе Кобрыне. Яшчэ ў школьныя гады вучань сярэдняй школы № 1 г. Кобрына Георгій Амельянюк выяўляў цікавасць да навукова-пазнавальнай літаратуры, быў старшынёй вучэбнага камітэта, уваходзіў у склад зборнай горада па валейболу, займаў прызавыя месцы ў спаборніцтвах па спартыўнаму шматбор'ю, іграў на бас-гітары ў ансамблі «Чырвоная гваздзіка». Георгій быў пераможцам ва ўсіх школьных алімпіядах, прызёрам гарадскіх алімпіяд па хіміі, матэматыцы і беларускай мове. Закончыў школу Георгій Амельянюк у 1983 годзе.

Глыбокія веды і эрудыцыя дапамаглі кобрынскаму школьніку ў няпоўных 17 гадоў стаць самым маладым студэнтам Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ламаносава (МДУ). Тут, працягваючы займацца спортам, Георгій стаў выяўляць цікавасць да навуковай дзейнасці па біялогіі і пяць гадоў працаваў пад кіраўніцтвам акадэміка Е. М. Самойлавай.

Пасля заканчэння з адзнакай МДУ і аддзялення аспірантуры з'явіліся першыя публікацыі тэзісаў навуковых дакладаў Г. Амельянюка. Працуючы ў філіяле Усесаюзнай акадэміі сельскай гаспадаркі ў Маскве, 25-гадовы выпускнік аспірантуры атрымаў навуковую ступень кандыдата біялагічных навук. У 1992 годзе ён абараніў дысертацыю па тэме «Влияние орошения на гумусное и агрегатное состояние степных почв».

У 1991 годзе Георгію Георгіевічу прапанавалі працу ў экспертна-крыміналістычным цэнтры Міністэрства ўнутраных спраў (МУС), дзе ён прайшоў шлях ад вядучага навуковага супрацоўніка да намесніка начальніка навукова-даследчай лабараторыі, атрымаўшы званне падпалкоўніка міліцыі. Працуючы ў цэнтры, ён завочна закончыў Маскоўскі юрыдычны інстытут і надрукаваў больш за 60 навуковых прац у вобласці крымінальнага права па кірунках экалогіі і радыялогіі. За гады працы ў экспертна-крыміналістычным цэнтры Міністэрства ўнутраных спраў Георгій Георгіевіч быў узнагароджаны Ганаровым знакам МУС «За верность долгу», «Знаком Георгия», медалём «За образцовую службу».

У 2004 годзе Г. Г. Амельянюк перайшоў на працу ў Міністэрства юстыцыі, праз год абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Концептуальные основы судебно-почвоведческой экспертизы», пасля чаго ўзначаліў лабараторыю ў Расійскім федэральным цэнтры судовай экспертызы пры Міністэрстве юстыцыі Расіі.

Георгій Георгіевіч апублікаваў каля 200 навуковых прац, у ліку якіх пяць кніг і адна манаграфія.

Галоўныя кірункі навуковых даследаванняў: судова-экалагічная экспертыза, стандартызацыя і сертыфікацыя ў судовай экспертызе, судова-глебазнаўчая экспертыза, судовая экспертыза тытунёвых вырабаў.

Георгій Георгіевіч з'яўляецца адным з арганізатараў работы па падрыхтоўцы судова-экспертных устаноў Міністэрства юстыцыі Расіі да акрэдытацыі па міжнародных стандартах. З 2009 года ён - эксперт па акрэдытацыі аналітычных лабараторый.

Навуковец выступае на міжнародных канферэнцыях за мяжой, яго працы апублікаваны ў ЗША, Швейцарыі, Шатландыі, Турцыі, Кітаі, Славеніі, Польшчы.

Сваю навуковую працу доктар юрыдычных навук спалучае з навукова-выкладчыцкай: Адзінаццаць гадоў ён чытаў лекцыі ў Маскоўскім універсітэце імя Баумана. Георгій Георгіевіч Амельянюк з'яўляецца дацэнтам крымінальна-пошукавай дзейнасці, прафесарам Акадэміі камунальнага кіравання і горадабудаўніцтва, выкладчыкам Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў. Валодае французскай і англійскай мовамі.

### *Працы*

**Омельянюк, Г. Г.** Концептуальные основы судебно-почвоведческой экспертизы : автореферат диссертации на соискание ученой степени доктора юридических наук : 12.00.09 / Георгий Георгиевич Омельянюк ; Государственное учреждение Российский федеральный центр судебной экспертизы при Министерстве юстиции Российской Федерации. - Воронеж, 2005. - 44 с.

**Омельянюк, Г. Г.** Судебно-почвоведческая экспертиза = Forensic soil examination / Георгий Георгиевич Омельянюк ; под редакцией Е. Р. Россинской ; Министерство юстиции Российской Федерации, Российский федеральный центр судебной экспертизы. - Москва : ЮНИТИ-ДАНА : Закон и право, 2004. - 619, [1] с.




**Ким Е. С.** Основные проблемы расследования преступлений, связанных с незаконным оборотом наркотических средств и психотропных веществ / Е. С. Ким, Г. Г. Омельянюк // Молодой ученый: вызовы и перспективы. – М. : «Интернаука», 2016.

**Судебная** экспертиза объектов дикой флоры и фауны: современное состояние и перспективы развития в Российской Федерации / Смирнова С. А., Омельянюк Г. Г., Гулевская В. В., Перфилова Т. В., Никулина М. В. // Теория и практика судебной экспертизы. – 2020. – Т. 15. - № 1. – С. 84-93.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Амельянюк Георгій Георгіевіч** // Самая «першая» : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 19-20. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**50 гадоў** з дня нараджэння Г. Г. Амельянюка (1966) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 8.

**Талантливые** люди талантливы во всем // Кобрин-информ. – 2009. – 17 сентября. – С. 27.

Уроженец Кобринщины Г. Г. Омельянюк - кандидат биологических наук, доктор юридических наук Российского федерального центра судебной экспертизы при Минюсте России, член Международного судебного общества.

**Георгий Георгиевич Омельянюк** [Электронный ресурс] // Юридическая Россия. – Режим доступа: http://law.edu.ru/person/ – Дата доступа: 02.03.2019.

# АНТАНЮК ГЕОРГІЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ

**АНТАНЮК Георгій Аляксандравіч** – беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук (1991), прафесар (1993), сацыёлаг, філосаф, даследчык прадметнай логікі, адзін з першых распрацоўшчыкаў метадалогіі сістэмнага падыходу ў сацыялагічным даследаванні.



Нарадзіўся 13 лістапада 1942 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна.

Пасля заканчэння Магілёўскага машынабудаўнічага тэхнікума служыў у Савецкай арміі. Закончыў філасофскі факультэт (дзённае аддзяленне) Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта, спецыяльнасць «філасофія» (1965-1970).

Вучыўся ў аспірантуры Інстытута філасофіі і права АН БССР (1970-1973). З 1973 года ён малодшы, потым старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі і права АН БССР (цяпер Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі).

У 1974 годзе Г. А. Антанюк абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Системный подход в социологическом исследовании».

З 1980 да чэрвеня 2004 года - выкладчык на кафедры філасофіі НАН Беларусі (старшы выкладчык, дацэнт, прафесар).

У 1990 годзе абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Социальное проектирование (теоретико-методологический аспект)». Доктарская дысертацыя прысвечана метадалогіі праектавання сацыяльных адносін.

Апублікавана звыш 70 навуковых работ Г. А. Антанюка. Ён аўтар шэрагу прац: «Социальное проектирование и управление общественным развитием: Теоретико-методологический аспект» (1986), «Социальное проектирование в процессе практического применения социальных знаний» (1992), «Социальная идеализация, идеология и общество» (1998), «Объективная цель человечества и его стандартизация» (2003) і інш.

Прафесар Антанюк быў наватарам у распрацоўцы метадалогіі сацыяльна-інжынернага праектавання, прысвяціў гэтай тэме шэраг грунтоўных работ. З 1990-х гадоў пастунова пераходзіць да крытычнага пераасэнсавання філасофіі і ў цэлым ідэалогіі як крыніцы аб'ектыўнага пазнання. Даследуе агульнасацыяльныя і агульнафіласофскія праблемы, вывучае праблемы сістэмнага падыходу ў сацыялагічным даследаванні,

метадалогіі навуковага пазнання, а таксама маралі, палітыкі, ідэалогіі і дзяржаўнага будаўніцтва, рэлігіі, нацыянальна-этнічных адносін і інш.

З 1992 года Георгій Аляксандравіч рэгулярна публікуецца ў СМІ па розных актуальных праблемах Беларусі і Расіі і праблемах, якія існуюць ва ўзаемаадносінах паміж гэтымі краінамі.

***Працы***

**Антонюк, Г. А.** Системный подход в социологическом исследовании (методологические проблемы исследования взаимоотношения социальной системы и ее компонентов) : дис…. канд. филос. наук / Георгий Александрович Антонюк ; АН БССР, Ин-т философии и права. - Минск : [б. и.], 1974. - 196 с.

**Антонюк, Г. А.** Социальное проектирование и управление общественным развитием : теоретико-методологический аспект / Георгий Александрович Антонюк ; АН БССР, Кафедра философии. - Минск : Наука и техника, 1986. - 205 с.

**Антонюк, Г. А.** Объективная цель человечества и его стандартизация / Г. А. Антонюк // Восточнославянские страны в эпоху глобализации: выбор путей развития. - Гродно, 2003.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1996. – Т. 1. – С. 382.

**Антонюк Георгий Александрович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Мінск, 2009. – Кн. 1. - С. 22.

**Антонюк Георгий Александрович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] – Минск, 2006. – Т. 2. – С. 122.

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2010. – Т. 1. - С. 171.

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. – (Імі ганарацца землякі).

**Елсуков, А. Н.** Антонюк Георгий Александрович / А. Н. Елсуков // Социологическая энциклопедия. – Минск, 2005. – С. 20.

**Кавецкий, С. Т.** Брестчина социологическая. Антонюк Георгий Александрович / С. Т. Кавецкий // Брестский социологический барометр / С. Т. Кавецкий. – Брест, 2005. – С. 25.

**З філасофскім** падыходам да жыцця // Кобрынскі веснік. – 2013. – 23 лютага. – С. 4.

# БАРМУЦКАЯ АЛІЦЫЯ ЗБІГНЕЎНА

**БАРМУЦКАЯ Аліцыя Збігнеўна** - вучоны-медык, кандыдат медыцынскіх навук.



Нарадзілася Аліцыя Бармуцкая ў 1953 годзе ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці.

У 1975 годзе закончыла Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Стаматалогія».

Аліцыя Збігнеўна - доктар-стаматолаг-хірург вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі па спецыялізацыі сківічна-тварнай хірургіі, дацэнт кафедры хірургічнай стаматалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Вобласць яе навуковых інтарэсаў: сківічна-тварная хірургія, хірургічная стаматалогія; рэфлексатэрапія, рэабілітацыя.

Тэма кандыдацкай дысертацыі А. Бармуцкай «Компрессионно-дистракционный остеосинтез в лечении осложненных переломов нижней челюсти».

А. З. Бармуцкая - член АА «Асацыяцыі аральных і сківічна-тварных хірургаў Рэспублікі Беларусь».

З 2008 года Аліцыя Збігнеўна працуе ў ТАА «Элегія». Выконвае ўсе віды амбулаторных хірургічных стаматалагічных аперацый, уключаючы прымяненне лазерных тэхналогій.

Аліцыя Збігнеўна Бармуцкая выступае з дакладамі на навукова-практычных канферэнцыях, семінарах у Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі, актыўна цікавіцца апошнімі навуковымі дасягненнямі ў вобласці сківічна-тварнай хірургіі, хірургічнай стаматалогіі, рэабілітацыі. Апублікавала больш за 100 навуковых прац па сківічна-тварнай хірургіі і хірургічнай стаматалогіі, мае патэнт на вынаходніцтва.

***Працы***

**Анаэробная** инфекция челюстно-лицевой области и шеи **:** учебное пособие / Походенько-Чудакова И. О., Чудаков О. П., Жаворонок С. В., Бармуцкая А. З. – Минск : БГМУ, 2014.

**Возможности** применения конусно-лучевой компьютерной томографии в диагностике радикулярных кист на верхней челюсти в области премоляров и моляров / А. З. Бармуцкая, И. О. Походенько-Чудакова, Н. А. Соврасова, Е. В. Шотт // Реабилитация в челюстно-лицевой хирургии и стоматологии : сборник трудов научно-практической конференции. – Минск, 2012. – С. 156–158.

**Рентгенодиагностика** мультифакальногоостеосклероза / Н. А. Саврасова, Е. В. Шотт, А. З. Бармуцкая, А. Г. Илькевич // Стоматологический журнал. – 2015. – № 3. – С. 74−78.

**Тактика** хирургического лечения одонтогенного хронического синусита в области дна верхнечелюстной пазухи / И. О. Походенько-Чудакова, А. З. Бармуцкая, А. В. Сурин // Новости хирургии. – 2015. – Т. 23, № 3. – С. 314−319.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Бармуцкая Аліцыя Збігнеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**65 гадоў** з дня нараджэння А. З. Бармуцкай (1953) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 64.

**Бармуцкая Алиция Збигневна** [Электронный ресурс] // Профессор. – Режим доступа: http://professor.bsmu.by/specialist/barmuckaya-aliciya-zbignevna. – Дата доступа: 21.06.2017.

# БАРЫСЮК МІКАЛАЙ АНДРЭЕВІЧ

**БАРЫСЮК Мікалай Андрэевіч** - генерал-лейтэнант (1993), лаўрэат дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі ў галіне навукі і тэхнікі (1994), сапраўдны член акадэміі касманаўтыкі імя К. Э. Цыялкоўскага, ганаровы радыст СССР (1986), старшы навуковы супрацоўнік, заслужаны выпрабавальнік касмічнай тэхнікі (2000), кандыдат тэхнічных навук (1994), дацэнт.



Нарадзіўся 15 жніўня 1941 года ў вёсцы Рэчыца Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1962 годзе закончыў Ленінградскае ордэна Леніна Чырванасцяжнае вучылішча імя М. В. Фрунзе.

Ва Узброеных Сілах СССР і Расійскай Федэрацыі з 1959 па 1997 год. Афіцэрскую службу з 1962 па 1987 год праходзіў на Байкануры, дзе прайшоў практычна ўсе пасады ад камандзіра ўзвода да намесніка начальніка касмадрома па ракетным узбраенні. Ён унёс значны ўклад у павышэнне абараназдольнасці краіны, прымаў удзел у правядзенні наземных і лётных выпрабаванняў вырабаў ракетна-

касмічнай тэхнікі на касмадроме. Пад яго кіраўніцтвам былі адпрацаваны і прыняты на ўзбраенне ракетныя комплексы з міжкантынентальнымі балістычнымі ракетамі новага пакалення.

Завочна закончыў Ваенную інжынерную акадэмію імя Ф. Э. Дзяржынскага ў 1971 годзе. Далейшая служба Мікалая Андрэевіча звязана з Галоўным навукова-даследчым цэнтрам касмічных сродкаў Мінабароны. У 1987 годзе ён становіцца намеснікам начальніка 53 Галоўнага цэнтра па кіраванні арбітальнымі групоўкамі касмічных апаратаў, кіруе працай дзяржаўных камісій па лётных выпрабаваннях перспектыўных ракетна-касмічных комплексаў. З 1991 года - намеснік начальніка касмічных сродкаў МА па эксплуатацыі касмічных сродкаў, з 1993 па 1997 год - першы намеснік камандуючага Ваенна-касмічнымі сіламі.

М. А. Барысюк удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні выпрабаванняў ракетна-касмічнага комплексу «Энэргія-Буран».

У 1989 годзе закончыў Вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Акадэміі Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР імя К. Я. Варашылава.

Мікалай Андрэевіч - кіраўнік даследаванняў па многіх навукова-даследчых работах, непасрэдны ўдзельнік больш за сотню баявых запускаў, аўтар 40 навуковых друкаваных прац. Актыўна прапагандуе дасягненні айчыннай касманаўтыкі, займаецца сацыяльна-прававой працай, навукова-гістарычнай і інфармацыйнай дзейнасцю.

У 1997 годзе звольнены ў запас па дасягненні гранічнага ўзросту знаходжання на ваеннай службе. Знаходзячыся на заслужаным адпачынаку, генерал Барысюк працягвае актыўную грамадскую працу па выхаванні маладога пакалення абаронцаў Радзімы, прымае ўдзел у ветэранскім руху, з'яўляецца старшынёй міжрэгіянальнай грамадскай арганізацыі «Ветэраны касмадрома «Байканур».

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, медалямі СССР, Расійскай Федэрацыі і Федэрацыі касманаўтыкі Расіі. Ганаровы грамадзянін горада Байканур (2004).

**Борисюк, Н. А.** Мы в Байконур вросли сердцами / Н. А. Борисюк, А. Я. Науджюнас // Красная звезда. – 2014. – 19 февраля.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**50 лет** 4 испытательному управлению космодрома Байконур (1962-2012) : буклет. – Байконур, 2012. – 6 с.

**Ганаровыя** грамадзяне-землякі іншых гарадоў**. Барысюк Мікалай Андрэевіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 65-66.

**Нечёса, Я.** Сила Байконура / Ярослав Нечёса, Игорь Подгурский // Красная звезда. – 2006. – 26 декабря.

Председатель центрального совета ветеранов Байконура - генерал-лейтенант Николай Борисюк.

**Куринной, И.** В строю ветеранов - гордость страны / Игорь Куринной // Красная звезда. – 2004. – 2 октября.

Председателем совета ветеранской организации Байконура является один из старейших и уважаемых байконуровцев генерал-лейтенант в отставке Н. А. Борисюк.

**Почтарев, А.** Пионеры космических стартов / Андрей Почтарев // Красная звезда. – 2004. – 10 апреля.

Достойным правопреемником, председателем ветеранского движения Байконура, является генерал-лейтенант в отставке Николай Борисюк.

**Борисюк Николай Андреевич** [Электронный ресурс] // Центр военно-политических исследований. – Режим доступа: http: http://eurasian-defence.ru/?q=node/29328. – Дата доступа: 31.10. 2018.

**Борисюк Николай Андреевич** [Электронный ресурс] // Командно-измерительный комплекс (КИК). – Режим доступа: http://kik-sssr.ru /00.5.5_ Deputy_commander.htm. – Дата доступа: 09.11.2018.

**Почетные** граждане города. **Борисюк Николай Андреевич** [Электронный ресурс] // Официальный сайт администрации города Байконур. – Режим доступа: http://www.baikonuradm.ru. – Дата доступа: 08.11.2019.

# БЕЛЬСКІ АЛЯКСЕЙ ЯКІМАВІЧ

**БЕЛЬСКІ Аляксей Якімавіч** – вучоны, кандыдат фізіка-матэматычных навук.



Нарадзіўся ў 1947 годзе ў вёсцы Стрыі Кобрынскага раёна.

Аляксей Якімавіч - дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Кірункі навуковых даследаванняў: распрацоўка стабільных крыніц ваганняў ЗВЧ дыяпазону, даследаванне шумавых уласцівасцяў ЗВЧ прыбораў і прылад.

Асноўныя публікацыі навукоўца: «Оценка шумовых характеристик волноводного генератора на диоде Ганна КВЧ диапазона», «Шумовые параметры генератора на диоде Ганна с варакторной перестройкой частоты», «Лабораторный практикум по курсу «Электронные приборы для студентов всех специальностей БГУИР» в 2 ч. Ч. 1. Активные компоненты полупроводниковой электроники».

***Працы***

**Бельский, А. Я.** Электронные приборы: цифровые устройства : учебно-методическое пособие / А. Я. Бельский. - Минск : БГУИР, 2011. - 128 с.

**Бельский, А. Я.** Электронные приборы и устройства : практикум для студентов специальности «Электронные вычислительные средства» всех форм обучения / А. Я. Бельский. – Минск : БГУИР, 2006. - 48 с.

**Электронные** приборы и устройства : методическое пособие / А. Я. Бельский, С. В. Дробот, В. Б. Рожанский [и др.]. – Минск : БГУИР, 2006. - 59 с.

**Оценка** шумовых характеристик волноводного генератора на диоде Ганна КВЧ диапазона / Бельский А. Я., Дробот С. В., Мошинский А. В. [и др.] // Современные средства связи : материалы международной научно-технической конференции. - Нарочь, 1995. – С. 131-134.

**Бельский, А. Я.** Автоматический измеритель флуктуаций миллиметрового диапазона длин волн / А. Я. Бельский [и др.] // Весці НАНБ. – 2003. - № 1. - С. 64-71.

**Бельский, А. Я.** Функционирование и калибровка измерителя флуктуаций сигналов трехмиллиметрового диапазона длин волн / А. Я. Бельский, А. В. Гусинский, А. Б. Дзисяк [и др.] // Известия Белорусской Инженерной Академии. – 2002. - № 2 (14). - С. 46-47.

**Бельский, А. Я**. Шумовые параметры генератора на диоде Ганна с варакторной перестройкой частоты / Бельский А. Я., Дробот С. В. // Радиотехника и электроника. – 1999. - Вып. 24. – С. 165–168.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Бельскі Аляксей Якімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**70 гадоў** з дня нараджэння А. Я. Бельскага // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 35.

**Бельский Алексей Якимович** [Электронный ресурс] // Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники. - Режим доступа: https://www.bsuir.by/ru/kaf-elektroniki/belskiy-a-ya. – Дата доступа: 06.02.2017.

**Бельский Алексей Якимович** [Электронный ресурс] // Помощник студента БГУИР. – Режим доступа: http://bsuir-helper.ru/lectors/belskii. – Дата доступа: 21.06.2017.

**Імі ганарацца** землякі. Бельскі Аляксей Якімавіч [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: https://ikobrin.by/kobrin-139.php . – Дата доступу: 30.06.2017.

# БОЎБЕЛЬ ЯЎГЕНІЙ ІВАНАВІЧ

**БОЎБЕЛЬ Яўгеній Іванавіч** (1941-2008) - кандыдат фізіка-матэматычных навук.



Нарадзіўся 23 верасня 1941 года ў горадзе Кобрыне. Вучыўся ў сярэдняй школе № 1. У 1959 годзе закончыў школу і паступіў у Мінскі радыётэхнікум. Закончыўшы яго, ідзе служыць у армію.

Пасля арміі Я. Боўбель - студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Як адукаванага і практычнага чалавека, які вылучаўся сярод астатніх працаздольнасцю, зацікаўленасцю да працы, Яўгенія Боўбеля запрашаюць працаваць у гэтым універсітэце. Ён - выкладчык на кафедры радыёфізікі і электронікі.

У 1976 годзе Я. І. Боўбель абараніў дысэртацыю на вынаходжанне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук па тэме «Исследование функции неопределенности неузкополосных сигналов численными методами».

Боўбель Я. І. - дацэнт кафедры радыёфізікі і электронікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ён унёс вялікі ўклад у адно з прыярытэтных напрамкаў даследаванняў кафедры - арганізацыю і правядзенне інфармацыйных тэхналогій і камп'ютарна-арыентаваных сістэм апрацоўкі сігналаў рознай фізічнай прыроды і прызначэння.

Яўгеній Іванавіч – ганаровы прафесар Ліёнскага ўніверсітэта, прафесар кафедры інфарматыкі Вышэйшай школы г. Ліёна (Францыя). На яго рахунку больш за 200 навуковых публікацый, якія апублікаваны ў міжнародных часопісах.

У 2000 годзе Амерыканскі Біяграфічны Інстытут узнагародзіў Я. І. Боўбеля медалём гонару «2000 Mileniym» (*Медаль гонару адліты ўручную амерыканскім дызайнерам. Ён мае два дзюймы ў дыяметры і ўтрымлівае дваццаць чатыры караты золата, з указаннем асабістага імя Я. І. Боўбеля. На медалі выведзены надпіс, які паказвае на іх абмежаваны выпуск).* Медаль сімвалізуе важнасць дасягненняў Боўбеля для ўсяго чалавецтва ў вобласці радыёэлектронікі.




За значныя заслугі Яўгеній Іванавіч Боўбель атрымаў выключнае запрашэнне на сёмае выданне «Пяць тысяч асоб свету», якое выдаецца Амерыканскім Біяграфічным Інстытутам (АБІ). У аснове гэтага выдання словы брытанскага пісьменніка, публіцыста, гісторыка і філосафа Томаса Карлейла з іх вялікім і значным сэнсам: «*Гісторыя свету складаецца з біяграфій вялікіх людзей*». У

гэтую даведачную працу, якая заснавана ў 1967 годзе і з'яўляецца адной з папулярных біяграфічных калекцый, унесены пяць тысяч асоб свету, лідэры з пяцідзесяці краін. Прэстыжна і ганарова, што дзейнасць Яўгенія Іванавіча Боўбеля, нашага земляка, знаходзіцца сярод тых, што інстытут пажадаў размясціць у выданні «Пяці тысяч асоб свету».

### *Працы*

**Бовбель, Евгений Иванович.** Исследование функции неопределенности неузкополосных сигналов численными методами : автореф. дис. на соиск. учен. степени канд. физ.-мат. наук : (01.04.03) / Е. И. Бовбель ; Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина. - Минск : [б. и.], 1976. - 20 с.

**Бовбель, Е. И**. Скрытые марковские модели и машины на опорных векторах от теории к практике : пособие для студентов естественнонаучных специальностей / Е. И. Бовбель, И. Э. Хейдоров, Ю. В. Пачковский. - Минск : Белорусский государственный университет, 2008. - 129, [2] с. : ил., табл.

**Бовбель, Е. И.** Элементы теории информации / Е. И. Бовбель, И. К. Данейко, В. В. Изох ; под ред. В. В. Изоха. - Минск : Издательство БГУ, 1974. - 112 с. : ил.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Боўбель Яўгеній Іванавіч** // Самая «першая» : інфармацыйна - бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 21. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Сарычев, В.** Школа моей мамы / Василий Сарычев // Вечерний Брест. – 2010. – 10 ноября. – С. 1-2. – (Вечёрочка).

Из стен СШ № 1 г. Кобрина вышли многие учёные, среди которых и Евгений Бовбель.

**Час** пазнанняў і адкрыццяў // Кобрынскі веснік. – 2003. – 26 красавіка.

У сярэдняй школе № 1 г. Кобрына вучыўся Я. І. Боўбель.

**Піліпук, С.** Цікавыя людзі побач / Света Піліпук // Маладзік. - 2001. - № 1. - С. 1, 3.

Боўбель Яўген Іванавіч **-** кандыдат фізіка-матэматычных навук, ураджэнец г. Кобрына.

## БРЭН КЕЛЯСЦІН ІВАНАВІЧ

**БРЭН Келясцін Іванавіч** (1800-1875) - беларускі краязнавец, фалькларыст, этнограф.



Нарадзіўся 7 красавіка 1800 года на Брэстчыне. З сям'і чыншавых дзяржаўных сялян. Як год нараджэння ў розных працах называюцца таксама 1799 и 1802. Закончыў Брэсцкае шасцікласнае вучылішча, дзе пасля два гады працаваў выхавацелем. У канцы 1820-х гадоў вучыўся і працаваў пісьмаводам у Жыровіцкай духоўнай семінарыі.

З 1831 года - святар, атрымаў парафію Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Кобрыне, намеснік дэкана, з 14 кастрычніка 1838 года настаяцель царквы св. Мікалая ў в. Стары Корнін Бельскага павета Гродзенскай губерні, з 30 красавіка 1839 года праваслаўны. Пасля прыняцця праваслаўя сустрэў варожыя адносіны да сябе з боку мясцовага насельніцтва і быў вымушаны перамяшчацца пад аховай тысяцкага.

К. І. Брэн збіраў матэрыялы пра абрады, народныя гульні і забавы. Ён адзначыў некаторую архаічнасць у беларускім фальклоры, што дало магчымасць лічыць беларускую народную творчасць адной з самых старажытных у славянскім рэгіёне.

Келясцін Брэн - аўтар працы «Мясцовае этнаграфічнае апісанне Бельскага павета» (напісана ў 1856 годзе), якая прысвечана матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага насельніцтва на тэрыторыі Падляшша (цяпер Беласточчына). Складаецца з 6 раздзелаў: «Вонкавы выгляд», «Мова», «Хатні побыт», «Асаблівасці грамадскага быту», «Разумовыя здольнасці, маральныя якасці і адукацыя», «Народныя паданні і помнікі». У ёй змешчана 38 народных песень, у тым ліку 14 вясельных з апісаннем вясельных абрадаў, 24 загадкі, 15 прымавак, 2 казкі, дадзена параўнальнае апісанне побыту беларусаў і мазураў. Вясельныя песні пададзены ў адпаведнасці з апісаннем вясельных абрадаў, іншы фальклорны матэрыял змешчаны ў дадатку. Да працы прыкладзены малюнкі адзення, рыбалоўных прылад, планы жылых і гаспадарчых пабудоў. Рукапіс захоўваецца ў архіве Геаграфічнага таварыства Расійскай Федэрацыі ў Санкт-Пецярбургу.

Памёр Келясцін Іванавіч Брэн у 1875 годзе. Пахаваны пры царкве ў Старым Корніне.

### *Працы*

**Бренн Келестин.** Из путевых заметок старого священника / Келестин Бренн // Литовские епархиальные ведомости. - 1864. - № 24. - С. 951-958.

**Бренн, К. И.** Местное этнографическое описание Бельского уезда / Келестин Иванов Бренн // Бельскі гостінэць. - № 1. - Бельск-Падляскі, 2017. - С. 13-51.

**Вяселле** ў Бельскім павеце. (На падставе рукапісу К. І. Брэна з 1853 г., апрацаваў Мікалай Лобач) // Беларускі каляндар. 1982. - Беласток, 1982. - С. 163-174.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Брен Келестин Иванович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2006. – Т. 2. – С. 498.

**Брен Келестин Иванович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 122-123.

**Лобач, М. С.** Брэн Келясцін Іванавіч / М. С. Лобач // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск, 1989. – С. 90.

**Лобач, М. С.** Брэн Келясцін Іванавіч / М. С. Лобач // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1996. – Т. 2. – С. 283.

**Лобач, М. С.** Брэн Келясцін Іванавіч / М. С. Лобач // Асветнікі зямлі Беларускай, X - пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. - Мінск, 2010. - С. 65.

Беларускі краязнавец, збіральнік фальклору К. І. Брэн (каля 1800-1875) служыў святаром у Кобрыне.

**Лобач, М.** Келясцін Брэн. Па слядах рукапіснага этнаграфічнага апісання Бельскага павету свяшчэнніка Келясціна Брэна з 50-х гадоў XIX ст. / М. Лобач // Беларускі каляндар 1986. - Беласток, 1986. - С. 69-90.

**Саламевіч, У. І.** Брэн Келясцін Іванавіч / У. І. Саламевіч // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. - Мінск, 2005. - Т. 1. – С. 190-191.

**Doroteusz, F.** Dziela duchownych ze Starego Kornina fundamenty naszej tożsamości / Fionik Doroteusz // Бельскі гостінэць. - № 1. - Бельск-Падляскі, 2017. - С. 3-12.

Бренн К. И. - краевед, этнограф, фольклорист, в 1831 служил священником в г. Кобрине.

**7 красавіка 1800 г.** [нар. К. І. Брэн] : Даты. Падзеі. Людзі // Звязда. - 2016. - 7 красавіка. – С. 16.

У гэты дзень нарадзіўся К. І. Брэн, беларускі краязнаўца, фалькларыст, этнограф, які некалькі год служыў святаром у Кобрыне.

**Пазднякоў, В**. Брэн Келясцін Іванавіч / Валерый Пазднякоў [Электронны рэсурс] // Электронная энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае». – Рэжым доступу: http://vkl.by/articles/2280. – Дата доступу: 15.12.2018.

# БУЙНОЎСКАЯ АНГЕЛІНА АНАТОЛЬЕЎНА

**БУЙНОЎСКАЯ (Дружылоўская) Ангеліна Анатольеўна** - кандыдат медыцынскіх навук (1986), урач-арганізатар аховы здароўя I кваліфікацыйнай катэгорыі.



Нарадзілася 5 красавіка 1955 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Закончыла сярэднюю школу № 1, выпускніца 1972 года. Ангеліна ўзнагароджана медалём «Юны ўдзельнік ВДНГ» выставы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР.

У 1972 годзе паступіла ў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (МДМІ), які закончыла з адзнакай па спецыяльнасці «Лячэбная справа». Ангеліна Анатольеўна працавала старшым навуковым супрацоўнікам лабараторыі калагенозаў Цэнтральнай навукова-даследчай лабараторыі МДМІ. У 1978-1990 гадах – лячэбна-кансультатыўная і навуковая работа ў галіне рэўматалогіі на базе 2-й кафедры ўнутраных хвароб МДМІ.

У 1986 годзе Ангеліне Анатольеўне прысуджана вучоная ступень кандыдата медыцынскіх навук.

У 1990-1991 гадах А. А. Буйноўская - загадчыца паліклінічнага аддзялення медыцынскай службы Цэнтральнай групы войскаў у Чэхаславакіі.

У 1991-1997 гадах – урач-кансультант, урач-рэфлексатэрапеўт медыцынскай фірмы «Авіцэна» і Мінскага гарадскога эндакрыналагічнага дыспансэра.

З 1997 па 2002 год працуе намеснікам дырэктара па медыцынскай частцы САК «Юнацтва» Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З 2002 года – галоўны ўрач рэабілітацыйнага цэнтра «Дом Міласэрнасці» рэлігійнай абшчыны «Прыход у гонар Усіх Святых» Мінскай епархіі Беларускай Праваслаўнай царквы.

Узнагароджана ордэнам Рускай Праваслаўнай Царквы ў гонар прападобнага Серафіма Сароўскага. Галоўны спецыяліст па медыцынскаму турызму «Цэнтра па санаторна-курортнай рабоце ЦЭНТР КУРОРТ» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прымае ўдзел у міжнародных семінарах у галіне рэабілітацыі, геранталогіі, анкалогіі.

**Буйновская, А. А.** Центральная, регионарная гемодинамика и сократительная функция миокарда при системной склеродермии : автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. мед. наук : 14.00.39 / Мин. гос. мед. ин-т ; Ангелина Анатольевна Буйновская. - Мінск, 1985. - 23 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**65 гадоў** з дня нараджэння А. А. Буйноўскай (1955) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 133.

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Буйноўская (Дружылоўская) Ангеліна Анатольеўна** // Самая «першая» : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 22. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Савчук, М.** Листая страницы памяти / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2020. – 16 января. – С. 3.

Ангелина Буйновская - о своей семье, матери.

# ВАЙТКОЎСКАЯ АЛА АЛЯКСАНДРАЎНА



**ВАЙТКОЎСКАЯ Ала Аляксандраўна** - беларускі вучоны ў галіне бульбаводства, кандыдат біялагічных навук (1971).

Нарадзілася 25 сакавіка 1934 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці.

У 1957 годзе закончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.

У 1957-1990 гадах Ала Аляксандраўна працавала ў Беларускім навукова-даследчым інстытуце бульбаводства. З 1962 года - загадчыца біяхімічнай лабараторыі па бульбаводстве, з 1972 - лабараторыі біяхіміі і фізіялогіі, з 1982 - лабараторыі біяхімічнай ацэнкі і аграхімічнага аналізу.

У 1971 годзе А. А. Вайткоўскай прысуджана вучоная ступень кандыдата біялагічных навук. Даследавала біяхімічныя метады якасці бульбы, дынаміку назапашвання пажыўных рэчываў у бульбе падчас росту і захоўвання клубняў.

Суаўтар сорту бульбы «Вярба».

***Працы***

**Войтковская, Алла Александровна.** Биохимическая характеристика развития клубней основных сортов картофеля БССР : Автореферат дис. на соискание ученой степени кандидата биологических наук. (093) / АН БССР. Ин-т эксперим. ботаники. - Минск : [б. и.], 1970. - 24 с.

**Бульба** : популярный энциклопедический справочник по биологии, возделы-ванию, хранению и использованию картофеля в кулинарии / сост. Е. В. Малашевич. - Минск : Беларуская энцыклапедыя, 1994. - 346, [4] с. - Среди научн. консульт. – Войтковская А. А.

**Бульба :** энциклопедический справочник по выращиванию, хранению, переработке и использованию картофеля / ред. кол.: И. П. Шамякин (гл. ред.), П. И. Альсмик, А. Ф. Богдановский, В. В. Валуев, В. Г. Иванюк [и др.]. – Минск : Белорусская Советская Энциклопедия, 1988. – 674 с. : ил. - Среди научн. консультантов – Войтковская А. А.

**Забара, М. Г.** Справочник картофелевода / Мария Григорьевна Забара, Алла Александровна Войтковская. - 2-е изд., перераб. - Минск : Ураджай, 1989. – 303 с.

**Ширко, Т. С.** Картофель: от ростка до горшка / Тамара Сергеевна Ширко, Алла Александровна Войтковская. - Минск : Полымя, 1999. - 172,[1] с. – (Подарок хозяину).

**250 блюд** из картофеля / сост. Т. С. Ширко, А. А. Войтковская. – Минск : Полымя, 1999. - 157, [1] с.

**Ширко, Т. С.** Пути снижения накопления нитратов в клубнях картофеля и плодоовощной продукции / Т. С. Ширко, Л. П. Дробенкова, А. А. Войтковская. - Минск, 1989. - 48 с. – (Общие вопросы растениеводства).

**Ширко, Т. С.** Щедрый стол : оригинальная кухня здоровья / Тамара Сергеевна Ширко, Алла Александровна Войтковская. – Минск : Чалавек і эканоміка : Произв.-коммерч. предприятие «Беласев», 1996. - 703 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Войтковская Алла Александровна** // Бульба белорусская : энциклопедия. – Минск, 2008. – С. 325.

**Войтковская**, **Алла Александровна** // Сводный электронный каталог библиотек Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by. – Дата доступа: 19.04.2018.

# ВЕРХАВЕЦ ЛЮДМІЛА ЯКАЎЛЕЎНА

**ВЕРХАВЕЦ Людміла Якаўлеўна** - вучоны, кандыдат тэхнічных навук.

Нарадзілася ў 1942 годзе ў вёсцы Літвінкі Кобрынскага раёна. Калі дзяўчынцы быў адзін год, яе бацькоў, Якава Георгіевіча і Ірыну Кляменцьеўну, забілі бандыты. Да 1947 года Людмілу гадавала цётка, а потым яе забрала бабуля ў г. Гомель, дзе яна жыла і вучылася.

У 1966 годзе Людміла Верхавец закончыла Кіеўскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці па спецыяльнасці «інжынер-канструктар».

Пасля заканчэння інстытута два гады працавала на Баранавіцкай швейнай фабрыцы.

З 1968 года Л. Я. Верхавец працавала ў Віцебскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці (цяпер Віцебскі тэхналагічны ўніверсітэт).

У 1979 годзе завочна закончыла аспірантуру Ленінградскага інстытута тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці і абараніла кандыдацкую дысертацыю.

Людміла Якаўлеўна Верхавец - дацэнт кафедры канструявання і тэхналогіі адзення Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта, кандыдат тэхнічных навук.

***Працы***

**Верховец, Л. Я**. Исследования свойств соединительных швов в готовой одежде : автореф. дис. / Л. Я. Верховец. - Л., 1979. - 18 с.

**Верховец, Л. Я.** Исследование деформационных свойств ниточных швов / Л. Я. Верховец, Ф. А. Ким // Повышение эффективности производства в отралях текстильной и легкой промышленности. – Ленинград, 1979. – С. 3-6.

**Верховец, Л. Я.** Зависимость качества одежды от деформационных свойств ниточных швов / Л. Я. Верховец, Ф. А. Ким // Товароведение и легкая промышленность : республиканский межведомственный сборник / БГИНХ им. В. В. Куйбышева. – Минск, 1983. – Вып. 10. – С. 72-74.

**Верховец, Л. Я.** Метод оценки качества ниточных швов / Л. Я. Верховец, Ф. А. Ким // Совершенствование методов конструирования, формования и улучшения качества швейных изделий : тезисы докладов Всесоюзной научно-технической конференции, Москва, 15-16 сентября 1981 г. / МТИЛП. – Москва, 1981. – С. 143-144.

**Верховец, Л. Я.** Формирование у студентов практических навыков по конструированию одежды / Л. Я. Верховец // Актуальные проблемы преподавания в ВУЗе : областная научно-методическая конференция : тезисы докладов, Витебск, 1996 г. / ВГТУ. – Витебск, 1996. – С. 66.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Верхавец Людміла Якаўлеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. - (Імі ганарацца землякі).

**[Верховец Людмила Яковлевна**] // Кафедре конструирования и технологии одежды - 45 лет / УО «ВГТУ» ; сост. Н. П. Гарская [и др.]. – Витебск : УО «ВГТУ», 2013. – С. 4, 5, 10.

**Верхавец Людміла Якаўлеўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 18-19.

**75 гадоў** з дня нараджэння Л. Я. Верхавец (1942) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 35.

# ВІСЛАВУХ СЕВЯРЫН

**ВІСЛАВУХ Севярын** (1900-1968) - прафесар, гісторык, грамадскі дзеяч, юрыст.



Севярын Віславух нарадзіўся 19 сакавіка 1900 года ў вёсцы Перкавічы Кобрынскага павета (цяпер Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці). Прадстаўнік шляхецкага роду Віславухаў.

Закончыў Віленскі ўніверсітэт (1927) і выкладаў у ім. З 1927 па 1939 год С. Віславух - навуковы супрацоўнік універсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні.

У даваенны перыяд Севярын вывучаў гісторыю ВКЛ, яго адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел да сярэдзіны XVI ст. (Кобрынскі павет, маёнткі Ласосна, Шарашова), шляхі зносін ВКЛ, даследаваў сацыяльную структуру, землеўладанне, рэлігійныя адносіны, працэсы русіфікацыі і паланізацыі ў Заходняй Беларусі, дзейнасць КПЗБ. Ён крытыкаваў урадавую палітыку асіміляцыі, выступаў у друку ў абарону беларускай культуры, выкладаў гісторыю ў беларускіх школах. Пасля вайны даследаваў сацыяльныя адносіны ў Сілезіі ў XIX-XX стагоддзях.

У 1945-1946 гадах С. Віславух загадчык кафедры гісторыі дзяржаўнага ладу Польшчы ў Лодзінскім універсітэце, з 1946 года - кафедры гісторыі дзяржавы і права Польшчы ў Вроцлаўскім універсітэце, у 1947-1955 гадах - яго прарэктар, у 1956-1958 - дэкан факультэта права і адміністрацыі.

Севярын Віславух - заснавальнік і дырэктар (1949-1953) Вроцлаўскага філіяла Заходняга інстытута, адзін з заснавальнікаў Сілезскага інстытута ў Аполе, з 1957 па 1960 год - старшыня яго Навуковай рады.

Памёр Севярын Віславух 28 лютага 1968 года ў горадзе Вроцлаве, Польшча.

***Працы***

**Rozwój** granic i terytorjum powiatu Kobryńskiego do połowy XVI wieku // Ateneum Wileńskie. 1929. Z. 1-4;

**Z dziejów** Łosośny i jej posiadaczy XV-XVI w. // Ateneum Wileńskie. 1930. Z. 1-2;

**Dobra** Szereszewskie: Ze studjów zad podziałem terytorjalnym W. Ks. Litewskiego przed reformą 1565-1566 r. // Ateneum Wileńskie. 1933. R. 8.

**Dawne** drogi Polesia // Ateneum Wileńskie. 1937. R. 12;

**Białorusini** na Ziemi Wileńskiej // Wilno i Ziemia Wileńska. Wilno, 1930. T. 1;

**Ziemia** Oszmiańska na rubieży dwu kultur // Pamiętnik Zjazdu Gospodarczego w Oszmianie. Wilno, 1932;

**Posługi** komunikacyjne w miastach W. Ks. Litewskiego na prawie magdeburskim do połowy XVI w. Wilno, 1936;

**Uwagi** o przyczynach rozwoju miasta Mohylewa w XVI-XVII w. // Wiadomości Studium historii prawa litewskiego USB. Wilno, 1938. T. 1.

***Аб жыцці і дзейнасці***


**Пазднякоў, В.** Віславух Севярын / Валерый Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск, 2005. – Т. 1. – С. 445.

**Вислоух Северин** [Электронный ресурс] // Википедия - свободная энциклопедия. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступа: 11.09.2019.

**Пазднякоў, В.** Віславух Севярын [Электронны рэсурс] / Валерый Пазднякоў // Электронная энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае». – Рэжым доступу: http://vkl.by/articles/546. – Дата доступу: 15.12.2019.

**Orzechowski,** K. Seweryn Wysłouch i jego prace z dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego i Śląska / K. Orzechowski // Czasopismo prawno-historyczne. - 1998. - Z. 1.

# ВОЛЧАК АЛЯКСАНДР АЛЯКСАНДРАВІЧ



**ВОЛЧАК Аляксандр Аляксандравіч** - доктар геаграфічных навук, прафесар. Лаўрэат прэміі Нацыянальнай Акадэміі навук 2007 года. Дэкан факультэта інжынерных сістэм і экалогіі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Аляксандр Волчак нарадзіўся 17 мая 1955 года ў вёсцы Сачковічы Пінскага раёна ў сям'і служачых.

У 1972 годзе закончыў СШ № 5 г. Кобрына. З 1972 па 1973 год працаваў слесарам на Кобрынскім ільнозаводзе.

У 1973 годзе Аляксандр паступіў на гідрамеліярацыйны факультэт Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута, які з адзнакай закончыў у 1978 годзе, атрымаў кваліфікацыю інжынера-гідратэхніка і быў напраўлены ў Яроміцкае БМУ Кобрынскага раёна на пасаду майстра ўчастка.

Пасля службы ў Савецкай арміі Аляксандр працаваў загадчыкам лабараторыі на кафедры сельскагаспадарчых меліярацый Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. У перыяд з 1984 па 1987 год вучыўся ў аспірантуры Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў (г. Мінск), дзе пад кіраўніцтвам загадчыка лабараторыі В. Н. Плужнікава падрыхтаваў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Исследование пространственно-временных колебаний элементов водного баланса (на примере Белоруссии)» на атрыманне навуковай ступені кандыдата геаграфічных навук, якую ў 1988 годзе абараніў у інстытуце водных праблем Акадэміі навук СССР (г. Масква). Пасля заканчэння аспірантуры працаваў на кафедры сельскагаспадарчых гідратэхнічных меліярацый на пасадах асістэнта, а затым дацэнта.

Па хадайніцтву НАН Беларусі і Брэсцкага аблвыканкама быў створаны Аддзел праблем Палесся НАН Беларусі ў г. Брэсце, куды на пасаду намесніка дырэктара па навуковай працы быў запрошаны А. А. Волчак. Сумесна з дырэктарам, доктарам хімічных навук, прафесарам Н. П. Ярчаком Аляксандр Аляксандравіч актыўна займаўся стварэннем і станаўленнем першай у Брэсцкай вобласці структуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У 2006 годзе ў г. Маскве А. А. Волчак абараніў дысертацыю на атрыманне навуковай ступені доктара геаграфічных навук па тэме «Закономерности формирования элементов водного баланса речных водосборов Беларуси в современных условиях».

У 2007 годзе сумесна з акадэмікам У. Ф. Логінавым Аляксандр Аляксандравіч стаў лаўрэатам прэміі Нацыянальнай акадэміі навук 2007 года за цыкл прац «Исследование гидрологического и климатического режимов территории Беларуси: современное состояние, изменения и прогноз». У лістападзе 2007 года прыняў удзел у рабоце Першага з'езду навукоўцаў Рэспублікі Беларусь.

У 2008 годзе А. А. Волчаку прысвоена навуковае званне прафесар па спецыяльнасці «Геаграфія». З 2007 па 2010 год Аляксандр Аляксандравіч з'яўляўся навуковым кіраўніком рэгіянальнай праграмы «Машыны, механізмы і сэрвіс».

У сакавіку 2009 года Аляксандр Аляксандравіч запрошаны ў Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт на пасаду дэкана факультэта водазабеспячэння і гідрамеліярацыі (з 2014 года - факультэт інжынерных сістэм і экалогіі). З 2009 года ён з'яўляецца членам навукова-метадычнага савета па спецыяльнасцях прыродаўладкавання і будаўніцтва вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў вобласці сельскай гаспадаркі.

А. А. Волчак – вядомы вучоны ў галіне гідралогіі, воднай гаспадаркі, аховы навакольнага асяроддзя. Аўтар больш за 600 навуковых прац (у тым ліку 10 манаграфій, 6 навучальных дапаможнікаў, 2 дапаможнікаў, 7 вынаходак). Актыўна ўдзельнічае ў навуковым жыцці рэспублікі, прымае ўдзел у навуковых канферэнцыях, дзе выступае з

дакладамі, рэгулярна друкуе свае працы ў цэнтральных рэспубліканскіх і замежных выданнях. З'яўляецца галоўным рэдактарам серыі Весніка БрДТУ.

Навуковец вядзе вялікую працу па падрыхтоўцы кадраў, чытае лекцыі студэнтам ва ўніверсітэтах г. Брэста, кіруе аспірантамі, дапамагае маладым спецыялістам. Пад кіраўніцтвам Аляксандра Аляксандравіча падрыхтавана і абаронена 12 магістарскіх і 6 кандыдацкіх дысертацый. Ім створана навукова-педагагічная школа «Брэсцкая гідралагічная школа».

З 2006 года А. А. Волчак з'яўляецца членам навукова-тэхнічнага савета Нацыянальнага парка «Белавежская пушча», з 2010 года - член секцыі па пытаннях навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання Навукова-кансультатыўнага савета Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. З 2012 года ўваходзіць у склад Міжведамаснай камісіі па пытаннях дзяржаўнай воднагаспадарчай палітыкі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і з'яўляецца намеснікам старшыні, экспертам Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў; членам савета па праблемах Палесся.

Па выніках рэспубліканскага конкурсу за выдатны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны быў удастоены персанальнай надбаўкі на 2011 год (распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25.01.2011 г. № 30рп).

У 2012 годзе А. А. Волчак узнагароджаны граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за значны асабісты ўклад у развіццё навукі, інавацыйнай дзейнасці і ў сувязі з Днём беларускай навукі. 24 снежня 2015 года Аляксандру Аляксандравічу прысуджана званне Ганаровага доктара УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна».

За выдатныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, значны асабісты ўклад у развіццё духоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, культурнай спадчыны беларускага народа Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 чэрвеня 2016 года А. А. Волчак узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Дарэчы, справу бацькі працягвае і дачка - Анастасія Аляксандраўна, кандыдат тэхнічных навук.

### *Працы*

**Волчек, А. А.** Закономерности формирования элементов водного баланса речных водосборов Беларуси в современных условиях : дис…. д-ра геогр. наук : 25.00.27 / А. А. Волчек. – Брест, 2005. – 297 с.

**Волчек, А. А.** Водные ресурсы Брестской области / А. А. Волчек, М. Ю. Калинин. – Минск : БГУ, 2002. - 440 с.

**Волчек, А. А**. Современное состояние водных ресурсов Белорусского Полесья / А. А. Волчек, М. Ю. Калинин // Прыроднае асяроддзе Палесся: Сучасны стан і яго змены : Тез. докл. межд. научн. конф. / ОПП НАН Беларуси. - Брэст, 2002. - С. 62-67.

**Волчек, А. А.** Синхронности в колебаниях стока рек Беларуси и его оценка / А. А. Волчек // Природные ресурсы. - 2001. - № 2. - С. 25-48.

**Волчек, А. А.** Пространственно-временные колебания элементов водного баланса (на примере Белоруссии) / А. А. Волчек, В. Н. Плужников // Водные ресурсы. - 1991. - № 5. - С. 21-38.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Брестский** государственный технический университет. Волчек Александр Александрович // Брест. Брэст. Brest. 1000 / сост. А. Н. Вабищевич. – Минск, 2019. – С. 366.

**65 гадоў** з дня нараджэння А. А. Волчака // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 135.

**Стрелец, М.** От рабочего до профессора. Александр Александрович Волчек / Михаил Стрелец // Брестская газета. – 2005. – 25 мая.

# ВОЎК АЛЯКСЕЙ АРСЕНЦЬЯВІЧ

**ВОЎК Аляксей Арсенцьевіч** (1930–1990)– вучоны, кандыдат гістарычных навук.



Нарадзіўся Аляксей Воўк у 1930 годзе ў вёсцы Мярніца Кобрынскага павета (цяпер в. Мярніца Кобрынскага раёна).

А. А. Воўк - дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З 1967 па 1990 год Аляксей Арсенцьевіч - дэкан філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

***Працы***

**Волк, А. А.** Деятельность КПБ по созданию и развитию издательского дела в БССР (1917-1937 гг.) : автореферат дис. / А. А. Волк. – Минск, 1964.

**Волк, А. А.** Книгоиздательское дело в Белоруссии : исторический очерк / А. А. Волк, А. И. Ракович. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1977. – 278 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Воўк Аляксей Арсенцьевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**90 гадоў** з дня нараджэння А. А. Воўка (1930) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 134.

**Да 85-годдзя** з дня нараджэння А. А. Воўка // Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2015 год / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. П. Сысоева. – Кобрын, 2015. – С. 60.

[**Волк Алексей Арсентьевич]** [Электронный ресурс] // Філалагічны факультэт. – Режим доступа: http:/ /philology.bsu.by/ru/ component/ . – Дата доступа: 21.06.2017.

# ВОЎК ЯЎГЕНІЙ АРСЕНЦЬЕВІЧ

**ВОЎК Яўгеній Арсенцьевіч** (1929–1986) - палкоўнік медыцынскай службы, кандыдат медыцынскіх навук. Заслужаны ўрач Узбекістана. Нарадзіўся ў 1929 годзе ў вёсцы Мярніца Кобрынскага павета (цяпер в. Мярніца Кобрынскага раёна).

***Працы***

**Волк, Е. А.** Агастральная астения и демпинг-синдром : автореферат дис. на соискание ученой степени кандидата медицинских наук специальность 777 Хирургия / Е. А. Волк. – Минск, 1972.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Воўк Яўген Арсенцьевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**90 гадоў** з дня нараджэння Я. А. Воўка (1929**)** // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 95.

**Імі ганарацца** землякі. Воўк Яўген Арсенцьевіч [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: https://ikobrin.by/kobrin-139.php. – Дата доступу: 21.06.2017.

# ГАПАСЮК СЦЯПАН ІЛЬІЧ

**ГАПАСЮК Сцяпан Ільіч** (1930-2005) - астрафізік, доктар фізіка-матэматычных навук, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны.



Нарадзіўся 7 ліпеня 1930 года ў вёсцы Лягаты Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і. Сцяпану даводзілася рабіць усё неабходнае па гаспадарцы, але ў яго былі выдатныя здольнасці, дапытлівасць і неверагодная цяга да ведаў, і у кожную вольную хвіліну ён шмат чытаў.

У час Вялікай Айчыннай вайны Сцяпан Гапасюк з 1942 па 1944 год знаходзіўся ў партызанскай брыгадзе імя Чапаева, удзельнічаў у ваенных аперацыях. Пасля вайны юны партызан быў узнагароджаны ордэнам.

Вучыўся ў сярэдняй школе № 1 г. Кобрына. Адоранага і таленавітага вучня накіроўваў і падтрымліваў любімы настаўнік рускай мовы і літаратуры Міхаіл Ільіч Кірылаў, заслужаны настаўнік БССР, удзячнасць да якога С. Гапасюк пранёс праз усё жыццё. Два апошнія класы Сцяпан закончыў за адзін год, у 1949 годзе экстэрнам здаў экзамены за курс сярэдняй школы. Паспяхова былі здадзены і ўступныя іспыты, Сцяпан Гапасюк стаў студэнтам фізічнага факультэта Львоўскага ўніверсітэта імя І. Франко.

Пасля заканчэння ўніверсітэта ў 1954 годзе С. І. Гапасюк прыехаў на працу ў Крымскую астрафізічную абсерваторыю Акадэміі навук СССР, дзе і прайшло ўсё яго наступнае жыццё. У абсерваторыі мелася магчымасць правядзення комплексных назіранняў успышак на Сонцы. Адначасова вяліся назіранні ў радыёдыяпазоне, спектральныя і іонасферныя назіранні. У выніку была пабудавана тэарэтычная мадэль успышкі, распрацаваны метады прагнозу ўспышак, што мела значэнне пры палётах спутнікаў.

Сваю навуковую дзейнасць С. І. Гапасюк пачаў на тэлескопах КГ-1 і БСТ-1. У 1963 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю «Развитие вспышек и магнитные поля на Солнце», а ў 1975 годзе – доктарскую «Магнитные поля и движения в атмосфере Солнца».

Навукоўцу давялося сустракацца і з канструктарам Сяргеем Каралёвым, і з першым касманаўтам Юрыем Гагарыным, бо перад палётам на нейкім этапе ўсе касманаўты праходзілі падрыхтоўку ў Крымскай абсерваторыі, дзе С. І. Гапасюк і яго калегі чыталі ім лекцыіі.

З 1967 года С. І. Гапасюк з'яўляўся членам Міжнароднага астранамічнага саюза (МАС), двойчы выбіраўся членам прэзідыума камісіі 12 МАС, што, безумоўна, сведчанне міжнароднага прызнання яго навуковай дзейнасці. У 1987–1989 гадах Сцяпан Ільіч узначальваў лабараторыю фізікі Сонца, з 1989 года стаў галоўным навуковым супрацоўнікам Крымскай астрафізічнай абсерваторыі.

Навуковая дзейнасць С. І. Гапасюка была накіравана на рашэнне фундаментальных праблем фізікі Сонца. Сцяпан Ільіч апублікаваў больш за 200 навуковых работ, якія прызнаны сусветнай грамадскасцю. Ім напісаны агляд па сонечнай электрадынаміцы і манаграфія па фізіцы Сонца (у суаўтарстве). Яго працы ўнеслі вялікі ўклад у разуменне фізічных працэсаў, якія праходзяць на Сонцы і ў касмічнай прасторы.

С. І. Гапасюк быў актыўна працуючым астрафізікам сусветнага ўзроўню. Ён надаваў вялікую ўвагу мадэрнізацыі наглядальных прылад абсерваторыі, укараненні новай тэхнікі. З вялікай упэўненасцю можна казаць пра яго значны ўклад у сусветную навуку. Шматлікія работы і адкрыцці навукоўца пацверджаны даследчыкамі іншых краін.

Шмат намаганняў Сцяпан Ільіч прыкладаў на падрыхтоўку маладых спецыялістаў не толькі Крымскай абсерваторыі, але і супрацоўнікаў іншых навуковых устаноў. Ён падрыхтаваў больш 10 аспірантаў з Украіны, Расіі, Узбекістана, Венгрыі, шэсць з якіх сталі кандыдатамі навук. Кіраваў навуковымі праектамі Міністэрства адукацыі і навукі Украіны і быў аўтарам двух касмічных праектаў. З'яўляўся членам навуковай рады Крымскай

астрафізічнай абсерваторыі, членам рэдкалегіі навуковага часопіса «Известия Крымской астрофизической обсерватории», членам Экспертнай Рады па астраноміі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Украіны, членам Навуковай рады па праблеме «Астраномія» аддзялення фізікі і астраноміі НАН Украіны.

Навуковая дзейнасць С. І. Гапасюка атрымала прызнанне і высокую адзнаку. У 2000 годзе яму было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны». У кнізе «500 асоб Крыма» з цыкла «Жыццё выдатных людзей Крыма» яму прысвечана частка старонак. Іменем С. І. Гапасюка названа адна з малых планет (8783 Gopasyuk), адкрытая 13 сакавіка 1977 года.

С. І. Гапасюк памёр 8 жніўня 2005 года. За сваё жыццё ён, несумненна, паспеў зрабіць шмат, аднак некаторыя тэмы навуковых даследаванняў так і не паспеў завяршыць. Працу над імі працягнула дачка навукоўца Вольга Сцяпанаўна Гапасюк, кандыдат фізіка-матэматычных навук (2000), якая жыве ў Крыме і працягвае пачатую бацькам справу.

5–11 верасня 2010 года ў п. Навучны Бахчысарайскага раёна адбылася навуковая канферэнцыя «Физика солнечной плазмы и активность Солнца», прысвечаная памяці С. І. Гапасюка ў сувязі з 80-годдзем з дня нараджэння.

### *Працы*

**Гопасюк, С. И.** Структура элементов общего магнитного поля Солнца / С. И. Гопасюк, Л. Б. Демкина. - М. : ИЗМИРАН, 1986. - 22 с.

**Гопасюк, С. И.** Некоторые особенности распределения поля фотосферных скоростей в АО в связи со вспышками / С. И. Гопасюк, Л. Ф. Лазарева // Исследования по физике Солнца : тез. докл. Всесоюз. конф. - Ашхабад, 1990. - С. 88-89.

**Гопасюк, С. И.** Вспышечная активность и токовые системы активной области / С. И. Гопасюк, В. И. Абраменко, М. Б. Огирь // Исследования солнечной плазмы.- Ашхабад, 1989.

**Гопасюк, С. И.** Вращение Солнца и мериодиональный дрейф магнитных структур / С. И. Гопасюк, О. С. Гопасюк // Кинематика и физика небесных тел. - 2004.- Т. 20, № 3. – С. 234 - 241.

**Гопасюк, О. С**. Меридиональный дрейф магнитных структур на Солнце / О. С. Гопасюк, С. И. Гопасюк // Астрономия – 2005: состояние и перспективы развития : тез. докл. 8-го съезда астрон. общества и междунар. симп. - М., 2005.- С. 28.

**Гопасюк, О. С**. Движение плазмы в магнитном поле тени пятна / О. С. Гопасюк, С. И. Гопасюк // Солнечно-земная физика. - 2004. - № 6. - С. 37-38.

**Гопасюк, С. И.** Вспышки и поле фотосферных скоростей в активной области / С. И. Гопасюк, Л. Ф. Лазарев // Кинематика и физика небесных тел. - 1988. - № 1. – С. 92 - 94.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**90 гадоў** з дня нараджэння С. І. Гапасюка (1930) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 135.

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Гапасюк Сцяпан Ільіч** // Самая «першая» : інфармацыйна - бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 23-24. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Курачук, С.** Астрафізік з сусветным іменем / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. – 2018. – 27 студзеня. – С. 4.

У рамках праекта «Людзі навукі нашага краю», да Дня беларускай навукі – артыкул пра ўраджэнца в. Лягаты, навукоўца Сцяпана Ільіча Гапасюка.

**Степанян, Н. Н.** Памяти Степана Ильича Гопасюка / Н. Н. Степанян // Известия Крымской астрофизической обсерватории. – 2011.– Т. 107, № 1. - С. 219 - 223.

**Сарычев, В.** Школа моей мамы / Василий Сарычев // Вечерний Брест. Вечерочка. - 2010. - 10 ноября. - С. I, II.

Во второй половине 40-х годов СШ № 1 окончил профессор Крымской обсерватории Степан Гопасюк.

**Его именем** названа планета // Кобрин-информ. – 2009. – 17 сентября. – С. 27.

С. И. Гопасюк (уроженец д. Легаты) - доктор физико-математических наук, астрофизик, заслуженный деятель науки и техники Украины.

**Шевченко, А.** Наука для него была всем / Алла Шевченко // Кобрин-информ. – 2006. – 7 декабря. – С. 3.

О докторе физико-математических наук, астрофизике с мировым именем из д. Легаты Степане Ильиче Гопасюке.

**Гопасюк Степан Ілліч** [Электронный ресурс] // Енциклопедія сучасної України. – Режим доступа: http://esu.com.ua/ search_articles.php?id=30955. – Дата доступа: 10.05.2020.

# ГАРДУН СЯРГЕЙ АЛЯКСЕЕВІЧ



**ГАРДУН Сяргей Аляксеевіч** (Сергій Гардун) - святар і вучоны, прафесар, мітрафорны протаіерэй, кандыдат багаслоўя (1990), дацэнт (2000). Ён злучае ў сваёй асобе навукоўца і клірыка.

Нарадзіўся 4 сакавіка 1959 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў звычайнай сялянскай сям'і. Бацькі, Аляксей Іванавіч і Аляксандра Іванаўна, працавалі ў калгасе «Новае жыццё». Вучыўся ў Дзівінскай сярэдняй школе.

Закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў па спецыяльнасці «настаўнік англійскай і французскай моў» (1981). Пасля заканчэння інстытута працаваў настаўнікам англійскай мовы ў сельскай школе.

У 1984 годзе Сяргей Гардун закончыў Маскоўскую духоўную семінарыю, у 1987 – Маскоўскую духоўную акадэмію.

У 1987 годзе пасвечаны ў сан святара пад імем Сергія. Некалькі гадоў айцец Сергій выкладаў у маскоўскіх духоўных школах. Пры аднаўленні работы Мінскай духоўнай семінарыі ў 1989 годзе пераведзены ў гэтую навучальную ўстанову, стаў яе першым вучоным сакратаром. 2 верасня 1990 года яму нададзены тытул протаіерэя.

У 1990 годзе Сергій Гардун абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Пастырство иеросхимонаха Макария (Иванова)». З 2000 года – дацэнт Мінскай духоўнай акадэміі і семінарыі. У 2005–2018 гадах – загадчык кафедры бібліістыкі і хрысціянскага веравучэння Інстытута тэалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, са студзеня 2018 года – першы прарэктар Інстытута тэалогіі БДУ. Выкладчык Свяшчэннага Пісання Старога Запавету, уводзін у спецтэрміналогію (на англ. мове), спецкурсу «Сучасная Праваслаўная Духоўнасць» (на англ. мове). Сфера навуковых інтарэсаў Сергія Гардуна: гісторыя хрысціянскіх канфесій у Беларусі, беларуская багаслоўская і літургічная тэрміналогія. Прафесар (2010) Мінскай духоўнай акадэміі. Клірык Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора.

Прафесіянал як у галіне багаслоўскай падрыхтоўкі, так і ў сферы мовазнаўства. Валодае дзевяццю мовамі, у тым ліку грэчаскай, лацінскай, царкоўнаславянскай, англійскай, французскай, польскай, украінскай. Яму даводзілася служыць набажэнствы цалкам па-англійску, можа параўноўваць свае пераклады з тымі, што робяцца на Захадзе. З'яўляецца членам Біблейскай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы па перакладу кніг Свяшчэннага Пісання Новага Запавету на беларускую мову. Узначальвае рэдакцыйную камісію

Беларускага Экзархата. Каментатар святочных багаслужэнняў у час іх трансляцыі па першаму дзяржаўнаму тэлеканалу Беларускага тэлебачання.

Узнагароджаны ордэнамі Сергія Раданежскага III ступені, Кірылы Тураўскага I і II ступеней, медалём Сергія Раданежскага II ступені і іншымі царкоўнымі ўзнагародамі. Кінастудыя «Беларусьфільм» выпусціла дакументальны фільм «Айцец Сергій» (2007; сцэнарый У. В. Мароза, пастаноўка рэжысёра С. А. Гайдука) аб лёсе чалавека, які прысвяціў свае жыццё служэнню Богу, – протаіерэя Сергія Гардуна.

9 студзеня 2019 года ў Палацы Рэспублікі адбылася цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» па выніках 2018 года. Калектыў Біблейскай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы ўдастоены прэміі за пераклад кнігі «Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста» на сучасную беларускую мову. Гэта 25-гадовая праца будзе садзейнічаць прымнажэнню духоўнай спадчыны нашага народа, умацаванню духоўных асноў грамадства і дзяржавы. Ад імя калектыву прэмію прыняў старшыня рабочай групы Біблейскай камісіі протаіерэй Сергій Гардун.

### *Працы*

**Гардун, С.** Праблемы фарміравання беларускай багаслоўскай тэрміналогіі / Сергій Гардун // Беларуская мова ў сакральнай сферы: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 21 лютага 2018 г.). - Мінск, 2019. - С. 7-12.

**Праваслаўны** малітваслоў / уклад. протаіерэй Сергій Гардун, прадм. і пер. з царкоўнаслав. і грэч. протаіерэя Сергія Гардуна. - 2-е выд., дап. – Мінск : Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора, 2012. – 144 с.

**Гардун, С.** Праваслаўе як падмурак беларускай нацыі / Сергій Гардун // Беларуская думка. - 2016. - № 1. – С. 23-29.

**Гардун**, **С. А**. Я таксама люблю Беларусь / прот. С. Гардун // Дзеяслоў. – 2009. – № 2 (39) сакавік-красавік. – С. 320-325.

**Гардун, С.** протаіерэй. У вечнай памяці будзе праведнік / прот. С. Гардун // Царкоўнае слова. – 2008. - № 21. – С. 6-7.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Гордун Сяргей Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**Гапановіч, А. Н.** Сергей Алексеевич Гордун / Афанасий Гапанович // Дивин — древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 70. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Гардун Сяргей Аляксеевіч.** Вядомыя людзі, ураджэнцы в. Дзівін // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 21.

**60 гадоў** з дня нараджэння С. А. Гардуна (1959) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 95.

**555-летие** со дня основания Спасского женского монастыря г. Кобрина // Кобрин-информ. – 2020. – 20 августа (№ 34). – С. 13.

В день престольного праздника Спасского монастыря г. Кобрина протоиерей Сергий Гордун, клирик кафедрального Свято-Духова собора в г. Минске (Минская епархия), сослужил Высокопреосвященнейшему Иоанну, архиепископу Брестский и Кобринский.

**Дабравесце.by**: Новый Завет на белорусском языке доступен в интернете // Кобрин-информ. – 2020. – 30 июля (№ 31). - С. 11.

В аудиоверсии переводов Священного Писания Нового Завета протоиерей Сергий Гордун читает молитвы.

**Гардун, С. А.** «Сімвал Беларусі» / [Сергій Гардун ; гутарыла] Ніна Шчарбацэвіч // Звязда. - 2019. — 10 студзеня. — С. 1, 13.

**Гардун, С.** «Для землякоў – беларусаў» / [Сергій Гардун ; размаўляла] Ніна Шчарбачэвіч // Звязда. – 2017. - 12 верасня. – С. 10.

**Цімошык, Л.** На беларускай мове – з благаславеннем / Ларыса Цімошык // Настаўніцкая газета. – 2017. – 15 верасня. – С. 4.

Пра тое, як ішла праца над перакладам на беларускую мову Новага Запавета, расказаў протаірэй Сергій Гардун.

**Гардун, С.** Гаварыць з нябёсамі па-беларуску / [Сергій Гардун ; гутарыла] Вераніка Пуставіт // Звязда. – 2014. – 4 снежня. – С. 5.

**Гардун, С**. «Нам неабходна шырокая дыскусія вакол выкладання ў школах асноў хрысціянскай культуры» / Сергій Гардун ; [размаўляла] Вольга Мядзведзева // Звязда. – 2009. – 14 кастрычніка. – С. 7.

**Бунеева, Л.** «Мы ідзём ад жыцця» / Людміла Бунеева // Вечерний Брест. – 2008. – 5 сентября. – С. 1.

Аб укладзе нашых землякоў С. Гардуна, І. Чароты ў праваслаўнае асветніцтва.

**Раманоўская, М.** Протаіерэй Сергій Гардун: «Пасля сотні атэістычных кніг Евангелле было для мяне адкрыццём» / М. Раманоўская // Царкоўнае слова. – 2004. - № 12. – С. 4-6.

**Раманоўская, М.** Протаіерэй Сергій Гардун: «За спробу паступіць у семінарыю мяне маглі арыштаваць» / Марына Раманоўская // Царкоўнае слова. – 2004. - № 13. – С. 4–6.

**Гордун, Сергей Алексеевич** [Электронный ресурс] // База данных Ученые Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/scient. – Дата доступа: 05.10.2017.

# ГЕРЖА МІКАЛАЙ ПАЎЛАВІЧ

**ГЕРЖА Мікалай Паўлавіч** – кандыдат тэхнічных навук. Дацэнт Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта.

Нарадзіўся 9 лютага 1956 года ў вёсцы Літвінкі Кобрынскага раёна. У 1963 годзе пайшоў у першы клас Літвінкаўскай пачатковай школы, у 1967 годзе працягваў вучобу ў Батчынскай васьмігадовай школе. Сярэднюю адукацыю Мікалай атрымаў у Якаўчыцкай сярэдняй школе Жабінкаўскага раёна.

У Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут на факультэт «Сельскагаспадарчае будаўніцтва» Мікалай Гержа паступіў у 1973 годзе. У 1978 годзе закончыў інстытут і быў накіраваны ў Беларускі праектны навукова-даследчы інстытут па будаўніцтву на сяле, дзе працаваў інжынерам-канструктарам. У гэтым жа годзе Мікалай быў прызваны ў рады Савецкай Арміі. У 1980 годзе дэмабілізаваны і выбраны па конкурсу асістэнтам кафедры «Арганізацыя і аўтаматызаваныя сістэмы кіравання ў будаўніцтве» Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута.

У 1984 годзе Мікалай Паўлавіч закончыў факультэт кіравання будаўнічай вытворчасцю Маскоўскага інстытута кіравання імя С. Арджанікідзе па спецыяльнасці «Эканамічная кібернетыка».

У 1985 годзе М. П. Гержа паступіў у аспірантуру Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута аказання матэрыяльна-тэхнічнай дапамогі па будаўніцтву (ЦНДІАМТД, г. Масква). У 1989 годзе ён абараніў дысертацыю на саісканне вучонай ступені «Кандыдат тэхнічных навук» па спецыялізацыі «Аўтаматызаваныя сістэмы кіравання вытворчасцю жалезабетонных вырабаў».

З 1990 года М. П. Гержа - старшы выкладчык кафедры «Арганізацыя і АСК у будаўніцтве» Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута, пазней кафедры «Менеджменту і маркетынгу» Брэсцкага політэхнічнага інстытута.

З 1996 года Мікалай Паўлавіч - дацэнт кафедры «Менеджменту і маркетынгу» (кафедры «Міжнародных эканамічных адносін і інвестыцый», кафедры «Сусветнай эканомікі, маркетынга, інвестыцый») Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта.

***Працы***

**Гержа, Н. П.** Автоматизация управления технологическим процессом изготовления железобетонных изделий : диссертация ... кандидата технических наук : 05.23.08 / Николай Павлович Гержа. - Минск, 1989.

**Головач, Э. П.** Методические рекомендации по преддипломной практике и выполнению дипломной работы для студентов специальности Э.01.08.00. «Мировая экономика и международные экономические отношения» дневной формы обучения. // Э. П. Головач, Н. П. Гержа, Е. И. Пашковец. – Брест, 2001.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**60 гадоў** з дня нараджэння М. П. Гержы (1956) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 10.

**Гержа Мікалай Паўлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук. – Кобрын, 2017. – С. 29-30.

**Гержа Николай Павлович** / материал предоставлен Батчинской публичной библиотекой. – Батчи, 2018.

# ГОРСКІ СТАНІСЛАЎ БАТЫС

**ГОРСКІ Станіслаў Батыс** (1802-1864) - прыродазнаўца, медык, педагог, папулярызатар навукі, адзін з першых даследчыкаў флоры Белавежскай пушчы.



Нарадзіўся 6 мая 1802 года ў вёсцы Дварэц Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Камянецкі раён Брэсцкай вобласці).

Сярэднюю адукацыю атрымаў у навучальных установах Гродна і Свіслачы (1814–1820). У 1820–1825 гадах вучыўся ў Віленскім універсітэце, дзе напачатку вывучаў прырода-знаўчыя навукі, потым медыцыну са спецыялізацыяй па фармакалогіі. Пасля заканчэння ўніверсітэта атрымаў дыплом лекара I ступені.

У 1830 годзе – загадчык батанічнага саду Віленскага ўніверсітэта. Пасля закрыцця ўніверсітэта (1831) выкладаў батаніку, фармацыю і фармакалогію ў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі. У 1840 годзе напярэдадні закрыцця акадэміі выехаў за мяжу ў камандзіроўку, дзе паглыблена вывучаў батаніку і энтамалогію. Пасля вяртання на радзіму ў 1842 годзе пэўны час працаваў у Паставах у арнітолага К. Тызенгаўза.

З 1847 года працаваў у музеях і бібліятэках Берліна. З 1851 года жыў у маёнтку А. Кубліцкага ў Свянцянскім павеце, дзе займаўся батанікай і энтамалогіяй, бясплатна лячыў мясцовых жыхароў. Па падазрэнні ў спачуванні нацыянальна-вызваленчаму руху ў 1863 годзе высланы ў Сібір. У ссылцы скончыў жыццё самагубствам 3 мая 1864 года.

С. Горскі вывучаў мясцовую флору і энтамалогію. Быў адным з першых даследчыкаў Белавежскай пушчы, які ў 1826 годзе апісаў расліннасць Белавежскай пушчы, цікавіўся, чым корміцца зубр. Яго матэрыялы выкарыстаў у 1830 годзе Э. Эйхвальд у працах па гісторыі

прыроды Літвы, Валыні і Падолля. Асноўным клопатам Станіслава Горскага было падтрыманне ў добрым стане і развіццё батанічнага саду ў Вільні.

У сваіх публікацыях ён апісваў многія батанічныя сады Заходняй Еўропы. Станіслаў Горскі выступаў за цесныя сувязі з заходне-еўрапейскай навукай, забяспечваў гербарыямі і ўзорамі расліннасці Беларусі і Літвы вучоных-прыродазнаўцаў Вены, Неапаля, Палермы, Жэневы, Падуі, Фларэнцыі; падрыхтаваў для дрэздэнскага прафесара Л. Рэйхенвальда ўзоры флоры для яго працы «Германскі гербарый», перадаў гербарыі тутэйшай расліннасці музеям Берліна і Парыжа.

Станіслаў Горскі - аўтар некалькіх дзясяткаў публікацый па батаніцы і энтамалогіі. Многія адкрытыя ім новыя віды раслін названы яго імем (напрыклад, Copaifera Gorskiana і інш.).

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Горскі Станіслаў Батыс** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1997. - Т. 5. – С. 366.

**Горскі Станіслаў Батыс** // Асветнікі зямлі Беларускай X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік.- 2-е выд. - Мінск, 2006. - С. 120.

**Горскі Станіслаў Батыс** // Мысліцелі і асветнікі Беларусі X–XIX стст. : энцыклапедычны даведнік. - Мінск, 1995. - С. 397.

**Горский Станислав Батис** // Регионы Беларуси : энциклопедия : [в 7 т. ]. Брестская область. - Минск, 2009. - Т. 1, кн. 1. - С. 296.

**Горский Станислав Батис** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск, 2006. - Т. 3.- С. 159.

**Горскі Станіслаў Батыс** // Энцыклапедыя прыроды Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1983. - Т. 2. – С. 111.

**215 гадоў** з дня нараджэння С. Б. Горскага // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 36.

# ГУЛЮК ГЕОРГІЙ РЫГОРАВІЧ

**ГУЛЮК Георгій Рыгоравіч** - кандыдат сельскагаспадарчых навук, доктар сельскагаспадарчых навук, дзяржаўны дзеяч.



Нарадзіўся 23 ліпеня 1944 года ў вёсцы Яромічы Кобрынскага раёна. У 1962-1963 гадах працаваў лабарантам у Мінянскай сярэдняй школе. Потым служба ў Савецкай арміі (1963-1966).

У 1966-1973 гадах Георгій Гулюк - рабочы, брыгадзір, прараб у Яроміцкай МТС. З 1973 па 1977 год ён галоўны інжынер, начальнік ПМК у г. Маларыта.

У 1977 годзе Георгій Рыгоравіч накіраваны на працу ў Валагодскую вобласць, дзе працаваў галоўным інжынерам, начальнікам аб'яднання «Волагдамеліярацыя», затым намеснікам старшыні аб'яднання «Волагдааграбуд». Выбіраўся членам Валагодскага абкама КПСС і аблвыканкама.

У 1979 годзе Г. Гулюк закончыў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію па спецыяльнасці «Гідрамеліярацыя».

У 1988 годзе Георгій Гулюк пераведзены на работу ў Маскву. У 1988-1999 гадах ён працаваў намеснікам старшыні Дзяржаграпрама Нечарназёмнай зоны РСФСР, прэзідэнтам акцыянернай аграбудаўніча-прамысловай карпарацыі «Цэнтрінж-сельбуд». У 2004-2005 гадах Г. Р. Гулюк - начальнік Упраўлення меліярацыі і тэхнічнага забеспячэння Федэральнага агенцтва па сельскай гаспадарцы.

Георгій Рыгоравіч працаваў дырэктарам Дэпартамента меліярацыі і тэхнічнага забеспячэння Міністэрства сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі. Ён віцэ-прэзідэнт Міжнароднай камісіі па ірагацыі і дрэнажу, член калегіі Міністэрства сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі. Георгій Рыгоравіч Гулюк з'яўляецца дзяржаўным саветнікам Расійскай Федэрацыі 2 класа (класны чын прысвоены Указам Прэзідэнта РФ ад 11 сакавіка 2008 года).

Георгій Рыгоравіч узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За преобразование Нечерноземья РСФСР» і 8 медалямі. З'яўляецца Заслужаным меліяратарам Расійскай Федэрацыі.

Георгій Рыгоравіч Гулюк - галоўны рэдактар часопіса «Мелиорация и водное хозяйство».

### *Працы*

**Гулюк, Г. Г.** Агромелиоративные мероприятия при длительной эксплуатации дренажа и экологической реабилитации техногенно загрязненных земель гумидной зоны / Георгий Григорьевич Гулюк. - М. : Изд-во Московского ун-та, 2004. - 232 с.

**Гулюк, Г. Г**. Земля отблагодарит / Георгий Гулюк. - Москва : Росинформагротех, 2007. - 287 с., [18] л. ил., портр., цв. ил., портр.

**Гулюк, Г. Г.** Эффективное функционирование дренажных систем на минеральных землях нечерноземной зоны России / Г. Г. Гулюк, А. В. Шуравилин ; [М-во сельского хоз-ва Российской Федерации]. - Москва : РУДН, 2007. - 376 с. : ил., табл.

**Гулюк, Г. Г.** Освоение долголетней залежи при возделывании сеяных злаковых трав / Г. Г. Гулюк, Н. А. Семёнов, А. В. Шуравилин, Н. В. Сурикова // Мелиорация и водное хозяйство (Москва). – 2017. - № 4. - С. 19-23.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Гулюк Георгій Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**Лукашик, П. И.** Прошлое и настоящее / Петр Иосифович Лукашик. – Брест : Брестская типография, 2002. – 48 с.

См. на с. 33.

**75 гадоў** з дня нараджэння Г. Р. Гулюка // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 96.

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля (№ 29). - С. 5.

Кобринская центральная районная библиотека начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны».

**Мельнік, Р.** Адметная дата ў календары / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2008. - 5 лістапада. - С. 1.

Сын Р. П. Гулюка Георгій з'яўляецца заслужаным меліяратарам Расіі, доктарам сельскагаспадарчых навук.

**Наш** земляк в российском министерстве // Заря. – 2008. – 24 мая. – С. 2.

**Гулюк Георгий Григорьевич** [Электронный ресурс] // Виперсон. – Режим доступа: http://viperson.ru/people/gulyuk-georgiy-grigorievich. – Дата доступа: 22.06.2017.

# ГУЦАЎ СЯРГЕЙ АНАТОЛЬЕВІЧ

**ГУЦАЎ Сяргей Анатольевіч** - кандыдат фізіка-матэматычных навук.



Нарадзіўся 22 студзеня 1966 года ў вёсцы Хідры Кобрынскага раёна. Вучыўся ў Хідрынскай сярэдняй школе (1972-1982).

З 1982 па 1984 год працаваў токарам на ліцейна-механічным заводзе ў г. Ленінградзе.

У 1984-1986 гадах знаходзіўся на службе ў Савецкай арміі (сяржант, камандзір аддзялення вадзіцеляў).

У перыяд з 1986 года па 1992 год вучыўся ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце (дыплом УВ № 285522, спецыяльнасць фізік (інжынер-даследчык).

З 1992 па 1995 год С. Гуцаў вучыўся ў аспірантуры Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У 1998 годзе абараніў дысертацыю па тэме «Исследование эволюции параметров нестационарной плазмы в электроотрицательных газах». Прысвоена навуковае званне «кандыдат фізіка-матэматычных навук». Спіс навуковых прац С. А. Гуцава складаецца з 50 прац, у асноўным яны прысвечаны фізіцы плазмы.

Пасля заканчэння аспірантуры працаваў індывідуальным прадпрымальнікам.

***Працы***

**Гуцев, С. А.** Исследование эволюции параметров нестационарной плазмы электроотрицательных газов : дис. … канд. физ-мат. наук. – СПб, 1998. - 147 с.

**Гуцев, С. А.** Экспериментальное исследование эволюции параметров кислородной плазмы импульсного разряда : сборник молодых учёных Спб ГГИ / С. А. Гуцев, А. А. Кудрявцев, В. Н. Скребов. - СПб, 1996. – С. 87-91.

**Гуцев, С. А.** Измерение температуры ионов из ВАХ электролитов / С. А. Гуцев // ИФЖ. – 2017. - Т. 90, № 5. - С. 1267-1274.

**Гуцев, С. А.** К теории призондового слоя в ионионной плазме / С. А. Гуцев // ИФЖ – 1998. - Т. 71, № 3. - С. 572-573.

**Гуцев**, **С. А.** Образование ионионной плазмы в результате убегания электронов в паузах импульсного разряда в кислороде / С. А. Гуцев, А. А. Кудрявцев, В. А. Романенко // ЖТФ. – 1995. - Т. 65, №11. – С. 77-85.

# ДАВІДЗЮК ГЕОРГІЙ ПЯТРОВІЧ

**ДАВІДЗЮК Георгій Пятровіч** – вучоны, сацыёлаг, філосаф. Заснавальнік беларускай навуковай школы прыкладной сацыялогіі, доктар філасофскіх навук, прафесар.



Нарадзіўся 5 ліпеня 1923 года ў вёсцы Камень-Шляхецкі Кобрынскага павета (цяпер Акцябр Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Да вайны закончыў два класы гімназіі ў горадзе Кобрыне.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Георгій Давідзюк быў камандзірам роты партызанскага атрада імя Мікалая Шыша Пінскага злучэння. Затым былі гады вучобы і пошуку месца ў жыцці, свайго прызвання.

Пасля паспяховага заканчэння Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1952) Георгій Давідзюк працаваў у партыйных структурах Брэсцкай вобласці, ЦК КП Беларусі.

Затым працягнуў адукацыю ў Акадэміі грамадскіх навук у Маскве, працаваў у Інстытуце філасофіі і права АН БССР.

У 1959 годзе Георгій Пятровіч абараніў кандыдацкую дысертацыю, а праз дзесяць год ён атрымаў ступень доктара філасофскіх навук. З 1970 года – прафесар.

Георгій Пятровіч Давідзюк па праве лічыцца роданачальнікам беларускай сацыялагічнай школы. У 1968 годзе ён арганізаваў сектар, а затым - аддзел сацыяльных даследаванняў у Інстытуце філасофіі і права АН БССР, які стаў базай для стварэння ў будучым (1990) Інстытута сацыялогіі АН БССР. У 1962–1973 гады Г. П. Давідзюк займаў пасаду загадчыка аддзела сацыялагічных даследаванняў Інстытута філасофіі і права АН БССР.

Новы этап у яго жыцці пачынаецца з пераходам у 1973 годзе ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (БДУ). Тут Г. П. Давідзюк у розныя гады ўзначальваў кафедру філасофіі гуманітарных факультэтаў, кіраваў Праблемнай навукова-даследчай лабараторыяй сацыялагічных даследаванняў. У апошнія гады ён быў прафесарам кафедры сацыялогіі. У 1989 годзе ва ўніверсітэце было адкрыта аддзяленне сацыялогіі.

Пад навуковым кіраўніцтвам Г. П. Давідзюка 48 аспірантаў абаранілі кандыдацкія, 12 з іх – доктарскія дысертацыі па сацыялогіі. Георгій Пятровіч у розныя гады чытаў лекцыі ў Іенскім і Білефельдскім (Германія), Люблінскім (Славенія), Кракаўскім (Польшча) універсітэтах. Прымаў удзел у міжнародных сацыялагічных канферэнцыях.

Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны і выдадзены ў 1975 годзе «Метадычныя ўказанні па распрацоўцы плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця Мінска на 1976-1980 гады». За гэтую працу Г. П. Давідзюк узнагароджаны залатым медалём ВДНГ СССР. На аснове багатага фактычнага матэрыялу, атрыманага падчас шматлікіх даследаванняў, пад рэдакцыяй Г. Давідзюка была падрыхтавана цэлая серыя кніг па актуальных праблемах развіцця грамадства, выдадзены шэраг кніг, падручнікаў і дапаможнікаў для ВНУ. Усяго Георгій Пятровіч надрукаваў 150 навуковых прац, у тым ліку 13 – у замежных выданнях.

Навуковая добрасумленнасць, высокая адказнасць за свае рэкамендацыі, адвага ў адстойванні навуковых высноў набылі Георгію Пятровічу заслужаны аўтарытэт сярод навуковай грамадскасці краіны.

У сярэдзіне 1990-х гадоў Г. П. Давідзюк завяршыў сваю актыўную навуковую і педагагічную дзейнасць і сышоў на пенсію, аднак не страціў сувязі з родным універсітэтам і кафедрай сацыялогіі. Першым на факультэце быў удастоены высокага звання – «Заслужаны работнік БДУ».

### *Працы*

**Давидюк, Г. П.** Введение в прикладную социологию / Г. П. Давидюк. - Минск : Вышэйшая школа, 1975. - 199 с.

**Давидюк, Г. П**. Критика теории «единого индустриального общества» / Г. П. Давидюк. - Мінск, 1968.

**Давидюк, Г. П**. Несостоятельность буржуазных концепций «общества нового типа» / Г. П. Давидюк. - Мінск, 1978.

**Давидюк, Г. П.** Прикладная социология / Георгий Петрович Давидюк. - Минск : Вышэйшая школа, 1979. - 220 с.

**Давидюк, Г. П.** Беларусь: в муках, страданиях родилась социология / Г. П. Давидюк // Социологические исследования. - 2008. - № 6. - С. 93–99.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Давидюк Георгий Петрович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 7. - С. 296.

**Давидюк Георгий Петрович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская обл. : в 2-х кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 316.

**Давидюк Георгий Петрович** // Социологическая энциклопедия / под общ. ред. А. Н. Данилова. - Минск, 2003. - С. 76-77.

**Давидюк Георгий Петрович** // Новейший социологический словарь. – Минск, 2010. - С. 253.

**Давідзюк Георгій Пятровіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1971. – Т. 4. - С. 106.

**Давідзюк Георгій Пятровіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 563.

**Давідзюк Георгій Пятровіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2012. – Т. 3. – С. 330.

**Давідзюк Георгій Пятровіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 432-433. – (Імі ганарацца землякі).

**Кавецкий, С. Т.** Давидюк Георгий Петрович / С. Т. Кавецкий // Брестский социологический барометр / С. Т. Кавецкий. – Брест, 2005. – С. 24.

**95 гадоў** з дня нараджэння Г. П. Давідзюка (1923) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 65.

**Курачук, С.** Таленты роднага краю. Г. П. Давідзюк / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. - 5 жніўня. – С. 4.

Чарговы сумесны з карэспандэнтам «КВ» артыкул у межах першага этапа праекта цэнтральнай раённай бібліятэкі аб славутых людзях Кобрыншчыны «Людзі навукі нашага краю» - пра беларускага сацыёлага, доктара філасофскіх навук, прафесара Г. П. Давідзюка.

**Бабосов, Е. М.** Доброе слово о коллеге и друге / Е. М. Бабосов // Социология. – 2013. - № 2. – С. 18-19.

К юбилею известного белорусского социолога Георгия Петровича Давидюка.

**Бурова, С. Н.** О Георгии Петровиче Давидюке / С. Н. Бурова // Социология. – 2013. - № 2. – С. 29-30.

**Грищенко, Ж. М.** Слово об учителе / Ж. М. Грищенко // Социология. – 2013. - № 2. – С. 31.

С именем Г. П. Давидюка связан факт возрождения отечественной социологии.

**Гуцаленко, Л. А.** У чистого источника / Л. А. Гуцаленко // Социология. – 2013. - № 2. – С. 24.

О Г. П. Давидюке - основоположнике белорусской социологии.

**Давидюк, Г. П.** Динамизм и оптимизм - жизненное кредо профессора Г. П. Давидюка / [Георгий Давидюк ; беседовал] А. Н. Данилов // Социология. – 2013. - № 2. – С. 6-17.

**Данилов, А. И.** Легендарный профессор Г. П. Давидюк: большой труженик, воин и учитель / А. И. Данилов // Социология. – 2013. - № 2. – С. 3-5.

Жизненный путь известного социолога Георгия Петровича Давидюка.

**Данилов, А.** Человек, заражающий желанием жить / Александр Данилов // Веды. – 2013. – 8 июля – С. 6.

90-летний юбилей основателя белорусской социологической школы, доктора философских наук, профессора Г. П. Давидюка.

**Ротман, Д. Г.** О Георгии Петровиче Давидюке / Д. Г. Ротман // Социология. – 2013. - № 2. – С. 23.

**Соколова, Г. Н.** Мэтр уверенный и бескомпромиссный / Г. Н. Соколова // Социология. – 2013. - № 2. – С. 25-26.

Г. П. Давидюк - знаковое имя и целая эпоха, связанная с созданием и развитием социологии в Беларуси.

**Титаренко, Л. Г.** Знаковая фигура белорусской социологии / Л. Г. Титиаренко // Социология. – 2013. - № 2. – С. 27-28.

Две огромные заслуги Г. П. Давидюка - развитие социологического образования и систематическое представление социологии как самостоятельной научной дисциплины.

**Шавель, С. А.** Родоначальник белорусской прикладной социологии : к юбилею Г. П. Давидюка / С. А. Шавель // Социология. – 2013. - № 2. – С. 20-22.

Одним из первых Г. П. Давидюк выступил с идеей «прикладной социологии».

**Данилов, А. Н.** У истоков отечественной социологии / А. Н. Данилов // Адукацыя і выхаванне. - 2003. - № 6. - С. 70-71.

Об учёном-социологе Г. П. Давидюке.

**5 ліпеня 2013 г.** – 90 гадоў з дня нараджэння (1923) Георгія Пятровіча Давідзюка, вучонага-сацыёлага і філосафа, заснавальніка беларускай навуковай школы прыкладной сацыялогіі [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. - Рэжым доступа: http://kb.brl.by/. - Дата доступа: 05.07 2013.

**Давидюк Георгий Петрович** [Электронный ресурс] // Белорусский государственный университет. – Режим доступа: http://www.bsu.by/main. – Дата доступа: 12.04.2018.

**Давидюк Георгий Петрович** [Электронный ресурс] // Национальная социологическая энциклопедия. – Режим доступа: http://voluntary.ru-/termin/davidyuk-georgii-petrovich.html. – Дата доступа: 28.06.2018.

**Давидюк Георгий Петрович** [Электронный ресурс] // «Персоналии белорусской социологии» : электронный справочник. – Режим доступа: http://soc-by. livejournal. com/32108.html. – Дата доступа: 28.06.2018.

# ДАРОШАК ЛЮБОЎ ВАСІЛЬЕЎНА

**ДАРОШАК Любоў Васільеўна** – дацэнт Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, спецыяліст па менеджменту.



Любоў Новік (Дарошак) - выпускніца 1964 года сярэдняй школы № 1 г. Кобрына. Закончыла школу з залатым медалём і ў той жа год паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У. І. Леніна.

Пасля заканчэння ўніверсітэта была размеркавана на работу ў навукова-даследчы інстытут пры Дзяржплане БССР. Потым практычна ўсё жыццё Л. Дарошак (з 1974 па 2007 год) звязана з выкладаннем у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі (цяпер Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт). Прайшла шлях ад асістэнта да дацэнта ўніверсітэта.

У 1975-1977 гадах Любоў Васільеўна працавала ў сумеснай фінска-савецкай фірме «Elorq-Дата» ў г. Хельсінкі, у 1988-1990 – у консульскім аддзеле пасольства СССР у Фінляндыі. Але заўсёды яна вярталася ў свой інстытут.

З 2007 года Л. В. Дарошак працуе ў Прыватным інстытуце кіравання і прадпрымальніцтва.

***Працы***

**Дорошек, Л. В.** Автоматизированные системы управления производством : методические указания и темы контрольных работ / Л. В. Дорошек, А. А. Брасс, Р. С. Седегов. – Минск : БГЭУ, 1993.

**Дорошек, Л. В.** Ведение переговоров. Деловая игра / Л. В. Дорошек, А. И. Ильин, С. В. Киселева. – Минск : БГЭУ, 1993.

**Дорошек, Л. В.** Должностные инструкции работников завода управления / Л. В. Дорошек [и др.]. – Минск : БГИНХ, 1983.

**Дорошек, Л. В.** Метод экспертных оценок при принятии управленческих решений и его использования. – Минск : БГЭУ, 1995.

**Дорошек, Л. В.** Методические указания по проведению практических занятий по теме «Методы управления» / Л. В. Дорошек, Е. В. Лаврова. – Минск : БГЭУ, 1999.

**Дорошек, Л. В**. Некоторые итоги и перспективы развития машинных игр «ДИГМА» / Л. В. Дорошек, В. К. Матюшевская, В. Д. Чертовской // Деловые игры в учебном процессе : сборник. – Минск : Высшая школа, 1985.

**Дорошек, Л. В**. Основы менеджмента : практикум / Л. В. Дорошек, Н. П. Беляцкий. – Минск : БГЭУ, 1999.

**Дорошек, Л. В.** Основы менеджмента : учебная программа для экономических специальностей ВУЗов / Л. В. Дорошек, И. В. Балдин, Н. П. Беляцкий. - Минск : БГЭУ, 2001.

**Дорошек, Л. В.** Основы менеджмента : учебно-практическое пособие / Л. В. Дорошек, И. В. Балдин, Н. П. Беляцкий. – Минск : БГЭУ, 2006.

**Дорошек, Л. В.** Положение об отделах и службах завода управления / Л. В. Дорошек [и др.]. – Минск : БГИНХ, 1981.

**Дорошек, Л. В.** Самооценка структурной формулы качеств менеджера / Л. В. Дорошек, Н. П. Беляцкий. – Минск : БГЭУ, 1996.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**55 гадоў** з дня нараджэння Л. В. Дарошак (1964) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 96.

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Дарошак (Новік) Любоў Васільеўна** // Самая «першая» : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 25. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Дарошак Любоў Васільеўна** : біяграфія / складзена па пісьму Л. В. Дарошак, напісанаму да юбілею СШ № 1. – Кобрын, 2017.

**Дорошек Любовь Васильевна** // Сводный Электронный Каталог библиотек Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/opac/pls/ dict.prn. – Дата доступа: 02.10.2018.

# ДЗЕМ’ЯНЮК ФАМА СЯМЁНАВІЧ

**ДЗЕМ’ЯНЮК Фама Сямёнавіч** (1898-1968) - доктар тэхнічных навук (1956), прафесар (1957), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР, савецкі вучоны-тэхнолаг.



Нарадзіўся 9 кастрычніка 1898 года ў вёсцы Пескі Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Пескі Кобрынскага раёна).

У 1926 годзе закончыў механічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя М. Э. Баўмана.

Працаваў начальнікам механазборачнага цэха, галоўным тэхнолагам на заводзе імя Ліхачова. Двойчы быў у замежных камандзіроўках: у 1928 годзе вывучаў працу завода «Мерседес-Бенц (Mercedes-Benz)» у Германіі, у 1930 годзе стажыраваўся ў Нью-Ёрку (ЗША).

У 1930-я гады падчас рэканструкцыі завода Ф. С. Дзем'янюк вырашыў шэраг складаных арганізацыйна-тэхналагічных задач па бесперабойнаму пераводу вытворчасці на новы від прадукцыі паточным метадам.

У 1933 годзе за засваенне новай вытворчасці Фама Сямёнавіч узнагароджаны ордэнам Леніна. У 1944 годзе за паспяховую арганізацыю паточнай вытворчасці абароннай тэхнікі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У 1947 годзе Ф. С. Дзем'янюк абараніў кандыдацкую дысертацыю. У тым жа годзе за распрацоўку і ўкараненне новых тэхналагічных працэсаў і хуткаснае засваенне вытворчасці аўтамабіля «ЗІС-110» Фаме Сямёнавічу прысуджана Дзяржаўная (Сталінская) прэмія І ступені. У 1948 годзе ўпершыню ў свеце навуковец ажыццявіў бесперабойны перавод вытворчасці на выпуск новай мадэлі (ЗІС-150). За гэтую працу Дзем'янюк узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і ўдастоены Дзяржаўнай (Сталінскай) прэміі ІІ ступені.

З 1947 па 1950 год Фама Сямёнавіч быў дэпутатам Массавета.

У 1956 годзе выдаў манаграфію «Технологические основы производства», якая атрымала шырокую вядомасць у СССР і за мяжой і актуальная да цяперашняга часу. Шырока вядомы і папулярны падручнік для ВНУ «Технологические основы поточно-автоматизированного производства», напісаны Ф. С. Дзем'янюком.

У 1956 годзе Ф. С. Дзем'янюк абараніў доктарскую дысертацыю, у наступным годзе яму было прысвоена званне прафесара.

Да 1961 года Ф. С. Дзем'янюк працаваў галоўным тэхнолагам, намеснікам галоўнага інжынера на аўтазаводах ЗІС і КІМ, у АН СССР, загадчыкам кафедры ва Усесаюзным завочным політэхнічным інстытуце. З 1961 па 1968 год прафесар Фама Сямёнавіч Дзем'янюк загадваў кафедрай «Тэхналогія машынабудавання» МАМІ (у 2004 годзе ёй прысвоена імя Дзем'янюка).

Пры Фаме Сямёнавічу прыкметна актывізавалася навуковая праца, ён стаяў ля вытокаў і спрыяў развіццю шматлікіх новых навуковых напрамкаў на кафедры. Яго апублікаваныя навуковыя працы перакладаліся на нямецкую, англійскую, кітайскую, японскую і іншыя мовы. Ф. С. Дзем'янюку прысвоена званне Заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі РСФСР.

### *Працы*

**Демьянюк, Ф. С.** Метод определения экономичности изготовления деталей / Ф. С. Демьянюк. – М. : [б. и.], 1958. - 34 с.

**Демьянюк, Ф. С.** Технологические основы поточно-автоматизированного производства : учебное пособие для машиностроительных вузов и факультетов / Фома Семенович Демьянюк. – М., 1965. - 690 с.

**Демьянюк, Ф. С.** Увеличение производительности многопозиционных токарных и агрегатных полуавтоматов / Ф. С. Демьянюк, А. И. Дащенко, Е. Г. Нахапетян. – М. : [б. и.], 1959. - 141 с. : 5 л. ил.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**120 гадоў** з дня нараджэння Ф. С. Дзем'янюка (1898**)** // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 66.

**Дзем'янюк Фама Сямёнавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 38-39 : фат.

**Заслужаныя** работнікі-землякі іншых дзяржаў. Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР. **Дзем'янюк Фама Сямёнавіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. - С. 142 : фат.

**Ф. С. Демьянюк** [Электронный ресурс] // Московский политех. – Режим доступа: http://mospolytech.ru/index.php?id=1171. – Дата доступа: 10.10.2019.

**Фома Семёнович Демьянюк** [Электронный ресурс] // Википедия – свободная энциклопедия. – Режим доступа: https://ru.wikipedia. org/wiki/Демьянюк,_Фома_ Семёнович. – Дата доступа: 10.10.2019.

# ДЗМІТРУК АЛЯКСАНДР АНДРЭЕВІЧ

**ДЗМІТРУК Аляксандр Андрэевіч** (1928–1996) - кандыдат філасофскіх навук (1975), дацэнт (1976).



Нарадзіўся Аляксандр Дзмітрук 3 ліпеня 1928 года ў вёсцы Ушкавіца Кобрынскага павета (цяпер Ушкавіца Кобрынскага раёна).

У гады Вялікай Айчыннай вайны ўся сям'я Дзмітрукоў прымала актыўны ўдзел у партызанскім руху. У 1944 годзе Аляксандр быў адпраўлены праз лінію фронту на работу ў тыл Чырвонай арміі.

У 1951 годзе Аляксандр Дзмітрук закончыў юрыдычны факультэт Львоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1951-1953 гадах ён працаваў інструктарам гаркама, сакратаром райкама камсамола ў Львове, з 1953 па 1958 год - у Брэсцкім абкаме ЛКСМБ, у 1961-1976 гадах - лектар, загадчык сектара аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ.

У 1961 годзе А. А. Дзмітрук закончыў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. З 1976 па 1982 год Аляксандр Андрэевіч - начальнік кафедры, намеснік начальніка па навуковай рабоце Мінскай вышэйшай школы МУС СССР, у 1982-1991 гадах - старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

Аляксандр Андрэевіч апублікаваў больш за 30 навуковых прац. Ён узнагароджаны медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Памёр Аляксандр Андрэевіч Дзмітрук 9 снежня 1996 года.

### *Працы*

**Дмитрук, А. А** Борьба марксистско-ленинских партий против правого и «левого» оппортунизма на современном этапе / отдел пропаганды и агитации ЦК КП Белоруссии ; А. А. Дмитрук. - Минск, 1970.

**Дмитрук, А. А.** Воспитание трудящихся в духе непримиримости к буржуазной идеологии / Александр Андреевич Дмитрук. - Минск: Беларусь, 1979. - 158 с.

**Дмитрук, А. А.** Идеологические оруженосцы империализма/ Александр Андреевич Дмитрук. - Минск, 1971.

**Дмитрук, А. А**. Плюрализм мнений, противоположность позиций: проблемы национальных отношений / Александр Андреевич Дмитрук. – Минск, 1990. - 24 с.

**Дмитрук, А. А.** Реальный социализм и его влияние на мировой революционный процесс : материал в помощь лектору / правление общества «Знание» БССР, научно-методический совет по пропаганде филос. и науч. Коммунизма ; А. А. Дмитрук. – Минск,1980.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Дзмітрук Аляксандр Андрэевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 433-434. – (Імі ганарацца землякі).

**90 гадоў** з дня нараджэння А. А. Дзмітрука (1928**)** // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016 –2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 66.

**Дзмітрук Аляксандр Андрэевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 39-40.

# ДЗЯМЧУК МІХАІЛ ІВАНАВІЧ



Вядомы дзяржаўны грамадскі дзеяч, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. Беларускі вучоны, спецыяліст у галіне навуковага прыборабудавання і квантавай радыёфізікі. Рэктар Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. За ўсім гэтым - адзін чалавек, наш зямляк **Міхаіл Іванавіч ДЗЯМЧУК** (1946–2016).

Міхаіл Дзямчук нарадзіўся 28 мая 1946 года ў вёсцы Дзявяткі Закросніцкага сельсавета Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Вучыўся ў школе ў в. Рынкі, потым у СШ № 2 г. Кобрына, якую закончыў з залатым медалём. Пасля заканчэння школы ў 1963 годзе паступіў на фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, які закончыў у 1968 годзе, паступіў у аспірантуру кафедры ядзернай фізікі.

У 1970–1976 гадах Міхаіл Дзямчук працаваў у БДУ малодшым, пазней старшым навуковым супрацоўнікам. У 1976–1984 гадах ён – загадчык лабараторыі Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем БДУ, у 1983–1985 гадах – загадчык кафедры аўтаматызацыі навуковых даследаванняў і сакратар парткама Белдзярж-універсітэта. Доктар фізіка-матэматычных навук (1983), прафесар (1985).

У 1985–1988 гадах М. І. Дзямчук – загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ, з 1988 года – міністр народнай адукацыі БССР. З 1991 года – намеснік старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, курыраваў пытанні адукацыі, навукі, культуры, аховы здароўя. З ліпеня 1994 года М. І. Дзямчук – рэктар Беларускай політэхнічнай акадэміі. У 2000–2001 гадах – намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. З 2001 года – дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу БДПА. З 2002 года – рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ.

Міхаіл Іванавіч Дзямчук – прэзідэнт Міжнароднай акадэміі тэхнічнай адукацыі, акадэмік Міжнароднай акадэміі вышэйшай школы, акадэмік Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі, віцэ-прэзідэнт Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі. Спецыяліст у галіне навуковага прыборабудавання і квантавай радыёфізікі. Створаныя ім прыборы і сістэмы працуюць больш чым у 30 навуковых цэнтрах Беларусі, Расіі, Германіі, ЗША і іншых краінах. Яны дазволілі правесці серыю эксперыментаў з новымі навуковымі і практычнымі вынікамі, вырашыць шэраг задач у галіне эксперыментальнай і тэхнічнай фізікі.

М. І. Дзямчук - аўтар больш 300 навуковых прац, у тым ліку 40 вынаходстваў і трох манаграфій. Кіраўнік (1973–1998) больш чым 30 навукова-даследчых работ, шэрагу праектаў і праграм, накіраваных на фарміраванне ў рэспубліцы высокаэфектыўнай сістэмы трансферу тэхналогій, арганізацыю эканамічных зон высокай інавацыйнай актыўнасці і навукова-вытворчых комплексаў і прадпрыемстваў высокай тэхналагічнай культуры. Падрыхтаваў 10 кандыдатаў і дактароў навук.

Асноўныя працы вучонага ў галіне навуковага прыбора- і машынабудавання, сістэмнага аналізу і арганізацыйнага праектавання. Развіў новы навуковы напрамак у галіне эксперыментальнай і тэхнічнай фізікі. Распрацаваў і стварыў на аснове тэхналогій новага пакалення лазеры ультракароткіх імпульсаў субпікасекунднага часавага дыяпазону з параметрамі выпраменьвання.

У апошнія гады ў сферы навуковых інтарэсаў М. І. Дземчука былі праблемы адукацыі і развіцця навукі ў рэспубліцы, тэорыя і практыка стварэння сучасных навукаёмістых, канкурэнтаздольных вытворчасцей і тэхналогій. Ён аўтар шэрагу прац і канцэптуальных палажэнняў па праблемах будаўніцтва нацыянальнай сістэмы адукацыі, стварэння новых

адукацыйных тэхналогій і навучальных устаноў інтэграванага тыпу, якія паслужылі асновай стварэння ў рэспубліцы першых ліцэяў, гімназій, каледжаў, а таксама рэфармавання прафесійна-тэхнічнай і вышэйшай школы рэспублікі ў рынычных адносінах, аптымізацыі кіруючых структур у галіне адукацыі.

Навуковыя дасягненні М. І. Дземчука атрымалі шырокае прызнанне. Ён лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі 1979 года і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне навукі і тзхнікі 1986 года. Дзяржаўная прэмія БССР 1986 года прысуджана Міхаілу Іванавічу за распрацоўку і ўкараненне ў практыку оптыка-фізічных даследаванняў статыстычных метадаў часавага аналізу хуткапераменных патокаў светлавога выпраменьвання.

М. І. Дзямчук узнагароджаны Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Рэспублікі Беларусь, мае званне Заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь (1996). У 1986-1990 гадах ён дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, з 1989 года па 1991 год - дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

26 ліпеня 2016 года Міхаіл Іванавіч Дзямчук пайшоў з жыцця. Пахаваны на ўсходніх могілках у Мінску.

М. І. Дземчука вылучала жыццёвая разважлівасць, востры розум, чалавечнасць, велізарнае асабістае абаянне. Ён на кожнай ступені росту і прызнання заставаўся чалавекам, не забываў пра родны кут, сваю малую радзіму. Заслужана ў гонар Міхаіла Іванавіча названа адна з вуліц горада Кобрына - вуліца Дземчука.

***Працы***


**Демчук, М. И.** Системная методология инновационной деятельности : учебное пособие / М. И. Демчук, А. Т. Юркевич. – Минск : РИВШ, 2007. – 303 с.

**Демчук, М. И**. Высшая школа в стратегии инновационного развития Республики Беларусь / М. И. Демчук. – Минск : РИВШ, 2006. – 300 с.

**Демчук, М. И.** Импульсная спектрометрия / М. И. Демчук, М. А. Иванов. – Минск : Университетское, 1986. – 205 с.

**Демчук, М. И**. Республика Беларусь: системные принципы устойчивого развития / М. И. Демчук, А. Т. Юркевич. – Минск : РИВШ БГУ, 2003. – 352 с.

**Демчук, М. И.** Статистический одноквантовый метод в оптико-физическом эксперименте / М. И. Демчук, М. А. Иванов. – Минск : Изд-во БГУ, 1981. – 176 с.

**Демчук, М. И.** Республиканскому институту высшей школы 40 лет / М. И. Демчук // Вышэйшая школа. - 2013. - № 5. - С. 13–17.

**Демчук, М. И.** Болонский процесс и его перспективы для Беларуси : [12 января 2012 г. состоялась онлайн-конференция, посвящённая вопросам присоединения Беларуси к Болонскому процессу. На вопросы посетителей сайта БЕЛТА отвечал ректор РИВШ, доктор физико-математических наук, профессор М. И. Демчук] / М. И. Демчук // Вышэйшая школа. - 2012. - № 1. - С. 20–26.

**Демчук, М. И.** Проектирование стандартов высшего образования третьего поколения: преемственность и новации / М. И. Демчук, А. В. Макаров // Вышэйшая школа. - 2012. - № 5. – С. 3–9.

**Демчук, М. И.** О приложении к диплому для белорусских и иностранных граждан, завершивших обучение в высших учебных заведениях Республики Беларусь / М. И. Демчук // Вышэйшая школа. - 2010. - № 6. - С. 30–34.

**Демчук, М. И.** Болонский процесс: истоки, направленность и перспективы для Республики Беларусь / М. И. Демчук // Вышэйшая школа. 2009. - № 4. - С. 11–16.

**Демчук, М. И.** Особенности модернизации системы университетского образования в условиях становления общества знаний / М. И. Демчук // Вышэйшая школа. - 2009. - № 6. - С. 17–21.

**Демчук, М. И.** Научно-методическое обеспечение идеологической работы в вузе: некоторые итоги и уроки / М. И. Демчук // Вышэйшая школа. - 2007. - № 4. -С. 25–27.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Дзямчук Міхаіл Іванавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1998. - Т. 6. – С. 149.

**Дзямчук Міхаіл Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 434. – (Імі ганарацца землякі).

**Демчук Михаил Иванович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2006. - Т. 3. – С. 332.

**Демчук Михаил Иванович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 321-322.

**Демчук Михаил Иванович** // Большой белорусский энциклопедический словарь. – Минск, 2011. – С. 111.

**Демчук Михаил Иванович** // Национальная Академия наук Беларуси : персональный состав. - Минск, 2003.

**Демчук Михаил Иванович** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание / под ред. И. В. Чекалова. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 102.

**Мешечко, Е. Н.** Демчук Михаил Иванович / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Нёмана, Западного Буга и Припяти / Е. Н. Мешечко. – Брест, 2012. – С. 225-226.

**70 гадоў** з дня нараджэння М. І. Дземчука (1946) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016 –2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 11.

**Дзямчук Міхаіл Іванавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 40-43.

**Беларускі** каляндар. 2021 год. Дзямчук Міхаіл Іванавіч // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. - 2020. - № 8. - С. 24 (дадатак).

**Курачук, С.** Таленты роднага краю / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. - 1 ліпеня. – С. 10.

У рамках праекта «Людзі навукі нашага краю» – артыкул пра М. І. Дземчука.

**Демчук Михаил Иванович** : [некролог] // Советская Белоруссия. - 2016. - 28 июля. - С. 3.

**Кузич, В.** Время неумолимо... / Владимир Кузич // Кобрынскі веснік. - 2016. - 6 жніўня. - С. 4.

26 июля 2016 года ушел из жизни М. И. Демчук - доктор физико-математических наук, профессор, член-корреспондент Национальной АН Беларуси.

**Светлай** памяці калегі і выдатнага чалавека М. І. Дземчука : [некралог] // Настаўніцкая газета. - 2016. - 28 ліпеня. - С. 16.

**Этот** день в истории : 28 мая 1946 г. // Советская Белоруссия. - 2016. - 28 мая. – С. 24.

О Михаиле Демчуке, ученом, уроженце д. Девятки Кобринского района.

**Дзямчук, М.** «Маё сэрца назаўсёды застаецца тут» / Міхаіл Дзямчук // Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 ліпеня. – С. 9.

Віншаванне прафесара, доктара фізіка-матэматычных навук, заслужанага дзеяча навукі РБ М. Дземчука з Днём вызвалення г. Кобрына.

**Этот** день в истории // Советская Белоруссия. – 2011. – 28 мая. – С. 30.

**Министр** учился в средней школе № 2 : ими гордится Кобрин // Кобрин-информ. - 2009. - 17 сентября. – С. 26.

**Кушнер, В.** Шлях адолее толькі той, хто ідзе наперад / Васіль Кушнер // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. - № 2. – С. 3–10.

Рэспубліканскаму дзяржаўна-грамадскаму аб’яднанню «Беларускае таварыства «Веды», якое с 1988 г. па 1993 г. узначальваў М. Дзямчук – 60 гадоў.

**Михаил Иванович Демчук** (к 60-летию со дня рождения) // Известия НАН Беларуси. Серия физизико-математематических наук. - 2006. - № 2.

**Славутыя** землякі // Кобрынскі веснік. - 2004. - 28 лютага. - С. 4.

**Дзямчук, М. І.** Акадэмія сацыяльнага аптымізму / М. І. Дзямчук // Звязда. - 1998. - 18 лістапада. - С. 3.

Гутарка па тэме «Студэнт на рубяжы стагоддзяў: адчуванне перспектывы».

**Дзямчук, М.** «Мы павінны ісці да перадавой мадэлі развіцця вышэйшай школы» / М. Дзямчук // Настаўніцкая газета. - 1998. - 31 сакавіка. – С. 2.

**Ганарымся** земляком! // Кобрынскі веснік. - 1996. - 8 чэрвеня. - С. 1.

М. І. Дземчуку – 50 год.

**Дзямчук, М.** Каб словы пераплавіліся ў справы / М. Дзямчук, [гутарыў] А. Сацук // Кобрынскі веснік. - 1995. - 25 лістапада. – С. 2.

Інтэрв'ю з прафесарам М. Дземчуком.

**Дзямчук Міхаіл Іванавіч** [Электронный ресурс] // Нацыянальная Акадэмія навук Беларусі – Режим доступа: http://nasb.gov.by/bel/ members/ correspondents /demchuk.php. - Дата доступа: 20.04. 2018.

**Демчук Михаил Иванович** [Электронный ресурс] // База данных Ученые Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/scient/pls-/dict.prn_ ref?tu. – Дата доступа: 04.10.2018.

# ЖУК МІКАЛАЙ ФЁДАРАВІЧ

**ЖУК Мікалай Фёдаравіч** - кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт.



Уся працоўная дзейнасць Мікалая Фёдаравіча звязана з сельскагаспадарчай навукай, у якой ён ужо больш за 35 гадоў.

М. Ф. Жук мае 47 навуковых прац і 8 патэнтаў на вынаходніцтвы. Абараніў дысертацыю па эмбрыёна-трансплантацыі.

Сёння ён працуе загадчыкам унікальнага цэнтра селекцыі і біятэхналогіі РСУП «Брэстплемпрад-прыемства», якое размешчана ў вёсцы Літвінкі Кобрынскага раёна, дзе праводзіцца работа па трансплантацыі эмбрыёнаў. Мікалай Фёдаравіч займаецца селекцыйна-племяннной жывёлагадоўляй і разумее, як прымусіць гены буйной рагатай жывёлы «працаваць» на вынік.

Правёў першую ў краіне паспяховую аперацыю па трансплантацыі эмбрыёна. У сакавіку 1986 года на свет з'явілася першае цяля-трансплантант, якога назвалі Пачын. У красавіку таго ж года нарадзіўся яго брат - Паўтор.

### *Працы*

**Жук, Н. Ф.** Биотехнологические аспекты получения двоен в молочном скотоводстве на основе метода трансплантации эмбрионов : Автореф.дис.на соиск.учен.степ.канд.с.-х.наук:(06.02.01) / Белорус.НИИ животноводства / Николай Федорович Жук. — Жодино, 1993. — Библиогр. : с. 29-30(9 назв.)

**Биотехнология** трансплантации эмбрионов крупного рогатого скота : методические рекомендации / Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, Академия аграрных наук Республики Беларусь, Белорусский научно-исследовательский институт животноводства ; [подготовили: И. И. Будевич, Н. Ф. Жук и др.]. — Минск : [б. и.], 1992. — 11 с.

**Метод** гормонального вызывания суперовуляции у коров-доноров : методические рекомендации / Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, Академия аграрных наук Республики Беларусь, Белорусский научно-исследовательский институт животноводства ; [подготовили: И. И. Будевич, Н. Ф. Жук и др.]. — Минск : [б. и.], 1992. — 10, [1] с. : табл.

**Метод** получения двоен в молочном скотоводстве на основе трансплантации эмбрионов : методические рекомендации / Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, Академия аграрных наук Республики Беларусь, Белорусский научно-исследовательский институт животноводства ; [подготовили: И. И. Будевич, Н. Ф. Жук и др.]. — Минск : [б. и.], 1992. — 10 с. : табл.

**Усовершенствованная** технология трансплантации эмбрионов в молочном и мясном скотоводстве : (методические рекомендации) / Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, Национальная академия наук Республики Беларусь, Республиканское унитарное предприятие «Научно-практический центр Национальной академии наук Беларуси по животноводству» ; [подготовили: А. И. Будевич, Н. Ф. Жук и др.]. - Жодино : Научно-практический центр Национальной академии наук Беларуси по животноводству, 2010. - 17 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Жук, Н. Ф**. Технологии будущего! / [Николай Федорович Жук ; беседовала] Ирина Романенко // Брестский калейдоскоп. - 2018. - № 1 (январь). - С. 1.

Беседа с заведующим центра селекции и биотехнологии РСУП «Брестплемпредприятие», расположенном в д. Литвинки Кобринского района, кандидатом сельскохозяйственных наук Н. Ф. Жуком.

**Петроченко, А.** Любовь по расчетам / Анна Петроченко // Рэспубліка. – 2017. – 2 снежня. – С. 18.

Руководитель центра трансплантации эмбрионов РСУП «Брестплемпредприятие» Николай Жук в селекционно-племенном животноводстве толк знает.

**Трибулева, Е.** Вторая жизнь «Агро-Заречья» / Елена Трибулева // Вечерний Брест. – 2013. – 7 июня.

Н. Ф. Жук возглавляет СООО «Агрофирма Девятки».

**Работа** в настоящем и перспективы развития племпредприятия [Электронный ресурс] // РСУП «Брестплемпредприятие». - Режим доступа: https://www.bsuir.by/ru/kaf-elektroniki/belskiy-a-ya. – Дата доступа: 30.01.2018.

# ЖУКОВІЧ ПЛАТОН МІКАЛАЕВІЧ

**ЖУКОВІЧ Платон Мікалаевіч** (1857-1919) - гісторык Беларусі, Польшчы і Украіны XVII-XVIII стагоддзяў, прафесар, педагог і беларусазнаўца, член-карэспандэнт Расійскай Акадэміі навук.



Платон Жуковіч нарадзіўся 26 верасня (8 кастрычніка) 1857 года ў горадзе Пружаны Гродзенскай губерні (цяпер Брэсцкай вобласці) у шматдзетнай сям'і першага настаяцеля Свята-Аляксандра-Неўскага сабора Мікалая Жуковіча (1827–1906). Яго бацька быў родам з м. Дзівін Кобрынскага павета і вызначаўся вялікай адданасцю праваслаўнай царкве. Гэта, безумоўна, паўплывала на будучы прафесійны выбар Платона Жуковіча і яго навуковую дзейнасць.

Дзіцячыя гады Платон Жуковіч правёў на радзіме ў Пружанах. Пачатковую адукацыю атрымаў дома і ў мясцовай царкоўна-прыходскай школе. У 1867 годзе паступіў у Кобрынскае духоўнае вучылішча.

Потым была Віленская духоўная семінарыя – адна з вядучых устаноў краю, дзе давалі яшчэ і добрую свецкую адукацыю. Па заканчэнні семінарыі (1877) за «весьма хорошие успехи и благонравие» па семінарскай традыцыі быў узнагароджаны кнігамі.

Вучыўся на царкоўна-гістарычным факультэце Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Вялікі ўплыў на будучага вучонага аказалі яго настаўнікі, асабліва прафесар М. Каяловіч, які паходзіў з Беларусі і быў адным са стваральнікаў ідэалогіі «заходнерусізму». На трэцім курсе Платон Жуковіч абраў тэму для даследавання «Кардинал Гозий и польская церковь его времени», яна перарасла ў дысертацыю, якую абараніў у 1881 годзе і атрымаў ступень кандыдата багаслоўя.

Пасля заканчэння акадэміі П. М. Жуковіч выкладаў арыфметыку і геаграфію ў Полацкім духоўным вучылішчы. Так у яго жыцці пачаўся «беларускі перыяд». Настаўніцтва сумяшчаў з навуковай дзейнасцю. У 1883 годзе атрымаў навуковую ступень магістра багаслоўя і запрашэнне на працу ў Кіеўскую духоўную акадэмію. Аднак вярнуўся ў Полацк, адкуль быў пераведзены на пасаду наглядчыка мужчынскага Віленскага духоўнага вучылішча, а ў 1884 годзе пачаў выкладаць у Літоўскай духоўнай семінарыі.

Праца ў Вільні дала новы штуршок для навуковых пошукаў. П. М. Жуковіч заняўся вывучэннем гісторыі Віленскай каталіцкай духоўнай семінарыі, яе ўплыву на жыццё Беларусі. Яго даследаванні ў гэтай галіне і сёння застаюцца асноўнай крыніцай для вывучэння сістэмы духоўнай каталіцкай адукацыі ў Расійскай імперыі XIX стагоддзя. Пяру Платона Жуковіча належаць і першыя працы па гісторыі ўніяцкай адукацыі ў Беларусі. Павага да вучонага была настолькі высокай, што 42 нумар «Литовских епархиальных ведомостей» за 1891 год поўнасцю прысвяцілі П. М. Жуковічу – адзіны выпадак у гісторыі Віленскай семінарыі і самога выдання.

У 1891 годзе П. М. Жуковіч пераходзіць на працу ў Пецярбургскую духоўную акадэмію. Праз некаторы час ён атрымлівае прафесарскую кафедру і працягвае навуковую працу па вывучэнні рэлігійнага пытання на тэрыторыі Беларусі ў часы Рэчы Паспалітай. У 1901 годзе абараніў доктарскую дысертацыю «Сеймовая борьба православного западно-русского дворянства с церковной унией до 1609 года», атрымаў доктарскую ступень і званне ардынарнага прафесара. У 1912 годзе абраны ганаровым членам Духоўнай акадэміі. З'яўляўся членам Рускага гістарычнага таварыства з 1914 года. Акрамя таго, з'яўляўся ганаровым членам Імператарскага Археалагічнага інстытута ў Санкт-Пецярбургу і Палтаўскай царкоўнай гісторыка-археалагічнай камісіі, пажыццёвым членам Уладзімірскай губернскай вучонай архіўнай камісіі.

Разам з асвятленнем царкоўнай гісторыі ў сферу інтарэсаў навукоўца ўваходзілі іншыя тэмы. Цікавіўся гісторыяй інвентарнага пытання, сялянскай рэформай 1861 года, адміністрацыйным кіраўніцтвам, судова-прававымі адносінамі, становішчам розных саслоўяў. У выніку з'явіліся працы: «О русском землевладении в Северо-Западном крае со времени присоединения его к России», «Смутное время и воцарение Романовых» (1913), «Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II» (1914), «Сословный состав населения Западной России в царствование Екатерины II» (1915), «Западная Россия в царствование императора Павла I» (1916) і інш. Самай галоўнай працай, працай усяго яго жыцця, стала манаграфія «Соймавая барацьба праваслаўнага заходнярускага дваранства з царкоўнай уніяй», у якой вучоны даследаваў міжнароднае становішча Рэчы Паспалітай і адносіны яе з Расіяй, Швецыяй, Асманскай імперыяй і манархіяй Габсбургаў за 1587-1632; высвятляў пазіцыю беларуска-літоўскай, украінскай і польскай шляхты, казацтва, пратэстантаў, сялянскіх і гарадскіх саслоўяў.

Рэвалюцыйныя падзеі 1917 года карэнным чынам змянілі жыццё П. М. Жуковіча. Ён выйшаў у адстаўку, а ў 1919 годзе ўладкаваўся на працу ў Дзяржаўную публічную бібліятэку імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Петраградзе.

У 1918 годзе П. М. Жуковіч абраны членам-карэспандэнтам Акадэміі навук. Дзейнасць навукоўца была важным крокам у вывучэнні канфесіянальнай і грамадзянскай гісторыі Беларусі і Расіі, станаўленні беларускага славяназнаўства. Аднак далейшым яго планам не

наканавана было ажыццявіцца. Платон Мікалаевіч памёр 30 лістапада 1919 года ў Петраградзе.

Прафесар Платон Мікалаевіч Жуковіч, безумоўна, адзін з лепшых гісторыкаў Расійскай імперыі пачатку XX стагоддзя, а яго веды па гісторыі ВКЛ сталі асновай беларусазнаўства.

***Працы***

**Жукович, П. Н.** О русском землевладении в Северо-Западном крае со времени присоединения его к России / П. Н. Жукович. – СПб., 1895.

**Жукович, П. Н.** Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией / П. Н. Жукович. - СПб., 1901. – 386 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Грыгор'ева, В.** Жуковіч Платон Мікалаевіч / В. В. Грыгор'ева // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1998. - Т. 6. - С. 447.

**Грыгор'ева, В.** Жуковіч Платон Мікалаевіч / Валянціна Грыгор'ева // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1996. - Т. 3:- С. 374.

**Жуковіч Платон Мікалаевіч** // Асветнікі зямлі Беларускай : энцыклапедычны даведнік. - Мінск, 2001. – С. 166.

**Жуковіч Платон Мікалаевіч** // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыклапедычны даведнік. - Мінск, 1995. – С. 429-430.

**Камінскі, М. І.** Жуковіч Платон Мікалаевіч / М. І. Камінскі // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1971. – Т. 4. – С. 423-424.

**Нікалаеў, М. В.** Беларускі Пецярбург / Мікола Нікалаеў. – Санкт-Пецярбург, 2009. – 535 с.

Са зместу: Платон Мікалаевіч Жуковіч - гл. с. 48.

**26 верасня 2017 г.** – 160 гадоў з дня нараджэння Платона Мікалаевіча Жуковіча [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Рэжым доступу: http://kb.brl.by/index. – Дата доступу: 12.09.2018.

# ЗАПАРОЖЧАНКА РАІСА ГЕОРГІЕЎНА

**ЗАПАРОЖЧАНКА Раіса Георгіеўна** - вучоны-фізік, доктар фізіка-матэматычных навук.



Нарадзілася 25 лютага 1944 года ў вёсцы Мярніца Кобрынскага раёна.

У 1966 годзе закончыла фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля аспірантуры пры Інстытуце фізікі АН Беларусі працавала малодшым навуковым супрацоўнікам.

У 1977 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «квантавая электроніка».

Тэматыка яе даследаванняў звязана з актыўнай сінхранізацыяй лазернага выпраменьвання для атрымання ўльтракароткіх імпульсаў святла, з нелінейна-аптычнымі метадамі ператварэння частаты ўльтракароткіх імпульсаў і нелінейным прапусканнем святла паўправаднікамі. Асноўным метадам даследавання, што развіла Раіса Георгіеўна, з'яўляецца метад матэматычнага мадэліравання працэсаў у лазерах і нелінейна-аптычных асяроддзях.

Р. Г. Запарожчанка надрукавала больш за 100 навуковых артыкулаў у айчынных і замежных часопісах, атрымала 9 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтва. Па выніках гэтых даследаванняў у 1996 годзе ёй прысвоена навуковая ступень доктара фізіка-матэматычных навук па спецыяльнасці «лазерная фізіка».

Раіса Георгіеўна - вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі імя Б. І. Сцяпанава Нацыянальнай АН Беларусі.

***Працы***

**Запорожченко, Раиса Георгиевна.** Математическое моделирование лазерных и нелинейно-оптических систем : автореферат дис. ... доктора физико-математических наук / Р. Г. Запорожченко : 01.04.21. - Минск, 1995. - 32 с.: ил.

**Запорожченко, Раиса Георгиевна.** Исследование вынужденной синхронизации мод в импульсных лазерах : автореф. дис. на соиск. учен. степени канд. физ.-мат. наук : (01.04.04) / Ин-т физики АН БССР. - Минск : [б. и.], 1977. - 15 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Запарожчанка Раіса Георгіеўна** // Памяць. Кобрынскі раёна : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 434-435. – (Імі ганарацца землякі).

**75 гадоў** з дня нараджэння Р. Г. Запарожчанка (1944) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016 –2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 97.

**Да 70-годдзя** з дня нараджэння Р. Г. Запарожчанка // Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2014 год / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Курачук, Л. Сысоева. – Кобрын, 2014. - С. 41-42.

**Імі ганарацца** земляки. Запарожчанка Раіса Георгіеўна [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: https://ikobrin.by/kobrin-139.php. – Дата доступу: 23.08.2017.

# ЗАРЫСКІ ОСКАР

**ЗАРЫСКІ Оскар** (сапраўдныя імя і прозвішча Ошэр Зарыцкі; англ. Oscar Zariski; (1899–1986) - амерыканскі матэматык беларускага паходжання, акадэмік Амерыканскай акадэміі мастацтваў і навукі ў Бостане.



Оскар (Ошэр) Зарыскі нарадзіўся 24 красавіка 1899 года ў горадзе Кобрыне Гродзенскай губерні (цяпер Брэсцкай вобласці). Яго бацька, Бецалель Зарыцкі, настаўнік талмуда, памёр, калі дзіцяці было ўсяго два гады. Маці, Хане Тэнэнбаум, прыйшлося адной гадаваць семярых дзяцей. Яна валодала магазінам і вяла сваю справу настолькі паспяхова, што неўзабаве сям’я стала адной з самых заможных у Кобрыне.

Ошэр Зарыцкі вывучаў філасофію ў Кіеўскім універсітэце ў 1918–1920 гадах. Адначасова вывучаў алгебру і тэрыю лічбаў у Д. А. Граве, стваральніка першай буйной матэматычнай школы. Ішла Грамадзянская вайна, вучыцца студэнтам было складана: у горадзе мяняліся ўлады, часам ішлі баі (аднойчы Ошэр быў паранены), рэвалюцыйныя ўлады ўносілі змены ў дзейнасць універсітэта, нават адмянялі экзамены.

О. Зарыцкі ў 1920 годзе вярнуўся ў родны Кобрын, які на гэты час быў заняты Польшчай. Атрымаўшы польскае грамадзянства, эмігрыраваў у Італію, каб працягваць заняткі матэматыкай. Вучыўся ў г. Піза, а потым перавёўся ў Рымскі ўніверсітэт. Стаў вучнем знакамітай італьянскай школы алгебраічнай геаметрыі – Г. Кастэльнуова, Ф. Энрыкеса і Ф. Северы. У Італіі імя і прозвішча вымаўляліся на заходні манер, і Ошэр Зарыцкі стаў Оскарам Зарыскім. Унесці такія карэктыроўкі ў гучанне прапанаваў адзін з настаўнікаў юнака Ф. Энрыкес, і новае імя выкарыстоўвалася для першай публікацыі.

У 1924 годзе О. Зарыскі закончыў дактарантуру, тэма яго доктарскай дысертацыі тычылася тэорыі Галуа (рашэннем ураўненняў у радыкалах). У тым жа годзе ажаніўся на італьянскай студэнтцы, якая вывучала літаратуру, з маладой жонкай наведаў Кобрын. У Італіі пагаршалася палітычная сітуацыя, да ўлады прыйшла фашысцкая партыя Б. Мусаліні. Маладому вучонаму даводзілася зарабляць на сям'ю ў выпадковых месцах. У 1926 годзе атрымаў стыпендыю Ракфелера. Спрабаваў выехаць у Савецкую Расію, але не атрымаў візу.

У 1927 годзе О. Зарыскі эмігрыраваў у ЗША. У 1927–1944 гадах выкладаў ва ўніверсітэце Джона Хопкінса, з 1945 па 1947 год – у Ілінойскім, у 1947–1960 гадах – у Гарвардскім універсітэце. У 1935–1936, 1939, 1960–1961 гадах таксама працаваў у Прынстанскім інтытуце перспектыўных даследаванняў. З 1937 года меў званне прафесара.

Другая сусветная вайна сарвала яго планы наведвання Англіі, а галоўнае – перарвала сувязі з маці і іншымі роднымі (шэсць братоў і сясцёр), якія апынуліся пад нямецка-фашысцкай акупацыяй. У 1945 годзе наведаў Сан-Паулу (Бразілія), дзе працаваў як запрошаны прафесар, і там атрымаў трагічную вестку – нацысты забілі яго маці і большую частку родных.

Асноўныя працы вучонага ў галіне алгебры, асабліва камутатыўнай алгебры, якую ён звязаў з алгебраічнай геаметрыяй. О. Зарыскі выказаў знакамітую гіпотэзу аб уласцівасцях алгебраічных многачленаў (Гіпотэза Зарыскага). У 1944 годзе матэматык за выдатны ўклад у алгебру быў удастоены прэміі Коўла, якая прысуджваецца Амерыканскім матэматычным грамадствам за выбітны ўнёсак у алгебру ці тэорыю лікаў. З 1944 года з'яўляўся членам Нацыянальнай акадэміі навук ЗША, з 1948 года – Амерыканскай акадэміі мастацтваў і навукі ў Бостане.

У 1958 годзе Оскар Зарыскі ўваходзіў у склад камітэта па прысуджэнні прэміі Філдса. Гэта міжнародная прэмія, якая ўручаецца адзін раз у чатыры гады на кожным міжнародным матэматычным кангрэсе двум, тром ці чатыром маладым матэматыкам ва ўзросце не старэй 40 гадоў. У перыяд паміж 1960 і 1961 гадамі быў віцэ-прэзідэнтам, а ў 1969–1970 – прэзідэнтам Амерыканскага матэматычнага грамадства – асацыяцыі прафесійных матэматыкаў ЗША. У 1965 годзе О. Зарыскага ўзнагародзілі Нацыянальным навуковым медалём ЗША, які прысуджаецца прэзідэнтам краіны. Оскар Зарыскі – лаўрэат прэміі Вольфа (Ізраіль) і прэміі Стыла (абедзьве ў 1981 годзе).

О. Зарыскі быў выдатным педагогам, зрабіў Гарвард сусветным цэнтрам па алгебраічнай геаметрыі. Чытаў лекцыі ў Маскоўскім універсітэце (1936), Кіота (1956), Кембрыджы (1972) і інш. Кніга О. Зарыскага і П. Самюэля «Камутатыўная алгебра» (т. 1 - 1958; т. 2 - 1960) стала класічнай і дагэтуль з'яўляецца адным са стандартных падручнікаў па прадмету.

4 ліпеня 1986 года вялікага матэматыка Оскара Зарыскага не стала. Яго сэрца перастала біцца ў Бруклайне (штат Масачусец, ЗША).

«Человек, который называл геометрию «настоящей жизнью», жил в мире математики. Здесь его темперамент имел свободное выражение – любопытный, оптимистичный, надменный, упрямый, требовательный. В своём роде он был воплощением интеллектуальной романтики; мальчиком-гением, отмеченным за своё величие учителями; идеалистом, разрывающимся между любовью к России и преданностью математике; учеником, превзошедшим своих учителей; предвестником европейского таланта, который изменил академичную и артистическую жизнь в Америке», – так ахарактарызавала О. Зарыскага Carol Parikh у сваёй кнізе «The Unreal Life of Oskar Zariski».

У Кобрыне з 2016 года сярод вучняў школ праводзіцца адкрытая алімпіяда імя Оскара Зарыскага па матэматыцы. Сёння ў горадзе арганізавана вывучэнне меркавання грамадзян аб прысваенні праектаванай вуліцы № 4 у раёне квартала сядзібнай жылой забудовы «Усходні» імя матэматыка Оскара Зарыскага.

**Зарисский, О.** Коммутативная алгебра / О. Зарисский, П. Самюэль. – М. : ИЛ, 1963. - Т. 1-2.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Боголюбов, А. Н.** Зариски Оскар / А. Н. Боголюбов // Математики. Механики : биографический справочник / А. Н. Боголюбов. - Киев : Наукова думка, 1983. - С. 188.

**Бородин, А. И**. Зариский Оскар / А. И. Бородин, А. С. Бугай // Выдающиеся математики : биографический словарь-справочник : 2-е изд., перераб. и доп. / А. И. Бородин, А. С. Бугай. - Киев : Радзяньска школа, 1987. - С. 205.

**Зариский, Зариски Оскар** // Большая Российская энциклопедия : в 30 т. - М., 2008. - Т. 10. - С. 272.

**Касцюковіч, М. М.** Зарыскі Оскар / М. М. Касцюковіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2004. – Т. 18, кн. 1. – С. 388.

**120 гадоў** з дня нараджэння О. Зарыскага (1899**)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 98.

**Зарыскі Оскар** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 46-48.

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля (№ 29). - С. 5.

Кобринская центральная районная библиотека начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны».

**Оскар** у кобринчан // Кобрынскі веснік. – 2017. – 12 ліпеня. – С. 5.

139 команд Беларуси, России и Украины приняли участие в I Международном асинхронном математическом турнире имени Оскара Зарисского по игре «Что? Где? Когда?».

**Тимошук, А.** В мире цифр и алгоритмов / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2017. - 22 лютага. - С. 4.

В честь гениального кобринского математика Оскара Зарисского преподавателями СШ № 6 Логвиновичами организована дистанционная районная олимпиада по математике «Олимпиада имени Оскара Зарисского» и интернет-платформа «OSKAR» для работы с одаренными детьми.

«**Oskar** получил «Оскара» // Вечерний Брест. - 2016. - 25 мая. - С. 7.

Проект «Олимпиада им. Оскара Зарисского» назван в честь талантливого математика, уроженца г. Кобрина.

**Логвинович, Я.** Оскар Зарисский – гениальный математик из Кобрина / Яков Логвинович // Кобрин-информ. – 2015. – 18 июня. – С. 7.

**24 красавіка 1899 г.** [нар. Оскар Зарыскі] : Даты. Падзеі. Людзі // Звязда. - 2019. - 24 красавіка. - С. 12.

Амерыканскі матэматык О. Зарыскі нарадзіўся ў г. Кобрыне.

**Зарисский, Оскар** [Электронный ресурс] // JewAge. – Режим доступа: http:// www.jewage.org/wiki/ru/Article:Зарисский,_Оскар_-_Биография. – Дата доступа: 23.08.2017.

**Зарисский Оскар** [Электронный ресурс] // ПомниПро : электронный мемориал. – Режим доступа: http://pomnipro.ru/memorypage45251/biography. – Дата доступа: 23.08.2017.

**Оскар Зарисский.** Гениальный математик из Кобрина [Электронный ресурс] // Туристический Кобрин. – Режим доступа: http://ikobrin.ru/kobrin-zariski.php. – Дата доступа: 28.02.2017.

# ЗІНЧУК СЦЯПАН ДЗМІТРЫЕВІЧ

**ЗІНЧУК Сцяпан Дзмітрыевіч** – вучоны-педагог, кандыдат педагагічных навук.



Нарадзіўся 12 красавіка 1937 года ў вёсцы Астромічы Кобрынскага павета (цяпер Астромічы Кобрынскага раёна). Вучыўся ў Астроміцкай школе, потым закончыў сямігодку ў в. Мухаўлокі Далей працягваў вучобу ў сярэдняй школе № 2 г. Кобрына.

У 1957 годзе Сцяпан Зінчук паступіў у Мінскі педагагічны інстытут імя Горкага, па заканчэнні якога выкладаў у гэтым інстытуце. Працаваў асістэнтам, старшым выкладчыкам.

У 1974 годзе Сцяпан Дзмітрыевіч абараніў кандыдацкую дысертацыю і ў 1978 годзе быў пераведзены на пасаду дацэнта. З 1988 года ўзначальвае кафедру «Асновы электронікі і вылічальнай тэхнікі».

Дацэнт Зінчук апублікаваў больш 50 навуковых і навукова-педагагічных прац, сярод якіх навучальныя дапаможнікі для школы і ВНУ. Пад яго кіраўніцтвам быў рэалізаваны франтальны метад выканання лабараторных работ. Таксама ён удзельнічаў пры ўкараненні вылічальнай тэхнікі ў навучальны працэс.

С. Д. Зінчук - педагог, спецыяліст у галіне тэорыі і методыкі выкладання фізікі. Сфера яго навуковых інтарэсаў - методыка выкладання электронікі і аўтаматыкі.

Сцяпан Дзмітрыевіч - выдатнік адукацыі БССР і выдатнік адукацыі СССР.

Працягваў працоўную дзейнасць да 1 чэрвеня 2017 года.

### *Працы*

**Зинчук, С. Д**. Изучение элементов автоматики и вычислительной техники в средней общеобразовательной школе : автореферат диссертации ... кандидата педагогических наук : 13.00.02 / Зинчук Степан Дмитриевич. - Минск, 1974.

**Зинчук, С. Д.** Цифровая электроника : лабораторный практикум / С. Д. Зинчук, В. В. Юргульский ; Министерство образования Республики Беларусь, Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка. – Минск, 2015.

**Зинчук, С. Д.** Элементы автоматики и вычислительной техники : учебно-методическое пособие по факультатив. курсу / Степан Дмитриевич Зинчук ; Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. - Минск, 1975. - 91 с.

**Дасько, А. Д.** Фронтальные лабораторные работы по радиотехнике с элементами вычислительной техники : методические указания / А. Д. Дасько, С. Д. Зинчук ; Министерство просвещения БССР, Минский государственный педагогический институт им. А. М. Горького. – Мінск, 1985.

**Китунович, Ф. Г.** Электротехника : учеб. пособие / Ф. Г. Китунович, С. Д. Зинчук. - Минск : Техноперспектива, 2004. - 357 с.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Зінчук Сцяпан Дзмітрыевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 435. – (Імі ганарацца землякі).

**80 гадоў** з дня нараджэння С. Д. Зінчука (1937) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 38.

**Зінчук Сцяпан Дзмітрыевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 48-49.

**Да 75-годдзя** з дня нараджэння С. Д. Зінчука // Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2012 год / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2012. – С. 5.

**Імі ганарацца** землякі. Зінчук Сцяпан Дзмітрыевіч [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: https://ikobrin.by/kobrin-139.php. – Дата доступу: 23.08.2018.

# ІАЎЧУК МІХАІЛ ТРЫФАНАВІЧ

**ІАЎЧУК Міхаіл Трыфанавіч** (1908–1990) - вучоны ў галіне філасофіі, член-карэспандэнт АН СССР (1946), замежны член Балгарскай АН (1975), партыйны дзеяч. Прафесар (1939), доктар філасофскіх навук (1946).



Нарадзіўся Міхаіл Іаўчук 19 лістапада 1908 года ў вёсцы Завужоўе Кобрынскага павета (цяпер Завужоўе Кобрынскага раёна). Закончыў філасофскае аддзяленне Акадэміі камуністычнага выхавання (1931).

У 1936-1939 гадах - кіраўнік кафедраў дыялектычнага матэрыялізму марксізму-ленінізму Маскоўскага хіміка-тэхналагічнага інстытута імя Мендзялеева і Маскоўскай сельскагаспадарчай акадэміі імя Ціміразева.

У 1939-1941 гадах - на партыйнай рабоце ў Выканкаме Камінтэрна, у 1941-1947 - ва ўпраўленні прапаганды і агітацыі ЦК ВКП(б). У 1947-1949 гадах М. Т. Іаўчук - сакратар ЦК КП(б)Б па прапагандзе і агітацыі, член бюро ЦК КП(б)Б.

У 1949-1970 гадах Міхаіл Трыфанавіч вёў навукова-выкладчыцкую работу ў Маскоўскім, Уральскім універсітэтах, Інстытуце філасофіі АН СССР.

У 1970-1978 гадах ён рэктар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС, рэдагаваў часопіс «Філасофскія навукі». З 1978 года М. Т. Іаўчук - кансультант Інстытута марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС. Іаўчук быў старшынёй Навуковага савета АН СССР па гісторыі грамадскай думкі.

Даследаваў праблемы гісторыі філасофіі, гісторыі марксізму-ленінізму, пытанні тэорыі культуры, ідэалагічнай барацьбы і інш. Ён аўтар кніг «Г. В. Пляханаў і яго працы па гісторыі філасофіі» (1960), «Гісторыя філасофіі як навука, яе прадмет, метад і значэнне» (1960) і іншых, адзін з аўтараў і рэдактараў «Гісторыі філасофіі».

Міхаіл Трыфанавіч - дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1941-1950 гадах.

Першы лаўрэат прэміі імя Г. В. Пляханава (1971).

Узнагароджаны многімі ордэнамі (ордэн Леніна (30.12.1948), ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1975), два ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга (1945; 27.03.1954), ордэн Дружбы народаў (20.11.1978), ордэн Чырвонай Зоркі (20.04.1944), ордэн «Знак Пашаны» (12.12.1968) і медалямі СССР.

Памёр Міхаіл Трыфанавіч Іаўчук 9 студзеня 1990 года.

***Працы***

**Иовчук, М. Т.** Г. В. Плеханов и его труды по истории философии / М. Т. Иовчук. - М.,1960.

**Иовчук, М. Т**. История философии как наука, её предмет, метод и значение / М. Т. Иовчук. - М., 1960.

**Иовчук, М. Т.** Ленинизм, философские традиции и современность / М. Т. Иовчук. - М., 1970.

**Иовчук, М. Т.** Философские и социологические взгляды Н. П. Огарева / М. Т. Иовчук. - М., 1957.

**Иовчук, М. Т.** Проблемы исследования истории философской и общественно-политической мысли в Средней Азии и Казахстане / М. Т. Иовчук, Ш. Ф. Мамедов // Вопросы философии. - 1978. - № 11.

**Иовчук, М. Т.** О роли историко-философской науки в системе образования / М. Т. Иовчук // Философские науки. - 1973. - № 2.

**Иовчук, М. Т.** Взаимосвязь истории философии и истории науки в трактовке советской историко-философской науки / М. Т. Иовчук // Философские науки. - 1972. - № 1.

**Иовчук, М. Т.** Основные вехи развития в СССР истории философии как науки / М. Т. Иовчук, Л. Н. Суворов // Философские науки. - 1958. - № 1. - С. 34-51.

**Иовчук, М. Т.** Г. В. Плеханов и вопросы истории русской философии / М. Т. Иовчук // Вестник Московского университета. Серия экономики, философии и права. - 1956. - № 2. - С. 15-33.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Іаўчук Міхаіл Трыфанавіч //** Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1998. – Т. 7. – С. 142.

**Іаўчук Міхаіл Трыфанавіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. - Т.5. - С. 26-27.

**Іаўчук Міхаіл Трыфанавіч** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1981. – Т. 5 : біяграфічны даведнік. – С. 248, 249.

**Іаўчук Міхаіл Трыфанавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 435. – (Імі ганарацца землякі).

**Иовчук Михаил Трифонович** // Большая советская энциклопедия : [в 30 т.]. – М., 1972. – Т. 10. – С. 366.

**Иовчук Михаил Трифонович** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1982. – Т. 5. Биографический справочник. – С. 258.

**Иовчук Михаил Трифонович** // Регионы Беларуси : эниццлопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская обл. : в 2-х кн. - Минск, 2009. - Кн.1. - С. 431.

**Иовчук Михаил Трифонович** // Философский энциклопедический словарь. - М., 1983. – С. 220.

**Корнилович, Э. А**. Политики и учёные. Иовчук Михаил Трифонович / Э. А. Корнилович // Беларусь: созвездие политических имён : историко-биографический справочник / Э. А. Корнилович. – Минск, 2009. – С. 342-343 : фото.

**110 гадоў** з дня нараджэння Іаўчука Міхаіла Трыфанавіча // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 67.

**Іаўчук Міхаіл Трыфанавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 49-51.

**Беларускі** каляндар. 2018 год. Іаўчук Міхаіл Трыфанавіч // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. - 2017. - № 9. - С. 19 (дадатак).

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля (№ 29). - С. 5.

Кобринская центральная районная библиотека начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны».

# ІВАНЮК УЛАДЗІМІР РЫГОРАВІЧ



**ІВАНЮК Уладзімір Рыгоравіч** (1941-2009) - вучоны ў галіне аховы раслін, член-карэспандэнт НАН Беларусі, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь. Доктар біялагічных навук, прафесар.

Нарадзіўся 23 ліпеня 1941 года ў вёсцы Мяфёдавічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Дзяцінства прыйшлося на цяжкія, галодныя ваенныя і пасляваенныя гады. Выпаўшыя на яго долю выпрабаванні станоўча адлюстраваліся на любові да працы, жыццёвай сіле і трываласці будучага вучонага.

У 1959 годзе Уладзімір Іванюк закончыў Гарадзецкую сярэднюю школу. Паступіў на прырода-геаграфічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна, які з адзнакай закончыў у 1964 годзе.

Па рэкамендацыі вучонага савета Уладзімір Іванюк паступіў у аспірантуру Беларускага навукова-даследчага інстытута бульбаводства і агародніцтва, з 1966 года працаваў там малодшым навуковым супрацоўнікам. У 1969 годзе яму была прысуджана навуковая ступень кандыдата біялагічных навук. У1971–1986 гадах – старшы навуковы супрацоўнік; у 1986–1989 гадах – загадчык аддзела, у 1989–1999 гадах – галоўны навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага інстытута абароны раслін.

У 1982 годзе Уладзімір Рыгоравіч стаў доктарам біялагічных навук, у 1992 годзе – прафесарам, членам-карэспандэнтам Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь. З 1999 года працаваў галоўным навуковым супрацоўнікам Беларускага НДІ бульбаводства (з 2006 года – Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па бульбаводству і плодаагародніцтву). Адначасова ў 1998–2005 гадах – прафесар кафедры Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта і кафедры БДСХА. У 2003 годзе - член-карэспандэнт НАН Беларусі.

У. Р. Іванюк – аўтар каля 500 навуковых прац, у тым ліку 13 манаграфій, 12 вынаходніцтваў. У вучонага шмат навуковых прац у вобласці імунітэту і абароны сельскагаспадарчых культур ад хвароб і шкоднікаў. Ён правёў вывучэнне біялогіі ўзбуджальнікаў хвароб бульбы, агароднінных культур, лубіну і інш. Усталяваў структуру папуляцый і яе дынаміку ў прасторы і часе. Выявіў эфектыўнасць шэрагу агратэхнічных прыёмаў, пестыцыдаў і біялагічных сродкаў абароны супраць комплексу грыбных і бактэрыяльных захворванняў. Распрацаваў матэматычныя мадэлі ўзаемаадносін у сістэме «расліна – патаген – навакольнае асяроддзе», якія дазваляюць прагназаваць характар праявы найболей шкодносных захворванняў сельскагаспадарчых культур у Беларусі і планаваць аб'ёмы правядзення ахоўных мерапрыемстваў. Выявіў спосабы прыгнечання паразітычнай актыўнасці патагенаў і павышэнне хваробаўстойлівасці сельскагаспадарчых культур.

У. Р. Іванюк – суаўтар сорту бульбы Дабро, памідораў Ружа, Віліна, Калінка, Аранж.

Уладзімір Рыгоравіч актыўна займаўся выкладчыцкай дзейнасцю. За 25 гадоў падрыхтаваў 19 кандадатаў навук. Заўсёды ў даступнай, зразумелай форме імкнуўся перадаць свае веды, свой жыццёвы вопыт маладому пакаленню даследчыкаў. Вучні запомнілі эрудзіраванага і мудрага выкладчыка, надзейнага сябра, зносіны з якім прыносілі інтэлектуальнае і духоўнае абагачэнне. Гэта быў сціплы і адкрыты чалавек. Частку свайго часу У. Р. Іванюк аддаваў прапагандзе навуковых ведаў: выступаў з лекцыямі і дакладамі на навуковых з'ездах, канферэнцыях, вытворчых семінарах, курсах павышэння кваліфікацыі, даваў рэкамендацыі па абароне раслін ў СМІ.

Праца Уладзіміра Рыгоравіча неаднаразова адзначалася граматамі, у тым ліку Граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, медалямі ВДНГ.

У. Р. Іванюк памёр 22 мая 2009 года.

Багатая навуковая спадчына, якую пакінуў беларускі навуковец, ставіць яго ў адзін шэраг з найбольш вядомымі айчыннымі і замежнымі вучонымі ў вобласці фітапаталогіі і фітаімуналогіі. 13–15 ліпеня 2011 года адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная памяці У. Р. Іванюка.

### *Працы*

**Иванюк, В. Г.** Болезни и вредители овощных культур : справочное пособие / В. Г. Иванюк, Н. Н. Колядко, М. С. Комарова. – Минск : Ураджай, 1994. – 351 с.

**Иванюк, В. Г.** Болезни картофеля; Вредители / В. Г. Иванюк // Бульба белорусская : энциклопедия. - Минск, 2008. - С. 157–235.

**Иванюк, В. Г.** Защита картофеля от болезней, вредителей и сорняков / В. Г. Иванюк, С. А. Банадысев, Г. К. Журомский. – Минск : Белпринт, 2005. – 696 с.

**Иванюк, В. Г**. Защита картофеля от болезней и вредителей на приусадебных участках / В. Г. Иванюк, Ж. В. Блоцкая, В. А. Бейня. – Минск : Современное слово, 1998. – 256 с.

**Иванюк, В. Г.** Проблемы иммунитета сельскохозяйственных растений к болезням / В. Г. Иванюк, Н. А. Дорожкин, А. Н. Палилова. – Минск : Наука и техника, 1988. – 247 с. : ил.

**Бульба** : энциклопедический справочник по выращиванию, хранению, переработке и использованию картофеля / ред. кол.: И. П. Шамякин (гл. ред.), П. И. Альсмик, А. Ф. Богдановский, В. В. Валуев, В. Г. Иванюк [и др.]. – Минск : Белорусская Советская Энциклопедия, 1988. – 674 с. : ил.

**Иванюк, В. Г.** Комплексная защита картофеля в личных подсобных хозяйствах / В. Г. Иванюк, В. И. Калач, Д. А. Ильяшенко // Защита и карантин растений : ежемесячный журнал для специалистов, ученых и практиков. - 2011. - № 10. - С. 48–52.

**Иванюк, В. Г**. Видовой состав возбудителей грибных болезней зернобобовых культур в условиях Белорусского Полесья / В. Г. Иванюк, Н. Ф. Климова // Земляробства і ахова раслін. - 2008. - № 4. - С. 16–18.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Іванюк Уладзімір Рыгоравіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1998. – Т. 7. – С. 156.

**Иванюк Владимир Григорьевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т.1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. - С. 415.

**Иванюк Владимир Григорьевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2006. – Т. 3. – С. 699.

**Иванюк Владимир Григорьевич** // Бульба белорусская : энциклопедия / под общ. ред. И. И. Колядко. – Минск, 2008. – С. 327, 328.

**Иванюк Владимир Григорьевич** // Национальная Академия наук Беларуси : персональный состав. - Минск, 2003. - С. 221–222.

**Владимир Григорьевич Иванюк**, член-корреспондент Национальной академии наук Беларуси, доктор биологических наук, профессор : к 70-летию со дня рождения / [сост. Л. И. Носевич]. – Минск : Равноденствие, 2011. – 55 с. – (Biобиблиография видных деятелей сельско-хозяйственной науки Беларуси).

**75 гадоў з дня нараджэння У. Р. Іванюка (1941)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 11.

**Беларускі** каляндар. 2021 год. Іванюк Уладзімір Рыгоравіч // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. - 2020. - № 9. - С. 6 (дадатак).

**Даты.** Падзеі. Людзі : 23 ліпеня 1941 года // Звязда. - 2016. - 23 ліпеня. – С. 16.

75 гадоў таму нарадзіўся (в. Мяфёдавічы Кобрынскага раёна) У. Р. Іванюк, беларускі вучоны ў галіне аховы раслін, член-карэспандэнт НАН (2003) і Акадэміі аграрных навук Беларусі (1992).

**Владимир Григорьевич Иванюк** (К 70-летию со дня рождения) // Весці НАН Беларусі. - Сер. аграрных навук. - 2011. - № 3.

**Владимир Григорьевич Иванюк** (К 65-летию со дня рождения) // Весці НАН Беларусі. - Сер. аграрных навук. - 2006. - № 3.

**Ильяшенко, Д. А.** Владимир Григорьевич Иванюк : (краткий очерк жизни и деятельности) (23.07.1941–22.05.2009) / Д. А. Ильяшенко // Земляробства і ахова раслін : навукова-практычны часопіс. - 2011. - № 5. - С. 58–59.

# ІЎЧАНКАЎ ВІКТАР ІВАНАВІЧ

**ІЎЧАНКАЎ Віктар Іванавіч** - доктар філалагічных навук, мовазнаўца, заснавальнік беларускай навуковай школы дыскурснага аналізу сродкаў масавай інфармацыі, лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро» (2011). Лінгвіст, педагог, журналіст.



Нарадзіўся 28 чэрвеня 1962 года ў вёсцы Хадынічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Працаваў настаўнікам у Бельскай васьмігадовай школе Кобрынскага раёна (1980–1983).

У 1985 годзе закончыў філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна па спецыяльнасці «Руская мова і літаратура». Працаваў выкладчыкам Брэсцкага дзяржаўнага педінстытута.

У 1988 годзе В. І. Іўчанкаў датэрмінова закончыў аспірантуру пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук БССР. У 1988–1989 гадах быў выкладчыкам кафедры агульнага, славянскага і рускага мовазнаўства Мінскага педагагічнага інстытута. З 1989 года працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, спачатку на пасадзе дацэнта, з 1996 года — загадчыка кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі БДУ.

Сапраўднымі ўніверсітэтамі Віктара Іванавіча сталі рэдакцыі амаль усіх рэспубліканскіх друкаваных СМІ, тэле- і радыёканалаў, дзе на працягу дзевятнаццаці гадоў (1992–2011), выконваючы абавязкі саветніка міністра адукацыі па сувязях са СМІ і грамадскасцю, ён падрыхтаваў тысячы паведамленняў, інтэрв’ю, артыкулаў, радыйных выступленняў, вёў прамыя эфіры на тэлебачанні. Павышаў кваліфікацыю за мяжой: у ЗША (1995), Польшчы (1999), Швецыі (2002, 2007, 2009), Францыі (2003).

В. І. Іўчанкаў - аўтар больш 360 навуковых і метадычных прац, у тым ліку сямі манаграфій. Фундаментальная праца «Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту» (2003) паклала пачатак фарміраванню ў галінах журналістыкі і лінгвістыкі самастойнага навуковага адгалінавання — лінгвістыкі публіцыстычнага тэксту.

В. І. Іўчанкаў - заснавальнік у Беларусі навуковай школы дыскурснага аналізу СМІ.

Віктар Іванавіч вядзе актыўную асветніцкую працу па прапагандзе роднага слова. Змясціў на старонках друку больш 200 публіцыстычных матэрыялаў па праблемах адукацыі, навукі і выхавання. З 1990 года актыўна друкуецца ў прэсе па праблемах правапісу. Займаецца стылістыкай беларускай і рускай моў, лінгвістыкай публіцыстычнага тэксту, рыторыкай.

Асноўныя працы: «Лінгвістычная арганізацыя тэксту. У творчай лабараторыі Уладзіміра Караткевіча», «Лінгвастылістыка тропаў Юрыя Казакова», «Студенческая печать: проблематика, дизайн, язык и стиль» (у суаўтарстве). Аўтар падручніка «Сучасная беларуская мова. Арфаграфія. Графіка. Лексікалогія (фразеалогія). Ч. 1», вучэбнага дапаможніка «Святло слова» (у суаўтарстве), праграм для студэнтаў факультэтаў журналістыкі ВНУ і інш.

Змены ў грамадстве на мяжы XX-XXI стагоддзяў выклікалі дыскусію пра неабходнасць перагляду асобных арфаграфічных норм. Прафесар Іўчанкаў стаў адным з асноўных распрацоўшчыкаў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (2008), а пасля яго прыняцця актыўна тлумачыў палажэнні беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, прапагандаваў у сродках масавай інфармацыі асноўныя змены. «Беларуская арфаграфія ў апорных схемах» В. Іўчанкава вытрымала некалькі выданняў і запатрабавана беларускімі настаўнікамі. Станоўчыя водгукі атрымала па-свойму ўнікальная кніга «Беларуская арфаграфія: апавяданні і гісторыі».

Прафесар Віктар Іўчанкаў распрацоўвае і праблемы медыярыторыкі, чытае адпаведны курс лекцый на выпускным курсе Інстытута журналістыкі БДУ. Навучальны дапаможнік па медыярыторыцы В. Іўчанкава - адзіны ў беларускай вышэйшай школе. Лекцыі прафесара выклікаюць нязменную цікавасць у студэнтаў, бо праходзяць у дыялагічнай форме з выкарыстаннем камп’ютарных тэхналогій.

В. І. Іўчанкаў - член Беларускага саюза журналістаў, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (1999), выдатнік друку Рэспублікі Беларусь (2006), лаўрэат прэміі імя У. Пічэты за цыкл навукова-адукацыйных дапаможнікаў па гісторыі і тэорыі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі (2011), лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў за лепшую журналісцкую работу ў рэспубліканскім творчым конкурсе «Залатое пяро» (2011).

Узнагароды В. І. Іўчанкава: Ганаровая грамата Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку (1996); грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (1998); падзяка Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (1992); прэмія спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2003); Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2008, 2012); Ганаровая грамата Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (2008); Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2012); падзяка Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь (2012).

### *Працы*


**Іўчанкаў, В. І.** Беларуская арфаграфія : апавяданні і гісторыі / В. І. Іўчанкаў. - Мінск : Пачатковая школа, 2010. - 304 с.

**Іўчанкаў, В. І.** Беларускі правапіс у апорных схемах: паводле новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» / В. І. Іўчанкаў. – Мінск : Пачатковая школа, 2010. - 56 с.

**Іўчанкаў, В. І.** Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В. І. Іўчанкаў. - Мінск : БДУ, 2003. -257 с.

**Іўчанкаў, В. І.** Медыярыторыка: рытарычныя асновы журналістыкі, лінгвістыка публіцыстычнага тэксту, дыскурсны аналіз СМІ : курс лекцый / В. І. Іўчанкаў. - Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. - 280 с.

**Ивченков, В. И.** Лингвистика речи: ретроспекция стилистического опыта / В. И. Ивченков // Лингвистика речи. Медиастилистика: монография, посвященная 80-летию профессора Г. Я. Солганика. - М., 2012. - С. 132-139.

**Ивченков, В. И.** Лингвистическая организация текста: В творческой лаборатории Владимира Короткевича / В. И. Ивченков. - Минск : БГУ, 2002. - 211 с.

**Іўчанкаў, В. І.** Вобразнае параўнанне ў творах Уладзіміра Караткевіча : лінгвістычныя назіранні / В. І. Іўчанкаў // Народная асвета. - 2020. - № 10. – С. 81-83.

**Іўчанкаў, В.** Беларускі правапіс ў апорных схемах : новае ў правапісе / Віктар Іўчанкаў // Роднае слова. – 2010. - № 5-12.

**Іўчанкаў, В. І.** Беларускі правапіс: гісторыя і сучаснасць / В. І. Іўчанкаў // Беларускі гістарычны часопіс. - 2009. - № 7. - С. 36–41.


### *Аб жыцці і дзейнасці*


**Зеленко, С. В**. Ивченков Виктор Иванович // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск, 2006. - Т. 3. - С. 706-707.

**Ивченков Виктор Иванович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 425.

**Іўчанкаў Віктар Іванавіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. - Мінск, 2012. - Т. 4. - С. 229.

**Іўчанкаў Віктар Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 435 : фота. - (Імі ганарацца землякі).

**55 гадоў** з дня нараджэння В. І. Іўчанкава (1962) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 38.

**Іўчанкаў Віктар Іванавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 54-57.

**Жаўняровіч, П.** Будучыня за ёмкім і мабільным словам : Да 55-годдзя Віктара Іўчанкава / Пятро Жаўняровіч // Роднае слова. – 2017. - № 7. – С. 29-30.

**Курачук, С.** Лінгвіст, сацыёлаг, журналіст / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. – 2017. – 20 верасня. – С. 5.

У рамках праекта «Людзі навукі нашага краю» – артыкул пра доктара філалагічных навук, прафесара, лінгвіста, педагога, журналіста В. І. Іўчанкава.

**Іўчанкаў, В.** «Няхай асвятляе жыццёвы шлях вечная крыніца натхнення!» / Віктар Іўчанкаў // Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 ліпеня. – С. 9.

Віншаванне доктара філалагічных навук, прафесара В. Іўчанкава з Днём вызвалення г. Кобрына.

**Іўчанкаў, В. І**. «Слова стала самым дарагім і каштоўным прадуктам …» / [В. І. Іўчанкаў; гутарыла] Зоя Падліпская // Роднае слова. - 2012. - № 7. - С. 26-28.

**Беларускі каляндар.** 2011 год. Іўчанкаў Віктар Іванавіч **//** Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. - 2011. - № 9. - С. 4 (дадатак).

**Ивченков**, **Виктор Иванович** [Электронный ресурс] // База данных Ученые Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/scient - . – Дата доступа: 05.10.2018.

# КАБАТА ЗБІГНЕЎ

**КАБАТА Збігнеў** (1924-2014) - брытанскі і канадскі паразітолаг, доктар біялагічных і філасофскіх навук, ганаровы член Паразіталагічнага грамадства.



Нарадзіўся 17 сакавіка 1924 года ў вёсцы Яромічы Кобрынскага павета (цяпер Кобрынскага раёна) у сям'і афіцэра. Выпускнік гімназіі г. Кобрына.

У 1937 годзе ва ўзросце 13 гадоў Збігнеў паступіў у Кадэцкую ваенную акадэмію імя маршала Пілсудскага ў г. Львове, але не паспеў закончыць яе ў сувязі з пачаткам Другой сусветнай вайны. У 1939 годзе Кабата далучыўся да руху Супраціву.

У 1945 годзе ён апынуўся спачатку ў Італіі, дзе далучыўся да Другога корпуса Арміі Краёвай. У 1946 годзе разам са сваім корпусам быў перамешчаны ў Вялікабрытанію, дзе пасля заканчэння шасцімесячных курсаў рыбакоў працаваў на камерцыйных рыбалоўных судах у Паўночным моры. Збігнеў палюбіў мора і стаў паспяховым студэнтам у вобласці марской біялогіі. Атрымаў доктарскую ступень ва Універсітэце Абярдзіна (Шатландыя), абараніў доктарскую навуковую працу «Паразіталогія марскіх рыб». Там жа ён сустрэў сваю будучую жонку Mary Montgomery, у шлюбе з якой нарадзіліся дачка і сын будучага навукоўца.

Пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў у марской лабараторыі Шатландскага аддзела сельскай гаспадаркі і рыбалоўства ў Абярдзіне. У 1966 годзе З. Кабату прысвоена званне доктара біялагічных і філасофскіх навук.

Кабата прысвяціў больш 50 гадоў працы па сістэматыцы і цыклах паразітычных капепод. Як прызнанне заслуг Кабаты, яго імем названа некалькі дзясяткаў марскіх істот.

На працягу 15 гадоў Збігнеў Кабата быў членам Міжнароднай камісіі па заалагічнай наменклатуры. У 1984 годзе ён стаў прэзідэнтам-заснавальнікам Міжнароднай асацыяцыі капепадалогаў. Чытаў лекцыі ва ўніверсітэтах Вялікабрытаніі, Аўстраліі, Індыі.

Апублікаваў шмат навуковых прац. Яго фундаментальная праца «Parasitic Copepoda of British Fishes» (Ray Society Publications, 1979) утрымоўвае больш 2000 арыгінальных, праўдзіва мастацкіх і заалагічна падрабязных малюнкаў паразітычных ракаў. Іншыя яго вядомыя кнігі: «Copepods Parasitic on Fishes: Keys and Notes for Identification of the Species (Synopses of the British fauna)» (Backhuys Publishers, 1992) і «Parasites and Diseases of fishes cultured in the tropics» (Taylor & Francis, 1985) і каля 150 артыкулаў у навуковых часопісах таксама запатрабаваны навуковай супольнасцю.

Сумесна з Л. Марголісам Збігнеў Кабата распрацаваў дыягностыку статкаў прамысловых рыб з выкарыстаннем выглядаў паразітаў як маркераў. Гэтым быў адкрыты новы кірунак у менеджменце біярэсурсаў мора, які паспяхова развіваецца ў нашы дні. Важнай заслугай Кабаты былі пераклады рускай паразіталагічнай літаратуры і іх папулярызацыя сярод маладых англамоўных паразітолагаў. Адзін з вучняў Збігнева прафесар Geoffrey Boxshall казаў, што ён быў выгадаваны на працах рускіх паразітолагаў і Кабаты.

З. Кабата адзначаны шматлікімі медалямі за прафесійную і грамадскую дзейнасць, сярод якіх узнагароды Канадскага грамадства заолагаў, Польскага паразіталагічнага грамадства. Ён быў выбраны ганаровым прэзідэнтам Кангрэсу паразітолагаў у Ванкуверы ў 2002 годзе, а ў 2003 годзе ўдастоены Прыза выдатнага паразітолага (Eminent Parasitologist Award) Амерыканскага грамадства паразітолагаў.

Раней, у 1996 годзе, навукоўцу быў уручаны Вялікі крыж Ордэна Адраджэння Польшчы (Grand Commander Cross of Polonia Restituta) і прысвоена званне Ганаровага доктара сельскагаспадарчага ўніверсітэта ў Шчэціне. У 1995 годзе Кабата быў аднагалосна абраны ганаровым членам Паразіталагічнага грамадства пры Расійскай акадэміі навук (цяпер Міжрэгіянальная грамадская арганізацыя Паразіталагічнага грамадства). Збігнеў быў членам рэдкалегій міжнародных паразіталагічных часопісаў.

4 ліпеня 2014 года Збігнеў Кабата пайшоў з жыцця.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Кабата Збігнеў** // Самая «першая» : інфармацыйна - бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 25-26. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Доктор** Збигнев Кабата // Паразитология. – 2015. – Т. 49. В. 1. – С. 72-74. – Паразитологическое общество.

**95 гадоў** з дня нараджэння З. Кабаты // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны: краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 98.

**Кабата Збігнеў** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 57-58.

# КАЗЛОЎ ЛЕЎ РАМАНАВІЧ

**КАЗЛОЎ Леў Раманавіч** - беларускі гісторык, картограф, выдавец, пісьменнік.



Нарадзіўся 28 ліпеня 1938 года ў вёсцы Літвінкі Кобрынскага павета Палескага ваяводства (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Вялікая Айчынная вайна застала сям'ю ў Пінску, пасля вайны жылі ў Кобрыне. У школу Леў пайшоў у 1946 годзе, у школьныя гады любіў чытаць, захапляўся маляваннем, гісторыяй. У 1956 годзе закончыў СШ № 2 г. Кобрына.

Служыў у Савецкай арміі ваенным картографам (1957–1960).

У 1965 годзе закончыў гісторыка-геаграфічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, затым там жа навучаўся ў аспірантуры (1965–1968), працаваў выкладчыкам.

У 1970 годзе Л. Р. Казлоў абараніў кандыдацкую дысертацыю «Рост культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа Беларусі ў гады першай пяцігодкі (1928–1932 гг.)» і атрымаў навуковую ступень кандыдата гістарычных навук. У 1970–1981 гадах – старшы выкладчык, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі МДПІ імя А. М. Горкага. У 1981–1992 гадах – прафесар кафедры гісторыі Беларусі і замежных краін, дэкан факультэта замежных студэнтаў Мінскага інстытута культуры.

З 1992 па 1994 год – старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных дысцыплін, кіраўнік картаграфічнай групы Інстытута гісторыіі АН Беларусі. Л. Р. Казлоў арганізаваў работу па складанні новых гістарычных карт і школьных атласаў. Навуковыя інтарэсы: гістарычная геаграфія і картаграфія Беларусі (ад старажтынасці да нашых дзён). Удзельнік шэрагу міжнародных і рэгіянальных навуковых канферэнцый, аўтар артыкулаў па краязнаўчай і картаграфічнай тэматыцы.

Узнаўляць карты – своеасаблівае мастацтва. Картограф Леў Раманавіч працуе ў старадаўняй манеры: аловак, цыркуль, пяро, туш, акварэль. Аднаўляе рарытэтныя карты, якія адшуквае ў розных архівах, бібліятэках, на аўкцыёнах і ў прыватных калекцыянераў. Так з'явіліся дзясяткі невядомых нам раней выяў беларускіх земляў са старажытнасці. Некаторыя карты, намаляваныя Л. Р. Казловым, упрыгожваюць раённыя краязнаўчыя музеі. Рабіў і глобусы для музейных экспазіцый. У Картаграфічным кабінеце Музея гісторыі Мінска, які знаходзіцца ў гарадской ратушы, большасць экспанатаў выкананы рукамі Льва Раманавіча.

Чалавек энцыклапедычных ведаў у розных галінах. Як многія з гісторыкаў – нумізмат, сабраў вялікую калекцыю манет. Захапляецца гістарычнай мастацкай літаратурай, мае выдатную бібліятэку. У 1983 годзе выйшаў яго зборнік гістарычных анекдотаў «Музей остроумия», які быў двойчы перавыдадзены (1986, 1989), а ў 1999 годзе з'явілася новае дапоўненае выданне – «Большой музей остроумия». Аўтар мастацкіх кніг «Георг Кристоф Лихтенберг» (2002), «Радзивилл "Сиротка» (2015), «З дазволу караля і вялікага князя» (2016) і інш. Пад псеўданімам «Плат. Гудовіч» выдаў зборнік вершаў «Размова нанова» (2017).

Леў Раманавіч не забывае родную Кобрыншчыну. У суаўтарстве з дырэктарам Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава Нінай Мяфодзіеўнай Пліско да 700-годдзя Кобрына выдаў гісторыка-эканамічны нарыс «Кобрин» (1987). У якасці рэдактара-ўкладальніка працаваў над гісторыка-дакументальнай хронікай «Память. Кобрынскі раён» (2002).

У 1994 годзе Л. Р. Казлоў, не дачакаўшыся бюджэтнага фінансавання выдання карт, заснаваў і ўзначаліў прыватнае выдавецтва – УП «Арты-Фэкс», якое займаецца выданнем геаграфічных карт і атласаў. Работа яго выдавецтва «Арты-Фэкс» адзначана еўрапейскім залатым прызам «Europe Award» (Парыж, 2001). З 1995 года – галоўны рэдактар «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі», часопісаў «Падарожнік» (1997–2001), «Наш край». Навуковы кансультант выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі». Член Саюза прадпрымальнікаў Беларусі, Нацыянальнай Геаграфічнай Асацыяцыі (ЗША), міжнароднага «Клуба лідэраў гандлю».

У зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў ліпені–жніўні 2018 года працавала выстава «Вандроўкі па ваколіцах мінулага», прысвечаная 80-годдзю Л. Р. Казлова. Пазней, з 14 верасня, юбілейная выстаўка дзейнічала ў Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Усе прадстаўленыя на выстаўцы матэрыялы юбіляр падараваў цэнтральнай бібліятэцы і яе чытачам, за што бібліятэкары вельмі ўдзячны знакамітаму земляку.

Калегі ахрысцілі Льва Раманавіча беларускім Меркатарам (у гонар фламандскага картографа XVI ст. Герарда Меркатара). Дарэчы, Л. Р. Казлоў упэўнены, што карты могуць расказаць нават больш, чым летапісы, гістарычныя дакументы і мемуары.

### *Працы*

**Гудовіч, П.** Размова нанова : выбраныя вершы / Плат. Гудовіч. – Мінск : Галіяфы, 2017. – 48 с.

**Казлоў, Л. Р.** «Афіцына Блавіяна»: з сярэднявечча – у новы час / Л. Р. Казлоў. – Мінск, 2014. – 16 с.

**Казлоў, Л. Р**. Беларусь у працах польскіх картографаў (XVI–XX стст.) / Л. Р. Казлоў. – Мінск : Арты-Фэкс, 2004. – 115 с. – (Беларусь на старажытных картах).

**Казлоў, Л. Р**. З дазволу караля і вялікага князя : [зборнік гістарычных анекдотаў] / Леў Раманавіч Казлоў. - Мінск : Полымя , 1992. - 109, [3] с.

**Казлоў, Л. Р.** Картаграфія Беларусі падчас паўстання 1863-1864 гг. / Л. Р. Казлоў. - Мінск, 2003. - [16] с.

**Казлоў, Л. Р.** Картаграфія Беларусі падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі / Л. Р. Казлоў. - Мінск : [б. в.], 2004. - 15, [2] с.

**Казлоў, Л. Р**. Карэліцкі край на старажытных картах (XVI-XIX ст.) / Л. Р. Казлоў. – Мінск : Арты-Фэкс, 2008. – 9, [3] с.

**Козлов, Л. Р**. Белорусское Полесье на старинных картах / Л. Р. Козлов. – Москва : [б. и.], 2008. – 22, [2] с.

**Козлов, Л. Р.** Большой музей остроумия : исторические анекдоты / Л. Р. Козлов. – Минск : Арти-Фекс, 1999. – 619 с.

**Козлов, Л. Р.** Музей остроумия / Л. Р. Козлов. - Минск : Полымя, 1983. – 222 с. : ил.

**Козлов, Л. Р**. Радзивилл «Сиротка» : историческая трилогия : Кн. 1 : Наследник по мечу / Л. Р. Козлов. – Минск : Альтиора – Живые краски, 2015. – 183 с.

**Козлов, Л. Р.** Старажытная картаграфія Беларусі : атлас : [у 3 вып.] / Л. Р. Козлов. – Мінск : Арты-Фэкс, 2005–2009. – (Старажытная картаграфія Беларусі).

**Козлов, Л. Р**. Рост культурно-технического уровня рабочего класса Белоруссии в годы первой пятилетки (19281932 гг.) : автореферат диссертации ... кандидата исторических наук / Л. Р. Козлов. – Минск, 1969. – 22 с.

**Плиско, Н. М.** Кобрин : историко-экономический очерк / Н. М. Плиско, Л. Р. Козлов. – Минск : «Полымя», 1987. – 95 с.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Казлоў Леў Раманавіч** // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. - 2-е выд. - Мінск, 2007. - Т. 2. - С. 15.

**Казлоў Леў Раманавіч** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. - С. 10-11.

**Казлоў Леў Раманавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 436. – (Імі ганарацца землякі).

**Казлоў Леў Раманавіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. - С. 262.

**Козлов Лев Романович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская обл. : в 2-х кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 488.

**Козлов Лев Романович** // Кто есть кто в Республике Беларусь. Люди дела. - Минск : Энциклопедикс, 1999. - С. 65.

**Корзенко, Г. В.** Козлов Лев Романович / Г. В. Корзенко // Историки Беларуси в начале XXI столетия : библиограф. справ. / Г. В. Корзенко. – Минск, 2007. – С. 173-174.

**80 гадоў** з дня нараджэння Л. Р. Казлова (1938) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. - С. 67-68.

**Бакун, А.** Вывучаць мінулае, каб будаваць будучыню / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. - 31 кастрычніка. – С. 8.

Пра сустрэчу ў Кобрынскай раённай бібліятэцы з гісторыкам, картографам Л. Р. Казловым.

**Бакун, А**. Вандроўкі з земляком-картографам / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. - 26 верасня. - С. 5.

Пра Л. Р. Казлова, картографа, гісторыка і літаратара.

**Декола, Н.** Белорусский Меркатор : минчанин Лев Козлов воссоздает раритетные карты / Надежда Декола // Советская Белоруссия. - 2018. - 7 июля (№ 128). - С. 11.

**Козлов, Л. Р.** «Белорусские земли на картах мира были ещё при Птолемее» / [Л. Р. Козлов ; беседовала] Надежда Белохвостик // Комсомольская правда. - 2009. – 4 марта.

# КАЗЮК МІКАЛАЙ ВАСІЛЬЕВІЧ

**КАЗЮК Мікалай Васільевіч** (1898–1979) – дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава з 1937 по 1938 год, партыйны дзеяч, загадчык аддзела друку і выдавецтва ЦК КП(б)Беларусі, галоўны рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР пры Народным камісарыяце асветы БССР.



Нарадзіўся ў вёсцы Корчыцы Кобрынскага павета Гродзенскай губерніі (цяпер в. Корчыцы Кобрынскага раёна) у беднай сялянскай сям'і. Усеагульная галеча не дазволіла юнаку атрымаць першапачатковую адукацыю. Мікалай вучыўся грамаце ад дарослых людзей, а потым тры зімы хадзіў у школу.

М. Казюк прайшоў шлях ад чорнарабочага друкарні «Думка друкара» да студэнта рабфака Маскоўскага ўніверсітэта і аспіранта Камуністычнага інстытута журналістыкі.

У Першую сусветную вайну М. Казюк трапіў у Расію. Быў добраахвотнікам Чырвонай арміі, закончыў рабфак, потым - інстытут журналістыкі, аспірантуру.

Працаваў у расійскіх выданнях «Рабочая Москва» і «Деревенский коммунист», у ЦК ВКП(б) інструктарам і ў аддзеле друку.

У 1931 годзе ў Цэнтральным выдавецтве народаў СССР у Маскве выйшла брашура М. Казюка «Другая бальшавіцкая вясна».

У 1936 годзе Казюк быў пераведзены на працу ў ЦК КП(б) Беларусі на пасаду загадчыка аддзела друку і выдавецтваў. Мікалай Казюк быў першым у спісе дэлегацыі, якая ўручала ў 1936 годзе Сталіну на з'ездзе Саветаў у Маскве знакамітае «Письмо белорусского народа Великому Сталину».

У лістападзе 1937 года Мікалай Васільевіч прызначаны дырэктарам Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі.

2 кастрычніка 1937 года Бюро ЦК КП(б)Б разгледзела справу М. Казюка і за «притупление политической бдительности к врагам народа Поссе и др., выразившееся в неразоблачении их, будучи в близких отношениях с ними», абвясціла яму вымову з унясеннем у асабістую справу. Захавалася стэнаграма пасяджэння, у якой сцвярджалася, што па прапанове наркама НКУС Бермана матэрыялы пра Казюка былі перададзены ў органы НКУС для далейшага расследавання. М. Казюк апелюе ў Камісію партыйнага кантролю пры ЦК ВКП(б), якая 10 красавіка 1938 года вымову зняла.

28 ліпеня 1938 года Мікалая Казюка арыштавалі па абвінавачванні ў прыналежнасці да контррэвалюцыйнай арганізацыі. Абвінавачванне не пацвердзілася, і 8 сакавіка 1939 года М. Казюк быў вызвалены. Але на ранейшай пасадзе ён не застаўся. У даведніку «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт: 70 гадоў. 1933-2003», якi выдадзены ў Мінску ў 2003 годзе, сцвярджаецца, што далейшы лёс М. Казюка невядомы.

Але, як вядома з архіваў, Мікалай Казюк не стаў ахвярай палітычных рэпрэсій. Ён нікуды не выязджаў з Мінска, працаваў галоўным рэдактарам дзяржвыдавецтва аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў БССР. Сустракаўся з Я. Коласам, Я. Купалам, Ц. Гартным, М. Лыньковым і іншымі беларускімі пісьменнікамі. Даводзілася Мікалаю Васільевічу пісаць рэцэнзіі на мастацкія творы, хоць гэта і не быў яго профіль працы. Нягледзячы на арышт і страту ганаровай пасады, Мікалай Казюк працягваў жыць і працаваць.

З першых дзён нашэсця фашысцкіх войскаў М. Казюк ваюе на подступах да Смаленска. У адным з баёў быў цяжка паранены, кантужаны і адпраўлены ў шпіталь за Маскву. У снежні 1941 года яго накіравалі начальнікам палітаддзела Залесаўскай МТС Арэнбургскай вобласці. Сельскія працаўнікі вырошчвалі хлеб, усе сілы аддавалі фронту. У 1943 годзе Казюка зноў залічылі ў армію, але загадам Галоўнага палітупраўлення арміі ён атрымаў прызначэнне на выкладчыцкую працу ў Ваенна-паветраную акадэмію, якая зараз носіць імя Ю. А. Гагарына. Калі вораг падыходзіў да Масквы, акадэмія перабазіравалася ў горад Чкалаў, куды Мікалай Васільевіч прыбыў і адразу ж прыступіў да распрацоўкі лекцый па марксізму-ленінізму, гісторыі партыі. У маі 1944 года акадэмія пераехала на сваё ранейшае месца - у мястэчка Моніна пад Масквой. У 1947 годзе ў лекцыйнай зале сярод слухачоў Мікалая Васільевіча лічылася 208 Герояў Савецкага Саюза, 20 - двойчы Герояў і тройчы - адзін (Іван Кажадуб).

У акадэміі ішла інтэнсіўная падрыхтоўка лётчыкаў, здольных штурмаваць космас. Слухачамі Мікалая Васільевіча Казюка былі таленавітыя лётчыкі Георгій Берагавы і Уладзімір Шаталаў, якія паспяхова закончылі Ваенна-паветраную акадэмію ў 1956 годзе, і іншыя будучыя касманаўты. Нярэдка выступаў ён і ў Зорным гарадку касманаўтаў, які знаходзіўся зусім блізка. Мікалай Казюк прайшоў у акадэміі шлях ад маёра да палкоўніка.



У 1961 годзе Мікалай Васільевіч сышоў у адстаўку. Але і будучы ваенным пенсіянерам, чытаў лекцыі ў вячэрніх універсітэтах пры Нагінскім і Шалкоўскім гаркамах партыі, у Доме афіцэраў, школах.

Узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Мікалай Васільевіч Казюк памёр у верасні 1979 года, пахаваны ў мястэчку Моніна, недалёка ад Зорнага гарадка.

М. В. Казюк ніколі не парываў сувязі з роднай Беларуссю. У пасляваенныя гады ён прыязджаў у Мінск, дзе жылі яго блізкія сваякі, дзе ў розныя часы ў Інстытуце народнай

гаспадаркі вучыліся яго дачка Генрыета і ўнучка Лена. Бацька Мікалая Казюка Васіль Андрэевіч, вясковы пастух, падчас Вялікай Айчыннай вайны быў расстраляны ў г. Кобрыне. Пахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Вялікія Лепясы.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**120 гадоў** з дня нараджэння М. В. Казюка (1898) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 68.

**Казюк Мікалай Васільевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 60-63.

**Корнилович, Э.** Воспитывал летчиков и космонавтов / Эдуард Корнилович // Кобрынскі веснік. – 2010. - 3 сакавіка. – С. 8.

Судьба нашего земляка (уроженца д. Корчицы) ректора Белорусского Государственного университета Николая Васильевича Казюка.

**Рублевская, Л.** Архивный детектив / Л. Рублевская // Советская Белоруссия. - 2009. - 24 января. - С. 16-17.

О Николае Казюке, выходце из д. Корчицы, был директором БИНХ.

**Рублевская, Л**. Мистика из табакерки / Л. Рублевская // Советская Белоруссия. - 2008. - 26 ноября. - С. 12-13.

О судьбе Николая Казюка, уроженца д. Корчицы Кобринского уезда, занимавшего высокие должности в ЦК КП(б) Беларуси.

**Корнилович, Э. А.** Он жил и мыслил без оглядки / Эдуард Александрович Корнилович // Кобрынскі веснік. – 1984. – 30 лістапада. – С. 3.

О жизни и деятельности ректора Белорусского государственного экономического университета Н. В. Казюка (уроженца д. Корчицы).

**История** университета. Казюк Николай Васильевич [Электронный ресурс] // Белорусский государственный экономический университет. - Режим доступа: http://bseu.by /belarusian/general/history_htm. – Дата доступа: 17.10.2017.

# КАРПУК АНДРЭЙ АНДРЭЕВІЧ

**КАРПУК Андрэй Андрэевіч** (1944-2012) - беларускі матэматык, кандыдат фізіка-матэматычных навук (1974), прафесар (1993).



Нарадзіўся 24 верасня 1944 года ў вёсцы Акцябр Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Акцябрскую 7-гадовую школу, затым Гарадзецкую сярэднюю школу. Ён быў заўсёды душой калектыву, з дзяцінства любіў матэматыку і ахвотна дапамагаў таварышам выконваць хатнія заданні па матэматыцы.

У 1966 годзе Андрэй Карпук закончыў Брэсцкі педагагічны інстытут, фізіка-матэматычны факультэт. Нягледзячы на напружаную вучобу, знаходзіў час для заняткаў спортам (гуляў за зборную каманду ВНУ па футболе, гандболе, валейболе), паездкі ў складзе студэнцкіх атрадаў на цалінныя будоўлі (менавіта тады А. А. Карпук быў узнагароджаны медалём «За асваенне цалінных земляў»).

З 1967 года А. А. Карпук - выкладчык Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута, з 1972 года - выкладчык Беларускага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Закончыў аспірантуру Інстытута матэматыкі АН БССР. У 1974 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1975 годзе становіцца дацэнтам кафедры вышэйшай матэматыкі, у 1993 годзе - прафесарам.

Напісаў шмат навуковых прац па матэматыцы і фізіцы. Аўтар падручнікаў і дапаможнікаў для ВНУ.

Андрэй Андрэевіч Карпук памёр у верасні 2012 года.

***Працы***

**Карпук, А. А**. Высшая математика. Операционное исчисление. Теория вероятностей. Математическая статистика. Случайные процессы : учебное пособие для вузов / Андрей Андреевич Карпук, Ростислав Михайлович Жевняк. – Минск : Обозрение, 1997. - 445 с.

**Карпук, А. А**. Высшая математика для технических университетов. Введение в математический анализ / Андрей Андреевич Карпук. – Минск : Обозрение, 1997. - 571 с.

**Карпук, А. А.** Высшая математика : учебник для технич. университетов / А. А. Карпук . –Минск : АСТ, 2008. – 288 с.

**Карпук, А. А.** Высшая математика для технических университетов. Интегральное исчисление функций многих переменных : учеб. пособие. – Минск : Харвест, 2008. - 271 с.

**Карпук, А. А.** Высшая математика для технических университетов. Линейная алгебра / Андрей Андреевич Карпук, Олег Федорович Борисенко. - Минск : Харвест , 2012 .- 223 с. .- ил.

**Карпук, А. А.** Математика для поступающих в вузы / Андрей Андреевич Карпук, Ростислав Михайлович Жевняк. - Минск : Обозрение , 1996 .- 375, [9] с.

**Карпук, А. А**. Сборник задач по специальным главам высшей математики / А. А. Карпук, Р. М. Жевняк. – Минск : Харвест, 2007. – 112 с.

**Борисенко, О. Ф**. Высшая математика для технических университетов. Аналитическая геометрия / Олег Федорович Борисенко, Андрей Андреевич Карпук. - Минск : Харвест , 2012 .- 200, [1] с. .- ил.

**Борисенко, О. Ф**. Высшая математика для технических университетов. Дифференциальные уравнения / Олег Федорович Борисенко, Валентин Федорович Бондаренко, Андрей Андреевич Карпук. – Минск : Харвест, [2010]. - 303 с.

**Высшая** математика : контрольные задания для студ. радиотех. спец. заоч. формы обуч. / сост. А. А. Карпук, О. А. Феденя. – 3-е изд. перераб. и доп. – Минск : БГУИР, 2008. – 36 с.

**Жевняк, Р. М.** Высшая математика : учебное пособие для студентов втузов / Ростислав Михайлович Жевняк, Андрей Андреевич Карпук. - Минск : Вышэйшая школа , 1984 . - Ч. 1 - 221, [2] с. .- ил.

**Жевняк, Р. М.** Высшая математика :учебное пособие для студентов втузов / Ростислав Михайлович Жевняк, Андрей Андреевич Карпук. - Минск : Вышэйшая школа , 1988. - Ч. V. - 252, [1] с. .- ил.

**Жевняк, Р. М.** Высшая математика: основы аналитической геометрии и линейной алгебры, введение в анализ, дифференциальное исчисление функций одной переменной : учебник для студентов высших технических учебных заведений / Ростислав Михайлович Жевняк, Андрей Андреевич Карпук. – Минск : Вышэйшая школа, 1992. – .- 382, [2] с. .- ил.

**Жевняк, Р. М.** Высшая математика: функции многих переменных, интегральное исчисление функций одной и многих переменных, векторный анализ : учебник для студентов высших технических учебных заведений / Ростислав Михайлович Жевняк, Андрей Андреевич Карпук. – Минск : Вышэйшая школа, 1993. – 410, [1] с. .- ил.

**Жевняк, Р. М.** Дифференциальные уравнения, ряды, уравнения математической физики, теория функций комплексной переменной : учебное пособие для вузов / Ростислав Михайлович Жевняк, Андрей Андреевич Карпук. – Минск : Обозрение, 1997. - 571 с.

**Жевняк, Р. М.** Теория вероятностей и математическая статистика : учеб. пособие / Р. М. Жевняк, А. А. Карпук, В. Т. Унукович. - Минск : Харвест, 2000. – 384 с.

**Общий** курс высшей математики : учебное пособие для студентов экономических специальностей высших учебных заведений / А. А. Карпук [и др.]. – Орша : Оршанская типография, 1996. – 317 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Карпук Андрэй Андрэевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 97.

**Барбосова, А.** Они были первыми : БГУИР в лицах и фактах / Анастасия Барбосова // Импульс. - 2013. - 31 мая (№ 9).

**Карпук Андрей Андреевич** : из воспоминаний жительницы д. Октябрь Кирилюк Марии Андреевны. – Октябрь, 2019.

# КАСАЧУК ВАСІЛІЙ СЦЯПАНАВІЧ

**КАСАЧУК Васілій Сцяпанавіч** - канструктар, адзін з арганізатараў комплекснай наладкі ЭВМ ЕС-1020, ЕС-1022, бартавых вылічальных комплексаў спецыяльнага прызначэння, сродкаў аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў.



Нарадзіўся Васілій Касачук 16 сакавіка 1951 года ў вёсцы Стрыі Кобрынскага раёна. Вучыўся ў Мінянскай школе.

У 1972 годзе Васілій Касачук закончыў Львоўскі політэхнічны інстытут.

З 1972 года ён працуе на Брэсцкім электрамеханічным заводзе, з 1978 года - начальнікам лабараторыі.

З 1996 года Васілій Сцяпанавіч працуе ў ТАА «БЕЛФОРТ».

В. С. Касачук – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР 1981 года ў вобласці тэхнікі. Прэмія прысуджана за ўкараненне вылічальнай тэхнікі ў вытворчыя тэхналогіі.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Косачук Василий Степанович** // Республика Беларусь: энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск, 2007. – Т. 4. – С. 234.

**Баландин, К. И.** Косачук Василий Степанович / Константин Иванович Баландин // Уроженцы Беларуси – лауреаты Нобелевской, Демидовской, Ленинской и Государственной премий СССР / Константин Иванович Баландин : пособие. – Минск, 2017. – С. 87.

**Касачук Васілій Сцяпанавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 151 : фат.

**Касачук Васілій Сцяпанавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 63 : фат.

**Этот** день в истории: 16 марта 1951 г. // Советская Белоруссия. - 2016. - 16 марта. – С. 16.

О Василии Косачуке, конструкторе, уроженце д. Стрии.

**История** предприятия. 1981 г. [Электронный ресурс] // Брестский электромеханический завод. – Режим доступа: http://www.bemzbrest.by/ru/ about/history/216-workshistory.html. – Дата доступа: 17.10.2018.

# КАСТКО УЛАДЗІМІР СЯМЁНАВІЧ



**КАСТКО Уладзімір Сямёнавіч** - кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Брэсцкага педагагічнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна.

Нарадзіўся Уладзімір Кастко ў вёсцы Яромічы Кобрынскага раёна. Пасля заканчэння Мінянскай СШ у 1965 годзе паступіў у Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна, які закончыў у 1972 годзе па спецыяльнасці «фізіка». Застаўся працаваць на кафедры. Пасля службы ў арміі паступіў у вочную аспірантуру (інстытут паўправаднікоў АН УССР) у Кіеве.

Уладзімір Сямёнавіч працуе ў Брэсцкім педінстытуце (цяпер Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт), якому аддаў больш 30 гадоў навуковай працы, заслужыўшы прызнанне калег і студэнтаў. Чытае курсы «Физика атома и атомных явлений», «Физика атомного ядра и элементарных частиц», «Квантовая физика», «Спецкурс по ФТТ». З'яўляецца кваліфікаваным спецыялістам у галіне атамнай, ядзернай фізікі і фізікі паўправаднікой і дыэлектрыкаў.

Уладзімір Сямёнавіч займаецца навуковымі даследаваннямі ў вобласці нанатэхналогій, валодае шэрагам патэнтаў у гэтай сферы. Аўтар і суаўтар каля 180 навуковых і навукова-метадычных прац, у тым ліку пяці запатэнтаваных вынаходніцтваў.

У. С. Кастко прымаў удзел у міжнародных выставах інавацыйных распрацовак. Дзве навуковыя распрацоўкі «Способ получения позитивного или негативного изображения на бессеребряных светочувствительных слоях» і «Способ нанесения рельефного изображения на диэлектрическую подложку» на IX Маскоўскім міжнародным салоне інавацый і інвестыцый узнагароджаны залатым і бронзавым медалямі.

У 2010 годзе Уладзімір Сямёнавіч прыняў удзел у Мінскім Тыдні навукі і тэхнікі, арганізаваным кітайскімі фундатарамі, дзе праекты брэсцкага фізіка спадабаліся прадпрымальнікам з КНР.

На працягу шматлікіх гадоў У. С. Кастко з'яўляецца навуковым сакратаром Савета ўніверсітэта.

### *Аб жыцці і дзейнасці*


**Кастко Уладзімір Сямёнавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 436. – (Імі ганарацца землякі).

**Волков, С.** С днем рождения альма-матер! / Сергей Волков // Заря. – 2010. – 30 октября. – С. 2.

На IX Московском международном салоне инноваций и инвестиций разработки доцента кафедры общей физики Владимира Семеновича Костко награждены золотой и бронзовой медалями.

**Кастко Уладзімір Сямёнавіч** : інфармацыя Мінянскай публічнай бібліятэкі. – Мінянка, 2010.

**Імі ганарацца** землякі. **Кастко** Уладзімір Сяменавіч [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: https://ikobrin.by/kobrin-139.php. – Дата доступу: 31.08.2017.

**Брестскому** государственному университету имени А. С. Пушкина – 65! [Электронный ресурс] // Виртуальный Брест. – Режим доступа: http://virtualbrest.by/news7402.php. – Дата доступа: 05.09.2017.

**Костко Владимир Семёнович** [Электронный ресурс] // Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина. – Режим доступа: http://www.brsu.by/div/kostko-vladimir-semyonovich. – Дата доступа: 05.09.2018.

# КАТОВІЧ ІВАН (ІААН) АНТОНАВІЧ



**КАТОВІЧ Іван (Іаан) Антонавіч** (1839-1911) – вядомы праваслаўны царкоўны дзеяч, гісторык, публіцыст, журналіст, фалькларыст. Магістр багаслоўя (1873).

Іван Катовіч, старэйшы сын протаіерэя Антонія Ануфрыевіча Катовіча, нарадзіўся ў 1839 годзе ў вёсцы Чаравачыцы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (сёння Чаравачыцы Кобрынскага раёна).

Прадстаўнік святарскага роду, Іван Катовіч атрымаў бліскучую адукацыю - закончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію. Навуковую працу ён пачаў значна раней - яшчэ падчас вучобы ў Кобрынскім духоўным вучылішчы і Літоўскай духоўнай семінарыі. Першыя друкаваныя працы, якія выйшлі з-пад яго пяра, убачылі свет напачатку 1860-х гадоў.

У 1861 годзе І. Катовіч заняў пасаду настаўніка ў Кобрынскім духоўным вучылішчы, пачаў друкавацца ў газеце «Дух христианина», рэдактар якой А. Гумілеўскі настойліва рэкамендаваў яму для працягу адукацыі ехаць у Пецярбургскую духоўную акадэмію. Ужо раней талент і розум І. Катовіча былі заўважаны мітрапалітам Іосіфам Сямашкам. 5 снежня 1863 года І. Катовіча без экзаменаў залічылі ў Духоўную акадэмію.

Закончыўшы акадэмію, у 1867 годзе І. Катовіч прыязджае ў Вільню, дзе на працягу года працуе ў Публічнай бібліятэцы, чакаючы адкрыцця штата ў найстаражытнейшым Віленскім саборы Нараджэння Багародзіцы. 2 жніўня 1868 года мітрапаліт Іосіф прыняў прашэнне прызначыць І. Катовіча святаром у названы сабор.

Рана выступіўшы на педагагічнай ніве ў розных навучальных установах (выкладаў у Кобрынскім і Віленскім духоўных вучылішчах, Віленскім рэальным вучылішчы), І. Катовіч выявіў сябе не толькі як арганізатар і кіраўнік навучальнага працэсу, але і як чалавек, неабыякавы да пытанняў пастаноўкі адукацыі ў краі. Пра гэта сведчыць шэраг яго артыкулаў па царкоўна-школьнай справе, народнай адукацыі, педагогіцы, а таксама тое, што ён быў нязменным старшынёй і кіраўніком епархіяльных з'ездаў, 11 гадоў быў членам педагагічнага сходу кіравання Літоўскай духоўнай семінарыі.

20 снежня 1869 года Св. Сінод зацвердзіў І. Катовіча на пасаду рэдактара «Литовских епархиальных ведомостей», якія пад яго кіраўніцтвам атрымалі росквіт, а рэдакцыя згуртавала знакамітых дзеячаў свайго часу — Ю. Крачкоўскага, П. Чарвякоўскага, А. Будзіловіча і многіх іншых. На пасадзе рэдактара І. Катовіч працаваў на працягу 33 гадоў да студзеня 1903 года. Іван Антонавічператварыў газету ў адно з лепшых перыядычных выданняў Расійскай імперыі, у якім з'яўляецца і мноства яго нарысаў, артыкулаў.

У 1873 годзе І. Катовіч пад кіраўніцтвам прафесара М. Каяловіча абараніў магістарскую дысертацыю «Первоначальная история христианства в нынешнем Северо-Западном крае России до Великого князя Литовского Ягайлы».

У 1875 годзе быў узведзены ў сан протаіерэя і неўзабаве прызначаны настаяцелем саборнай царквы ў Вільні.

І. А. Катовіч - аўтар шматлікіх даследчых прац, артыкулаў. Ужо ў перыяд настаўніцтва ў яго выяўляюцца схільнасці да даследчай працы па вывучэнні свайго краю. Родам з Кобрыншчыны, І. Катовіч памятаў свае карані, падтрымліваў цесныя сувязі са сваёй сям'ёй і ўвесь час цікавіўся падзеямі гісторыі і сучаснасці сваёй малой радзімы. На старонках газеты «Литовские епархиальные ведомости» наш зямляк друкуе артыкулы: «О православных церквях в г. Кобрине», «Об обычаях ставить кресты на открытых местах северо-западного края России», «Из Кобринского уезда», «Завещание помещицы Верещаковой», «О событиях 8 сентября в с. Берёза», «Освящение каменной Соборной церкви в городе Кобрине», «Протоирей Антоний Котович», «О построении и освещении церквей», «Праздник в девятый четверг после Пасхи - в память воссоединения униатов с Православной Церковью».

І. А. Катовіч даследаваў гісторыю распаўсюджвання хрысціянства на Беларусі, праваслаўных храмаў Кобрына, Вільні. Падчас працы ў Кобрынскім духоўным вучылішчы збіраў палескі фальклор для выдання «Сборник памятников народного творчества в Северо-Западном крае» Пятра Гільтэнбранда. Ён удзельнічаў у падрыхтоўцы да друку матэрыялаў для кнігі «Дакументы, якія тлумачаць гісторыю Заходнярускага краю і яго адносіны да Расіі і Польшчы» (1865), а таксама прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы прац IX археалагічнага з’езда ў Вільні (1893).

Сярод найвышэйшых узнагарод І. Катовіча — ордэн Св. Ганны І ступені.

Памёр выдатны пастыр, народжаны зямлёй кобрынскай, у канцы 1911 года (аб гэтым сведчыць некралог у сувязі з яго смерцю, які змешчаны на другой старонцы Літоўскіх Епархіяльных Ведамасцяў № 1 за 1912 год). Дакладнае месца пахавання Івана Антонавіча Катовіча невядома. Верагодна, ён спачывае на адных з віленскіх могілак. Многія іншыя члены святарскага роду Катовічаў пахаваны ў Чаравачыцах.

### *Працы*

**Котович, Иван Антонович**. Слово 7-го ноября 1898 года на заупокойной литургии накануне освящения и открытия памятника графу Михаилу Николаевичу Муравьеву / [Соч.] Кафедр. прот. Иоанна Котовича. - Вильна : тип. Св.-Дух. Братства, 1898. - 10 с.

**Котович, И. А.** Первоначальная история христианства в нынешнем Северо-Западном крае России до великого литовского князя Ягайлы / И. А. Котович.- СПб., 1873.

**Котович, И. А.** Историческая записка о Литовской духовной семинарии / И. А. Котович. - Вильна, 1878. - С. 99-100.

**Котович, И. А.** Слово в день празднования 300-летнего юбилея со времени построения Свято-Духовским братством церкви Св. Духа в г. Вильне / И. А. Котович. - Вильна, 1897.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч** // Асветнікі зямлі Беларускай : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. – С. 223.

**Котович Иван (Иоанн) Антонович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 1. - С. 505-506.

**Мароз, В. В**. Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. – 512 с.

Гл. на с. 49, 50.

**Чарапіца, В.** Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч / Валерый Чарапіца // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1997. – Т. 4. – С. 149.

**Щавинская, Л. Л.** Народная православная книжность в собрании и исследованиях Иоанна Котовича : материалы к спецкурсу «Белорусская народная рукописная книжность XX- XXI вв.» / Л. Л. Щавинская. - Москва-Минск, 2010.

**Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 65-66.

**180 гадоў** з дня нараджэння І. А. Катовіча **(1839)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 100.

**Иоанн Антонович Котович** (1839-1911 годы) / работа подготовлена членами организации «Золотой возраст», И. Э. Симонова. – Кобрин, 2011. – 21 с.

**Иоанн Антонович Котович** // Кобрин-информ. – 2011. – 21 июля, 28 июля.

**Ильин, А**. Волчинское ответвление рода Котовичей / А. Ильин // Гістарычная брама. - 2004. - № 1. - С. 47-48.

**Ильин, А**. Полесские священники Котовичи / А. Ильин // Гістарычная брама. - 2004. - № 1. - С. 29-40.

**Черепица, В.** Два юбилея в жизни протоиерея Иоанна Котовича / В. Черепица // Гістарычная Брама. - 2004. - № 1. - С. 43.

**Черевачицкие** Котовичи – священники, деятели культуры и просто люди [Электронный ресурс] // Гістарычная брама. – Рэжым доступу: http://brama. brestregion.com. – Дата доступу: 28.12.2018.

# КАЧАНОЎСКІ УЛАДЗІМІР ВАСІЛЬЕВІЧ

**КАЧАНОЎСКІ Уладзімір Васільевіч** (1853–1901) - гісторык, філолаг-славіст, магістр філалогіі (1882).

Нарадзіўся 13 сакавіка 1853 года ў сям'і свяшчэнніка ў вёсцы Вялікі Лес Кобрынскага павета Гродзенскай губерніі (цяпер Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці).

Закончыў Варшаўскі ўніверсітэт у 1876 годзе, быў астаўлены для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. Студэнцкае сачыненне «Падение Сербии» (1876) было ўдастоена залатога медаля.

Славяназнаўствам Уладзімір Качаноўскі пачаў займацца пад кіраўніцтвам прафесара В. В. Макушава (1867, Брэст-Літоўск–1883). Працаваў у пецярбургскіх і маскоўскіх архівах (1878–1879).

Падарожнічаў у навуковых мэтах па землях Румыніі, Грэцыі, Італіі, Турцыі, паўднёвай Францыі (1879–1881) і Балгарыі (1883). Пасля вяртання з падарожжа абараніў магістарскую дысертацыю «Неизданный дубровницкий поэт А. М. Глегевич» (Санкт-Пецярбург, 1882), у якой паказаў яго значэнне ў развіцці драматургіі ў славян. За час свайго падарожжа па Балгарыі склаў вялікі зборнік песень «Памятники болгарского народного творчества» (Санкт-Пецярбург, 1882), дзе змясціў таксама кароткія нататкі пра асаблівасці народнай мовы, апісанні звычаяў, узоры балгарскай мовы XVII–XVIII стст., збор прымавак і кароткі слоўнік. Гэта выданне лічаць галоўнай заслугай вучонага.

У 1886–1888 гадах У. В. Качаноўскі з'яўляецца прыват-дацэнтам Казанскага ўніверсітэта, у 1889–1901 – прафесарам Нежынскага гістарычна-філалагічнага інстытута, дзе чытаў курс лекцый на кафедры царкоўнаславянскай мовы, гісторыі рускай і славянскіх моў. У 1888 годзе распачаў выданне перыядычнага зборніка «Вестник славянства» (1888–1896). Ён апублікаваў больш 200 навуковых прац па гісторыі і мовазнаўстве славянскіх народаў.

Уладзімір Качаноўскі даследаваў сербскія, харвацкія, візантыйскія і іншыя помнікі як гістарычныя крыніцы, на базе якіх стварыў шмат прац па літаратуразнаўстве, лінгвістыцы, палеагеаграфіі, гісторыі славянскіх моў: «Суждения преосвященного Порфирия о кирилице и глаголице» (1877), «Заметки о словенском языке XV–XVI веков» (1878), «Хорвацкие летописи XV–XVI веков» (1881), «К вопросу о литературной деятельности болгарского патриарха Евфимия» («Христианские чтения». 1882. № 7–8; 1888. № 3–4), «Рассмотрение диссертации П. В. Владимирова «Доктор Францыск Скорина, его переводы, печатные издания и язык» (1888), «Об истории изучения русского языка» (Казань, 1886), «А. С. Пушкин как воспитатель русского общества» (1888), «История Сербии с половины XIV до конца XV века» (Т. 1. Кіеў, 1899) і інш.

Памёр Уладзімір Васільевіч Качаноўскі 24 красавіка 1901 года ў Нежыне Чарнігаўскай губерні.

***Працы***

**Качановский, В. В.** Александр Сергеевич Пушкин, как воспитатель русского общества / Владимир Качановский. - Казань : тип. Ун-та, 1888.

**Качановский, В. В.** Болонская псалтырь (1186-1196 г.) и Евангелие Рыльского монастыря (в Болгарском княжестве), конца XII в. или начала XIII в. / В. В. Качановский // Заседание «Общества любителей древней письменности» 15 января 1882 г. - СПб : тип. Имп. Акад. наук, 1882.

**Качановский, В. В.** Из истории сербской литературы / В. В. Качановский. - Киев : тип. П. Барского, 1900.

**Качановский, В. В.** История Сербии с половины XVI до конца XV вв. / В. В. Качановский. - Киев, 1889. - Т. 1.

**Качановский, В. В.** К вопросу о литературной деятельности болгарского патриарха Евфимия (1375-1393) / Владимир Качановский. - СПб : тип. Ф. Елеонского и К°, 1882.

**Качановский, В. В.** Неизданные грамоты из афонских архивов / Владимир Качановский. - Казань : тип. Ун-та, 1888.

**Качановский, В. В.** Неизданный дубровницкий поэт Антон Марин Глегевич / Владимир Качановский. - СПб : тип. В. С. Балашева, 1882.

**Качановский, В. В.** Об историческом изучении русского языка : [вступ. лекция прив.-доц. Владимира Качановского] / Владимир Васильевич Качановский. - Казань : тип. Ун-та, 1887.

**Качановский, В. В.** Памятники болгарского народного творчества / В. В. Качановский. - СПб., 1882**. -** Вып. 1.

**Качановский, В. В.** Славянская «Кормчая» : с прил. 39 грани «О казнех» по сп. 1295 г. и некоторых ст. по сп. XVI-XVII в. / В. В. Качановский. - СПб : тип. Имп. Акад. наук, 1897.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Качановский Владимир Васильевич** // Большая советская энциклопедия : [в 30 т.]. – М., 1973. – Т. 11. – С. 550.

**Качаноўскі Уладзімір Васілевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 195.

**Кочановский Владимир Васильевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 506.

**Качановский Владимир Васильевич** // Славяноведение в дореволюционной России : биобиблиографический словарь. - Москва : Наука, 1979. С. 179–180.

**Чарапіца, В.** Качаноўскі Уладзімір Васільевіч / Валерый Чарапіца // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. - С. 157.

**165 гадоў** з дня нараджэння У. В. Качаноўскага (1853) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 69.

**Качаноўскі Уладзімір Васільевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 66-68.

**Да 160-годдзя** з дня нараджэння У. В. Качаноўскага // Каляндар дат, падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2013 год / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2013. - С. 18.

**Васильев, М.** Петр Климук, Василий Ласкович и другие / Михаил Васильев // Заря. – 1997. – 16 декабря.

Четвертый том «Энциклопедии истории Беларуси» включает информацию о наших земляках, в т. ч. об историке филологе-славяноведе В. В. Качановском.

# КАЧУРКА ВАСІЛІЙ ІВАНАВІЧ

**КАЧУРКА Васілій Іванавіч** - беларускі навуковец у вобласці сельскай гаспадаркі, доктар сельскагаспадарчых навук (2003), прафесар (2003).



Васілій Іванавіч Качурка нарадзіўся 27 верасня 1950 года ў вёсцы Стрыі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння Мінянскай сярэдняй школы паступаў у Брэсцкі політэхнічны інстытут, але не прайшоў па конкурсе. Працаваў станочнікам на Кобрынскім райпрамкамбінаце. У 1967 годзе, добра здаўшы экзамены і з годнасцю вытрымаўшы вялікі конкурс, становіцца студэнтам Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках Магілёўскай вобласці.

Пасля заканчэння ў 1973 годзе акадэміі па спецыяльнасці «агранамія» Васілій Качурка займаў розныя кіраўнічыя пасады на прадпрыемствах Магілёўскай вобласці. Маладога спецыяліста накіравалі галоўным аграномам калгаса імя Свярдлова Горацкага раёна, дзе ён адпрацаваў тры гады. Шэсць гадоў (1976–1983) кіраваў эксперыментальнай базай «Пагодзіна» (Горацкі раён). Паралельна завочна вучыўся ў аспірантуры ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, падрыхтаваў і абараніў кандыдацкую дысертацыю «Разработка некоторых приёмов получения высоких урожаев ячменя на дерново-подзолистых суглинистых почвах северо-восточной зоны Белоруссии» (1982).

З 1983 года Васілій Іванавіч пачынае займаць розныя дзяржаўныя і партыйныя пасады. У 1983 годзе быў пераведзены на пасаду першага намесніка начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі Магілёўскага аблвыканкама, потым год працаваў намеснікам загадчыка сельскагаспадарчага аддзела абкама КПБ. З 1985 па 1990 год – першы сакратар Крычаўскага гаркама КПБ.

Увосень 1990 года В. І. Качурка прыехаў у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію працаваць выкладчыкам, дацэнтам кафедры раслінаводства, а ў маі 1991 года яго прызначылі дэканам агранамічнага факультэта, аднаго з самых буйных (больш за 1000 студэнтаў). У снежні 2002 года В. І. Качурка абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Агротехнические основы формирования урожайности озимого тритикале на дерново-подзолистых легкосуглинистых почвах». Доктар сельскагаспадарчых навук (2003), прафесар (2003).

Вучонаму паступіла прапанова ўзначаліць створаны ў Баранавічах дзяржаўны ўніверсітэт – першую дзяржаўную ВНУ, створаную ва ўмовах сувярэннай Беларусі. З ліпеня 2004 года В. І. Качурка – рэктар БарДУ. Пад кіраўніцтвам Васілія Іванавіча значна пашырылася матэрыяльна-тэхнічная база ўніверсітэта, былі наладжаны міжнародныя сувязі з установамі вышэйшай адукацыі, забяспечаны высокі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў.

Васілій Іванавіч выкладае дысцыпліны «Раслінаводства», «Тэхналагічныя асновы раслінаводства» і інш., з’яўляецца кіраўніком і кансультантам дыпломных праектаў. Рэктар вядзе значную грамадскую работу, яго двойчы выбіралі дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў (26 і 27 скліканні), дэлегатам IV Усебеларускага народнага сходу (2010).

В. І. Качурка – аўтар больш за 170 навуковых прац па энергазахоўваючых тэхналогіях вырошчвання збожжавых і збожжабабовых культур, якія забяспечваюць высокую ўраджайнасць зерня з высокімі тэхналагічнымі паказчыкамі. Акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі (2005), Міжнароднай акадэміі навук педагагічнай адукацыі (2009), Акадэміі эканамічных навук Украіны (2014).

Узнагароджаны медалямі «За працоўныя заслугі» (2009), свяціцеля Кірылы Тураўскага II ступені (2007), знакам «Выдатнік адукацыі» (1997), Ганаровымі граматамі Савета Міністраў (2000), Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці (2000),

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2010), ЦК Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі (2009) і інш. У 2015 годзе Васілій Іванавіч атрымаў ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», у 2019 годзе – «Ганаровы прафесар БарДУ».

Кожны раз, знаходзячыся ў камандзіроўках паблізу родных мясцін, Васілій Іванавіч не абмінае Кобрыншчыну, магілы бацькоў, што пахаваны ў вёсцы Бяроза, а калі дазваляе час – затрымліваецца ў Стрыях, дзе жыве і займаецца фермерствам адзін з блізкіх родзічаў.

### *Працы*

**Кочурко, В. И.** Технология возделывания озимой ржи : лекция для студентов сельскохозяйственных специальностей / В. И. Кочурко, А. А. Пугач. – Барановичи : РИО БарГУ, 2007. – 31 с.

**Кочурко, В. И.** Технология хранения, переработки и стандартизация продукции растениеводства : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по агрономическим специальностям / Г. А. Жолик [и др.] ; рец.: В. И. Кочурко, Н. Н. Петюшев. – Минск : ИВЦ Минфина, 2014. – 574 с.

**Кочурко, В. И.** Технологии и техническое обеспечение производства продукции растениеводства : учеб. программа для студентов специальности 1-74 06 01 Техническое обеспечение процессов сельскохозяйственного производства / М-во образования Респ. Беларусь, Барановичский гос. ун-т ; [сост. В. И. Кочурко, Д. А. Белов]. – Барановичи : РИО БарГУ, 2014. – 14 с.

**Кочурко, В. И.** Основы органического земледелия : пособие / В. И. Кочурко, Е. Э. Абарова, В. Н. Зуев. – Минск : Донарит, 2013. – 173 с. : ил.

**Кочурко, В. И.** Рациональное природопользование и природоохранные технологии на производстве : учеб.-метод. пособие для студентов высш. учеб. заведений / В. И. Кочурко, В. Н. Зуев, С. К. Рындевич. – Барановичи : РИО БарГУ, 2010. – 238 с. : ил.

**Кочурко, В. И.** Формирование элементов продуктивности и урожайности озимой тритикале в зависимости от предшественников / В. И. Кочурко // Сб. ст. Акад. наук Польши. - Вып. 538. – Щетин, 2009. – С. 111–117.

**Кочурко, В. И.** Лекции по технологии возделывания озимых зерновых культур / В. И. Кочурко, А. А. Пугач. – Горки, 2007. – 147 с.

**Кочурко, В. И.** Роль микроэлементов в формировании урожайности сои / В. И. Кочурко, Е. Э. Абарова // Земледелие. – 2014. – № 8. – С. 30–32.

**Кочурко, В. И.** На пути к признанию и успеху : Барановичскому государственному университету 10 лет / В. И. Кочурко // Вышэйшая школа. – 2014. – № 3. –С. 39–43.

**Кочурко, В. И.** Влияние сроков сева на урожайность сои / В. И. Кочурко, Е. Э. Абарова // Земледелие и защита растений. – 2013. – № 4. – С. 28–30.

**Кочурко, В. И.** О направлениях расширения международного сотрудничества в Учреждении высшего образования «Барановичский государственный университет» (Республика Беларусь) / В. И. Кочурко // Экономика. Предпринимательство. Окружающая среда. - 2012. - № 2. - С. 73–75.

**Кочурко, В. І.** Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт – цэнтр адукацыі, навуковага і культурнага жыцця рэгіёна / В. І. Качурка // Вышэйшая школа. - 2009. - № 6. - С. 33–36.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Кочурко Василий Иванович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2006. – Кн. 2. - С. 506.

**Кочурко Василий Иванович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 6 т.]. – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 257.

**Кочурко Василий Иванович** // Кто есть кто в Республике Беларусь. 2001. Т. 2. Деловой мир. Культура и искусство. Здравоохранение. Народное хозяйство. Ветераны войны и труда. - Минск, 2001. - С. 49.

**Василий Иванович Кочурко** : биобиблиографический указатель / УО «Барановичский государственный университет», библиотека ; сост. : Л. В. Горбунова, Т. В. Громова, Р. Б. Венцель. – Барановичи : БарГУ, 2015. – 56 с.

**Качурка Васілій Іванавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 68-70.

**70 гадоў** з дня нараджэння В. І. Качурка (1950) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 139.

**Бакун, А.** Навука жыць, любіць, працаваць і марыць / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 18 верасня. — С. 5 : фота.

Жыццёвыя ўніверсітэты прафесара Васіля Качуркі.

**Шубич, М**. Наука и исследования / Михаил Шубич // Заря. - 2019. - 30 октября. - С. 3.

Делегация Барановичского университета во главе с ректором В. Кочурко принимала участие в научно-практическом форуме (Китай).

**Качурка, В.** «Першыя крокі рабіліся тут» / Васіль Качурка // Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 ліпеня. – С. 4.

Віншаванне з Днём горада Кобрына.

**Кочурко, В. И**. Ректор БарГУ Василий Кочурко: «Наш вуз стал социальным центром региона» / В. И. Кочурко ; [беседовал] Н. Андриевский // Рэспубліка. - 2011. - 5 лістапада. - С. 7.

**Кочурко, В. И.** «Наш университет войдёт в число лучших в Беларуси» // Василий Иванович Кочурко ; [беседовала] Елена Юркевич // Заря. - 2010. - 25 февраля. - С. 3.

**Кочурко, В. И.** Ученый с крестьянскими корнями / В. И. Кочурко ; [беседовала] С. Гиль // Наш край. Барановичи. - 2010. - 2 октября. - С. 1.

**Кочурко, В. И.** Высокий полет / В. И. Кочурко ; [беседовала] Л. Конопелько // Народная газета. - 2010. - 16 сакавіка. - С. 4.

**Кочурко, В. И**. Василий Кочурко: «За три года мы сделали невозможное» / В. И. Кочурко ; [записала] Л. Прокопова // Intex-press. Барановичи. - 2008. - 10 января. - С. 10.

О достижениях БарГУ.

**Гринкевич, Т.** Первые экзамены «младенца» : студенты самого молодого вуза страны – Барановичского госуниверситета – сдали свою первую сессию / Т. Гринкевич // Советская Белоруссия. - 2005. - 25 февраля.

Интервью с ректором БарГУ В. И. Кочурко.

**Кочурко, В. И.** Мы смело смотрим в будущее / [Василий Иванович Кочурко ; беседовал] А. К. Щербацевич // Хозяин. – 2005. – № 7. – С. 2-3.

**Кочурко, В. И**. «Вижу личность в каждом человеке...» / В. И. Кочурко ; [беседовала] И. Соснина // Наш край. Барановичи. - 2005. - 12 марта.- С. 1–2.

**Кочурко, В.** Барановичи – университетские / [Василий Кочурко ; беседовала] Людмила Бунеева // Вечерний Брест. - 2004. – 13 августа. – С. 1-2.

**Кадровые назначения** / пресс-служба Президента Республики Беларусь // Рэспубліка. - 2004. - 13 июля.

О назначении В. И. Кочурко ректором БарГУ.

**Пянко, А.** Настоящее дело для молодых / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2004. – 3 красавіка – С. 4.

**Вильчинский, А**. Не уходи далеко от земли / А. Вильчинский // Белорусская нива. - 2001. - 10 января.

О доценте БГСХА В. И. Кочурко.

**Пугач, А.** Сильна крестьянская закваска / А. Пугач // Белорусская нива. - 2000. - 6 октября. - С. 2.

О декане агрономического факультета БГСХА В. И. Кочурко.

# КІРЫЧУК СЦЯПАН МІХАЙЛАВІЧ

**КІРЫЧУК Сцяпан Міхайлавіч** – кандыдат тэхнічных навук (1999), доктар сацыялагічных навук, дацэнт, ганаровы прафесар Цюменскай дзяржаўнай архітэктурна-будаўнічай акадэміі, сапраўдны член Муніцыпальнай акадэміі Расійскай Федэрацыі.



Кірычук Сцяпан Міхайлавіч нарадзіўся 18 мая 1949 года ў вёсцы Мазуры Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Пачатковую школу закончыў у роднай вёсцы, васьмігодку – у вёсцы Дзямідаўшчына, што ў трох кіламетрах ад яе.

У 1968 годзе з адзнакай закончыў Брэсцкі тэхнікум чыгуначнага транспарту.

Зімой 1968 года прыбыў у горад Цюмень, які з таго часу стаў яго другой радзімай. Больш 20 гадоў працаваў на чыгунцы. Прайшоў усе вехі - ад пуцявога рабочага да намесніка начальніка Цюменскага аддзялення Свярдлоўскай чыгункі.

У 1985 годзе закончыў Уральскі электрамеханічны інстытут.

З 1990 года С. М. Кірычук працуе ў муніцыпальных органах заканадаўчай і выканаўчай улады. Займаў кіраўнічыя пасады ў Цюменскім абкаме КПСС. Пасля распаду СССР чатырохразова выбіраўся мэрам Цюмені на прамых усенародных выбарах.

Сцяпан Міхайлавіч - кандыдат тэхнічных навук (1999), доктар сацыялагічных навук, дацэнт, ганаровы прафесар Цюменскай дзяржаўнай архітэктурна-будаўнічай акадэміі, сапраўдны член Муніцыпальнай акадэміі Расійскай Федэрацыі. Ён - аўтар шматлікіх навуковых прац, член навукова-рэдакцыйнага савета «Большой Тюменской энциклопедии» (2004).

У 2005 годзе Сцяпан Міхайлавіч упершыню выбраны членам Савета Федэрацыі ад Цюменскай вобласці. Узначальваў камітэт па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.

С. М. Кірычук - старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па пытаннях мясцовага самакіравання, член камісіі Савета Федэрацыі па натуральных манаполіях, прадстаўнік ад выканаўчага органа дзяржаўнай улады Цюменскай вобласці.

Узнагароджаны медалём «За освоение недр и развитие нефтегазового комплекса Западной Сибири» (1981), ордэнам Дружбы народаў (1986), ордэнам «За заслуги перед Отечеством» IV ступені (2010), Ганаровай граматай Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.

У 2017 годзе пастановай Цюменскай абласной Думы ад 22.06.2017 года № 601 Сцяпану Міхайлавічу Кірычуку прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Цюменскай вобласці».

***Працы***


**Киричук, С. М.** Муниципальное управление как объект социально-политического изучения : диссертация ... доктора социологических наук : 23.00.02 / С. М. Киричук. - Тюмень, 2005. - 356 с. : ил.

**Киричук, С. М.** Муниципальное управление как объект социально-политического изучения : автореферат дис. ... доктора социологических наук : 23.00.02 / С. М. Киричук ; Тюмен. гос. нефтегаз. ун-т. - Тюмень, 2005. - 48 с.

**Киричук, С. М.** От местного управления к местному самоуправлению : [монография] / С. М. Киричук ; Федер. агентство по образованию М-ва образования и науки Рос. Федерации, Тюмен. гос. нефтегазовый ун-т. - Тюмень : Вектор Бук, 2005. - 261 с. : ил., цв. ил., табл.

**Киричук, С. М.** Реализация полномочий органов местного самоуправления в сфере благоустройства территории муниципального образования : монография / С. М. Киричук, Ю. М. Конев ; Министерство образования и науки Российской Федерации, Федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования «Тюменский индустриальный университет». - Уфа : Нефте-газовое дело, 2018. - 167 с. : ил., табл.

**Киричук, С. М.** Система муниципального управления : учебное пособие / С. М. Киричук ; Федеральное агентство по образованию, Государственное образовательное учреждение высшего профессіонального образования «Тюменский государственный нефтегазовый университет». - Тюмень : Вектор Бук, 2008. - 351 с.

**Киричук, С. М.** Социальный мониторинг - основа муниципального управления : [монография] / С. М. Киричук ; Федер. агентство по образованию М-ва образования и науки Рос. Федерации, Тюменский государственный нефтегазовый университет. - Тюмень : Вектор Бук, 2004. - 232 с. : ил., табл.

**Киричук, С. М.** Управление муниципальным образованием : курс лекций / С. М. Киричук ; М-во образования Рос. Федерации, Тюменский государственный нефтегазовый университет. - Тюмень : Вектор Бук, 2003. - 397 с. : ил., портр., табл.

**Киричук, С. М.** Управление муниципальным образованием : учебное пособие по дисциплине «Государственное и муниципальное управление» / С. М. Киричук ; Федеральное агентство по образованию, Федеральное гос. образовательное учреждение высш. проф. образования Северо-Западная акад. гос. службы. - Санкт-Петербург : Изд-во СЗАГС, 2008. - 476 с. : ил.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Андреевец, Г.** Член Совета Федерации Степан Киричук / Григорий Андреевец // Две родины : книга в 2-х частях / Григорий Андреевец. – М., 2009. - С. 239-242.

**Кірычук Сцяпан Міхайлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 71.

**70 гадоў** з дня нараджэння С. М. Кірычука (1949) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 101.

**Павловский, Б.** «Во-первых, избирались, во-вторых, не халтурили» / Борис Павловский // Вечерний Брест. – 2016. - 16 сентября. – С. 5.

Киричук С. М. - доктор социологии, автор многочисленных научных работ, уроженец д. Мазури Кобринского района.

**Степан Михайлович Киричук** [Электронный ресурс] // Википедия - свободная энциклопедия. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступа: 18.03.2019.

**Кто** есть кто. **Киричук Степан Михайлович** [Электронный ресурс] // Деловой Петербург. – Режим доступа: http:// whoiswho.dp.ru/cart/person/ 1930889/. – Дата доступа: 18.03.2019.

**Почетный** гражданин Тюменской области. **Киричук Степан Михайлович** [Электронный ресурс] // Тюменская область. Официальный портал органов государственной власти. - Режим доступа: https://admtyumen.ru/ogv_ru/ about/ awards/more.htm?id. – Дата доступа: 12.03.2019.

# КОЛБАС НАТАЛЛЯ ЮР'ЕЎНА

**КОЛБАС Наталля Юр'еўна** – кандыдат біялагічных навук, дацэнт.



Колбас (Куц) Наталля нарадзілася ў 1978 годзе ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. У вольны час на працягу васьмі гадоў займалася танцамі ва ўзорным танцавальным калектыве «Пралесачкі».

Выпускніца 1995 года сярэдняй школы № 1 г. Кобрына, закончыла школу з залатым медалём.

Падчас навучання ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна была стыпендыятам Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Стажыравалася ў Францыі.

Абараніла кандыдацкую дысертацыю «Антоциановый комплекс и антиоксидантная активность плодов некоторых представителей семейства Розоцветные (Rossaceae Juss)».

Наталля Юр'еўна Колбас з'яўляецца загадчыкам кафедры хіміі біялагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Член Савета біялагічнага факультэта, кіраўнік студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі «Экалагічная біяхімія».

Н. Ю. Колбас - аўтар 18 вучэбна-метадычных выданняў для студэнтаў вышэйшай школы. Мае больш за 90 навуковых публікацый, у ліку якіх 20 на англійскай мове, і манаграфію.

### *Працы*

**Колбас, Н. Ю.** Антоциановый комплекс и антиоксидантная активность плодов некоторых представителей семейства Розоцветные (Rosaceae Juss.) : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата биологических наук : 03.01.05 / Колбас Наталья Юрьевна ; Государственное научное учреждение «Институт экспериментальной ботаники им. В. Ф. Купревича НАН Беларуси». – Мінск, 2013.

**Биологическая** химия : курс лекций для студентов биологического факультета : в 2 ч. / Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина ; Е. Г. Артемук, О. В. Корзюк, Н. Ю. Колбас. – Брест, 2015. - Ч. 2. Динамическая биохимия.

**Менделеевские** чтения — 2019 : сборник материалов Республиканской научно-практической конференции по химии и химическому образованию, Брест, 22 февраля 2019 года / под общей редакцией Н. Ю. Колбас. – Брест, 2019.

**Экологическая** биохимия : курс лекций / Учреждение образования «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина» ; [авторы-сост.: Н. Ю. Колбас, А. П. Колбас]. – Брест, 2016.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Колбас (Куц) Наталля Юр'еўна** // Самая «першая» : інфармацыйна - бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 27. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Вовк, Ю.** Индивидуальный подход в обучении / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2020. — 28 мая (№ 22). — С. 4 : фот.

Об уроженке г. Кобрина, кандидате биологических наук, доценте, заведующей кафедрой химии биологического факультета УО «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина» Н. Ю. Колбас.

# КРАСНАПРОШЫН ВІКТАР УЛАДЗІМІРАВІЧ



**КРАСНАПРОШЫН Віктар Уладзіміравіч** - беларускі вучоны ў галіне прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Доктар тэхнічных навук, прафесар.

Віктар Краснапрошын нарадзіўся 23 лістапада 1947 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Закончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум, пасля служыў у Савецкай арміі.

У 1974 годзе закончыў факультэт прыкладной матэматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1974 года працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на пасадах стажора выкладчыка, асістэнта, дацэнта, загадчыка кафедры.

У 1979 годзе Віктар Уладзіміравіч абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «Математическая кибернетика», у 2007 годзе - доктарскую па спецыяльнасці «Теоретические основы информатики». У 1983 годзе В. У. Краснапрошыну прысвоена навуковае званне дацэнта, у 2008 годзе - прафесара.

Віктар Уладзіміравіч з'яўляецца навукоўцам у вобласці матэматычнай кібернетыкі і інфарматыкі. Мае больш 260 навуковых прац, у тым ліку 7 кніг. Вынікі яго навуковых даследаванняў дакладваліся на буйных міжнародных канферэнцыях і сімпозіумах.

В. У. Краснапрошын падрыхтаваў 14 кандыдатаў навук. Стажыраваўся ва ўніверсітэтах Германіі, Іспаніі і Фінляндыі.

Сіламі арганізаванай ім навукова-даследчай лабараторыі «Информационных технологий и компьютерной графики» на працягу шэрагу гадоў выконваюцца праекты па найважнейшых рэспубліканскіх і саюзных навукова-тэхнічных праграмах: «Научные основы информационных технологий и систем», «Защита от чрезвычайных ситуаций», «Триада»; «Космос – НТ»; «Информатика и космос»; «Мониторинг»; «Недра» і інш. Распрацаваныя сістэмы ўкаранёны ў розныя арганізацыі і прадпрыемствы Рэспублікі Беларусь. Інтэлектуальная камп’ютарная сістэма «Орта-Эксперт» выкарыстоўвалася медыцынскай службай зборнай каманды Рэспублікі Беларусь пры падрыхтоўцы і непасрэдна ў перыяд правядзення Алімпійскіх гульняў у Пекіне.

Кола навуковых інтарэсаў В. У. Краснапрошына: распазнаванне вобразаў, тэорыя прыняцця рашэнняў, інфармацыйна-камп'ютарныя тэхналогіі.

Віктар Уладзіміравіч Краснапрошын - загадчык кафедры інфармацыйных сістэм кіравання факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, віцэ-прэзідэнт Беларускай асацыяцыі па распазнанні і аналізу малюнкаў, замежны акадэмік Іспанскай Каралеўскай Акадэміі эканомікі і фінансаў, член кіраўнікоў саветаў міжнародных навуковых асацыяцый (AEDEM, AMSE, SIGEF), член дзяржаўнага экспертнага савета Рэспублікі Беларусь па інфарматызацыі, вылічальнай тэхнікі і інфармацыйных тэхналогіях, член экспертнага савета фонду фундаментальных даследаванняў НАН РБ па інфарматыцы, член экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па тэхнічных навуках, член савета па абароне доктарскіх дысертацый, член рэдкалегій навуковых выданняў: «Вестник БГУ», «Информатика», «Таврический вестник информатики и математики», «Machine Graphics & Vision», «Fuzzy Economic Review», «Selguk Jornal of Applied Mathematics».

В. У. Краснапрошын узнагароджаны: знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», знакам «Заслужаны работнік БДУ», падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; ганаровай граматай Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь; ганаровай граматай Нацыянальнай Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь; ганаровай граматай ВАК Рэспублікі Беларусь; ганаровымі граматамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, медалём Францыска Скарыны.

***Працы***

**Краснопрошин, В. В.** Жуан Абелье. Художник и время / В. В. Краснопрошин, Т. В. Краснопрошина. – Минск : Интернешил Транс-Кэпитал, 2002. - 192 с.

**Краснопрошин, В. В**. Исследование операций : учебное пособие / В. В. Краснопрошин, Н. А. Лепешинский. - Минск: БГУ, 2013. - 191 с. - (серия «Классическое университетское издание»).

**Краснопрошин, В. В.** Визуализация динамических моделей на основе стандартных аппаратно-программных средств / Краснопрошин В. В., Мазовка Д. И. - Минск, 2009.

**Адзериха, К. С**. Физические основы дистанционного зондирования / Адзериха, К. С., Киселевский Л. И., Костюкевич С. Б., Краснопрошин В. В. – Минск : Университетское, 1991. - 294 с.

**Ватлин, С. И.** Проблема обучения понятиям в адаптивных системах искусственного интеллекта / Ватлин С. И., Краснопрошин В. В*.* – Минск : БелНИИТИ, Серия искусственный интеллект, 1991. - 44 с.

**V. Krasnoproshin.** Decision-Making in Economy and Management: Problems and Prospects / V. Krasnoproshin. - Barcelona: Royal Academy of Economy and Financial Sciences, 1999.-118 p.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Краснопрошин Виктор Владимирович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 507.

**Краснапрошын Віктар Уладзіміравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 73-74.

**70 гадоў** з дня нараджэння В. У. Краснапрошына (1947) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 40.

**Краснопрошин, Виктор Владимирович** // Белорусский государственный университет. – Режим доступа: https://www.bsu.by/ru/main.aspx?guid=96751. - Дата доступа: 18.09.2017.

# КРАЧКОЎСКІ ЮЛЬЯН ФАМІЧ

**КРАЧКОЎСКІ Юльян Фаміч** (1840–1903) - беларускі і рускі этнограф, педагог, гісторык, старшыня Віленскай археаграфічнай камісіі. У другой палове XIX стагоддзя назіраўся вялікі інтарэс да беларускага краязнаўства, этнаграфіі і фальклору. Сярод актыўных удзельнікаў краязнаўчага руху вылучаўся Юльян Фаміч Крачкоўскі.



Нарадзіўся 25 ліпеня 1840 года ў вёсцы Азяты Кобрынскага павета (цяпер Жабінкаўскі раён Брэсцкай вобласці) у сям'і арганіста ўніяцкай царквы Фамы Крачкоўскага. Пры дапамозе азяцкага святара Васіля Грыгаровіча маці ўладкавала сына на вучобу ў Тараканскую прыходскую школку пад Брэст-Літоўскам, а затым у Жыровіцкую духоўную семінарыю.

Пасля заканчэння Літоўскай духоўнай семінарыі і Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі Ю. Крачкоўскі адмовіўся ад духоўнага сану і выбраў прафесію настаўніка.

Яго педагагічная дзейнасць працягвалася амаль 30 гадоў. Быў выкладчыкам рускай мовы ў Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі, інспектарам народных вучылішчаў Віленскай навучальнай акругі, дырэктарам Полацкай і Туркестанскай настаўніцкіх семінарый і Віленскага настаўніцкага інстытута. У 1888-1902 гадах з’яўляўся старшынёй Віленскай археаграфічнай камісіі. Некаторы час працаваў старшынёй часовай камісіі па наладжванні работы Віленскай публічнай бібліятэкі і этнаграфічнага музея і кіраванні імі. Падрыхтаваў IX археалагічны з’езд, які праходзіў у Вільні ў 1893 годзе, быў старшынёй мясцовага камітэта. За старанную і карысную службу ён атрымаў тытул стацкага саветніка і ордэн Станіслава I ступені.

Цікавасць да вывучэння народнага быту праявілася ў Ю. Крачкоўскага ў самым пачатку яго працоўнай дзейнасці. На Маладзечаншчыне ён захапіўся вусна-паэтычнай творчасцю, пачаў збіраць і запісваць беларускі фальклор (песні, прымаўкі, легенды, казкі, абрады, звычаі). Да гэтай справы далучаў і сваіх выхаванцаў. Пазней на падставе сабраных матэрыялаў надрукаваў у газеце «Виленский вестник» шэраг артыкулаў, сярод якіх вылучаюцца тыя, дзе апісваецца вясельная абраднасць беларусаў (напрыклад, «Свадебные обряды западнорусских крестьян»), Склаў разам з А. Садокавым «Сборник русских народных гимнов и песен для народных училищ» (1867), які ўключаў 54 папулярныя песенныя тэксты з нотамі, узятыя з друкаваных крыніц. Ён аўтар працы «Очерки быта западнорусского крестьянина» (1869) - грунтоўнага даследавання пра радзінна-хрэсьбінны абрад беларусаў і выхаванне дзіцяці. Апісанні аўтар рабіў на фоне агульнага становішча беларускага селяніна, яго цяжкага лёсу. Даследчык падкрэсліваў, што нараджэнне дзіцяці лічыцца вялікім святам у сям’і, але бацькоў заўсёды хвалюе тое, што яму прыйдзецца таксама шмат працаваць і гараваць. У працы ўпершыню разгледзеў шэраг дзіцячых гульняў, паказаў іх багацце і разнастайнасць. У 1874 годзе быў надрукаваны яго фальклорна-этнаграфічны зборнік «Быт западнорусского селянина», прысвечаны сямейным (пераважна вясельным) і каляндарна-аграрным абрадам беларусаў. Ён складаецца з дзвюх частак: першая прысвечана апісанню беларускага вяселля, другая - абрадам каляндарна-гадавога цыкла і інш. У кнігу ўвайшлі этнаграфічныя матэрыялы з публікацый Я. Чачота, Я. Тышкевіча, П. Гільтэбранта, Р. Зянькевіча, П. Баброўскага, А. Карэвы і інш. Акрамя вядомых матэрыялаў, ім выкарыстаны і новыя запісы (усяго каля 200 песень, 90 прыказак і прымавак, шмат вераванняў і павер’яў), якія былі зроблены ў некалькіх паветах Беларусі (у тым ліку Кобрынскім (Азяты, Драгічын) і Брэсцкім (Камянец, Радванічы).

Юльян Крачкоўскі цікавіўся не толькі педагогікай і этнаграфіяй, але і гісторыяй. У 1893 годзе ён апублікаваў нарыс «Старая Вильна до конца XVII столетия», у 1903 годзе- зборнік дакументаў «Исторический обзор деятельности управления Виленского учебного округа за первый период его существования, 1803-1832». За 1888-1902 гады, у той час, калі Ю. Крачкоўскі з’яўляўся старшынёй Віленскай археаграфічнай камісіі, былі выдадзены XV-XXVIII тамы «Актов Виленской археографической комиссии». Ён склаў XVI, XX тамы і напісаў да іх і да XXV тома прадмовы, якія вылучаліся сваімі незвычайнымі памерамі (прадмова да XX тома, напрыклад, займае больш за 200 старонак). Ён таксама аўтар прадмоў да XII і XIII тамоў «Археографического сборника документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси» (1900, 1902). Працы этнографа даюць магчымасць пазнаёміцца з багаццем і разнастайнасцю народнага быту беларусаў, іх вуснапаэтычнай творчасцю.

У гонар Ю. Крачкоўскага ў в. Азяты на будынку Дома культуры ў 1995 годзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Біёграфы Юльяна Крачкоўскага звычайна звяртаюць увагу на цікавы збег акалічнасцяў: вучоны памёр 25 ліпеня 1903 года - у дзень свайго нараджэння, а імя атрымаў ад лацінскай назвы месяца Юліуса, у які прыйшоў у свет.

***Працы***

**Крачкоўскі, Ю. Ф.** Быт западнорусского селянина / Ю. Ф. Крачкоўскі. - М., 1874.

**Крачкоўскі, Ю. Ф.** Памяти Помпея Николаевича Батюшкова / Ю. Ф. Крачкоўскі. - Вильна, 1892.

**Крачкоўскі, Ю. Ф.** Старая Вильна до конца XVII столетия / Ю. Ф. Крачкоўскі. - Вильна, 1893.

**Крачкоўскі, Ю. Ф.** Пятидесятилетие воссоединения западнорусских униатов с православною церковью (1839-1889 гг.) / Ю. Ф. Крачкоўскі. - Вильна, 1889.

**Крачковский, Ю. Ф**. Православные святыни города Вильны в XIV-XVIII вв. / Ю. Ф. Крачковский // Труды IX археологического съезда 1893 года. - М., 1897. - Т. 2.

**Крачковский, Ю.Ф.** Очерки быта западно-русского селянина / Ю. Ф. Крачковский // Виленский сборник. – Вильна : печатня А.Г. Сыркина, 1869. – С. 160-209.

**Крачковский, Ю. Ф**. Очерки униятской церкви / Ю. Ф. Крачковский // Чтения в Обществе истории и древностей Российских, 1871. - Кн. 1-2; 1876. - Кн. 3-4.

**Исторический** обзор деятельности Виленского учебного округа, 1803 г. - 1903 г. Ч. 1, отд. 1. 1803 г. -1812 г. - Вильна, 1905.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Крачковский Юлиан Фомич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 508.

**Крачковский Юлиан Фомич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск. 2007. - Т. 4.- С. 277.

**Крачковский Юлиан Фомич** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1982. – Т. 5. Биографический справочник. – С. 331.

**Крачкоўскі Юльян Фаміч** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск. 1997. – Т. 4. – С. 255.

**Крачкоўскі Юльян Фаміч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. - Мінск, 2013. - Т.4. - С. 567.

**Крачкоўскі Юльян Фаміч** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1986. – Т. 3. - С. 125.

**Крачкоўскі Юльян Фаміч** // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : [у 2 т.]. - Мінск, 2005. – Т. 1.- С. 718.

**Крачкоўскі Юльян Фаміч** (1840-1903) // Асветнікі зямлі беларускай X - пачатак XX ст.: энцыклапедычны даведнік. - 2-е выд. - Мінск, 2006. - С. 241-242.

**Крачкоўскі Юльян Фаміч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 75-76.

**Бандарчык, В. К.** Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. / В. К. Бандарчык ; [Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору М-ва культуры БССР]. - Мінск : Навука і тэхніка, 1964. - 280, [2] с. : партр.

Гл. «Алфавітны паказальнік імён і навуковых устаноў», с. 279.

**Бензярук, Р.** Зямля і навука / Расціслаў і Анатоль Бензерукі // Сорак дарог / Расціслаў і Анатоль Бензерукі. - Брэст, 2007.

Гл. на с. 17-19.

**Бензярук, А.** Вучоны з Вёскі Азяты / Анатоль Бензярук // Свята для сэрца : невялікія гісторыі для юных беларусаў / Анатоль Бензярук. – Мінск, 2009. – С. 114-115.

**Вывучэнне** Беларусі мясцовымі сіламі // Беларусы : у 8 т. / [В. К. Бандарчык ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, А. І. Лакотка] ; НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. - Мінск, 1999. - Т. 3 : Гісторыя этналагічнага вывучэння. - С. 82-107.

Гл. на с. 90-93.

**Мароз, В. В.** Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. – 512 с.

Гл. на с. 67.

**Очерки** истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX вв. / П. Т. Петриков [и др.]. - Минск : Навука і тэхніка, 1996. – 527 с.

См. на с. 68, 84, 182.

**Саламевіч, І. У.** Крачкоўскі Юльян Фаміч / І. У. Саламевіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. – Т. 6. – С. 111.

**Снітко, Г. М.** Асоба Ю. Ф. Крачкоўскага і яго ўклад у развіццё беларускай этнаграфіі / Г. М. С'нітко // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгёна Беларусі. - Брэст, 1998. - Ч. 1. - С. 213-216.

**Снітко, Г. М.** Збіральнікі духоўнай спадчыны / Г. М. Снітко // Літаратурная Берасцейшчына : краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы / В.Я. Ляшук, Г.М. Снітко. – Мінск, 2008. – С. 18-19.

**Цішчанка, І. К.** Крачкоўскі Юльян Фаміч / І. К. Цішчанка // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 470.

**Цішчанка, І. К**. Юльян Фаміч Крачкоўскі (1840-1903) / І. К. Цішчанка // Беларуская фалькларыстыка : збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гг. XIX - пачатку XX ст. - Мінск, 1989. - С. 64-72.

**Ю.Ф. Крачкоўскі** // Памяць. Жабінкаўскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1999. – С. 133-135.

**Юльян Крачкоўскі** (1840–1903) // Літаратурная карта Берасцейшчыны. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2008. – С. 198-201.

**180 гадоў** з дня нараджэння Ю. Ф. Крачкоўскага (1840) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 140.

**25 ліпеня** - 180 гадоў з дня нараджэння Ю. Ф. Крачкоўскага (1840-1903), фалькларыста, этнографа, гісторыка, археографа, педагога // Новыя кнігі. – 2020. - № 5. – С. 17-19 (дадатак).

**Замкавец, У.** Вучоны з вёскі Азяты: Юльян Крачкоўскі (1840 – 1903) / Уладзімір Замкавец // Настаўніцкая газета. – 2004. – 20 сакавіка.

**Бензярук, А.** Вучоны з Азятаў: да 160-годдзя Юльяна Крачкоўскага / А. Бензярук // Сельская праўда. – 2000. – 26 ліпеня.

**Цішчанка, І.** «Адна навука не пакіне чалавека...» : да 145-годдзя з дня нараджэння Ю. Ф. Крачкоўскага / Іван Цішчанка // Мастацтва. - 1995. - № 12. - С. 45-48.

# КРАЧЭЎСКІ ПЁТР АНТОНАВІЧ

**КРАЧЭЎСКІ (Крэчэўскі) Пётр Антонавіч** (1879–1928) – гісторык, беларускі палітычны і грамадска-культурны дзеяч, паэт, драматург. Дэлегат І Усебеларускага Кангрэсу, Прэзідэнт Рады БНР.



Нарадзіўся 7 жніўня 1879 года ў сям’і дыякана вясковай царквы ў Кобрынскім павеце Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці). Пасля заканчэння Віленскай духоўнай семінарыі ў 1902 годзе настаўнічаў у Ялоўцы на Беласточчыне і ў Ваўкавыскім павеце.

Перад Першай сусветнай вайной працаваў у Віленскім дзяржаўным банку (1909–1914). Напачатку банкаўскай кар’еры часта трапляў пад пільную ўвагу паліцыі, віной чаму былі яго цесныя сувязі з рознымі палітычнымі групамі. Праца ў банку дала Пятру Крачэўскаму магчымасць наладзіць зносіны са шматлікімі беларусамі, якія займалі пасты ў структурах улады.

Падчас Першай сусветнай вайны П. Крачэўскі быў прызваны ў Рускую армію. Вопыт адміністрацыйнай працы забяспечыў яму хуткае прасоўванне па службе, а таксама магчымасць наведваць вайсковыя часці, размешчаныя на тэрыторыі беларускіх губерняў, і заводзіць новыя знаёмствы. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі П. Крачэўскаму атрымалася сабраць сродкі для стварэння арганізацыі беларускіх салдатаў.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года П. Крачэўскі становіцца старшынёй Барысаўскага савета салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Удзельнік Усебеларускага Кангрэса 1917 года, быў абраны ў склад яго выканаўчага камітэта. У 1918 годзе, пасля абвешчання БНР, у нацыянальным урадзе выконваў абавязкі дзяржаўнага кантралёра, народнага сакратара фінансаў, узначальваў Цэнтральную Беларускую гандлёвую палату. Адзін з лідэраў Беларускай партыі сацыял-федэралістаў. На снежаньскай сесіі Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ў Мінску ў 1919 годзе абраны яе прэзідэнтам. Выконваў гэты пачэсны абавязак да канца жыцця.

З 1920 года П. Крачэўскі знаходзіцца ў эміграцыі ў Літве, Чэхаславакіі. У яго непасрэдныя задачы ўваходзіла ўсталяванне кантактаў з прадстаўнікамі БНР у розных краінах, што ён рабіў досыць эфектыўна. У Празе П. Крачэўскі стварыў Прадстаўніцтва Рады БНР, разгарнуў шырокую дыпламатычную дзейнасць, наладзіў інфармаванне заходне-еўрапейскіх краін пра становішча ў Савецкай і Заходняй Беларусі. Крачэўскі ўдзельнічаў і ў Першай Усебеларускай палітычнай канфэрэнцыі ў Празе-Чэшскай у верасні 1921 года.

У 1923 годзе разам з кіраўніцтвам БНР пераязджае на сталае жыхарства ў Чэха-Славаччыну. Актыўна бараніў нацыянальныя інтарэсы беларускага народа на міжнароднай арэне. У мэмарандумах БНР у Лігу Нацый асуджаў дыскрымінацыйную ў дачыненні да Беларусі Рыжскую мірную дамову, выкрываў імпэрыялістычную сутнасць палітыкі Масквы і Варшавы на беларускіх землях.

Пётр Крачэўскі дамогся ў чэхаславацкага ўрада стыпэндый для беларускіх студэнтаў, стварыў Беларускі архіў у Празе.

У 1926 годзе беларуска-культурнае таварыства імя Ф. Скарыны ў Празе выдала зборнік артыкулаў па гісторыі, культуры і эканоміцы «Замежная Беларусь» (рэдактар П. Крачэўскі), у якім адлюстраваліся погляды Пятра Крачэўскага. Ён выявіў сябе як здольны публіцыст, гісторык і паэт. Яго артыкулы «Беларусь у мінулым і сучасным», «Гісторыя беларускай кнігі», «Скарына і незалежнасць» актуальныя і сёння. Галоўныя прынцыпы тагачаснай праграмы П. Крачэўскага – актывізацыя сапраўднай культурнай працы, асвета і выхаванне нацыянальнай свядомасці праз шанаванне, удасканаленне і далейшае развіццё роднай мовы.

П. Крачэўскі - аўтар вершаванай драмы «Рагнеда» (1921), гістарычнай драмы «Здрада» (1922), многіх вершаў, перакладаў з чэшскай і ўкраінскай моў. У мастацкіх творах П. Крачэўскі паўстае як тонкая паэтычная натура, якую хвалявала шматстайнасць быцця. У яго вершах адлюстравана грамадзянская пазіцыя аўтара, непазбыўнае жаданне служыць народу і пакінуць штосьці вартаснае пасля смерці.

П. А. Крачэўскі не прызнаў рашэнняў Бярлінскай палітычнай нарады 1925 года пра фактычнае скасаванне БНР. Дзякуючы яго прынцыповай пазіцыі, традыцыя сапраўды незалежнай беларускай дзяржаўнасці, асвечаная імем БНР, не была перапынена.

Пётр Антонавіч Крачэўскі памёр 8 сакавіка 1928 года і пахаваны на Альшанскіх могілках у Празе (Чэхія).

### *Працы, творы*

**Крачэўскі, П.** Кніга ; Беларускаму народу ; Творчасць ; Мурашнік ; Таемная сіла : [вершы] / Пятро Крачэўскі // Роднае слова. - 2003. - № 3. - С. 35–36.

**Крачэўскі, П.** Патрэбнасць дзяржаўнага органу заграніцай / Пётра Крэчэўскі // Спадчына. - 1997. - № 6. – С. 6–15.

**Крачэўскі, П.** Мандаты БНР : даклад чытаны ў Беларускім Студэнскім Клюбе ў Празе 16 студзеня 1926 г. / Пётра Крэчэўскі // Спадчына. - 1993. - № 1. - С. 2–10.

**Крачэўскі, П.** Стварэнне бусла ; Мурашнік ; Беларускаму народу ; Рэха ; Таемная смага ; Мана ; Творчасць ; Вершаваныя пераклады : [вершы і пераклады] / Пётра Крэчэўскі // Спадчына. - 1993. - № 2. - С. 30–35.

**Крачэўскі, П.** Рагнеда : гістарычная драма X сталецьця ў 4 актах з пралогам / Пётра Крэчэўскі ; публікацыя Валянціна Мазца // Спадчына. - 1993. - № 3. - С. 16–30.

**Крачэўскі, П.** Вершы / П. Крачэўскі // Роднае слова. – 2003. - № 3. – С. 33-36.

**Крэчэўскі, П.** Патрэбнасць дзяржаўнага органу заграніцай / Пётра Крэчэўскі // Спадчына. - 1997. - № 6. – С. 6-15.

**Крэчэўскі, П.** Мандаты БНР : даклад чытаны ў Беларускім Студэнскім Клюбе ў Празе 16 студзеня 1926 г. / Пётра Крэчэўскі // Спадчына. – 1993. - № 1. – С. 2-10.

**Крэчэўскі, П.** Рагнеда: гістарычная драма X сталецьця ў 4 актах з пралогам / Пётра Крэчэўскі // Спадчына. - 1993. - № 3. – С. 16-30.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Крачэўскі (Крэчэўскі) Пётр Антонавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1999. - Т. 8. - С.470.

**Крачэўскі (Крэчэўскі) Пётр Антонавіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2012. – Т. 4. – С. 567.

**Крачэўскі (Крэчэўскі) Пётр Антонавіч** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. – Мінск, 2003. - С. 509. – (Сведкі і ўдзельнікі падзей).

**Крачэўскі Пётр Антонавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 77-79.

**Мазец, В.** Крачэўскі Пётр Анонавіч / Валянцін Мазец // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. - С. 256.

**Памяткі** нашай мінуўшчыны. Пётр Крачэўскі // Берасцейскія карані : гісторыка-краязнаўчы і літаратурны зборнік. – Брэст, 1993. – С. 97.

**140 гадоў** з дня нараджэння П. А. Крачэўскага // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 102.

**Канецкий, А**. Провозглашение Белорусской Народной Республики : из цикла «100-летние юбилеи 2018 года» / Алексей Канецкий // Кобрин-информ. - 2018. - 29 марта. - С. 4.

В 1919 г. уроженец Кобринского уезда П. Кречевский избран президентом Рады БНР.

**Мазец, В**. БНР — первая национальная форма белорусской государственности в XX столетии / Валентин Мазец ; [беседовал] Андрей Осмоловский // Комсомольская првда. - 2018. — 24 марта. — С. 8-9.

Белорусскую торговую палату, со дня ее основания (25 апреля 1918 г.), возглавлял П. Кречевский.

**Трефилов, С**. Два президента БНР, четыре врага народа и один литовский министр белорусских дел / Сергей Трефилов // Комсомольская правда. - 2018. - 21-27 марта. - С. 6-7.

Личность Петра Кречевского в истории первого белорусского государства.

**130 гадоў** з дня народзінаў Пятра Крачэўскага // Наша слова. – 2009. – 5 жніўня. – С. 1.

**Пётр Крачэўскі** (1879-1928) // Роднае слова. – 2003. - № 3. – С. 33.

**Чмарава, М.** «Дзе слава наша…» : літаратурна-публіцыстычная дзейнасць Пятра Крачэўскага / М. Чмарова // Роднае слова. – 2003. - № 3. – С. 33-36.

**Васильев, М.** Петр Климук, Василий Ласкович и другие / Михаил Васильев // Заря. – 1997. – 16 декабря.

Четвертый том «Энциклопедии истории Беларуси» включает информацию о наших земляках, в т. ч об историке Петре Антоновиче Кречевском.

**Ціхаміраў, А.** Беларуска-літоўскія дачыненні ў 1914–1920 гг. / Аляксандр Ціхаміраў // Спадчына. – 2000. - № 5–6. – С. 3–27.

Упамінаецца П. Крэчэўскі, яго роля ва ўмацаванні сувязяў з Літвой.

**Ляхоўскі, У.** Прэзыдэнты Рады Беларускае Народнае Рэспублікі / Уладзімір Ляхоўскі // Спадчына. – 1997. - № 4. – С. 7-8.

**[Крэчэўскі Пётра Антонавіч]** // Спадчына. – 1995. - № 5. – С. 27.

**Краўцоў, М.** Пётра Антонавіч Крачэўскі / Макар Краўцоў; публікацыя Валянціна Мазца // Спадчына. - 1993. - № 2. – С. 35–37.

**Сідарук, І.** Не забудзе сыноў сваіх Бацькаўшчына. П. Крэчэўскі / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 1993. – 24 ліпеня. – С. 3.

# КРУСЬ ПАВЕЛ ПАЎЛАВІЧ

**КРУСЬ Павел Паўлавіч** - кандыдат філасофскіх навук (1990), дацэнт (1992), загадчык кафедры філасофіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна.



Нарадзіўся 2 красавіка 1961 года ў вёсцы Пескі Кобрынскага раёна. Дзяцінства і юнацкія гады Паўла прайшлі ў вёсцы Астромічы Кобрынскага раёна. Вучыўся ў Астроміцкай школе.

У 1978 годзе Павел Крусь закончыў сярэднюю школу № 4 г. Кобрына, а ў 1979 годзе паступіў на філасофскі факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Пасля заканчэння ўніверсітэта, нягледзячы на магчымасць працаваць у Ленінградзе, паехаў у Краснаярск і ў той жа год адзіны з курсу паступіў у аспірантуру.

Пасля заканчэння аспірантуры ў 1988 годзе прыехаў працаваць у Брэсцкі педагагічны інстытут.

У 1990 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Философские проблемы биологической эволюции современного человека». Вучонае званне дацэнта атрымаў у 1992 годзе. З 1999 года з'яўляецца сапраўдным членам Акадэміі сацыяльных навук Рэспублікі Беларусь. З 2001 года Павел Паўлавіч загадчык кафедры філасофіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна.

П. П. Крусь выбраны членам прэзідыума філасофскага таварыства Рэспублікі Беларусь. У яго больш за 100 навуковых, вучэбна-метадычных і публіцыстычных прац рознага характару. 18-20 кастрычніка 2017 года дацэнт Павел Паўлавіч Крусь прысутнічаў на Першым міжнародным філасофскім кангрэсе ў г. Мінску.

***Працы***

**Крусь, Павел Павлович.** Философские проблемы биологической эволюции современного человека : диссертация ... кандидата философских наук : 09.00.08. / П. П. Крусь. – Л., 1990. - 162 с.

**Философия** и методология науки: методические рекомендации для аспирантов, магистрантов и соискателей всех специальностей / Учреждение образования «Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина», Кафера философии ; [авторы-составители: П. П. Крусь и др.]. – Брест, 2009.

**Аксиологические** и антропологические проблемы образования и воспитания студенческой молодежи : сборник научных статей : [материалы региональной научно-практической конференции, Брест, 22 апреля 2016 г. / редколлегия: Г. И. Займист, П. П. Крусь, А. В. Климович]. – Брест, 2017.

**Образование** и воспитание студенческой молодежи: философский и аксиологический аспекты : сборник материалов международной научно-практической конференции, Брест, 17-18 апреля 2008 года / под ред. В. А. Степановича, П. П. Круся. – Брест, 2008.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Прафесарска-выкладчыцкі** калектыў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна : бібліяграфічны даведнік, 1945-2005 : 60 год. - Брэст, 2005.

**Вовк, Ю**. Павел Крусь: «Учить делать жизнь человечнее» / Юлия Вовк // Кобрин-информ. – 2018. – 27 сентября. – С. 3.

Уроженец д. Пески П. П. Крусь — действительный член Академии социальных наук Республики Беларусь.

**Крусь, П. П**. О нравственности в науке и философии / Павел Павлович Крусь ; [беседовала] Анна Шевченко // Кобрин-информ. – 2007. – 1 февраля. – С. 3.

Интервью с кандидатом философии, доцентом П. П. Крусем.

**Кафедра** философии. Крусь П. П. [Электронный ресурс] // Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина. – Режим доступа: http://www.brsu.by/div/kafedra-filosofii. – Дата доступа: 10.09.2017.

# КУДЗІНА ГАЛІНА ВАСІЛЬЕЎНА

**КУДЗІНА Галіна Васільеўна** – гісторык, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна.

Нарадзілася 24 красавіка 1954 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці ў сям'і рабочых.

У 1985 годзе закончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ). Вялікі ўплыў на фарміраванне гістарычнага светапогляду аказалі Н. І. Ермаловіч, Э. М. Загарульскі, Ю. Л. Казакоў, Г. М. Ліўшыц, У. М. Сікорскі.

Працавала лабарантам, адказным сакратаром таварыства «Веды» Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі (1980-1986).

З 1986 года - загадчык кабінета гісторыі КПСС, лабарант, асістэнт, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Кіраўнік студэнцкага навуковага гуртка «Культура Беларусі: мінулае і сучаснасць» на матэматычным факультэце ўніверсітэта.

Навуковыя інтарэсы: праблемы гістарычнага краязнаўства і беларускай дзяржаўнасці. Аўтар больш за 30 работ.

***Працы***

**Кудина, Г. В.** К вопросу об объединении белорусских земель в сентябре 1939 г. / Г. В. Кудина // Материалы республиканской научно-практической конференции, посвящённой 60-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР. — Брест, 1999.

**Кудина, Г. В**. Проблема насилия в обществе: гендерный аспект (на примере Брестской области) / Г. В. Кудина // Междунар. науч. конф. «Женщины. Образование. Демократия». – Минск, 2000.

**Кудзіна, Г. В** Некаторыя аспекты развіцця культурных сувязей Берасцейшчыны / Г. В. Кудзіна // Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю з дня нараджэння У. Калесніка. — Брэст, 2002.

**Кудзіна, Г. В**. Старонкі з гісторыі старажытнага Кобрына. / Г. В. Кудзіна // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі, супярэчнасці, перспектывы развіцця: матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі. - Гродна, 2002.

**Кудзіна, Г. В**.Уплыў гістарычных падзей на развіццё літаратуры ў XIX ст. / Г. В. Кудзіна // Материалы республиканской научно-практической конференци., посвящ. Ф. Богушевичу «Шануйце мову, каб не ўмерлі!» — Брэст, 2000.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Корзенко, Г. В**. Кудина Галина Васильевна / Г. В. Корзенко // Историки Беларуси в начале XXI столетия : библиографический справочник / Г. В. Корзенко. – Минск, 2007. – С. 205-206.

**Прафесарска-выкладчыцкі** калектыў Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна. 1945 - 2005 : біябібліяграфічны даведнік / УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна» ; аўт.-уклад.: У. В. Здановіч, А. А. Савіч, І. І. Шаўчук ; рэд. М. Э. Часноўскі. - Брэст : БрДУ, 2005. - 248 с. : фота.

Гл. на с. 113-114.

# КУЖЫР ПАВЕЛ РЫГОРАВІЧ



**КУЖЫР Павел Рыгоравіч** - кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, загадчык кафедры фізікі Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі.

Нарадзіўся 1 студзеня 1946 года ў вёсцы Батчы Кобрынскага раёна. Вучыўся ў Батчынскай школе (сем класаў), потым у СШ № 2 г. Кобрына, якую закончыў у 1963 годзе з залатым медалём.

У 1963 годзе Павел Кужыр паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (БДУ) на фізічны факультэт, пасля заканчэння якога пайшоў у аспірантуру на кафедру тэарэтычнай фізікі.

У 1978 годзе Павел Рыгоравіч абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэарэтычнай і ядзернай фізіцы.

Пасля заканчэння аспірантуры працаваў малодшым, потым старшым навуковым супрацоўнікам навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем пры БДУ.

З 1979 года Павел Рыгоравіч пераходзіць на выкладчыцкую работу ў Беларускі політэхнічны інстытут (цяпер Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт - БНТУ). Працаваў дацэнтам кафедры фізікі, а з 1995 года ён загадчык кафедры фізікі. Выкладае наступныя дысцыпліны: механіка, малекулярная фізіка і тэрмадынаміка; электрычнасць і магнетызм; оптыка і ядзерная фізіка.

Вобласць навуковых інтарэсаў П. Р. Кужыра: радыяцыйная бяспека, методыка выкладання фізікі. Павел Рыгоравіч з’яўляецца аўтарам 300 навуковых і навукова-метадычных прац. Выдае вучэбныя дапаможнікі, якія маюць грыф Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, сярод якіх: «Радиоционная безопасность», «Прикладная ядерная физика», «Сборник задач по курсу общей физики» в 3-х частях.

У 1995 годзе Паўлу Рыгоравічу прысвоена званне «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь». У 2002 годзе Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь назначана імянная стыпендыя за выдатныя заслугі ў галіне падрыхтоўкі інжынерных кадраў.

***Працы***

**Кужир, П. Г.** Диагностика при проектировании учебных занятий / П. Г. Кужир [и др.] ; Белорусский национальный технический университет. – Минск, 2013.

**Кужир, П. Г.** Общая физика: электричество и магнетизм : сборник задач / П. Г. Кужир. – Минск : изд-во Гревцова, 2013.




**Кужир, П. Г.** Прикладная ядерная физика : учебное пособие для вузов / П. Г. Кужир. – 2-е изд., стер. - Минск : Технопринт, 2004. - 112 с.: ил.

**Кужир, П. Г.** Сборник задач по общему курсу физики : учебное пособие для студентов высших учебных заведений по техническим специальностям : в 2 ч. / П. Г. Кужир, Н. П. Юркевич, Г. К. Савчук ; Министерство образования Республики Беларусь, Белорусский национальный технический университет. – Минск : БНТУ, 2014.- Ч. 1: Механика, статистическая физика и термодинамика.

**Кужир, П. Г.** Физика : учебно-методическое пособие для вузов / П. Г. Кужир. – Минск, 2003.

**Кужир, П. Г.** Физика конденсированных сред : учеб. пособие для вузов / П. Г. Кужир, А. А. Баранов, А. П. Каравай, Н. П. Юркевич. – Минск, 2002.

**Кужир, Павел Григорьевич**. Эффекты высших приближений в угловой корреляции при электромагнитных переходах ядер : автореферат дис. на соискание ученой степени кандидата физико-математических наук. (01.04.02) / П. Г. Кужир, Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина. - Минск : [б. и.], 1973. - 14 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Кужыр Павел Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 436. – (Імі ганарацца землякі).

**Кужыр Павел Рыгоравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 80-82.

**70 гадоў** з дня нараджэння П. Р. Кужыра (1946) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 12.

**Профессорско-**преподавательский состав. Кужир Павел Рыгоравич [Электронный ресурс] // Белорусский национальный технический университет. – Режим доступа: http://www. bntu.by/achieve.html. – Дата доступа: 12.09.2019.

# КУЛЬЧЫЦКІ АНДРЭЙ МІХАЙЛАВІЧ

**КУЛЬЧЫЦКІ Андрэй Міхайлавіч** (у манастве Аляксандр) (1826-1888) - царкоўны дзеяч, гісторык. Кандыдат багаслоўя (1857).



Нарадзіўся Андрэй Кульчыцкі ў вёсцы Камень-Шляхецкі Кобрынскага павета Гродзенскай губерніі (цяпер в. Акцябр Кобрынскага раёна) у сям'і святара. Атрымаў імя Андрэй у гонар святога апостала Андрэя Першазванага.

Выпускнік Літоўскай духоўнай семінарыі (1841-1847). З 1847 года А. Кульчыцкі - свяшчэннік Петрапаўлаўскай царквы ў Кобрыне. Толькі пяць гадоў працягвалася служэнне Андрэя Кульчыцкага ў Кобрыне, пасля чаго ўвесь ход яго жыцця крута змяніўся. У 1852 годзе ён аўдавеў. Па правілах таго часу, удовін святар для таго, каб працягваць сваё служэнне, павінен быў прыняць манаскі пострыг. 8 лістапада 1852 года свяшчэннік Андрэй Кульчыцкі прыняў манаства і атрымаў манаскае імя Аляксандр.

У 1853 годзе для працягу духоўнай адукацыі паступіў у Санкт-Пецярбургскую Духоўную Акадэмію. Вучоба ў акадэміі - адным з лепшых вышэйшых навучальных устаноў у тагачаснай Расіі - адкрывала перад маладым іераманахам бліскучыя перспектывы.

У 1857-1866 гадах А. Кульчыцкі займаецца місіянерскай працай у Пекіне. Падчас знаходжання ў Кітаі вывучае традыцыі і побыт гэтай краіны. Адным са значных яго жыццёвых дасягненняў гэтага перыяду — складанне руска-кітайскага слоўніка.

Пасля вяртання ў Беларусь А. Кульчыцкі працуе інспектарам Полацкай духоўнай семінарыі (1866). 20 красавіка 1869 года ўзведзены ў сан архімандрыта.

З 1871 года — настаяцель царквы пасольства Расіі ў Рыме. З 1878 года — епіскап Туркестанскі, Кастрамскі, Галіцкі. У Туркестане ён заснаваў пры возеры Ісык-Куль Свята-Троіцкі мужчынскі манастыр, пра які працягваў клапаціцца нават у Кастраме.

28 сакавіка 1882 года А. Кульчыцкі ўзнагароджаны ордэнам святой Ганны І ступені.

Аўтар прац па гісторыі царквы, геаграфічных нататкаў і інш.

Памёр 16 снежня 1888 года. Пахаваны ў Кастрамскім Іпацьеўскім манастыры, у царкве праведнага Лазара.

### *Працы*

**Александр (Кульчицкий), епископ**. Несколько слов, поучений и речей / Александр (Кульчицкий), епископ. - СПб., 1887, - II, 201 с.

**Александр (Кульчицкий), иеромонах**. Брак у китайцев / Александр (Кульчицкий), иеромонах // Китайский благовестите, 1907. - № 7-10 ; 1908 -№ 16/17, 23-26, 29-32; 1909 - №2-6. (Отдельный оттиск — Пекин, 1908).

**Александр (Кульчицкий), епископ**. Религиозно-нравственное состояние инородцев Туркестанского края и необходимость учреждения для них Православной Миссии / Александр (Кульчицкий), епископ // Православный благовестник, 1893 — № 20. (Отдельный оттиск — М., 1893).

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Мароз, В. В.** Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. – 512 с.

Гл. на с. 44 – А. М. Кульчыцкі.

**Митрополит** Астанайский и Казахстанский Александр (Могилёв). Преосвященный Александр Кульчицкий, православный миссионер (1826-1888) : жизнеописание / Митрополит Астанайский и Казахстанский Александр. - Москва, 2012. - 304 с.

**Черепица, Н. В.** Кульчицкий Андрей Михайлович / Н. В. Черепица // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 515.

**Кульчыцкі Андрэй Міхайлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 82 : фат.

**190 гадоў** з дня нараджэння А. М. Кульчыцкага (1826) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 12-13.

**Комаров Н**. Свято-Троицкий миссионерский монастырь при озере Иссык-Куль в Туркестане / Н. Комаров // Православный благовестник. - 1894 - № 4, 6, 8. (Отдельный оттиск - М., 1894).

**Кончина** и погребение в Бозе почившего Преосвященнейшего Епископа Александра // Костромские епархиальные ведомости. – 1889. - № 1.

# КУПРЫЯНЮК ВАЛЯНЦІНА АЛЯКСЕЕЎНА

**КУПРЫЯНЮК Валянціна Аляксееўна** - доктар эканамічных навук.

Нарадзілася ў 1952 годзе ў вёсцы Буховічы Кобрынскага раёна. Вучылася ў Буховіцкай базавай школе. Закончыла сярэднюю школу № 4 г. Кобрына.

Пасля заканчэння школы паступіла ў Мінскі інстытут народнай гаспадаркі, атрымала спецыяльнасць «эканаміст».

Пазней Валянціна Аляксееўна закончыла вышэйшую партыйную школу. Працавала першым сакратаром райвыканкама камсамола ў г. Лунінцы, потым у Брэсце ў аблвыканкаме.

Сёння В. А. Купрыянюк жыве і працуе ў Маскве. Нягледзячы на пенсійны ўзрост, Валянціна Аляксееўна працягвае працаваць у Маскоўскай акадэміі навук.

**Куприянюк, Валентина Алексеевна.** Действие закона возвышения потребностей в условиях перехода к рыночной экономике : автореферат дис. ... кандидата экономических наук : 08.00.01 / Акад. общ. наук ЦК КПСС 9 91-3/2544-6-9 91-3/2545-4. - Москва, 1991. – 25 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Купрыянюк Валянціна Аляксееўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 437. – (Імі ганарацца землякі).

**Імі ганарацца** землякі. **Купрыянюк Валянціна Аляксееўна** [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: https://ikobrin.by/kobrin-139.php. – Дата доступу: 05.09.2019.

# КУРАШЫК ВІТАЛІЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ

**КУРАШЫК Віталій Уладзіміравіч** - акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі, Ганаровым доктар Міжнароднай кадравай акадэміі, беларускі і ўкраінскі палітычны дзеяч, беларускі дыпламат, Ганаровы грамадзянін горада Еўпаторыі.



Віталій Курашык нарадзіўся 8 мая 1939 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага павета Палескага ваяводства (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і. У Дзівінскую сярэднюю школу пайшоў у шэсць гадоў у далёкім пасляваенным 1945 годзе. У школьныя гады захапляўся спортам, меў дасягненні.

Пасля заканчэння ў 1955 годзе школы паехаў у Данбас. У 1957 годзе закончыў тэхнічнае вучылішча ў г. Чырвоны Прамень Луганскай вобласці. Пасля заканчэння ў 1960 годзе Тарэзскага горнага тэхнікума (Данецкая вобласць, Украіна) працаваў машыністам, горным майстрам самай глыбокай шахты Данбаса «Качагарка», тэхнолагам, галоўным тэхнолагам завода высакавольтнай апаратуры ў г. Канстанцінаўка. Шэсць гадоў аддаў шахцёрскай працы. Узнагароджаны ордэнамі Шахцёрскай Славы II і III ступеняў.

Закончыў завочна Украінскі політэхнічны інстытут (1967). Пасля завода - на партыйнай рабоце. У 1974-1982 гадах - другі, першы сакратар Канстанцінаўскага гаркама.

З 1982 года жыве ў Крыме. Крым для Віталія Уладзіміравіча стаў другой радзімай. У 1982-1985 гадах ён быў старшынёй Еўпатарыйскага гарвыканкама, потым плённа працаваў у Крымскім абкаме партыі. З прыходам Курашыка на пасаду старшыні гарвыканкама (1982) у Еўпаторыі была створана служба «05» для сувязі «ўлады з народам»; рэалізаваны вялікі праект па пасадцы дрэваў (тысячы іх і па гэты час упрыгожваюць горад); з'явілася новая набярэжная, тэлефонная станцыя, дарогі, інжынерныя сеткі.

У 1985-1987 гадах В. У. Курашык - загадчык аддзела Крымскага абкама КПУ, у 1987-1991 - намеснік старшыні, першы намеснік старшыні, старшыня Крымскага аблвыканкама.

У 1991-1993 гадах В. У. Курашык - старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Крым.

На пасольскую працу сышоў з пасады старшыні Савета Міністраў Крыма. З мая 1993 па 14 чэрвеня 2001 года - Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь ва Украіне. Дарэчы, ён першы прадстаўляў нашу суверэнную незалежную Беларусь ва Украіне ў рангу Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла. І гэта, як успамінае В. У. Курашык, быў самы важны і цікавы перыяд яго жыцця. З 1999 года ён дуайен дыпкорпуса.

З 2001 года - першы віцэ-прэзідэнт Міжрэгіянальнай Акадэміі кіравання персаналам. Віталій Уладзіміравіч з'яўляецца Акадэмікам Беларускай інжынернай акадэміі, Ганаровым доктарам Міжнароднай кадравай акадэміі. Узнагароджаны залатым медалём Міжнароднай Кадравай Акадэміі «За эфектыўнае кіраванне».

З 2003 года - саветнік Прадстаўніка Прэзідэнта ААТ «Лукойл» ва Украіне.

За сваю дзейнасць у Беларусі і Украіне В. У. Курашык узнагароджаны ордэнамі «Працоўнага Чырвонага Сцяга» і «За заслугі» III і II ступеняў (Украіна), а таксама ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Кабінета Міністраў Украіны і іншымі ўзнагародамі. Народны дэпутат Украіны (1990-1994), дэпутат Вярхоўнай Рады Крыму I склікання (1991-1994).

У 1999 годзе за вялікі асабісты ўклад у развіццё горада Еўпаторыі і шматгадовую актыўную дзейнасць на карысць жыхароў горада Віталію Уладзіміравічу Курашыку прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Еўпаторыі».

У сённяшні час ён знаходзіцца на пенсіі. Наш зямляк цяпер зноў жыве ў вядомым крымскім горадзе Еўпаторыі, піша кнігі. У 2010 годзе выйшла кніга В. У. Курашыка «Я не хочу судьбу иную…(Записки дипломата)», у якой ён шмат старонак прысвяціў сваёй малой радзіме – в. Дзівін. У 2014 годзе выдадзена наступная кніга нашага земляка «Я люблю тебя, жизнь». Новая кніга Віталія Курашыка - «Сюжеты из жизни. Посол вспоминает и размышляет».

Сябар Віталія Курашыка паэт Анатоль Мірзаян пра яго напісаў так:

«Ты клинка остриё поменял на перо.
Побежали вдогонку строка за строкой.
Ты всегда созидал, создавая добро.
Будет снова тепло
Тем, кто вместе с тобой».

Віталій Курашык, беларускі хлопец з палескай глыбінкі, прайшоў шлях ад шахцёра да старшыні Саўміна Крыма, вядомага дыпламата. У адной з яго кніг знаходзім такое жыццёвае крэда В. У. Курашыка: «Працаваць да сёмага поту… Любіць жыццё. Берагчы блізкіх людзей. Быць карысным для іншых і шчодрым, заўсёды гатовым прыйсці на дапамогу людзям».

### *Працы, творы*

**Курашик, В. В**. Живи и помни : размышления дипломата / В. В. Курашик. — Киев : АВЕГА, 2008. - 72 с. : [40] л. фот.

**Курашик, В. В.** Уроки жизни : записки дипломата / В. В. Курашик. — Киев : АВЕГА, 2006. - 96 с. : [72] л. фот.

**Курашик, В. В**. Я не хочу судьбу иную…(Записки дипломата) / В. В. Курашик. - Киев : «Освита Украины», 2010. - 366 с.

**Курашик, В. В**. Я люблю тебя, жизнь / В. В. Курашик. – Симферополь : Антиква, 2014. –160 с.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Гапанович, А. Н.** Виталий Владимирович Курашик / Афанасий Гапанович // Дивин - древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 72,73. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Курашик Виталий Владимирович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 517.

**Курашик, В.** Пути-перепутья / [Виталий Курашик ; беседовал М. Н. Шиманский] // Моя вера - моя Беларусь / М. Н. Шиманский. – Минск, 2010. – С. 142,143-152,153.

**Курашык Віталь Уладзіміравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 437 : фота. – (Імі ганарацца землякі).

**Курашык Віталій Уладзіміравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 83-85.

**Курашык Віталій Уладзіміравіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 23.

**Шпакова, Н. В**. Курашик Віталій / Н. В. Шпакова // Українська дипломатична енциклопедія : у 2-х т. – Киев : Знання України, 2000. - Т. 1.

**Юрчак, Д. В**. Виталий Владимирович Курашик - первый посол Республики Беларусь в Украине: страницы биографии и дипломатическая деятельность / Д. В. Юрчак // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова» : сборник научных трудов. - Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2016. – Т. 22. - С. 76-81. - Библиография : с. 81 (10 назв.).

**80 гадоў** з дня нараджэння В. У. Курашыка (1939) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 102-103.

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2017. – 20 июля. – С. 5.

Центральная районная библиотека ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система» начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны».

**Курачук, С.** Людзі навукі нашага краю / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2017. – 5 красавіка. – С. 3.

Цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» пачынае працу над чарговым праектам «Славутыя імёны Кобрыншчыны».

**Ждановіч, І.** Будзе цёпла ізноў... / Іван Ждановіч // Советская Белоруссия. - 2015. – 26 марта.

Ганаровы грамадзянін горада Еўпаторыя Віталь Курашык падараваў землякам-беларусам сваю новую кнігу.

**Курашик, В.** Я… посол. Что я могу? / В. Курашик // Рэспубліка. – 1994. – 16 чэрвеня. – С. 5.

**Виталий** Курашик: «Я люблю тебя, жизнь!»// Крымское эхо [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://c-eho.info/biblioteka/item/470-vitalij-kurashik-ya-lyublyu-tebya-zhizn. – Дата доступа: 03.04.2019.

**Персоналии.** Курашик Виталий Владимирович [Электронный ресурс] // Крым политический. – Режим доступа: http://politika-crimea. ru/persons/441-kurashik-vitalij-vladimirovich. – Дата доступа: 03.04.2019.

**Почётные** граждане города Евпатории. **Курашик Виталий Владимирович** [Электронный ресурс] // Официальный сайт муниципального образования городской округ Евпатория Республики Крым. – Режим доступа: http://my-evp.ru/imi-gorditsya-gorod/spisok-pochetnyx-grazhdan-goroda/. – Дата доступа: 11.04.2019.

# ЛАГАНЧУК ЛЕАНІД МІХАЙЛАВІЧ

**ЛАГАНЧУК Леанід Міхайлавіч** – кандыдат тэхнічных навук, дацэнт.



Нарадзіўся 25 красавіка 1930 года.

У 1948 годзе Леанід Лаганчук закончыў сярэднюю школу № 1 г. Кобрына.

Леанід Міхайлавіч Лаганчук - выкладчык, дацэнт кафедры «Аўтаматызаваныя электраэнергетычныя сістэмы» Новачаркаскага політэхнічнага інстытута.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Лаганчук Леанід Міхайлавіч** // Самая «першая» : інфармацыйна - бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 27. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Лаганчук Леанід Міхайлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 85.

**90 гадоў** з дня нараджэння Л. М. Лаганчука (1930) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 142.

**Сарычев, В.** Школа моей мамы / Василий Сарычев // Вечерний Брест. – 2010. – 10 ноября. – С. 1-2. – (Вечёрочка).

Из стен СШ № 1 г. Кобрина вышли многие учёные, среди которых и доцент Новочеркасского института Леонид Логанчук.

**Логанчук Леонид** [Электронный ресурс] // Государственное учреждение образования «СРЕДНЯЯ ШКОЛА № 1 г. КОБРИНА». Виртуальный музей. – Режим доступа: http://sch1.kobrin.edu.by/ ru/ main. aspx?guid=1861. – Дата доступа: 22.06.2017.

# ЛАПСКІ АСТАП ВАСІЛЬЕВІЧ

**ЛАПСКІ Астап Васільевіч** (1926-2012) - украінскі мовазнавец-асветнік, настаўнік, выкладчык кафедры ўкраінскай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта, прафесар філалогіі, паэт.



Нарадзіўся Астап Лапскі 7 ліпеня 1926 года ў сяле Гуцкі Кобрынскага павета (цяпер в. Гуцкі Кобрынскага раёна) у сялянскай сям'і. Ад сваіх бацькоў (маці - украінка, а бацька - паляк) хлопчык вучыўся ўкраінскай і польскай мовам. Закончыў школу – чатыры класы на польскай мове, два на расійскай. Пачаў працу ў рамесленай майстэрні ў Кобрыне. Менавіта ў гэты час у рукі будучага паэта патрапіў «Кабзар» Тараса Шаўчэнкі, які паўплываў на фарміраванне яго светапогляду і нацыянальнай свядомасці.

У чэрвені 1944 года Лапскія разам са шматлікімі іншымі сваімі землякамі рушылі на Захад і аселі пад горадам Лодзь у цэнтральнай Польшчы.

Пасля вайны Астап вучыўся ў Вроцлаўскім і Варшаўскім універсітэтах. Працаваў выкладчыкам у сталічным універсітэце на кафедры ўкраінскай філалогіі. Быў рэдактарам на Палескім радыё. Супрацоўнічаў з украінскімі выданнямі ў Польшчы, з рэдакцыяй штотыднёвіка «Наша слова» і лінгвістычнай рэдакцыяй Польскага радыё.

За прыналежнасць да «Салідарнасці» ў 1981 годзе яго звольнілі з працы.

Астап Лапскі, вядомы ў Польшчы ўкраінамоўны літаратар і перакладчык, выдаў дзясятак кніг прозы і паэзіі на ўкраінскай мове і школьныя падручнікі ўкраінскай мовы і літаратуры. Ён дасягнуў высокага майстэрства ў творчасці, набыў павагу і пашану як дзеяч асветы сярод украінскай дыяспары Польшчы. З замежных украінамоўных аўтараў ён адзін стаў лаўрэатам Нацыянальнай прэміі імя Тараса Шаўчэнкі.

Астапа Лапскага называюць «патрыярхам украінскіх паэтаў у Польшчы». Асобна выйшлі тры зборнікі паэта, выдадзеныя ўкраінскім архівам: «Мій по читачу» (Варшава 2000), «Обабіч: істини?!» (Варшава 2003), «Себе: розшукую?!» (Варшава 2003). А. В. Лапскі друкаваўся ў часопісе «Наша слова» (Польшча), выданнях Украіны, у газеце «Берестейский край». Яго творы ўвайшлі ў анталогію Берасцейшчыны «До тебе, світе».

Памёр Астап Васільевіч 20 кастрычніка 2012 года ў Варшаве (Польшча).

Ужо будучы прызнаным аўтарам, А. В. Лапскі не раз успамінаў паэтычным радком сваю малую радзіму - Кобрыншчыну.

### *Творы*

**Лапський, О.** Всупереч / Остап Лапський. – Луцьк, 2013. – 120 с.

**Лапський, О**. [Стихи] / Остап Лапський // Справа : беларуска-ўкраінскі альманах Таварыства ўкраінскай літаратуры пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў / гал. рэд. А. Наварыч. - С. 179-181. - Мінск, 2015. - Вып. 1.

Стихи и биография О. Лапского (на укр. яз.), есть фото.

**Остап Лапський** // До тебе, свите… : українська література Берестейщини / [упорядкув., передм., тексти біогр. Цвида А. П.]. – Київ, 2003. – С. 330-343.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Лапський, О.** [Стихи] **/** Остап Лапський // Справа : беларуска-ўкраінскі альманах Таварыства ўкраінскай літаратуры пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў / гал. рэд. А. Наварыч. - С. 179-181. - Мінск, 2015. - Вып. 1.

Стихи и биография О. Лапского (на укр. яз.), есть фото.

**Лапскі Астап Васільевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 86-87.

**90 гадоў** з дня нараджэння А. В. Лапскага (1926) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 13.

**Казакова, А.** «Вопреки» - новый сборник поэта / А. Казакова // Кобрин-информ. – 2014. – 5 июня. – С. 7.

Литературная жизнь Кобринщины ознаменовалась важным событием - вышел в свет сборник стихов нашего земляка Остапа Лапского.

**Казакова, А.** Поэт, рождённый кобринской землей / А. Казакова // Кобрин-информ. – 2012. – 27 сентября. – С. 5.

**Марчук, Н.** Невядомы, вядомы Лапскі / Н. Марчук [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. - Режим доступа: http://ikobrin.by/kobrin-tvmarchuk61.php. – Дата доступа: 02.09.2017.

# ЛЕВЫ СЯМЁН ВАСІЛЬЕВІЧ

**ЛЕВЫ Сямён Васільевіч** – прафесійны арнітолаг, выкладчык школы бёрдвотчара «Ад Бусла да Ястраба», спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны».



З Кобрынам у Сямёна Левага звязаны дзіцячыя і юнацкія гады. Тут ён нарадзіўся і рос, жыў і працаваў да 2006 года, пакуль не пераехаў у г. Барысаў.

Першыя крокі ў навуку вядомы беларускі арнітолаг Сямён Левы зрабіў у Кобрыне. Да прыроды роднага краю ён быў уважлівы заўсёды. Асабліва выявіўся гэты інтарэс у школьныя гады, калі пад чулым кіраўніцтвам настаўніка біялогіі Святланы Траццяк ён адкрываў для сябе таямніцы прыроды. Падказкі мудрага педагога, цікавасць да кніг па арніталогіі дапамаглі Сямёну акрэсліць кола інтарэсаў.

Пасля заканчэння СШ № 8 г. Кобрына Сямён працягнуў вучобу на біялагічным факультэце Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, затым працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам у Аддзеле праблем Палесся Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У 2003 годзе малады спецыяліст узначаліў навуковае таварыства вучняў у Кобрынскім эколага-біялагічным цэнтры і захапіўся даследчай працай. Ідэі педагога знайшлі падтрымку ў дырэктара цэнтра Л. Страчук, а неўзабаве да Сямёна прыйшло прызнанне. Пад яго кіраўніцтвам быў створаны актуальны экалагічны маршрут па ўнікальных прыродных кутках малой радзімы, які стаў лепшым у вобласці ў 2005 годзе.

Сёння Сямён Левы - спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны», бёрдвотчар з 25-гадовым стажам, які займае першы радок у спісе членаў аб'яднання «Клуб 200» (аб'яднанне людзей, захопленых наглядам за птушкамі), паколькі здолеў убачыць найбольшую колькасць відаў птушак на тэрыторыі Беларусі. Яго асабісты рэкорд - 281 від птушак, з якіх многія вельмі рэдка трапляюцца на вочы спецыялістам.

Землякі памятаюць Сямёна Васільевіча як маладога спецыяліста, які яшчэ на этапе свайго прафесійнага станаўлення нястомна шукаў спосабы спазнаць і захаваць прыроду Кобрыншчыны.


**Незабываемое** болото Ельня / [Общественная организация «Ахова птушак Бацькаўшчыны», Государственное природоохранное учреждение «Ельня»] ; авторы-составители : Н. Д. Черкас [и др.] ; фото: В. Е. Ковалёнок [и др.]. – Минск, 2012.

**Определитель** птиц : [перевод с литовского языка] / Витаутас Юсис [и др. ; научный редактор В. Гричик] ; Общественная организация «Ахова птушак Бацькаўшчыны»

**Охраняемые** природные территории. Брестская область : каталог / Брестское областное отделение общественной организации «Ахова птушак Бацькаўшчыны» ; [автор-составитель А. В. Абрамчук ; фото: А. В. Абрамчук, С. В. Левый и др.]. - Брест : Альтернатива, 2016. - 147 с.

**Стань** хранителем ТВП «Березина — Гайна»! [Изоматериал] : [буклет] / фото Д. Якубовича, А. Клещука, С. Левого ; Ахова птушак Бацькаўшчыны. – Минск, 2018.

**Елизарова, Ж.** Хранитель птиц / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 5 мая. — С. 16.

Уроженец г. Кобрина С. Левый — известный белорусский орнитолог, бердвотчер с 25-летним стажем.

# ЛІСКОВІЧ ВІКТАР АНДРЭЕВІЧ

**ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч** – кандыдат медыцынскіх навук, дзяржаўны дзеяч.



Нарадзіўся 4 верасня 1960 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. У школе быў прызёрам алімпіяд па фізіцы і хіміі. Вельмі любіў дакладныя навукі. Асновай усіх навук і сёння лічыць матэматыку. Пасля заканчэння сярэдняй школы паступіў у Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, які закончыў у 1983 годзе (урач-акушэр-гінеколаг).

Сваю працоўную дзейнасць пачаў у Брэсцкай вобласці. Працаваў урачом-акушэрам-гінеколагам, загадчыкам аддзялення Астравецкай цэнтральнай раённай бальніцы Гродзенскай вобласці (з 1985 года); намеснікам начальніка лячэбнага аддзела - галоўным акушэрам-гінеколагам упраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама (з 1997); галоўным урачом установы аховы здароўя «Гродзенскі абласны клінічны перынатальны цэнтр» (са снежня 2003).

У 2000 годзе Віктар Андрэевіч Лісковіч паступіў і ў 2002 годзе з адзнакай закончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Дэпутацкая дзейнасць В. А. Лісковіча пачалася ў 2012 годзе. Віктара Андрэевіча вылучылі кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Ён атрымаў перамогу на выбарах і стаў працаваць у камісіі па ахове здароўя, сямейнай і маладзёжнай палітыцы. Неўзабаве старшыня Гродзенскага аблвыканкама У. В. Краўцоў прапанаваў Віктару Андрэевічу пасаду свайго намесніка па сацыяльнай сферы. З'яўляўся дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў XXV склікання, дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў XXVI склікання. В. А. Лісковіч - старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.

Віктар Андрэевіч Лісковіч вялікую ўвагу надае навуковай дзейнасці, займаецца даследчай працай. У 2000 годзе была зацверджана тэма яго кандыдацкай дысертацыі «Научное обоснование организации этапной акушерско-гинекологической помощи на примере Гродненской области», якая паспяхова абаронена 18 чэрвеня 2003 года. 12 кастрычніка 2003 года Віктару Андрэевічу было прысвоена вучонае званне кандыдата медыцынскіх навук.

Навуковая навізна і значнасць вынікаў, атрыманых у ходзе работы над дысертацыяй, складаецца ў тым, што ўпершыню было праведзена медыка-статыстычнае даследаванне перынатальнай, дзіцячай і мацярынскай смяротнасці ў Гродзенскай вобласці за перыяд з 1991 па 2000 год; дадзена комплексная ацэнка дынамічных паказчыкаў перынатальнай, дзіцячай і мацярынскай смяротнасці, іх структуры і ўзроставых асаблівасцей у розных рэгіёнах Гродзенскай вобласці; упершыню быў паказаны ўплыў захворвання цяжарных і нованароджаных на ўзровень перынатальных страт.

Па выніках дысертацыйнага даследавання распрацаваны і зацверджаны метадычныя рэкамендацыі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і новы комплексны метад арганізацыі аказання этапнай акушэрска-гінекалагічнай дапамогі жаночаму насельніцтву на рэгіянальным узроўні, што дазволіла значна знізіць паказчык перынатальнай, дзіцячай і мацярынскай смяротнасці ў Гродзенскай вобласці.

За час работы над дысертацыяй апублікавана ў рэцэнзуемых выданнях 66 навуковых прац. У 2003 годзе ў суаўтарстве выдадзена манаграфія «Управление системой перинатальных технологий на региональном уровне».

В. А. Лісковіч прызнаны лепшым кіраўніком у сферы аховы здароўя Гродзенскай вобласці за 2006 год. Яго імя ў 2010 годзе ўнесена ў Кнігу Славы Гродзенскай вобласці, а ў 2011 годзе - у Вялікую міжнародную энцыклапедыю «Лепшыя людзі».

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За трудовые заслуги», юбілейнымі медалями «90 лет Вооруженных сил Республики Беларусь», «90 год на варце граніцы», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «65 лет победы в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.», «70 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «100 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі», медалём Беларускай праваслаўнай царквы Свяціцеля Кірылы Тураўскага, памятным медалём саюзнай дзяржавы «За сотрудничество», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Мае нагрудныя знакі «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь», «За заслугі ў развіцці галіновага прафсаюзу», «90 лет уголовному розыску МВД Республики Беларусь», «140 лет Пожарной службе г. Волковыска», «За службу по исполнению закона», «20 год упраўленню ваеннай контрразведкі КДБ Рэспублікі Беларусь», «За заслуги УЗ «ГОКПЦ».

Віктар Андрэевіч Лісковіч - аўтар больш за 350 навуковых прац, у тым ліку 1 падручніка, 8 манаграфій, 6 навучальных дапаможнікаў. Мае 4 патэнты на вынаходніцтва.

### *Працы*

**Лискович, В. А.** Акушерско-гинекологическая помощь на Гродненщине: история и современность : монография / В .А. Лискович и др. ; Министерство здравоохранения Республики Беларусь, Учреждение образования «Гродненский государственный университет». – Минск, 2005.

**Лискович, В. А**. Клинический менеджмент : монография : в 2 т. / [В. А. Лискович и др.] ; Министерство здравоохранения Республики Беларусь, Учреждение образования «Гродненский государственный медицинский университет». – Гродно, 2014-2015.

**Лискович, В. А**. Клинический менеджмент : пособие для магистрантов учреждений высшего образования специальности второй ступени высшего образования 1-26 81 02 «Инновационный менеджмент», 1-26 81 09 «Технология управления персоналом» / В. А. Лискович, В. А. Снежицкий, И. А. Наумов ; под общей редакцией М. Г. Жилинского, О. Н. Солдатовой ; Академия управления при Президенте Республики Беларусь. – Минск, 2016.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Каспер, А.** Его кредо - делать жизнь людей лучше / Анна Каспер // Дзянніца. – 2020. – 2 ноября.

О Викторе Андреевиче Лисковиче.

**Рыбак, Н.** Знакомый и неизвестный Виктор Лискович / Нина Рыбик // Астравецкая праўда. — 2018.

Интервью с заместителем председателя Гродненского облисполкома В. А. Лисковичем.

**Лискович Виктор Андреевич** : поздравления // Журнал ГГМУ. – 2004. - № 1.

Редакция журнала Гродненского медицинского университета и сотрудники университета поздравляют Лисковича Виктора Андреевича с успешной защитой кандидатской диссертации.

**Лискович Виктор Андреевич** [Электронный ресурс] // Совет Республики Национального собрания Республики Беларусь. – Режим доступа: http://www.sovrep.gov.by/ru/senators-ru/view/liskovich-viktor-619/. - Дата доступа: 28.10.2020.

**Лискович Виктор Андреевич** [Электронный ресурс] // Палата представителей Национального собрания Республики Беларусь. - Режим доступа: http://house.gov.by/ru/deputies-ru/view/liskovich-viktor-190/curr_conv/14/. – Дата доступа: 28.10.2020.

**Лискович Виктор Андреевич** [Электронный ресурс] // Республиканское общественное объединение «Белая Русь». - Режим доступа: https://belayarus.by/liders/grodnenskaya-oblast/liskovich-viktor-andreevich/ – Дата доступа: 28.10.2020.

# ЛУКАШУК АЛЯКСАНДР АЛЕГАВІЧ

**ЛУКАШУК Аляксандр Алегавіч** - беларускі біёлаг, энтамолаг. Старшы навуковы супрацоўнік Бярэзінскага біясфернага запаведніка.



Нарадзіўся 25 мая 1964 года ў вёсцы Шыповічы Кобрынскага раёна. Прыгажосць і ўнікальнасць прыроды адкрылі юнаму даследніку біёлагі СШ № 1 г. Кобрына, дзе вучыўся Аляксандр з 1971 па 1981 год, і педагогі станцыі юннатаў, гурткі якой хлопчык наведваў пасля ўрокаў. Сувязь з юннатаўскім рухам ён не страціў да гэтага часу, ужо многія гады Аляксандр Лукашук з'яўляецца членам журы злёту юных эколагаў Беларусі і Расіі.

Ва ўніверсітэце, куды Аляксандр паступіў пасля года працы ў будаўнічай брыгадзе Кобрынскага інструментальнага завода, у яго завязалася супрацоўніцтва з доктарам біялагічных навук, прафесарам Ігарам Лапаціным, які і адкрыў дапытліваму студэнту свет насякомых ва ўсёй яго загадкавасці і непаўторнасці, а таксама пазнаёміў з адным з лепшых спецыялістаў І. Кержнерам з Заалагічнага інстытута Расійскай акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу. Дзякуючы садзейнічанню і падтрымцы навуковых кіраўнікоў, Аляксандр змог пабываць у шматлікіх экспедыцыях на Далёкім Усходзе, ва Украіне, Арменіі, Абхазіі, Узбекістане, Таджыкістане, Казахстане, Карэліі, Балгарыі, Польшчы і Францыі.

У 1989 годзе Аляксандр закончыў біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна (спецыяльнасць – біёлаг).

У 1987 годзе паступіў на працу ў Бярэзінскі біясферны запаведнік. Спецыялізацыя - энтамалогія.

Кола навуковых інтарэсаў: сістэматыка, фаўністыка і экалогія паўжосткакрылых насякомых (Heteroptera); бесхрыбетныя жывёлы Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

Асноўны характар працы: навуковыя даследаванні, праца з базамі даных, экатурызм, біялагічная інфармацыя, маніторынг, ахова прыроды, экалагічная адукацыя.

Аляксандр Лукашук мае вопыт палявой і лабараторнай работы ў Беларусі, краінах блізкага і далёкага замежжа ў лясных, горных абласцях.

Апублікаваў 72 навуковыя працы і тры навукова-папулярныя.

***Працы***

**Лукашук, А. О.** Водные клопы (Heteroptera) и жуки (Coleoptera) в растительных сообществах озер Березинского биосферного заповедника : матер. II междунар. научн. конф. 22–26 сентября 2003 г. / А. О. Лукашук, С. К. Рындевич, С. А. Автушко // Озерные системы: биологические процессы антропогенная трансформация, качество воды — Минск – Нарочь, 2003. - С. 461-465.

**Лукашук, А. О.** Итоги и перспективы изучения полужесткокрылых насекомых (Hemiptera: Hetreroptera) Беларуси / А. О. Лукашук // Современные проблемы энтомологии Восточной Европы : материалы Международной научно-практической конференции. – Минск, 2015. – С. 183-186.

**Лукашук А. О.** Клопы подкорники (Heteroptera: Aradidae) Березинского биосферного заповедника / А. О. Лукашук // Особо охраняемые природные территории Беларуси : исследования. – Минск, 2012. – Вып. 7. – С. 296-301.

**Лукашук, А. О.** Опыт сотрудничества Домжерицкого экологического лицея и Березинского биосферного заповедника : материалы международной конференции 28-30 мая 2003 г. / А. О. Лукашук, В. М. Арнольбик, В. С. Ивкович // Экологическое образование для устойчивого развития. Отечественный и международный опыт. — Минск, 2003. – С. 45-46.

**Лукашук, А. О**. Полужесткокрылые насекомые (Hemiptera: Heteroptera), трофически связанные с дубом черешчатым (Quercus robur L.) в Березинском биосферном заповеднике / А. О. Лукашук, Е. М. Сетракова // Особо охраняемые природные территории Беларуси : исследования. – Минск, 2015. – С. 105-111.

**Лукашук А. О**. Первое указание двух видов настоящих полужесткокрылых насекомых (Hemiptera: Heteroptera) с территории Беларуси / Лукашук А. О., Ильинская А. В. // Зоологические чтения – 2017 : сборник статей Международной научно-практической конференции. Гродно, 15-17 марта 2017 г. – Гродно, 2017. – С. 127-129.

**Лукашук А. О**. Результаты экспедиции белорусских зоологов в Эквадор. Водомерки (Hemiptera: Heteroptera: Gerromorpha) / А. О. Лукашук // Итоги и перспективы развития энтомологии в Восточной Европе : сборник статей III Международной научно-практической конференции, 19-21 ноября 2019 г., г. Минск. – Минск, 2019. – С. 223 - 226.

**Лукашук, А. О**. Экологические группы насекомых (Odonata, Orthoptera, Hemiptera, Heteroptera) на пойменных лугах Березинского биосферного заповедника / А. О. Лукашук // Перспективы сохранения и рационального использования природных комплексов особо охраняемых природных территорий : материалы Международной научно-практической конференции. – Минск, 2015. – С. 39-41.

**Лукашук, А. О**. Полужесткокрылые семейства Saldidae (Heteroptera) Березинского биосферного заповедника / А. О. Лукашук // Особо охраняемые природные территории Беларуси : исследования. – Минск, 2007. - Вып. 2. – С. 128-138.

**Лукашук, А. О.** Дозорщики заповедного края / А. О. Лукашук // Экология. - 2010. - № 4. – С. 10-11.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Лукашук Аляксандр Алегавіч** // Самая «першая» : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 27-28. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Елизарова, Ж.** Охотник за насекомыми / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2017. – 11 лістапада. – С. 3.

О белорусском энтомологе, старшем научном сотруднике национального Березинского биосферного заповедника кобринчанине Александре Лукашуке.

**Нікіфарава, С.** Экалета для юннатаў / Святлана Нікіфарава // Настаўніцкая газета. – 2015. – 25 чэрвеня.

Старшы навуковы супрацоўнік, энтамолаг Аляксандр Алегавіч Лукашук праводзіць экскурсіі для ўдзельнікаў рэспубліканскага профільнага аздараўленчага лагера «Юны эколаг».

**Радзюк, К**. Як праходзяць канікулы ў эколагаў? / Кацярына Радзюк // Родная прырода. – 2014. - № 8. – С. 5.

Упамінаецца навуковец Аляксандр Лукашук.

**Лукашук Александр Олегович** [Электронный ресурс] // Государственное природоохранное учреждение «Березинский биосферный заповедник». – Режим доступа: http://www.berezinsky.by /ru/about/structure/div3/. – Дата доступа: 26.10.2017.

**Лукашук, Александр Олегович** (энтомолог) [Электронный ресурс] // Электронный каталог РНТБ. – Режим доступа: http://rntbcat.org.by/ – Дата доступа: 26.10.2017.

# МАКАРУК МІХАІЛ МАРКАВІЧ

**МАКАРУК Міхаіл Маркавіч** - кандыдат ваенных навук, генерал-маёр авіяцыі, ваенны лётчык-інструктар І класа.



Нарадзіўся 1 жніўня 1945 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння Стрыгаўскай сярэдняй школы вырашыў паступаць у Чарнігаўскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча, але не прайшоў па конкурсе. Працаваў старшым піянерважатым у Рынкаўскай сярэдняй школе Кобрынскага раёна. Юнак валодаў добрымі арганізатарскімі здольнасцямі, захапляўся мадэліраваннем, разьбой па дрэве, любіў спорт.

У 1963–1967 гадах Міхаіл Макарук – курсант Чарнігаўскага вышэйшага ваеннага авіяцыйнага вучылішча. З 1967 па 1973 год – лётчык-інструктар, намеснік камандзіра авіяцыйнай эскадрыллі вучэбнага палка Чарнігаўскага вучылішча. У 1973–1976 гадах – слухач Ваенна-паветранай акадэміі імя Ю. А. Гагарына.

З 1976 года М. М. Макарук – камандзір авіяцыйнай эскадрыллі, намеснік камандзіра авіяцыйнага палка, інспектар упраўлення ваенна-вучэбных устаноў ВПС СССР. З 1978 года М. М. Макарук, які добра валодае іспанскай і англійскай мовамі, знаходзіўся на ваенна-дыпламатычнай рабоце. У 1978–1989 гадах ён памочнік ваеннага аташэ пры пасольствах СССР у Рэспубліцы Куба, Рэспубліцы Індыя, у 1989–1991 гадах – ваенны, ваенна-марскі і ваенна-паветраны аташэ пры пасольстве СССР у Федэрацыі Малайзія.

З 1991 года М. М. Макарук – памочнік галоўнакамандуючага ВПС, намеснік начальніка ўпраўлення ВПС Галоўнага аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі. У 1997–2000 гадах –ваенны, ваенна-паветраны і ваенна-марскі аташэ пры пасольстве Расійскай Федэрацыі ў Іспаніі, з 2001 года – у Рэспубліцы Куба.

1 жніўня 2005 года Міхаіл Маркавіч сышоў у запас у сувязі з пенсійным узростам. Актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю. Член прэзідыума Агульнарасійскай арганізацыі «Офицеры России». Член Асацыяцыі ветэранаў Карыбскага крызісу. З 2018 года Міхаіл Маркавіч – першы віцэ-прэзідэнт Расійскага таварыства дружбы з Кубай. З'яўляецца кіраўніком Маскоўскага аддзялення Міжрэгіянальнай грамадскай арганізацыі «Содружество воинов-интернационалистов «кубинцев».

Пражываючы ў Маскве, высокапастаўлены дзеяч памятае, што яго малая радзіма – у Беларусі, на Брэстчыне. У Кобрынскім раёне пахаваны яго бацькі, дзяды і прадзеды. Тут жывуць яго родныя сёстры, блізкія сябры, землякі. Таму і імкнецца ён часцей бываць у родных краях. Падчас сваіх адпачынкаў Міхаіл Маркавіч заўсёды прыязджае ў родныя месцы.

### *Аб жыцці і дзейнасці*


**Макарук Міхаіл Маркавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 437. – (Імі ганарацца землякі).

**Макарук Міхаіл Маркавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2017. - С. 89–90.

**75 гадоў** з дня нараджэння М. М. Макарука (1945) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 143.

**Гурда, В.** Орел крылатого племени Брестчины / Владимир Гурда // Кобрин-информ. – 2006. – 12 января.

М. М. Макарук – кандидат военных наук, генерал-майор авиации, уроженец д. Мацы Кобринского района.

**Гурда, В.** Генерал-лейтенант из деревни Мацы / В. Гурда // Кобрынскі веснік. – 2003. – 11 студзеня. – С. 6.

В настоящее время М. М. Макарук – военно-морской атташе при посольстве Российской Федерации в Республике Куба.

**Макарук** Михаил Маркович [Электронный ресурс] // Офицеры России. – Режим доступа: http://oficery.ru/cp.html. – Дата доступа: 18.10.2019.

**Макарук** Михаил Маркович [Электронный ресурс] // Российское общество дружбы с Кубой. – Режим доступа: http://www.roscuba. ru/community/structure/. – Дата доступа: 18.10.2019.

# МАКАРУК МІХАІЛ АРСЕНЦЬЕВІЧ

**МАКАРУК Міхаіл Арсенцьевіч** – вучоны, кандыдат ветэрынарных навук, дацэнт Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.



Нарадзіўся Міхаіл Макарук 1 студзеня 1947 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

У 1969 годзе з адзнакай закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. Працаваў галоўным ветэрынарным урачом саўгаса «Жабінкаўскі» Брэсцкай вобласці.

З 1973 па 1976 год Міхаіл Арсенцьевіч - аспірант кафедры ўнутраных незаразных хвароб Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. З 1975 года ён асістэнт кафедры.

Кандыдацкую дысертацыю па тэме «Особенности субклинических нарушений обмена веществ у коров, иммунобиологическая резистентность, состав молозива и заболеваемость телят в неонатальный период» абараніў у 1976 годзе. З 1982 года М. А. Макарук - дацэнт кафедры фізіялогіі. З верасня па чэрвень 1982 года знаходзіўся на стажыроўцы ў Маскоўскай ветэрынарнай акадэміі з мэтай вывучэння французскай мовы, пасля чаго быў накіраваны на выкладчыцкую працу ў Гвінейскую Народную рэспубліку, дзе знаходзіўся да кастрычніка 1986 года.

Дацэнт Макарук М. А. з'яўляецца аўтарам шэрагу пытанняў па паталагічнай фізіялогіі жывёл, уключаных у ветэрынарную энцыклапедыю (1994, 2013), тыпавой праграмы па паталагічнай фізіялогіі для вышэйшых сельскагаспадарчых навучальных устаноў (2001, 2008), навучальнага дапаможніка з грыфам Міністэрства адукацыі «Тыпавыя паталагічныя працэсы» (2011).

Ім апублікавана 76 навуковых і метадычных прац, сярод іх такія навучальна-метадычныя дапаможнікі, як «Патологические изменения в тканях», «Биологические аспекты опухолей», «Положение об инфекционном процессе», «Лейкограмма и ее диагностическое значение» і інш. Пад кіраўніцтвам Мікалая Арсенцьевіча выкананы магістарская дысертацыя і дыпломныя працы.

***Працы***

**Макарук, М. А.** Особенности субклинических нарушений обмена веществ у коров, иммунобиологическая резистентность, состав молозива и заболеваемость телят в неонатальный период : дис. … канд. ветеринарных наук : 16.00.11 / М. А. Макарук ; Витебский ветеринарный институт. – Витебск, 1976. – 156 с.

**Макарук, М. А**. Типовые патологические процессы : учебное пособие для студентов высших учебных заведений / М. А. Макарук [и др.] ; Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, Витебская государственная академия ветеринарной медицины. - Минск : ИВЦ Минфина, 2011. - 168 с.

**Мотузко, Н. С.** Общие этиология и патогенез : учебно-методическое пособие / Н. С. Мотузко, М. А. Макарук ; Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, Витебская государственная академия ветеринарной медицины, Кафедра нормальной и патологической физиологии. - Витебск : Витебская государственная академия ветеринарной медицины, 2001. - 11 с.

**Воспаление** : учебно-методическое пособие для факультета ветеринарной медицины и слушателей ФПК / М. А. Макарук, Н. С. Мотузко, Л. Л. Руденко и др. ; Учреждение образования «Витебская государственная академия ветеринарной медицины». - Витебск : ВГАВМ, 2004. - 22 с.

**Руденко, Л. Л.** Аллергия : учебно-методическое пособие / Л. Л. Руденко, М. А. Макарук ; Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, Учреждение образования «Витебская государственная академия ветеринарной медицины», Кафедра нормальной и патологической физиологии. - Витебск : Витебская государственная академия ветеринарной медицины, 2003. - 27 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Макарук Міхаіл Арсенцьевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 437. – (Імі ганарацца землякі).

**Макарук Міхаіл Арсенцьевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 90-92.

**70 гадоў** з дня нараджэння М. А. Макарука (1946) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 13.

**Макарук Михаил Арсентьевич** [Электронный ресурс] // УО «Витебская ордена «Знак почёта» государственная академия ветеринарной медицины. - Режим доступа: http://www.vsavm.by/kafedra-normalnoj-i-patalogicheskoj. - Дата доступа: 2.08.2017.

# МАЛАХОЎСКІ УЛАДЗІСЛАЎ ЮЛЬЯНАВІЧ

**МАЛАХОЎСКІ Уладзіслаў Юльянавіч** (1827–1900) - вынаходнік, інжынер, фотааматар, рэвалюцыянер. Адзін з кіраўнікоў паўстання 1863-1864 гадоў у Польшчы, Літве і Беларусі.



Нарадзіўся ў маёнтку Маце Стрыгаўскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (сёння ад маёнтка нічога не засталося, паблізу ёсць вёска Мацы Тэвельскага сельсавета Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Пасля хатняга навучання юнак набываў веды ў Свіслацкай гімназіі, якая адкрыла дарогу ў свет многім славутым людзям Беларусі. Закончыў Пецярбургскі інстытут інжынераў шляхоў зносін, быў накіраваны ў Вільню на будаўніцтва чыгункі.

У сталіцы Расійскай імперыі маладым чалавекам авалодалі ідэі барацьбы за пераўтварэнне грамадства. Уладзіслаў Малахоўскі наладзіў кантакты з тайнай рэвалюцыйнай арганізацыяй разначынцаў «Зямля і воля». У Пецярбургу пазнаёміўся з Кастусём Каліноўскім (1838–1864), які

вучыўся на юрыдычным факультэце ўніверсітэта.

У 1863 годзе Уладзіслаў Малахоўскі стаў адным з кіраўнікоў партыі «чырвоных»: займаў пасаду начальніка паўстанцаў Вільні. Уваходзіў у склад Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы, потым Выканаўчага аддзела Літвы. Яго бескампрамісная пазіцыя паўплывала на прызначэнне начальнікам аддзела па вынясенні і выкананні прыгавораў. Ён мог караць любога, каго палічыў асабліва вінаватым.

Ахранка правяла шматлікія арышты, набліжалася да выкрыцця Уладзіслава Малахоўскага, ён пакінуў Вільню. Са жніўня 1863 года знаходзіўся на нелегальным становішчы, выехаў у Пецярбург, потым у Кёнігсберг, дзе быў прадстаўніком К. Каліноўскага, удзельнічаў у выданні падпольнай газеты «Głos z Litwy», займаўся закупкай і дастаўкай зброі для паўстанцаў.

Пасля падаўлення паўстання У. Ю. Малахоўскі выехаў у Англію. З 1866 года жыў у Лондане пад прозвішчам Леон Варнерке. Ён пакінуў выношваць планы звяржэння самадзяржаўя, вырашыў заняцца інжынернай справай: распрацоўваць фатаграфічныя прылады. У англійскай сталіцы заснаваў уласную фірму, якая займалася фотасправай. Ужо праз пяць гадоў фірма «Варнерке і Ко» стала шырока вядомай ва ўсёй Заходняй Еўропе.



У. Ю. Малахоўскі набыў шырокую вядомасць шэрагам вынаходак у галіне фотатэхнікі. У 1875 годзе сканструяваў фотаапарат са скручанай касетай, які спецыялісты лічаць прататыпам сучасных аматарскіх камераў «Кодак».

Важны ўклад унёс У. Ю. Малахоўскі ў сам працэс фатаграфавання: фотапласцінкі ён замяніў на плёнку, пакрытую бромсерабром. Плёнка з нанесеным на яе такім матэрыялам лёгка скручваецца ў рулон, таму на ёй можна было рабіць некалькі кадраў. Кошт такой камеры быў высокі, але пакупнікі знаходзіліся. Яго адкрыццё выклікала пераварот у сусветнай фотасправе. У. Ю. Малахоўскі пачаў ездзіць па розных краінах і прапагандаваць свае адкрыцці.

У 1880-я гады У. Ю. Малахоўскі некалькі разоў пабываў у Расіі, у т. л. у Маскве і Пецярбургу, пад імем Льва Вікенцьевіча Варнерке ўдзельнічаў у фотавыстаўках, у заснаванні секцыі фатаграфіі Расійскага імператарскага тэхнічнага таварыства. У 1882 годзе на Усерасійскай выставе ў Маскве ўзнагароджаны сярэбраным медалём. Адкрыццямі нашага земляка захапляўся расійскі вучоны-хімік Дзмітрый Мендзялееў.

Фірма У. Ю. Малахоўскага імкліва развівалася. Сведчаннем гэтага служылі шматлікія філіялы не толькі ў Вялікабрытаніі, але і ў іншых еўрапейскіх краінах. Але, на жаль, дзейнасць фірмы была азмрочана абвінавачваннямі ў выкарыстанні фальшывых расійскіх рублёў адным з філіялаў лабараторыі ў 1898 годзе. У судзе віна У. Ю. Малахоўскага не была даказана, але беспадстаўныя абвінавачванні выклікалі ў яго цяжкія перажыванні. Нягледзячы на апраўдальны вердыкт суда, душэўнае супакаенне не прыйшло. 7 кастрычніка 1900 года Уладзіслаў Малахоўскі, не вытрымаўшы маральных пакут, скончыў жыццё самагубствам у Жэневе, там і быў пахаваны. А фальшывыя купюры пад назвай «варнеркі» і цяпер карыстаюцца попытам сярод калекцыянераў-баністаў.

Ідэямі У. Ю. Малахоўскага скарыстаўся амерыканскі бізнесмен Джордж Істмен (1854–1932), які першым выпусціў на рынак фотаапарат «Кодак» з касетамі са скручанай плёнкай. Цяпер фатографу не абавязкова было мець прафесійныя веды ў праяўленні матэрыялу і друку здымкаў, дастаткова было перадаць касету ў фоталабараторыю і атрымаць гатовыя здымкі.

…Невядома, ці з'явілася б фірма «Кодак», фотаапараты якой сёння карыстаюцца папулярнасцю ва ўсім свеце, калі б беларуская зямля не падарыла свету Уладзіслава Малахоўскага.

*Аб жыцці і дзейнасці*

**Кісялёў, Г.** Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч / Г. В. Кісялёў, В. Ф. Шалькевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2000. - Т. 10. - С. 14.

**Кісялёў, Г. В.** Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч / Г. В. Кісялёў // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. - Т. 6. - С. 571.

**Кісялёў, Г.** Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч / Генадзь Кісялёў, Вячаслаў Шалькевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1999. - Т. 5. - С. 57.

**Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. - Мінск, 1981. - Т. 5. Біяграфічны даведнік. - С. 392.

**Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 92-95.

**Малаховский Владислав Юльянович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 66-67.

**Матвейчык, Д.** Малахоўскі [Уладзіслаў] / Дзмітрый Матвейчык // Удзельнікі паўстання 1863-1864 гадоў : біяграфічны слоўнік / Дзмітрый Матвейчук. - Мінск, 2016. - С. 362.

**Марціновіч, А.** «Кодак – з паўстанцкай падсветкай». Уладзіслаў Малахоўскі / Алесь Марціновіч // Хто мы, адкуль мы… : гістарычныя эсе, нарысы : у 3 кн. / Алесь Марціновіч. - Мінск, 2008. - Кн. 2. - С. 212-226.

**Марціновіч, А.** Уладзіслаў Малахоўскі / Алесь Марціновіч // Гісторыя праз лёсы. Т. 7 / Алесь Марціновіч. – Мінск, 2019. – Кн. 2 - С. 147-154.

**Марчук, Н**. Кобринские корни «Кодака» / Нина Марчук // Паміж памяццю і гісторыяй (Малавядомыя старонкі гісторыі Кобрыншчыны і Берасцейшчыны) / Нина Марчук. – Кобрын, 2018. – С. 93-94.

**[Владислав Малаховский]** // Кастусь Калиновский : страницы биографии / В. Шалькевич. – Минск, 1988. – С. 68, 185, 186.

**Рублевская, Л.** Вино, кассеты и фальшивые банкноты. Владислав Малаховский (1827-1900) / Людмила Рублевская // Рыцари и дамы Беларуси : исторические очерки / Людмила Рублевская. - Минск, 2016. - С. 152-156.

**190 гадоў** з дня нараджэння У. Ю. Малахоўскага (1827) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 42-43.

**Да 185-годдзя** з дня нараджэння У. Ю. Малахоўскага // Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2012 год / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Дз. Курачук. – Кобрын, 2012. – С. 7.

**Марчук, Н.** Кобринские корни «Кодака» / Нина Марчук // Кобрин-информ. -2015. – 4 июня. - С. 7.

Об уроженце д. Мацы В. Малаховском, создателе прототипа фотоаппарата «Кодак».

**Капылоў, І.** Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч / Ігар Капылоў // Звязда. - 2013. -23 красавіка.

**Марчук, Н.** Брэсцкія карані «Кодака» / Ніна Марчук // Краязнаўчая газета. - 2008. – № 21 (230), чэрв. - С. 2.

**Марціновіч, А.** «Кодак» – з паўстанцкай падсветкай / Алесь Марціновіч // Маладосць. - 2006. - № 11. - С. 122-128.

Пра У. Малахоўскага, ураджэнца в. Мацы, займаўся фотасправай.

**Яновіч, М.** Уладзіслаў Малахоўскі / М. Яновіч // Народная воля. - 2005. - 14 красавіка. - С. 2.

**Вендровский, К. В.** «Вы нажимаете кнопку – мы делаем остальное» / Карл Валерианович Вендровский // Химия и жизнь. - 1988. - № 11. - С. 30–37.

Об истории фотоаппарата «Кодак»; об открытиях Владислава Малаховского.

# МАРТЫНАВА МАРЫЯ АЛЯКСЕЕЎНА

**МАРТЫНАВА Марыя Аляксееўна** – кандыдат хімічных навук.



Нарадзілася 23 студзеня 1952 года ў горадзе Кобрыне. Бацька Марыі Аляксееўны – вядомы даследчык гісторыі Кобрыншчыны, першы дырэктар музея імя А. В. Суворава, ганаровы грамадзянін горада Кобрына Аляксей Міхайлавіч Мартынаў.

У 1973 годзе Марыя Мартынава закончыла фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З 1978 года працуе ў Інстытуце біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі (да 2004 года - Інстытут фотабіялогіі НАН Беларусі).

З 1983 па 1986 год Марыя Аляксееўна праходзіла навучанне ў вочнай аспірантуры лабараторыі хіміі ліпідаў Інстытута біяарганічнай хіміі імя М. М. Шамякіна АН СССР (г. Масква), дзе ў 1987 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «біяхімія».

З 2005 года М. А. Мартынава ўзначальвае лабараторыю біяфізікі і інжынерыі клеткі інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Вобласць навуковых інтарэсаў: ліпідалогія, азонабіялогія і клеткавая інжынерыя. Марыя Аляксееўна з'яўляецца адным з вядучых навукоўцаў Беларусі ў галіне ліпідалогіі, вывучэння малекулярна-мембранных механізмаў фарміравання ўні- і мульціламелярных ліпасом, якія ўтрымоўваюць інкапсуляваны лекавы прэпарат.

М. А. Мартынавай праведзены работы па даследаванні ўмоў лакальнага асептавання пітнай вады «Аквадзіў» шляхам азанавання і распрацаваны тэхналагічны рэгламент на яе апрацоўку азонам перад разлівам і бутэляваннем, на падставе якога вырабляецца прадукцыя вышэйшай катэгорыі якасці і рэалізуецца ў гандлёвай сетцы.

Марыя Аляксееўна актыўна развівае ў лабараторыі новы напрамак - распрацоўку экспрэс-метадаў ацэнкі індывідуальнай адчувальнасці клетак да хіміяпрэпаратаў з выкарыстаннем першасных клетачных культур.

Мае 8 патэнтаў на вынаходства і карысныя мадэлі, з іх адзін патэнт на вынаходства СССР і адзін патэнт на вынаходства Расійскай Федэрацыі.

Апублікавана 120 навуковых прац, матэрыялы канферэнцый і з'ездаў.

За шматгадовую плённую навуковую дзейнасць, значны ўклад у развіццё навуковых даследаванняў у галіне біяфізікі Марыя Аляксееўна Мартынава ўзнагароджана граматамі шэрагу ўстаноў і Падзякай Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі (загад НАН Беларусі ад 23.01.2017 № 15-к).

***Працы***

**Академик** НАН Беларуси С. В. Конев : воспоминания современников / сост. М. А. Мартынова ; под ред. И. Д. Волотовского – Минск : Право и экономика, 2011. – 173 с. – (Серия «Людзі беларускай навукі»).

**Бушмакина, И. М**. Влияние липосомального «биена» на функциональную активность альвеолярных макрофагов / И. М. Бушмакина, Н. И Дроздова, М. А. Мартынова // Химико - фармацевтический журнал. - 2011. - № 1.- С. 51-53.

**Бушмакина, И. М**. Фагоцитарная активность альвеолярных макрофагов в присутствии липосомального «биена» / И. М. Бушмакина, Н. И Дроздова, М. А. Мартынова // Бюллетень экспериментальной биологии и медицины. - 2009. - Т. 147. - № 8. - С. 170-172.

**Скоринко, Е. В.** Условия локального асептирования питьевой воды «Аквадив» методом озонирования / Скоринко Е. В., Мартынова М. А., Бушмакина И. М., Дроздова Н. И., Молчан М. М., Юрченко И. С. // Водоснабжение и санитарная техника. - 2009. - № 11. - С. 14-20.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Мартынава Марыя Аляксееўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 95-97.

**65 гадоў** з дня нараджэння М. А. Мартынавай (1952) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 43.

**Раку** покажут комбинацию // Советская Белоруссия. – 2014. – 1 июля.

Заведующей лабораторией биофизики и инженерии клетки Института биофизики и клеточной инженерии Национальной академии наук работает уроженка г. Кобрина кандидат химических наук Мария Мартынова.

**Лаборатория** биофизики и инженерии клетки. Зав. лабораторией Мартынова Мария Алексеевна [Электронный ресурс] // Институт биофизики и клеточной инженерии. Национальной академии наук Беларуси. – Режим доступа: http://ibp.org.by/ru/?page_id=37. – Дата доступа: 4.09.2017.

**Мартынова М. А. :** краткая информация о научной деятельности / сост. кандидатом химических наук М. А. Мартыновой. – Минск, 2017.

# МЕЯРЭВІЧ КАНСТАНЦІН МІКАЛАЕВІЧ

**МЕЯРЭВІЧ Канстанцін Мікалаевіч** (1936–2018) - акадэмік Міжнароднай акадэміі арганізацыі вытворчасці, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі менеджменту, заслужаны будаўнік Расійскай Федэрацыі, Ганаровы грамадзянін горада Разані.



Нарадзіўся 26 студзеня 1938 года ў горадзе Кобрыне. Выпускнік сярэдняй школы № 2 Кобрына. Вучыўся ён выдатна і ў 16 гадоў закончыў школу з медалём.

У 1952 годзе К. Меярэвіч паступіў у Кіеўскі політэхнічны інстытут. У 1957 годзе закончыў інстытут, тады ж пачаўся яго працоўны шлях у будаўнічай галіне.

На Краснадарскім камбінаце будаўнічых матэрыялаў Канстанцін Мікалаевіч працаваў зменным і старшым майстрам, начальнікам кардоннага цэху. З 1966 па 1970 год узначальваў партыйную арганізацыю прадпрыемства. У 1970-1971 гадах - намеснік галоўнага інжынера камбіната.

Адукацыю Канстанцін Меярэвіч працягнуў у Ленінградскім інжынерна-эканамічным інстытуце, па заканчэнні якога ў 1971 годзе пераехаў у Разань. Тут яго чакала цікавая праца ў галіновай праектна-канструктарскай арганізацыі. Працаваў начальнікам Разанскага вытворча-тэхнічнага аб'яднання «Оргкровля» Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў (МПБМ) РСФСР. У 1977 годзе быў прызначаны дырэктарам Разанскага кардонна-рубероіднага завода, з 1992 года Канстанцін Мікалаевіч - генеральны дырэктар ЗАТ «Разанскі КРЗ».

Больш за 60 гадоў працоўнай дзейнасці Канстанціна Мікалаевіча прайшлі ў галіне будаўнічых матэрыялаў. З іх больш за 40 гадоў - генеральным дырэктарам на адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў. Прадпрыемства пад яго кіраўніцтвам стала перадавым, многія гады ўваходзіць у эліту будаўнічага комплексу не толькі рэгіёна, але і Расіі, станавілася лаўрэатам конкурсу «100 лепшых тавараў Расіі», пераможцам Усерасійскага конкурсу «Лепшыя расійскія прадпрыемствы».

Указам Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў ліпені 1994 года К. М. Меярэвічу прысвоена званне «Заслужаны будаўнік Расійскай Федэрацыі».

Канстанцін Мікалаевіч - лаўрэат нацыянальнай прэміі імя Пятра Вялікага ў намінацыі «За значны ўклад у стварэнне новых відаў канкурэнтаздольнай прадукцыі», лаўрэат конкурсу «СНД - дырэктар года 1999», пераможца Усерасійскага конкурсу «Менеджэр года» ў намінацыі «Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў» (1999), уладальнік сертыфіката «Лепшы кіраўнік арганізацыі будаўнічага комплексу» (2007).

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Залатым медалём імя акадэміка В. Ф. Уткіна, залатым медалём «Дырэктар года - 2001», медалямі «За дабрачыннасць», «За дабрыню і шчодрасць» абласнога фонду ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл, ганаровым знакам Расійскага саюза прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў «За вялікі ўклад у развіццё айчыннай прамысловасці і прадпрымальніцтва, стварэнне асноў рыначнай эканомікі», ганаровымі граматамі федэральнага і рэгіянальнага ўзроўню.




Пастановай мэра г. Разані ў красавіку 1996 года К. М. Меярэвічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Разані».

Яго радзіма - Беларусь, месца вучобы – Украіна, месца жыхарства – Расія. Свае родныя мясціны ў Беларусі К. М. Меярэвіч не забываў ніколі, наведваў рэгулярна. З землякамі чэрпаў сілы для жыцця і далейшай працы.

26 снежня 2018 года Канстанцін Мікалаевіч Меярэвіч памёр. Кніга Анатолія Говарава «Лидер. К. Н. Мееревич. Судьба в событиях и лицах» выйшла праз год пасля смерці, напярэдадні дня памяці нашага знакамітага земляка.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Мееревич Константин Николаевич** // Почетные граждане Рязанской области и города Рязани : биобиблиографический указатель / РОУНБ им. Горького. - Рязань, 2009.

**Меярэвіч Канстанцін Мікалаевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 97-98.

**80 гадоў** з дня нараджэння К. М. Меярэвіча (1936) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 13.

**Лидер** // Рязанские ведомости. – 2020. – 22 января.

О профессиональной деятельности и судьбе заслуженного строителя РФ, почетного гражданина г. Рязани К. Н. Мееревича.

**[Мееревич Констанин Николаевич]** : некролог // Рязанкие ведомости – 2018. – 28 декабря (№ 195). – С. 20.

**Шеламова, Т.** Свежий глаз / Татьяна Шеламова // Вечерний Брест. – 2013. – 25 июня.

Генеральный директор ЗАО «Рязанский картонно-рубероидный завод», председатель городской общественной организации «Рязанское землячество белорусов», почетный гражданин Рязани, уроженец Брестской области К. Мееревич в составе делегации посетил Брестчину.

**Говоров, А.** Успешный Мееревич / Анатолий Говоров // Рязанские ведомости. – 2011. - 27 января.

**Шугай, А.** 60-гадовы юбілей СШ № 2 / А. Шугай // Кобрынскі веснік. – 1995. – 15 лістапада. – С. 3.

У розныя гады ў СШ № 2 вучыліся, працавалі заслужаныя і знакамітыя выпускнікі і настаўнікі школы, у іх ліку Меярэвіч К. М. - заслужаны будаўнік Расіі.

**Меервич Константин Николаевич** // Администрация города Рязани : официальный сайт. – Режим доступа: http://admrzn.ru/gorod-ryazan/pochetnye-grazhdane/:5831. – Дата доступа: 2.102017.

**Меервич Константин Николаевич** // «Лучшие люди» : международная энциклопедия. – Режим доступа: http://bestpeople.name/ book/face/url/ MJEJERJEVICH_KONSTANTIN_ NIKOLAJEVICH/. – Дата доступа: 12.10.2018.

**Выпускники.** Ими гордится школа. **Меервич Константин Николаевич** // ГУО «Средняя школа № 2 г. Кобрина». - Режим доступа: http://sch2.kobrin.edu.by/ ru/main.aspx?guid=1391. – Дата доступа: 12.10 2018.

# МІХАЙЛАЎ ПАВЕЛ АЛЯКСАНДРАВІЧ

**МІХАЙЛАЎ Павел Аляксандравіч** - беларускі мовазнавец, педагог, спецыяліст у галіне дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі, анамастыкі, этналінгвістыкі, навуковай тэрміналогіі. Дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.



Нарадзіўся 13 кастрычніка 1950 года ў вёсцы Ушкавіца Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і Аляксандра Агафонавіча і Марыі Восіпаўны. Дзяцінства і юнацтва прайшло ў роднай вёсцы. У 1968 годзе закончыў сярэднюю школу № 1 г. Кобрына.

Пасля службы ў Савецкай арміі ў 1971 годзе Павел Міхайлаў паступіў на філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Надзелены матэматычным складам мыслення, аддаў перавагу мовазнаўству менавіта таму, што з усіх гуманітарных навук якраз лінгвістыка валодае найбольш дакладнымі метадамі даследавання.

Першымі завершанымі навуковымі даследаваннямі Паўла Міхайлава сталі працы «Батанічная тэрміналогія палескай гаворкі в. Сінкевічы Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці» і «Жанравая прырода «Слова аб палку Ігаравым», якія былі адзначаны дыпломамі на рэспубліканскім конкурсе навуковых работ. У студэнцкія гады з'явіліся і першыя публікацыі, якія сталі сведчаннем таго, што ў навуку прыйшоў даследчык са сваёй пазіцыяй, з тонкім адчуваннем слова і добрым веданнем прадмета даследавання. Педагагічны інстытут закончыў з адзнакай у 1975 годзе.

Пасля некалькіх месяцаў працы настаўнікам рускай і беларускай моў і літаратур Лелікаўскай сярэдняй школы Кобрынскага раёна П. А. Міхайлаў падаў дакументы для паступлення ў аспірантуру Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. Рэферат, прадстаўлены суіскальнікам для допуску, быў прысвечаны даследаванню жывёлагадоўчай лексікі вёскі Ушкавіца.

У лістападзе 1975 года П. А. Міхайлаў быў залічаны ў аспірантуру па спецыяльнасці «Беларуская мова». У красавіку 1976 года назначаны малодшым навуковым супрацоўнікам, пераведзены з дзённай аспірантуры на завочную. Аспірант актыўна ўзяўся за працу над кандыдацкай дысертацыяй. Вынікам карпатлівай навуковай працы стала паспяховая абарона 7 мая 1981 года дысертацыі «Лексіка беларускіх ганчароў», падрыхтаванай без адрыву ад працы, на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

Важным кірункам дзейнасці П. А. Міхайлава працяглы час была арганізацыя навукі. Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам сектара дыялекталогіі (1976–1982), вучоным сакратаром (1982–1986), загадчыкам аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР (1986–1991). У той час беларускі Інстытут мовазнаўства быў адной з найболыш аўтарытэтных лінгвістычных устаноў Савецкага Саюза.

У верасні 1991 года Павел Аляксандравіч перайшоў працаваць на пасаду дацэнта кафедры беларускага моваазнаўства Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, а яшчэ праз два гады стаў загадчыкам гэтай кафедры і ўзначальваў яе паўтара дзесяцігоддзі. Менавіта яго намаганнямі кафедра стала адным з найбольш вядомых навукова-педагагічных цэнтраў краіны. На кафедры вялася падрыхтоўка не толькі спецыялістаў у галіне беларусістыкі, але і выкладчыкаў польскай, літоўскай моў.

Вынікам шматгадовай самаадданай працы П. А. Міхайлава стала стварэнне ім і яго вучнямі навуковай школы сістэмна-структурнага вывучэння фаналогіі і лексікі беларускай мовы, якая афармілася на кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка.

Павел Аляксандравіч – аўтар больш за 140 навуковых і навукова-метадычных прац па разнастайных актуальных пытаннях сучаснай беларускай лінгвістычнай і метадычнай навукі. Ён вучоны сакратар савета па абароне дысертацый пры БДПУ імя М. Танка, член вучоных саветаў універсітэта і факультэта беларускай філалогіі і культуры.

Актыўны ўдзел прымаў П. А. Міхайлаў у падрыхтоўцы шэрагу найбольш аб'ёмных і арыгінальных праектаў у галіне беларускай дыялектаграфіі. Так, ён распрацаваў больш за 1700 слоўнікавых артыкулаў для «Слоўніка гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча» (у 5 т.; 1979–1986). Адзін і разам з суаўтарамі Павел Аляксандравіч падрыхтаваў каля 100 тэкставых узораў мясцовай гаворкі для «Тураўскага слоўніка» (у 5 т.; 1982–1987). Гэтыя слоўнікі на многія дзесяцігоддзі сталі ўзорам дыялектнай лексікаграфіі і набылі сусветную вядомасць.

П. А. Міхайлаў прымаў удзел у падрыхтоўцы міжнародных навуковых праектаў: «Агульнаславянскі лінгвістычны атлас», «Лінгвістычны атлас Еўропы», «Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці лексічнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы», «Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння».

Вучоны ўваходзіў у рэдкалегію першай беларускай «Матэматычнай энцыклапедыі» (2001), быў рэдактарам «Тэрміналагічнага слоўніка па вышэйшай матэматыцы для ВНУ» (1993), суаўтарам «Кароткага руска-беларускага тлумачальнага слоўніка па агульнай біялогіі» (1994), міжнароднай калектыўнай манаграфіі «Лексикографические штудии» (Масква, 2015). Дзякуючы найперш яго карпатлівай збіральніцкай працы ўбачыла свет унікальнае выданне «Лингвистика Беларуси: аннотированный указатель диссертаций (1991–2013)» (2015).

З'яўляецца аўтарам шэрагу базавых і тыпавых праграм для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ Рэспублікі Беларусь. П. А. Міхайлаў унёс важкі ўклад у падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Падрыхтаваў 8 кандыдатаў навук.

У сферы навуковых інтарэсаў вучонага беларуская дыялекталогія, лінгвагеаграфія, анамастыка, тэрміназнаўства і гісторыя лінгвістыкі. Некалькі дзясяткаў навуковых публікацый П. А. Міхайлаў прысвяціў пытанням беларускай акцэнталогіі. Навуковы кансультант часопіса «Роднае слова», член рэдкалегіі навуковых зборнікаў «Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння» (2009, 2011, 2013).

Імя Паўла Аляксандравіча Міхайлава, сумленнага даследчыка і адоранага педагога, добра вядома навукоўцам і выкладчыкам у Беларусі і далёка за яе межамі. Грунтоўныя веды, акадэмічны вопыт, вернасць аднойчы абранаму шляху дазваляюць заслужана лічыць яго адным з вядучых дыялектолагаў Беларусі. Узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», граматамі.

### *Працы*

**Міхайлаў, П. А.** Беларуская мова: тэматычны трэнажор: фанетыка. Арфаэпія. Арфаграфія : для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / П. А. Міхайлаў, А. К. Пекач, С. І. Фацеева. - Мінск, 2009.

**Міхайлаў, П. А.** Беларуская мова: тэматычны трэнажор: лексікалогія, фразеалогія, асновы стылістыкі : для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / П. А. Міхайлаў, С. І. Фацеева. - Мінск, 2008. – 118 с.

**Міхайлаў, П. А.** Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сэрэдняй адукацыі : тэксты дыктантаў / П. А. Міхайлаў. - Мінск, 2013.

**Міхайлаў, П. А.** Націск у асабовых формах дзеясловаў другога прадуктыўнага класа ў гаворцы вёскі Беражное Столінскага раёна / Павел Міхайлаў, К. Руц // Каб жыло наша Слова : зборнік навук. артыкулаў да 90-годдзя з дня нараджэння Фёдара Янкоўскага. - Брэст, 2009. - С. 61-64.

**Міхайлаў, П. А.** Тэсты для тэматычнага кантролю па беларускай мове 7-ы кл. : дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з беларус. і рус. мовамі навучання з 12-гад. тэрмінам навучання / П. А. Міхайлаў, М. І. Навумчык, С. І. Фацеева. - Мінск, 2005.

**Лексічныя** ландшафты Беларусі: Жывёльны свет / [І. Я. Яшкін, П. А. Міхайлаў, Я. М. Рамановіч і інш.] ; навук. рэд.: Ф. Д. Клімчук, І. Я. Яшкін ; АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. - Мінск : Навука і тэхніка, 1995. - 255 с.

**Дзятко, Д. В**. Мовазнаўцы : нарысы па гісторыі беларускай лінгвістыкі / Дзмітрый Дзятко, Павел Міхайлаў. - Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. - 495 с., [32] с. іл., партр.

**Шахоўская, С. У.** Назвы азёр Беларусі : слоўнік / С. У. Шахоўская ; [навуковы рэдактар П. А. Міхайлаў]. — Мінск : Медысонт, 2014. - 381 с.

**Шахоўская, С. У.** Беларуская анамастычная лексікаграфія: фарміраванне, сучасны стан, вектары развіцця / С. У. Шахоўская ; [навуковы рэдактар П. А. Міхайлаў]. - Мінск : Красная звезда, 2012. - 257 с. : іл., табл., парт., факсім.

**Шахоўская, С. У.** Назвы азёр Беларусі : слоўнік / С. У. Шахоўская ; [навук. рэд. П. А. Міхайлаў]. – Мінск : Медысонт, 2014. – 381 с.

**Міхайлаў, П.** Зачаравы родным словам : да 70-годдзя з дня нараджэння Алеся Зайкі / Павел Міхайлаў, Наталля Цяслюк // Роднае слова. - 2018. - № 8. - С. 26–29.

**Міхайлаў, П.** Даследчык палескіх скарабаў Фёдар Клімчук / Павел Міхайлаў // Роднае слова. - 2015. - № 2. – С. 38–40.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Дзятко, Д. В.** Міхайлаў Павел Аляксандравіч / Д. В. Дзятко, С. У. Шахоўская // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. - Мінск, 2014. - Т. 5.- С. 597.

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 438. - (Імі ганарацца землякі).

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Міхайлаў Павел Аляксандравіч** // Самая «першая» : інфармацыйна - бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 29-30. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Нацыянальная** мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння : навуковы зборнік да 60-годдзя Паўла Аляксандравіча Міхайлава / [рэдкалегія : Д. В. Дзятко (адк. рэдактар), А. В. Барысевіч, Н. П. Лобань і інш.]. – Мінск : Права і эканоміка, 2010. – 298 с.

**70 гадоў з дня нараджэння П. А. Міхайлава (1950)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 144.

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2017. - С. 99-101 : фат.

**Дзятко, Д.** Пра майго настаўніка : [да 65-годдзя Паўла Міхайлава, ураджэнца Кобрынскага раёна, беларускага мовазнаўца, педагога, спецыяліста ў галіне дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі] / Дзмітрый Дзятко // Роднае слова. - 2015. - № 10. - С. 48-49.

**Дзятко, Д.** Адданы беларускай навуцы : [да 60-годдзя Паўла Міхайлава, беларускага моваазнаўца] / Дзмітрый Дзятко // Роднае слова. - 2010. - № 10. - С. 33-35.

**Сарычев, В.** Школа моей мамы / Василий Сарычев // Вечерний Брест. - 2010. - 10 ноября. - С. 1-2. - (Вечёрочка).

Из стен СШ № 1 г. Кобрина вышли многие учёные, среди которых и белорусский языковед П. Михайлов.

# МІХУТА ІГАР ЮР'ЕВІЧ

**МІХУТА Ігар Юр'евіч** – кандыдат педагагічных навук, дацэнт.



Нарадзіўся ў 1985 годзе ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Выпускнік 2002 года сярэдняй школы № 1 Кобрына.

Закончыў факультэт фізічнага выхавання Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля ўніверсітэта паступіў у магістратуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Танка.

З 2016 па 2018 год Ігар Юр'евіч - загадчык кафедры спартыўных дысцыплін і методык іх выкладання Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, кіраўнік комплекснай навуковай групы па дзевяці відах спорту Рэспублікі Беларусь.

У 2019 годзе І. Ю. Міхута стаў лепшым на міжнародным конкурсе навукова-метадычных распрацовак маладых выкладчыкаў педагагічных ВНУ, каледжаў і арганізацый дадатковай прафесійнай педагагічнай адукацыі дзяржаў-удзельніц СНД «Вучымся вучыць».

Сёння Ігар Юр'евіч - дактарант дактарантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Танка.

### *Працы*

**Михута, И. Ю.** Повышение координационных способностей учащихся суворовских училищ на этапе начальной профессионально-прикладной физической подготовки : автореферат диссертации ... кандидата педагогических наук : 13.00.04 / Михута Игорь Юрьевич. — Минск, 2013. - 26 с.

**Михута, И. Ю.** Психофизическая пригодность воспитанников кадетских училищ к будущей военно-профессиональной деятельности / И. Ю. Михута // Педагогика, психология и медико-биологические проблемы физического воспитания и спорта. – 2012. - № 9. – С. 57-60.

**Михута, И. Ю** Факторная структура психофизической готовности суворовцев старшего школьного возраста к военно-профессиональной деятельности / И. Ю. Михута // Педагогика, психология и медико-биологические проблемы физического воспитания и спорта. – 2011. - № 3.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Міхута Ігар Юр'евіч** // Самая «першая» : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 31. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Михута, И. Ю.** Зажечь искру потребности к знаниям / Игорь Михута ; [беседовала] Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. - 14 июня. - С. 3.

Беседа с уроженцем г. Кобрина, кандидатом педагогических наук, доцентом И. Ю. Михутой.

**Кафедра** спортивных дисциплин и методик их преподавания. Зав. кафедрой И. Ю. Михута // Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна. – Рэжым доступу: http://www.brsu.by/be/div/kafedra-sportivnyh-distsiplin-i-metodik-ih-prepodavaniya. – Дата доступу: 15.10.2017.

**Банк** одаренной молодежи. Сотрудники университета: Михута Игорь Юрьевич, доцент кафедры спортивных дисциплин // Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина. – Режим доступа: http://www.brsu.by/div/bank-odarennoj-molodezhi. – Дата доступа: 12.10.2017.

**Все пять** преподавателей БГПУ стали победителями международного конкурса научно-методических разработок «Учимся учить» // Белорусский государственный университет имени Максима Танка. – Режим доступа: https://bspu.by/news/universitet/vse-pyat-prepodavatelei-bgpu-stali-pobeditelyami-mezhdunarodnogo-konkursa-nauchno metodicheskih-razrabotok-uchimsya-uchit. – Дата доступа: 20.10.2020.

И.Ю. Михута по результатам конкурса набрал максимальное количество баллов.

**Михута, Игорь Юрьевич** [Электронный ресурс] // Сводный электронный каталог библиотек Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/opac/pls/dict.prn_ref?tu=r&tq=v0&name_view=va_aall&a001=BY-SEK-ar1907114&strq=l_siz=20. – Дата доступа: 25.11.2020.

# МІЦКЕВІЧ ЮЛЬЯН АЛЯКСАНДР

**МІЦКЕВІЧ Юльян Аляксандр** (1801-1871) - юрыст, прафесар права. Малодшы брат паэта Адама Міцкевіча.



Нарадзіўся Аляксандр Міцкевіч 11 жніўня 1801 года ў Навагрудку Гродзенскай губерні. Пачатковую адукацыю атрымаў у Навагрудскай дамініканскай школе.

У 1823 годзе з адзнакай закончыў юрыдычны факультэт Віленскага ўніверсітэта. У час студэнцтва актыўна дзейнічаў у таварыстве філарэтаў, за што быў арыштаваны і ў лістападзе 1823 года - красавіку 1824 года адбываў зняволенне ў кляштары францысканцаў у Вільні. Адзін год працаваў у канцылярыі лясных спраў Валынскай губерні.

У 1825 годзе Ю. Міцкевіч удасканальваў юрыдычную адукацыю ў Пецярбургскім і Маскоўскім універсітэтах, дзе быў узнагароджаны як лепшы студэнт і ў 1826 годзе атрымаў званне «Магістр заканадаўчага і царкоўнага права».

Шэсць гадоў А. Міцкевіч быў выкладчыкам рымскага і літоўска-польскага права ў Крамянецкім ліцэі (Украіна).

У год адкрыцця Кіеўскага ўніверсітэта Святога Уладзіміра (1834 год, цяпер імя Т. Шаўчэнкі) абраны членам навуковай рады і прафесарам рымскага права ўніверсітэта.

Са студзеня 1838 года А. М. Міцкевіч - прафесар і дэкан юрыдычнага факультэта Харкаўскага ўніверсітэта. У жніўні 1858 года сышоў на пенсію і, вярнуўшыся ў родныя краі, набыў невялікі маёнтак Губерня пад Кобрынам, дзе пражыў больш 10 гадоў.

Тут ён працягваў займацца гісторыка-літаратурнай дзейнасцю. У перапынках паміж гаспадарчымі справамі рыхтаваў да друку навуковыя працы «Энцыклапедыя права» і «Курс рымскага права». Выдаў у Варшаве вучэбны дапаможнік па «Літоўскім Статуце» - «Пра ўплыў рымскага права на літоўска-польскае і расійскае заканадаўства». Публікаваў артыкулы «Пра побыт і этнаграфію сялян Кобрынскага павета».

За гады жыцця на Кобрыншчыне сям'ю Міцкевічаў неаднойчы наведвалі пляменнікі - дзеці Адама Міцкевіча - Уладзіслаў (упершыню наведаў Кобрын у 1861), Марыя (у 1862), пазней - Юзаф.

Аляксандр Міхайлавіч перажыў свайго старэйшага брата Адама на 16 гадоў. Высока цаніў яго як паэта. Сабраў велізарную бібліятэку ў памяць брата і перадаў у Кобрынскі хрысціянскі храм і Варшаўскую Акадэмію навук.



Памёр Аляксандр Міхайлавіч Міцкевіч 16 лістапада 1871 года і пахаваны на старых кобрынскіх могілках каля Петра-Паўлаўскай царквы. Захаваўся помнік на сямейнай магіле Міцкевічаў, дзе пахаваны Аляксандр, яго жонка Тэрэза і сын Францішак. Помнік уяўляе сабой вертыкальную кампазіцыю з фігурай анёла з крыжам, абвітым кляновай галінкай. Статуя выраблена па праекце Андрэя Прушынскага з Варшавы.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Мііцкевіч Юльян Аляксандр** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2000. – Т. 10. - С. 489-490.

**Міцкевіч Юльян Аляксандр** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1999. - Т. 5. - С. 218.

**Міцкевіч Юльян Аляксандр** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 64. – (Лёсам звязаны з Кобрыншчынай).

**Міцкевіч Юльян Аляксандр** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 102-104.

**Помнік** на магіле сям'і Міцкевічаў каля Петрапаўлаўскай царквы // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 152-153 : каляр. фота.

**215 гадоў** з дня нараджэння Ю. А. Міцкевіча (1801) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 14.

**Денисюк, О.** Александру Мицкевичу 210 лет / Ольга Денисюк // Кобрин-информ. - 2012. - 5 января. - С. 6.

**Шевченко, А**. Памятник Александру Мицкевичу в Кобрине / Алла Шевченко // Кобрин-информ. – 2007. – 19 апреля. – С. 14.

**Агеявец, А. М.** Маршрутны ліст экскурсійнай паездкі па славутых мясцінах Адама Міцкевіча / А. М. Агеявец // Народная асвета. – 2005. - № 11. – С. 68.

Адзін з маршрутаў – г. Кобрын, помнік брату пісьменніка – Ю. А. Міцкевічу.

**Климец, М.** Младший брат Адама Мицкевича / Михаил Климец // Заря. - 2002. – 9 апреля.

А. М. Мицкевич прожил на Кобринщине более 10 лет.

**Сущук, А.** Сближение литератур – сближение народов / А. Сущук // Кобрынск веснік. – 1997. – 6 снежня. – С. 2.

Упоминается брат Адама Мицкевича – А. Мицкевич, живший в Кобрине.

# ПАДПАЛАЎ УЛАДЗІСЛАЎ ПАЎЛАВІЧ

**ПАДПАЛАЎ Уладзіслаў Паўлавіч** – беларускі вучоны ў вобласці клінічнай медыцыны, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік аховы здароўя. Доктар медыцынскіх навук (1996), прафесар (2005).



Нарадзіўся 9 жніўня 1958 года ў вёсцы Імянін Буховіцкага сельсавета Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1975–1981 гадах вучыўся ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце, які скончыў Ленінскім стыпендыятам. З 1981 па 1983 год працягваў вучобу ў клінічнай ардынатуры на кафедры прапедэўтыкі ўнутраных хвароб Віцебскага медінстытута пад кіраўніцтвам аднаго з вядучых кардыёлагаў рэспублікі, выдатнага клініцыста і педагога, прафесара А. Г. Даўгяла.

З 1983 года У. П. Падпалаў працаваў урачом у Віцебскім абласным кардыялагічным дыспансеры. У 1985 годзе ён паступіў у вочную аспірантуру па тэрапіі пры кафедры прапедэўтыкі ўнутраных хвароб. З 1986 года ўся творчая і навуковая дзейнасць Уладзіслава Падпалава была звязана з акадэмікам, прафесарам Г. І. Садарэнкам. З 1988 года працаваў асістэнтам, з 1994 года – дацэнтам, з 1996 па 1997 год – прафесарам кафедры шпітальнай тэрапіі. За гады працы У. П. Падпалава прарэктарам Віцебскага медыцынскага інстытута (1997–2005) распрацоўваліся і ўкараняліся новыя канцэптуальныя падыходы развіцця аховы здароўя і ўдасканалення медыцынскай адукацыі.

Уладзіслаў Паўлавіч з'яўляўся намеснікам старшыні працоўнай групы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па падрыхтоўцы і рэалізацыі нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь на 2007–2010 гады. На падставе паглыбленага аналізу стану здароўя насельніцтва і дзейнасці лячэбна-прафілактычных устаноў г. Віцебска і Віцебскай вобласці пад кіраўніцтвам У. П. Падпалава распрацавана «Канцэпцыя ўмацавання здароўя насельніцтва Віцебскай вобласці і праграмныя кірункі яе рэалізацыі да 2015 года».

У. П. Падпалаў прайшоў курс навучання па тэрапіі і кардыялогіі Карнуэльскага ўніверсітэта (ЗША, 1996), курс прафесійнай перападрыхтоўкі на факультэце сацыяльнай медыцыны, арганізацыі і кіравання аховай здароўя БЕЛМАПА (2000–2002), на факультэце педагогікі і псіхалогіі ВДМУ (2002–2005). Знаёміўся з арганізацыяй аховы здароўя Італіі (2001), Чэхіі (2002), Нідэрландаў (2005) і Швецыі (2007).

Уладзіслаў Паўлавіч мае вышэйшыя кваліфікацыйныя катэгорыі ўрача-тэрапеўта і ўрача-арганізатара аховы здароўя. Ён з'яўляецца галоўным пазаштатным кардыёлагам упраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама. З 1999 года і па цяперашні час У. П. Падпалаў – загадчык кафедры тэрапіі № 1 ФПК і ПК Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

У 2000 годзе ён арганізаваў і ўзначаліў Беларускае грамадскае аб'яднанне па артэрыяльнай гіпертаніі. Пад яго кіраўніцтвам праведзена 8 міжнародных канферэнцый па дадзенай праблеме, у якіх прымалі ўдзел навукоўцы больш чым з 20 краін свету, у тым ліку з Расіі, ЗША, Канады, Швецыі, Польшчы, Грэцыі, Латвіі, Сірыі і інш. Неаднаразова прымаў удзел з дакладамі на вядучых міжнародных і еўрапейскіх кангрэсах, канферэнцыях і з'ездах, як у Рэспубліцы Беларусь, так і ў Расіі, Канадзе, Японіі, Францыі, Італіі, Іспаніі, Швецыі, Чэхіі, Галандыі, Польшчы, Грэцыі і іншых краінах. Ёсць публікацыі ў англамоўных часопісах.

Уладзіслаў Паўлавіч мае навуковыя працы па дэмаграфічнай бяспецы ў Рэспубліцы Беларусь і ролі ў ёй сардэчна-сасудзістай паталогіі ў насельніцтва, у прыватнасці, у пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС; па распрацоўцы медыкамянтозных і немедыкамянтозных метадаў карэкцыі. Кіруе фундаментальнымі і прыкладнымі навуковымі даследаваннямі ў вобласці аховы здароўя, дэмаграфіі, прафілактычнай медыцыны і

кардыялогіі. Аўтар больш за 350 навуковых і навукова-метадычных прац, 7 вынаходстваў, 6 з якіх абаронены патэнтамі. Член экспертнай камісіі Навуковага медыцынскага Савета Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, член рэдакцыйных саветаў двух замежных і трох айчынных часопісаў.

За ўклад у практычную дзейнасць па ахове здароўя насельніцтва ў 2001 годзе прафесару У. П. Падпалаву была ўсталявана персанальная надбаўка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Навуковец узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2007), нагрудным знакам «Выдатнік аховы здароўя», памятным медалём «За заслугі развіцця ВДМУ», медалём «Сто гадоў прафсаюзам», ганаровымі граматамі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта і Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў. 12 сакавіка 2014 года прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь».

***Працы***

**Подпалов, В. П.** Прогностическое значение параметров вариабельности ритма сердца как фактора риска развития артериальной гипертензии/ В. П. Подпалов, А. Д Деев, В. П. Сиваков, Л. А. Розум // Кардиология. – 2016. - Т. 46 (№ 1). - С. 39-42.

**Подпалов, В. П.** Ремоделирование сердечно-сосудистой системы у пациентов с артериальной гипертензией I и II степени / В. П. Подпалов, Н. С. Балашенко // Вестник Витебского государственного медицинского университета. – 2015. - № 14 (1).

**Подпалов, В. П.** Распространенность факторов риска в зависимости от уровней артериального давления в городской неорганизованной популяции (данные одномоментного исследования) / В. П. Подпалов, А. И. Счастливенко, А. Д. Деев, О. Н. Журова, Н. Н. Огризко // Кардиология в Беларуси. – 2012. - № 8. – С. 76-88.

**Подпалов, В. П.** Влияние факторов риска на распространенность артериальной гипертензии / В. П. Подпалов, А. Д. Деев, А. И. Счастливенко // Рецепт. – 2007. – № 1. – С. 61-66.

**Подпалов, В. П.** Прогнозирование развития и прогрессирования артериальной гипертензии / В. П. Подпалов, В. П. Сиваков // ВГМУ. – 2005. - № 2.

**Подпалов, В. П.** Формирование дизадаптационного синдрома у населения, проживающего на территориях, загрязненных радионуклидами в результате аварии на Чернобыльской АЭС / В. П. Подпалов // Здравоохранение Беларуси. – 1994. - № 5. – С. 36-39.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Подпалов Владимир Васильевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 245.

**Подпалов Владислав Павлович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск, 2008. - Т. 6. - С. 129.

**Падпалаў Уладзіслаў Паўлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2017. - С. 104–106.

**60 гадоў** з дня нараджэння Падпалава Уладзіслава Паўлавіча // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 71.

**Подпалов, В. П.** «Нас должно быть больше!» / В. П. Подпалов ; [беседовала] Елена Бегунова // Рэспубліка. - 2007. - 17 студзеня. - С. 1, 3.

К работе над проектом Национальной программы демографической безопасности Республики Беларусь привлекались лучшие специалисты страны, в т.ч. председатель правления Белорусского общ. объедин. по артериальной гипертензии В. Подпалов.

**Рыжкова, Н.** Кардиология завтрашнего дня сегодня / Н. Рыжкова // Витебские вести. - 2015. - 24 января. - С. 1–2.

Доктор медицинских наук и практикующий кардиолог, профессор ВГМУ В. П. Подпалов удостоен звания заслуженного деятеля науки.

**Падпалаў Уладзіслаў Паўлавіч** (1958, Кобр. р-н), вучоны ў галіне клінічнай медыцыны, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік аховы здароўя – 60 гадоў з дня нараджэння // Новыя кнігі: па старонках беларускага друку. – 2017. - № 9. – С. 8. – (Дадатак да бюлетэня. Беларускі каляндар. 2018 год).

**Рыжкова, Н.** Витебский кардиолог Владислав Подпалов удостоен звания заслуженного деятеля науки Беларуси / Наталья Рыжкова // Витебские вести. - 2015. – 25 января.

**Подпалов** Владислав Павлович [Электронный ресурс] // Витебский государственный ордена Дружбы народов медицинский университет. – Режим доступа: http://www.vsmu.by/about-vsmu.htmlhttp://www.vsmu.by/nir/58-persons/2261-podpalov-vladislav-pavlovich.html/ - Дата доступа: 27.09.2017.

# ПАНАСЮК ІВАН ПАЎЛАВІЧ

**ПАНАСЮК Іван Паўлавіч** - кандыдат філасофскіх навук, грамадскі дзеяч, прадпрымальнік, мецэнат.



Нарадзіўся 14 красавіка 1960 года ў вёсцы Лелікава Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і каваля і даяркі. Пасля васьмі класаў паступіў у Мінскае суворaўскае вучылішча, выбраўшы ваенную прафесію. Вучылішча закончыў амаль на выдатна, з адной чацвёркай у атэстаце. Здольны малады чалавек змог бы паступіць у любую вышэйшую навучальную ўстанову Савецкага Саюза, але яго вабілі сібірскія абшары, нязведаная зямля, і ён выбраў Новасібірскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча, якое ў 1981 годзе закончыў з адзнакай.

Служыў Іван Панасюк у Забайкаллі, праз пяць гадоў з павышэннем перавялі служыць на новае месца – у г. Кызыл Тувінскай АССР. Службу праходзіў на пасадах намесніка камандзіра роты, намесніка камандзіра батальёна па палітычнай частцы, сакратара партыйнага камітэта палка (Манголія, Хакасія, Тува). Пасля заканчэння ў 1993 годзе Ваенна-палітычнай акадэміі быў накіраваны ў Сібірскую ваенную акругу, дзе служыў намеснікам камандзіра палка па выхаваўчай рабоце.

У 1993 годзе І. П. Панасюк выйшаў у адстаўку і заняўся прадпрымальніцкай дзейнасцю. Час паказаў, што яму і гэта справа падуладна, і неўзабаве ён узначаліў савет дырэктараў вядомай у Сібіры групы кампаній «Еўропа-Азія». Створаныя І. П. Панасюком прадпрыемствы эфектыўна працуюць у розных галінах эканомікі, перавага – вытворчай сферы, сацыяльнай накіраванасці бізнесу. Эфектыўны прадпрымальнік, удзельнік Праграмы Расійскага лідарства ў 2001 годзе быў запрошаны для ўдзелу ў Расійскай праграме лідарства Бібліятэкі Кангрэса ЗША «Открытый мир», паспяхова прайшоў навучанне па тэме «Федэралізм і рэгіянальная палітыка (ЗША, штат Луізіяна, Новы Арлеан)».

І. П. Панасюк – паліттэхнолаг, спецыяліст па выбарчых сістэмах. Паспяхова правёў некалькі выбарчых кампаній. Быў назіральнікам ад СНД на прэзідэнцкіх выбарах Рэспублікі Беларусь. Закончыў аспірантуру Сібірскай акадэміі дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі. Абараніў дысертацыю «Избирательная система как фактор трансформации современного российского общества (социально-философский анализ)» (2004), атрымаў навуковую ступень кандыдата філасофскіх навук. Кандыдацкая дысертацыя

была першай працай на яго навуковым шляху, потым ён падрыхтаваў да выдання сваю другую працу – манаграфію на тэму «каляровых рэвалюцый» на постсавецкай прасторы.

Іван Паўлавіч ніколі не забываў пра Беларусь, пра сваю малую радзіму. З групай аднадумцаў узяўся за стварэнне ў Новасібірску беларускага культурна-асветніцкага цэнтра, з дапамогай якога можна было б хоць неяк паменшыць настальгію па родных мясцінах. З часу заснавання цэнтра (12 красавіка 2002 года) І. П. Панасюк – старшыня праўлення Новасібірскай гарадской грамадскай арганізацыі «Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр у імя святой Еўфрасінні Полацкай».

І. П. Панасюк добра вядомы ў Расіі і за яе межамі мецэнат. У 2002 годзе пры яго актыўным фінансавым удзеле ў Новасібірску быў узведзены храм у гонар беларускай святой Еўфрасінні Полацкай. Па даручэнні Мітрапаліта Філарэта асвячэнне храма правёў епіскап Брэсцкі і Кобрынскі Іаан. У Новасібірску таксама не без удзелу нашага земляка працуе «беларускі канал» на гарадскім тэлебачанні, выходзіць газета «Мая Радзіма».

Як і многія дзелавыя людзі, Іван Паўлавіч жыве на некалькі краін. Значную частку часу праводзіць, напрыклад, у Іспаніі, дзе мае інтарэсы бізнесу. І, вядома, шмат часу праводзіць у роднай вёсцы. У свой летні адпачынак Іван Панасюк з сям'ёй абавязкова едзе на малую радзіму, дзе ён узвёў сельскую сядзібу з гасцявым домам. Шматгадовая дапамога роднай школе, вясковай бібліятэцы, сельскаму Дому культуры, дзіцячым дамам, школам-інтэрнатам і іншае рабілася і робіцца ім для землякоў.

Найлепшае пацвярджэнне сказанага – удзел у рэстаўрацыі мясцовай царквы (помнік архітэктуры драўлянага дойлідства XVIII ст.), і асабліва ў святкаванні... 

Шмат чаго зроблена ім па добраўпарадкаванні вёскі Лелікава. Асабліва значна набыццё для роднай вёскі з дапамогай сібірскага земляка спартыўнага комплексу для вялікага тэніса, які адпавядае міжнародным стандартам, паспяхова функцыянуе з 2005 года, дзе бясплатна займаюцца дзеці і дарослыя, праводзяцца ветэранскія і дзіцячыя турніры.

27 верасня 2004 года І. П. Панасюк першым з грамадзян Расіі быў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Узнагароду за вялікі асабісты ўклад у культурна-асветніцкую дзейнасць, прапаганду духоўнай спадчыны беларускага народа ў Расійскай Федэрацыі ўручыў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. Іван Паўлавіч Панасюк – дэлегат III Усебеларускага народнага сходу (2006), выступаў на ім па даручэнні беларусаў замежжа.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Андреевец, Г.** В краю белых птиц / Григорий Андреевец // Две родины : в 2-х ч. / Григорий Андреевец. - М., 2009. - Ч. 2. - С. 455-472.

Жизненный путь И. П. Панасюка, уроженца д. Леликово Кобринского района**.**

**Кунц, Н. З.** Панасюк Иван Павлович / Н. З. Кунц // Гордость кадетского братства: выпускники суворовских военных и нахимовских военно-морских училищ, добившихся государственной и общественной известности / Н. З. Кунц. - М., 2010. - С. 438-440 :фат.

**Панасюк Іван Паўлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2017. - С. 107-110 : фат.

**60 гадоў** з дня нараджэння І. П. Панасюка (1960) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 145.

**Вечорко, С.** Нужно дома бывать не гостем / Светлана Вечорко // 7 дней. - 2019. - 15 августа. - С. 17.

Бизнесмен-меценат Иван Панасюк благоустраивает родную деревню Леликово в Кобринском районе.

**Яскевіч, С**. Сын малой радзімы / Святлана Яскевіч // Звязда. - 2019. - 7 верасня. – С. 11.

Расійскі бізнесмен і мецэнат І. Панасюк дапамагае добраўпарадкоўваваць родную в. Лелікава.

**Мы** з Кобрыншчыны. Іван Панасюк // Кобрынскі веснік. - 2018. - 14 ліпеня. - С. 2.

І. Панасюк - кандыдат філасофскіх навук, ураджэнец в. Лелікава – аб сваёй малой радзіме.

**Казакова, А**. Белорусский сибиряк / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. - 8 сентября. - С. 4, 5.

Уроженец д. Леликово И. П. Панасюк - крупнейший предприниматель, общественный деятель, кандидат философских наук, меценат, награжденный в 2004 году медалью Франциска Скорины «За пропаганду белорусского наследия».

**Іван** Панасюк: «Галоўная каштоўнасць – людзі» // Кобрынскі веснік. - 2013. – 20 ліпеня. – С. 12.

**Андреевец, Г.** В краю белых птиц : очерк / Григорий Андреевец // Неман. - 2009. - № 2. – С. 130-138.

У истоков всех больших начинаний по зарождению белорусскости в Сибири стоит наш земляк И. П. Панасюк.

**Васюк, Н.** Иван Панасюк: «Я родом из Леликово!» / Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2006. - 7 сентября. - С. 3.

В 2004 году И. П. Панасюк первым из граждан России был награжден белорусской медалью Франциска Скорины.

**Куварына, Т.** Край, куды вяртаюцца буслы / Таццяна Куварына // Маладосць. - 2006. - № 11. - С. 106-111.

І. П. Панасюк – чалавек, які імкнецца адрадзіць свой родны край.

**Куварина, Т**. Деревня, в которую возвращаются аисты / Татьяна Куварина // Нёман. - 2006. - № 12. - С. 157–165.

Об открытии тенисного спортивного клуба в д. Леликово.

**Панасюк, И.** «Мы не спрашиваем, что Родина сделала для нас, мы спрашиваем себя: что мы сделали для Родины?» / И. Панасюк ; [беседовала] Наталья Счастная // Белорусская нива. - 2006. - 18 апреля. - С. 4.

**Семаков, В.** Из Сибири – с любовью / Виктор Семаков // Советская Белоруссия. - 2006. - 2 марта.

**Пятроўская, М**. Жыве ў Сібіры беларус / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. - 2005. - 5 лютага.

**Панасюк, И**. День белорусской культуры – 2004 / И. Панасюк // Мая Радзіма. – 2004. – июнь. – С. 1.

Председатель Правления БКПЦ И. Панасюк от имени членов Белорусского культурно-просветительского центра во имя святой Евфросинии Полоцкой – ко Дню белорусской культуры.

**Панасюк, И. П.** «Я никогда не стыдился того, что я родом из деревни» / [Иван Павлович Панасюк ; беседовал] Виктор Гарбыш // Мая Радзіма. - 2004. - июнь. - С. 12, 13.

**Тактасунава, Н**. Панасюк Іван Паўлавіч / Наталля Тактасунава // Мая Радзіма. - 2004. - 20 мая. - С. 9.

І. Панасюк добра вядомы ў Расіі і за яе межамі мецэнат.

**Панасюк, І**. Размова пра свята з чалавекам, які падарыў яго землякам / [Іван Панасюк ; гутарыў] Сымон Свістуновіч // Звязда. - 2003. - 2 верасня. - С. 3.

**Панасюк, И. П**. Сибирский полешук / [Иван Павлович Панасюк ; беседовал] Анатолий Гурин // Российская газета. - 2003. - 23 октября.

**Панасюк, И.** «Я никогда не стыдился того, что родом из деревни» / Иван Панасюк; [беседовал] Виктор Гаврыш // Крыніца. - 2003. - № 10. - С. 30-33.

**Белорусский** культурно-просветительский центр во имя святой Евфросинии Полоцкой [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://bkpc.ru. – Дата доступа: 13.03.2020.

**Иван Панасюк** – наш человек в Новосибирске [Электронный ресурс]. // Минское ВВПОУ. - Режим доступа: https://minpolit.com/vypuskniki/ivan-panasyuk-nash-chelovek-v-novosibirske/ - Дата доступа: 13.03.2020.

**14 красавіка 2020** г. – 60 гадоў з дня нараджэння Івана Паўлавіча Панасюка (1960), грамадскага дзеяча, кандыдата філасофскіх навук, прадпрымальніка, мецэната [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Рэжым доступу: http://kb.brl.by/index. – Дата доступу: 24.03.2020.

# ПАСВЯНЧУК ІВАН АЛЯКСАНДРАВІЧ

**ПАСВЯНЧУК Іван Аляксандравіч** - вынаходнік, доктар філасофіі ў галіне інфармацыйных тэхналогій (машынабудаванне).



Іван Пасвянчук нарадзіўся 13 красавіка 1947 года ў вёсцы Лука Кобрынскага раёна. Сярэднюю адукацыю атрымаў у школе працоўнай моладзі ў г. Кобрыне. Працаваў на прадпрыемствах Кобрына і раёна фрэзероўшчыкам, шафёрам.

У 1974 годзе закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі па спецыяльнасці «інжынер».

Універсітэтамі Івана Аляксандравіча стала праца загадчыкам рамонтнымі майстэрнямі ў саўгасе «Дружба» Кобрынскага раёна, галоўным інжынерам калгаса імя Кутузава і калгаса «За мір» Кобрынскага раёна. За час працы ў гэтых гаспадарках І. А. Пасвянчук паказаў сябе як вынаходнік і рацыяналізатар. Пад яго кіраўніцвам былі праведзены рэспубліканскія семінары па вытворчасці новых машын на базе спісанай сельгастэхнікі.

Потым была праца ў інстытуце «Брэстсельгасбудпраект» інжынерам-тэхнолагам, выконваючым абавязкі дырэктара па камплектацыі аб’ектаў будаўніцтва, галоўным спецыялістам.

З 2001 года І. А. Пасвянчук працуе дырэктарам ААТ «Двигатель» у г. Брэсце.

Вынаходніцкай дзейнасцю Іван Пасвянчук займаўся са студэнцкіх гадоў. За аснову свайго вынаходства ён узяў магчымасць утварэння цягі на прынцыпах, якія адрозніваюцца ад рэактыўных. У 1976 годзе Пасвянчук падаў заяўку на вынаходства. Але яму было адмоўлена: вучоны савет палічыў, што ні адзін рухавік не можа працаваць, калі яго прылада супярэчыць рэактыўным законам механікі. Аднак у 2003 годзе мадэль была зроблена і паспяхова запрацавала. І толькі пасля гэтага з'яўленне ўнікальнага «Движителя» было зарэгістравана Камітэтам Расійскай Федэрацыі па патэнтах і таварных знаках, Дзяржаўным патэнтным камітэтам і Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці Рэспублікі Беларусь, а таксама Еўразійскай патэнтнай арганізацыяй. Вынаходства адносіцца да вобласці энэргетычных установак, у прыватнасці, да рухавікоў, якія пераўтвараюць круцільны паток газу ў цягавае намаганне, і можа быць выкарыстана ў многіх галінах народнай гаспадаркі.

І. А. Пасвянчук, правёўшы ўласныя даследаванні, распрацаваў «Двигатель» і «Движитель», праца якіх заснавана на нерэактыўных прынцыпах. У выніку ўпартай шматгадовай працы навукоўца атрыманы эфект, заснаваны на віхравых струменях. Акрамя таго, у якасці прывада «Движителя» можа выступаць любы тып рухавіка. Гэта і ёсць не што іншае, як прарыўная тэхналогія, пра што сведчаць выдадзеныя на яе шматлікія аўтарытэтныя патэнты.

Пасля аналізу праведзеных даследаванняў унесены змены ў закон механікі, аспрэчана сцвярджэнне аб нязменнасці колькасці руху, складзена новае ўраўненне, якое

растлумачвае, што колькасць руху, энергія і праца здольныя пераходзіць з аднаго стану ў іншыя.

Незвычайны прыбор пад назвай рухавік, абаронены патэнтамі Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Беларусь і Еўразійскай патэнтнай арганізацыяй, здольны зрабіць фурор у галіне беларускага машынабудавання і авіяцыі.

Міжнародная Акадэмія Інфармацыйных Тэхналогій у 2014 годзе ўзнагародзіла Пасвенчука Івана Аляксандравіча медалём М. С. Высоцкага (*Высоцкі М. С. - савецкі і беларускі вучоны, Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Герой Беларусі, стварыў беларускую школу канструявання і даследавання грузавых аўтамабіляў*).

Па сукупнасці вынаходак, абароненых патэнтамі Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Беларусь і Еўразійскай патэнтнай арганізацыі, І. А. Пасвенчуку ў 2015 годзе была прысвоена вучоная ступень доктара філасофіі ў галіне інфармацыйных тэхналогій (машынабудаванне).

У перспектыўных планах Івана Аляксандравіча – укараненне «Движителя» на мотадэльтапланах, глісерах, у аўтатрактарнай тэхніцы.

**Посвенчук Іван Іванович** [Электронный ресурс] // База патентов Беларуси. – Режим доступа: http://bypatents.com/patents/posvenchuk. – Дата доступа: 4.09.2017.

**Посвенчук, И. «**Мои «двигатель» и «движитель» можно будет эксплуатировать в воздушном, водном, безвоздушном пространстве, а также в смешанном режиме без внесения существенных изменений в их конструкцию» / И. Посвенчук // Международная деловая газета. – 2015. - № 11-12. – С. 4.

***Аб жыцці і дзейнасці***

«**В Беларуси** немало талантов...» : [стихотворение] // Кобрин-информ. - 2017. - 13 апреля. – С. 24.

Стихотворение посвящено юбиляру - изобретателю И. А. Посвенчуку.

**Савчук, М.** Необычный прибор – движитель / Маргарита Савчук // Кобрин- информ. – 2014. – 23 января – С. 7.

Ученая степень доктора философии в области информационных технологий в области машиностроения присвоена уроженцу д. Луки И. А. Посвенчуку.

**Против** правил работает Движитель из Бреста // 5-е колесо. – 2006. - № 6. – (Приложение).

Необычный прибор под названием Движитель изобретателя Ивана Посвенчука, уроженца д. Луки, способен произвести фурор в области белорусского машиностроения.

# ПАЎЛОВІЧ СЯРГЕЙ КАНСТАЦІНАВІЧ

**ПАЎЛОВІЧ Сяргей Канстанцінавіч** (1875-1940) – кандыдат багаслоўскіх навук, беларускі грамадскі, культурна-асветны дзеяч, педагог, публіцыст. З'яўляецца адной з выдатных, але незаслужана забытых асобаў беларускага духоўнага асветніцтва.

Нарадзіўся 13 верасня 1875 года ў вёсцы Осаўцы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сям'і святара.

У Дзяржаўным цэнтральным архіве Літвы захавалася яго а ўтабіяграфія.

*Аўтабіяграфія*

*Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч. Па паходжанні беларус, нарадзіўся ў Кобрынскім павеце Гродзенскай губерні ў 1875 г. Мае польскае грамадзянства. Скончыў Літоўскую духоўную семінарыю (у 1896 г.) і Кіеўскую духоўную акадэмію (у 1900 г.) са ступенню кандыдата багаслоўя.*

*На службе з 1900 года. Педагагічнай працай займаецца 19 гадоў без перапынку, у тым ліку 13 гадоў выкладчыкам і 6 гадоў інспектарам народных вучылішч Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні.*

*Цягам 4 гадоў выкладаў рускую мову, методыку і літаратуру ў Рагачоўскай (Магілёўская губ.) настаўніцкай семінарыі, Мінскай гімназіі і на педагагічных курсах для народных настаўнікаў.*

*С. Паўловіч*

Закончыў Літоўскую духоўную семінарыю ў Вільні, пасля вучыўся ў Кіеўскай духоўнай акадэміі, дзе вялікая ўвага надзялялася вывучэнню гісторыі царквы на Украіне і Беларусі, таму тэмай дысертацыі быў абраны Замойскі ўніяцкі сабор 1720 года. Кандыдацкую дысертацыю С. К. Паўловіч абараніў са ступенню кандыдата багаслоўя (1900).

Першым прызначэннем маладога педагога было Каргопальскае духоўнае вучылішча на Украіне. З восені 1903 года ён перабраўся ў Беларусь, выкладаў у Жыровіцкім духоўным вучылішчы. У сувязі з адкрыццём у 1909 годзе Рагачоўскай мужчынскай настаўніцкай семінарыі С. К. Паўловіч прызначаны выкладчыкам Закону Божага. Неўзабаве педагагічныя здольнасці С. К. Паўловіча былі заўважаны кіраўніцтвам Віленскай вучэбнай акругі, і ў 1913–1918 гадах ён служыў інспектарам народных вучылішчаў Ваўкавыскага павета.

Асаблівае месца ў жыцці і дзейнасці С. К. Паўловіча займае Вільня – цэнтр культурнага і грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі. Туды сям'я Паўловічаў перабралася ў пачатку 1920-х гадоў, калі вярнулася з эвакуацыі, дзе яны апынуліся ў сувязі з Першай сусветнай вайной. У Вільні Сяргей Канстанцінавіч працаваў выкладчыкам Закону Божага ў Віленскай беларускай гімназіі, быў інспектарам, а ў навучальным годзе 1927–1928 займаў пасаду дырэктара гэтай гімназіі.

Педагагічная і грамадская дзейнасць С. К. Паўловіча была цесна звязаная з Таварыствам беларускай школы, некаторы час ён уваходзіў у склад кіраўніцтва гэтай культурна-асветніцкай арганізацыі. Ён рэдагаваў часопісы «Летапіс Таварыства беларускае школы» (з 1936 года – «Беларускі летапіс») і «Беларускі каляндар», якія выдаваліся ТБШ. Акрамя таго, С. К. Паўловіч дапамагаў Беларускаму выдавецкаму таварыству, быў сябрам Беларускага навуковага таварыства, выступаў з рэфератамі па гісторыі хрысціянства на яго пасяджэннях.

Праца С. К. Паўловіча на пасадзе дырэктара Віленскай беларускай гімназіі і асабліва ў Галоўнай управе Таварыства беларускай школы па-свойму была ацэненая польскай адміністрацыяй. Яго двойчы, у 1930 і 1933 гадах, арыштоўвалі ў Лукішскі астрог, хоць ён не належаў ні да якой партыі. У канцы 1936 года дзейнасць Таварыства была забаронена польскім урадам.

Вялікую ўвагу С. К. Паўловіч надаваў адукацыі сялянскіх дзяцей і самаадукацыі простага люду. Ужо ў 1926 годзе была надрукавана падрыхтаваная С. К. Паўловічам «Свяшчэнная гісторыя Старога Завету. Для беларускіх пачатковых школ і малодшых класаў гімназій». Падручнік карыстаўся вялікай папулярнасцю, што выклікала незадаволенасць польскай адміністрацыі. «Свяшчэнную гісторыю Новага Завету» аўтару ўдалося выдаць толькі праз дзесяць гадоў, у 1936 годзе, пасля захадаў створанай у Вільні спецыяльнай камісіі па падрыхтоўцы беларускіх падручнікаў. Таксама выйшлі «Першая навука Закону Божага. Падручнік для пачатковай школы (I-V аддзелы)» (Варшава, 1935) і «Свяшчэнная гісторыя Новага Завету. Падручнік для беларускіх школаў і самаадукацыі» (Вільня, 1936). У гэтых выданнях С. К. Паўловіч выкладае асноўны змест гісторыі Старога і Новага Запавету на роднай мове, у даступнай і цікавай для дзяцей форме.

У 1936 годзе ў Варшаве пабачыў свет укладзены С. К. Паўловічам падручнік «Першая навука Закону Божага» (2-е выданне, папраўленае і дапоўненае), які ўключаў раздзелы «Аб малітве», «Кароткая Свяшчэнная гісторыя», «Праваслаўная вера», «З царкоўнай гісторыі», «Праваслаўная вера на Беларусі». Арыгінальнасць падручніка не толькі ў аўтарскіх перакладах Свяшчэннага пісання і дакладным тлумачэнні асноўных палажэнняў праваслаўнай веры: у ім упершыню па-беларуску прыводзяцца жыціі беларускіх святых, апісанні шанаваных цудатворных ікон, даецца нарыс па гісторыі праваслаўнай царквы ў Беларусі.

З канца 1920-х гадоў беларускае школьніцтва і культурна-асветніцкае жыццё ў Заходняй Беларусі трапляе пад жорсткі кантроль, а затым і забарону польскіх уладаў. З 400 беларускіх пачатковых школ, якія існавалі да 1921 года на заходне-беларускіх тэрыторыях, да 1939 года не засталося ніводнай. Былі закрыты таксама дзве настаўніцкія семінарыі і восем беларускіх гімназій. У такіх умовах Сяргей Канстанцінавіч працягвае напружаную педагагічную і асветніцкую дзейнасць.

У 1929 годзе ў Вільні, у Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны, быў выдадзены яго падручнік «Пішы самадзейна. Развіццё навыку самастойнага пісьма. Пасобнік для беларускай школы і самавукаў. Ч. 1: першы год навучання (пасля азбукі)». У тым жа годзе выйшлі ў свет і «Метадычныя ўвагі да пасобніка». Самай арыгінальнай працай С. К. Паўловіча лічыцца яго буквар «Першыя зерняткі» (Вільня, 1936). Нацыянальнай азбукай беларусаў Сяргей Канстанцінавіч лічыў кірыліцу і абгрунтоўваў гэта прычынамі гісторыка-культурнага характару. Тым не менш, ва ўмовах паланізацыі ён быў вымушаны надрукаваць другое выданне буквара лацінкай пад назвай «Zasieuki» (1937). Нягледзячы на гэта, тыраж быў канфіскаваны польскімі ўладамі, якіх напалохала папулярнасць беларускага падручніка.

С. К. Паўловіч з вялікай увагай ставіўся да духоўных патрэб дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. У 1937 годзе ён узяў на сябе клопат па рэдагаванні дзіцячага царкоўна-культурнага ілюстраванага часопіса «Снапок». Разнастайнасць матэрыялаў, высокая патрабавальнасць да тэкстаў і мастацкага афармлення сталі прычынамі шырокай папулярнасці часопіса, таму польскія ўлады ўжо праз год забаранілі выданне. Сяргею Канстанцінавічу прыйшлося перажыць нямала нягод і расчараванняў, што не магло не адбіцца на стане яго здароўя.

Сяргей Канстанцінавіч Паўловіч памёр ад хваробы сэрца 16 верасня 1940 года, пахаваны на Ліпаўскіх могілках у Вільні.

Значнасць асобы С. К. Паўловіча ў тым, што па-першае, ён, міранін з тэалагічнай адукацыяй, шмат папрацаваў на ніве духоўнага асветніцтва беларусаў; па-другое, ён як асветнік, клапаціўся пра тое, каб самыя шырокія колы насельніцтва, асабліва моладзь, спасцігалі асновы хрысціянскай веры. Для гэтага Сяргей Канстанцінавіч выкарыстоўваў дасягненні педагогікі, псіхалогіі і іншых навук, у тым ліку зарубежныя даследаванні, таму яго метадычныя рэкамендацыі, падручнікі, часопіс нават з пазіцыі сённяшняга дня знаходзяцца на даволі высокім узроўні. У якасці падручнікаў Свяшчэннай гісторыі кнігі Паўловіча пакуль што не маюць аналагаў. З пэўнымі каментарыямі і рэдактарскай дапрацоўкай яны маглі б выкарыстоўвацца ў беларускіх нядзельных школах і сярэдніх навучальных установах і сёння.

Спадчына С. К. Паўловіча даволі вялікая. Педагог на практыцы рэалізоўваў прынцыпы рэлігійнай адукацыі і выхавання як неабходнай часткі паўнавартаснай класічнай адукацыі і выхавання чалавека. Несумненна, гэта не згубіла актуальнасці і ў наш час.

### *Працы*


**Паўловіч, С.** Аб арганізацыі беларускай працоўнай школы / С. К. Паўловіч. – Вільня : Беларускае выдавецкае таварыства, 1928. – 16 с.

**Паўловіч, С.** Засеўкі : Беларускі лемантар для хатняга навучання / С. К. Паўловіч. – Вільня : Белпрес, 1937. – 88 с. : іл.

**Паўловіч, С.** Метадычныя ўвагі да пасобніка «Пішы самадзейна» / С. Паўловіч. - Вільня, 1929.

**Паўловіч, С.** Першая навука Закона Божага / С. Паўловіч. - Вільня, 1936.

**Паўловіч, С.** Першыя зерняткі / С. К. Паўловіч. – Вільня, 1936.

**Паўловіч, С.** Пішы самадзейна. Развіццё навыку самастойнага пісьма : пасобнік для беларускае школы і самавукаў. Ч. 1: першы год навучання (пасля азбукі) / С. Паўловіч. - Вільня, 1929.

**Паўловіч, С.** Свяшчэнная гісторыя Старога Завету : для беларускіх пачатковых школ і малодшых класаў гімназій / С. Паўловіч. - Вільня, 1926.

**Паўловіч, С.** Свяшчэнная гісторыя Новага Завету : падручнік для беларускіх школаў і самаадукацыі / С. Паўловіч. - Варшава, 1936.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Асвета** і педагагічная думка ў Беларусі : са старонак часопісаў да 1917 года. – Мінск, 1985.

Гл. на с. 240–243.

**Вабішчэвіч, А.** Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч / Аляксандр Вабішчэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1999. - Т. 5. -С. 439.

**Вабищевич, А. Н.** Павлович Сергей Константинович / А. Н. Вабищевич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2007. – Т. 5. - С. 679.

**Ліс, А. С**. Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч / А. С. Ліс // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1975. - Т. 8. - С. 332.

**Ліс, А. С.** Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч / А. С. Ліс // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1987. – Т. 4. – С. 119, 120.

**Маракоў, Л.** Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна - і царкоўнаслужыцелі Беларусі. 1917-1967 / Леанід Маракоў : энцыклапедычны даведнік : у 2-х тамах. – Мінск, 2007. - Т. 2.

**Мароз, В. В.** Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. – 512 с.

Гл. на с. 329.

**Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1981. – Т. 5 : Біяграфічны даведнік. – С. 473, 474.

**Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч** // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыклапедычны даведнік. - Мінск, 2001. - С. 243.

**Павлович Сергей Константинович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 2. - С. 183.

**Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 112-114.

**145 гадоў** з дня нараджэння С. К. Паўловіча (1875) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 145-146.

**Святланіч, П.** Да юбілею Сяргея Паўловіча / Паўліна Святланіч // Царкоўнае слова. - 2015. - № 38. - С. 13.

**16 верасня** 1940 года памёр Сяргей Канстанцінавіч Паўловіч // Волат. – 2013. -16 сентября.

**Кулажанка, Л**. Сяргей Паўловіч як асветнік і перакладчык : [С. К. Паўловіч] / Лідзія Кулажанка // Царкоўнае слова. - 2010. - № 38. - С. 10–11.

**Бунеева, Л**. Нарадзіўся на Драгічыншчыне, спатрэбіўся ў Вільні : [С. К. Паўловіч] / Людміла Бунеева // Вечерний Брест. - 2010. - № 76. - С. 2.

**Арыпава, Д.** Нялёгкі шлях асветніка / Д. Арыпава / ЛіМ. - 2010. - № 40. - С. 4.

Памяці С. К. Паўловіча.

**Вабішэвіч, А**. «Каб жыць пад сваім небам...» : навукова-педагагічная спадчына Сяргея Паўловіча / А. Вабішчэвіч // Голас Радзімы. - 1996. - 19 снежня; 26 снежня.

# ПРЫМАЧУК ВІКТАР ІВАНАВІЧ



**ПРЫМАЧУК Віктар Іванавіч** – акадэмік, сапраўдны член Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій (МАІТ). Прафесар, доктар МАІТ у вобласці інфармацыйных тэхналогій.

Нарадзіўся 24 кастрычніка 1953 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна. Закончыў Брацкі інжынерна-будаўнічы інстытут. Па адукацыі інжынер-будаўнік прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва.

Працоўную загартоўку атрымаў на будаўніцтве Байкала-Амурскай магістралі, дзе прайшоў шлях ад майстра да начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела будаўнічага падраздзялення. Затым на працягу дзевяці гадоў працаваў у Міністэрстве агульнага машынабудавання СССР намеснікам, начальнікам аддзела капітальнага будаўніцтва.

Пасля ліквідацыі міністэрства В. І. Прымачук працаваў выключна ў будаўнічай галіне, займаўся будаўніцтвам шэрагу буйных і ўнікальных аб'ектаў, у тым ліку Адзінага цэнтра дыспетчарскага кіравання ААТ «РЖД» у Хабараўску і вычышчальных збудаванняў поўнай біялагічнай ачысткі для ААТ «Воронеж-синтезкаучук». Працаваў генеральным дырэктарам ТАА «Строительно-монтажный поезд № 93» («СМП-93»), генеральным дырэктарам Далёкаўсходняй дырэкцыі «Росстроя».

У 2012 годзе ўзнагароджаны знакам «За обеспечение космических стартов», знакам «За преданность Владивостоку». Мае ордэн «За верность традициям». Заслужаны будаўнік Расійскай Федэрацыі (2012). Аўтар больш 30 навуковых прац, 3 вынаходстваў.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Заслужаныя** работнікі-землякі іншых дзяржаў. Заслужаны будаўнік Расійскай Федэрацыі. **Прымачук Віктар Іванавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 141.

**Новый** директор // Владивосток. – 2009. – 2 июня.

В Дальневосточной дирекции Росстроя - новый генеральный директор - Виктор Иванович Примачук.

# ПРЫМАЧУК ІВАН ПЛАТОНАВІЧ



**ПРЫМАЧУК Іван Платонавіч** – вучоны, кандыдат гістарычных навук (1980), дацэнт (1986), прафесар Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута (МГЭІ) (2001).

Нарадзіўся Іван Прымачук 25 мая 1936 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага павета (цяпер Мацы Кобрынскага раёна).

У 1960 годзе закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Працаваў завучам Лужкаўскай школы Маладзечанскага раёна, выкладчыкам Мінскага індустрыяльнага тэхнікума будаўнічых матэрыялаў, інспектарам, начальнікам аддзела Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, дацэнтам Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

З 2000 года ўзначальваў кафедру сусветнай гісторыі Міжнароднага гуманітарна-экана-мічнага інстытута.

І. П. Прымачук - аўтар больш 40 прац па гісторыі Беларусі. Адзін з аўтараў «Эканамічнай гісторыі Беларусі» (1983, 1996, 1999) і «Экономической истории зарубежных стран» (1996, 1998). Колам яго навуковых інтарэсаў з'яўляюцца міжнародныя сувязі Беларусі ў галіне адукацыі і навукі, станаўленне капіталістычных адносін на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX - пачатку XX стагоддзя. Тэматыка публікацый: міжнародная эканоміка, палітычная эканомія і інш.

***Працы***

**Прымачук, І. П.** З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі : метадычны зборнік / І. П. Прымачук, Н. І. Палятаева, Ю. Л. Грузіцкі [і інш.]. - Мінск, 1994.

**Примачук, И. П.** Развитие международного сотрудничества высшей школы Советской Белоруссии (1959-1975 гг.) : автореф. дис. канд. ист. наук / Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина, И. П. Примачук. – Минск, 1980.

**Беларусь:** история, краеведение, этнология в контексте мировых цивилизаций : учебно-метод. пособие для студентов 1-го курса заочной формы обучения / Междунар. гуманит.-экон. ин-т; авт.-сост. И. П. Примачук [и др.]. – Минск : Веды, 2003.- 122 с.

**Экономическая** история зарубежных стран : курс лекций / Н. И. Полетаева, В. И. Голубович, И. П. Примачук [и др.] ; под общ. ред. В. И. Голубовича. - Минск : НКФ «Экоперспектива», 1996. – 432 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Прымачук Іван Платонавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Прымачук Іван Платонавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 115-116.

**80 гадоў** з дня нараджэння І. П. Прымачука (1936) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 145-146.

**25 мая – 80** гадоў з дня нараджэння [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Рэжым доступу: http://kb.brl.by/index.php/. – Дата доступу: 12.09.2016.

# ПРЫМАЧУК ЛЕАНІД ПЛАТОНАВІЧ

**ПРЫМАЧУК *Леанід Платонавіч*** - вучоны-матэматык, кандыдат фізіка-матэматычных навук (1970), дацэнт (1980).



Нарадзіўся Леанід Прымачук 13 жніўня 1943 года ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна. У 1960 годзе закончыў Стрыгаўскую сярэднюю школу і паступіў на матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ).

У 1960-1965 гадах Леанід Прымачук - студэнт механіка-матэматычнага факультэта БДУ. У 1965 годзе паступіў у аспірантуру БДУ.

Кандыдацкую дысертацыю Леанід Платонавіч абараніў у 1970 годзе. У 1973 годзе яму прысвоена вучонае званне дацэнта.

У БДУ працаваў з 1967 па 2008 год на пасадзе малодшага навуковага супрацоўніка, асістэнта кафедры матэматычнага аналізу, дацэнта кафедры тэорыі функцый, намесніка дэкана.

З 1985 па 1996 год Леанід Платонавіч - дэкан механіка-матэматычнага факультэта. Ён з'яўляецца спецыялістам у галіне даследавання краявых задач тэорыі аналітычных функцый. Неаднаразова выступаў з дакладамі на міжнародных канферэнцыях і кангрэсах. Чытаў лекцыі ва ўніверсітэтах Алжыра і Буркіна Фасо.

Л. П. Прымачук апублікаваў звыш 50 навуковых і навукова-метадычных прац. Узнагароджаны Граматай Мінвуза БССР (1983, 1987), нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі» (2003), Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (1993, 2008).

**Примачук, П. П.** Дифференциальные формы : учебно-методическое пособие для механико-математического факультета специальности Н.01.01.00 — «Математика» : в 2 ч. / Л. П. Примачук, Н. В. Бровка, А. Э. Малевич ; Белорусский государственный университет, Механико-математический факультет. - – Минск, 1999-2000.

**Примачук,** Леонид Платонович. О разрешимости краевых задач со сдвигом : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата физико-математических наук, специальность 01.002 Функциональный анализ и теория функций / Леонид Платонович Примачук ; Белорусский государственный университет им. В. И. Ленина. – Минск, 1969.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Прымачук Леанід Платонавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**75 гадоў** з дня нараджэння Л. П. Прымачука (1943) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. – С. 72.

**Да 70-годдзя** з дня нараджэння Л. П. Прымачука // Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2013 год / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2013. - С. 28.

**Примачук Леонид Платонович** [Электронный ресурс] // Белорусский государственный университет. – Режим доступа: https://www.bsu.by/ru/main.aspx?guid=64631&detail=70503. – Дата доступа: 03.10.2018.

# РАГОЎСКІ ЯЎГЕН АЛЯКСАНДРАВІЧ

**РАГОЎСКІ Яўген Аляксандравіч** (1855-1923) – фізік, метэаролаг, прафесар Пецярбургскага і Харкаўскага ўніверсітэтаў.



Яўген Аляксандравіч Рагоўскі нарадзіўся ў горадзе Кобрыне Гродзенскай губерні (цяпер Брэсцкай вобласці) у сям'і гарадскога ўрача, род якога паходзіў з патомнай шляхты Гродзенскай губерні.

У 1874 годзе Яўген Рагоўскі закончыў Беластоцкае рэальнае вучылішча, у 1876 годзе паступіў у Пецярбургскі тэхналагічны інстытут. Праз год здаў за курс гімназіі і паступіў на матэматычнае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта Пецярбургскага ўніверсітэта, дзе слухаў лекцыі Д. Мендзялеева, П. Чэбышава, Ф. Петрушэўскага, І. Боргмана, А. Хвольсана.

У 1882 годзе Яўген Рагоўскі закончыў курс універсітэта са ступенню кандыдата. Затым усё жыццё спалучаў працу выкладчыка і вучонага. Па заканчэнні ўніверсітэта Яўген Аляксандравіч выкладаў матэматыку і фізіку ў Пакроўскай жаночай гімназіі ў Санкт-Пецярбургу і

адначасова займаўся падрыхтоўкай для атрымання прафесарскага звання ў фізічнай лабараторыі пад кіраўніцтвам прафесара Ф. Петрушэўскага пры Пецярбургскім універсітэце.

Рускім фізіка-хімічным таварыствам быў камандзіраваны на станцыю Падсонечная Маскоўскай губерні для фотаметрычных вымярэнняў у складзе камісіі па даследаваннях поўнага сонечнага зацьмення, якое назіралася 7 жніўня 1887 года.

У 1903 годзе Рускім астранамічным таварыствам за працы «О составе атмосферы солнца и планет и их температуре» і «Ещё о температуре и составе атмосфер солнца и планет» (1899) Я. А. Рагоўскі быў удастоены прэміі і медаля імя імператара Мікалая Аляксандравіча. У тым жа годзе абараніў дысертацыю «О внешней теплопроводности серебряных проволок в воде» на ступень магістра фізікі.

З 1891 года Я. А. Рагоўскі выкладаў фізіку і матэматычную геаграфію ва Увядзенскай мужчынскай гімназіі. З 1885 да 1904 года быў памочнікам рэдактара фізічнай часткі часопіса «Журнал Руского физико-химического общества» і на працягу некалькіх гадоў кіраваў практычнымі заняткамі студэнтаў у фізічнай лабараторыі Пецярбургскага ўніверсітэта. Навуковыя працы вучонага, якія друкаваліся ў «Журнале Руского физико-химического общества», «Nature», «Astron. Nahhrichten» і інш., прысвечаны такім пытанням, як будова зямной атмасферы, тэмпература і склад атмасферы Сонца і планет, сонечная радыяцыя, кінетычная тэорыя газаў. Вучоны праводзіў фотаметрычныя назіранні.

На працягу 1903–1904 гадоў Я. А. Рагоўскі чытаў лекцыі па кінетычнай тэорыі газаў у Пецярбургскім універсітэце ў якасці прыват-дацэнта, адначасова працаваў у гімназіях. Чытаў публічныя лекцыі аб тэрмаэлектрычнасці, аб Сонцы, а таксама публічны курс гідрастатыкі.

У 1904 годзе Яўген Аляксандравіч выбіраецца на пасаду прафесара кафедры фізікі і метэаралогіі Імператарскага Харкаўскага ўніверсітэта, дзе выкладаў такія дысцыпліны, як метэаралогія і механічная тэорыя цяпла. Адначасова ў 1907–1908 гадах чытаў курс эксперыментальнай фізікі ў Харкаўскім ветэрынарным інстытуце.

У 1906 годзе Я. А. Рагоўскі прыняў удзел у пасяджэнні камісіі па даследаванні Сонца пры Імператарскай Акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу. У 1909 годзе прыняў удзел у II Метэаралагічным з'ездзе (Санкт-Пецярбург). Я. А. Рагоўскі з'яўляўся пажыццёвым членам Рускага фізіка-хімічнага таварыства і сапраўдным членам Рускага астранамічнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу, французскага фізічнага таварыства ў Парыжы і Харкаўскага матэматычнага таварыства.

Працаваў у сваёй лабараторыі па пытанні аб зменах спектра вадарода ад працягласці дзеяння моцных разрадаў. Папярэднія звесткі аб сваіх вопытах паслаў на I Мендзялееўскі з'езд (1907). Выпрацаваў план вопытаў і амаль усё падрыхтаваў для іх (факультэт адпусціў неабходныя сродкі для набыцця прыбораў), але хвароба прыпыніла яго работы.

У 1909–1910 гадах захварэў на пляўрыт, па рэкамендацыі ўрачоў паехаў лячыцца ў Швейцарыю (камуна Мантро), затым у Крым. Пасля працяглай хваробы Яўген Аляксандравіч Рагоўскі заўчасна памёр 6 лютага 1911 года ў Ялце. Засталася добра падабраная бібліятэка кніг па фізіцы і матэматыцы, якую праўленне Харкаўскага ўніверсітэта набыло для фізічнага і матэматычнага семінараў. Бібліятэка была змешчана ў асобным пакоі, упрыгожаным партрэтам прафесара.

### ***Працы***

**Роговский, Е. А.** История преподавания метеорологии / Е. А. Роговский // Физико-математический факультет Харьковского университета за первые сто лет его существования. - Харьков, 1908. - С. 249–258.

**Роговский, Е. А.** Кинетическая теория газов / Е. А. Роговский // Энциклопедический словарь Ефрона-Брокгауза. - Спб, 1895. - Т. XV. - С. 70–75.

**Роговский, Е. А.** Лучистая теплота / Е. А. Роговский // Энциклопедический словарь Ефрона-Брокгауза. - Спб, 1896. - Т. XVIII. - С. 118–125.

**Роговский, Е. А.** О температуре небесного пространства / Е. А. Роговский // Метеорологический вестник. - 1909. - № 8; № 9.

**Роговский, Е. А.** О разности температур на границе соприкасающихся тел / Е. А. Роговский // Журнал Русского физико-химического общества. - 1903. -Т. XXXV.

**Роговский, Е. А.** Еще о температуре и составе составе атмосфер солнца и планет // Е. А. Роговский // Известия Русского астрономического общества. - 1899. - Вып. VII. - № 7–9. С. 8; Вып. VIII. - № 1–3. - С. 32–45.

**Роговский, Е. А.** О составе атмосфер солнца и планет и их температуры / Е. А. Роговский // Известия Русского астрономического общества. - 1898. -Вып. VII. - № 1. - С. 2, 10–34.

**Роговский, Е. А** Отчет о фотографических измерениях во время полного солнечного затмения 7 августа 1887 г. / Е. А. Роговский // Журнал Русского физико-химического общества. - 1888. - Т. XX. - С. 47–77.

**Роговский, Е. А** О температуре небесных тел / Е. А. Роговский // Журнал Русского физико-химического общества. - 1885. - Т. XVII. - С. 77, 314–325.

**Роговский, Е. А.** О строении земной атмосферы и общих законах теории газов / Е. А. Роговский // Журнал Русского физико-химического общества. - 1884. - Т. XVI. - С. 25–48, 185–212, 255.

**Роговский, Е. А.** О температуре и составе атмосфер солнца и планет / Е. А. Роговский // Журнал Русского физико-химического общества. – 1884. - Т. XVI.

**Роговский, Е. А** О строении земной атмосферы и общей теории газов / Е. А. Роговский // Журнал Русского физико-химического общества. - 1882. - Т. XIV. - С. 276–277.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Гапоненка, В. А.** Рагоўскі Яўген Аляксандравіч / В. А. Гапоненка // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. **-** Мінск, 2001. **-** Т. 13. - С. 202.

**Рагоўскі Яўген Аляксандравіч** (1855-1923) : біяграфія // 250 асоб з Беларусі у дыялогах культур : даведачнае выданне. - Мінск, 2008. - С. 77-78.

**Роговский Евгений Александрович** // Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона. - Спб, 1907. - Доп. т. II а. - С. 540–541.

**Е. А. Роговский** // Сообщения Харьковского математического общества. - Харьков, 1913. – Т. 13. - № 6. - С. 242–246.

Некролог, воспоминания А. П. Грузинцева о пребывании Е. А. Роговского в Харьковском университете и список печатных работ.

**165 гадоў** з дня нараджэння Я. А. Рагоўскага (1855) **//** Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 147.

**Рагоўскі Яўген Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2017. - С. 117-119.

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля. - С. 5.

**Барысюк, У.** Талент і праца землякоў / Уладзімір Барысюк // Кобрынскі веснік. - 2009. - 15 ліпеня.

У даведніку «250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур» кабрынчан у першую чаргу зацікавіць ураджэнец горада Я. Рагоўскі.

**2020 год** – 165 гадоў з дня нараджэння Яўгена Аляксандравіча Рагоўскага : [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Рэжым доступу: http://kb.brl.by/index.php/homehttp .– Дата доступу: 02.08.2020.

# САМЕРСАВА НАДЗЕЯ УЛАДЗІМІРАЎНА

**САМЕРСАВА Надзея Уладзіміраўна** – прафесар, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.



Нарадзілася 17 ліпеня 1961 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна. Пасля заканчэння Дзівінскай сярэдняй школы паступіла ў Мінскі дзяржаўны інстытут культуры (цяпер - Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў). Інстытут закончыла з чырвоным дыпломам, была размеркавана ў сталічны Дом народнай творчасці.

Паспяховы ўдзел у конкурсе на замяшчэнне вакантнай пасады выкладчыка інстытута культуры дазволіў вярнуцца ў інстытут ужо ў якасці педагога. Надзею Уладзіміраўну заўсёды захапляла навука, таму ў яе метадычнай скарбонцы навукова-метадычныя дапаможнікі, навуковыя манаграфіі, навучальныя праграмы, больш за 300 артыкулаў.

Тэма дысертацыйнага даследавання - «Аптымізацыя экалагічнай адукацыі і выхавання падлеткаў ва ўстановах сацыякультурнай сферы».

Н. У. Самерсава мае больш за 40 навуковых і навукова-метадычных публікацый.

Прымае ўдзел у адукацыйных і сацыяльна-экалагічных праектах:

Праграма па развіцці пачуццёвага ўспрымання навакольнага свету «Ощущение чуда» (Прыродны цэнтр імя Бракнера (ЗША), Асацыяцыя «Экалагічная адукацыя» (Расія);

Праграма «Экалагічная адукацыя: методыка, прыклады «ECOLOGIC» (Шведскі інстытут, Фонд «Захаваем чысціню Швецыі», «АсЭкО» (Расія);

Праект « ЭкоОбразование: Новое поколение» («АсЭкО» - Расія і Савет па навучанні на прыродзе - Field Studies Council, FSC EE - Вялікабрытанія)

Праграма «Экалагічная адукацыя ў Германіі» (IBB, Dortmund, Германія, Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр).

Н. У. Самерсава мае сертыфікаты міжнароднага ўзору па трэнерскай працы. Кіраўнік пастаянна дзеючага семінара «Экалагічная адукацыя для ўстойлівага развіцця» (Мінскі Міжнародны адукацыйны цэнтр).

Сёння Надзея Уладзіміраўна – намеснік загадчыка кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

***Працы***


**Самерсова, Н. В.** Оптимизация экологического образования и воспитания подростков в условиях социокультурной сферы : дис. на соиск. учен. степ. канд. пед. наук : 13.00.05 / Бел. ун-т культуры. – Мінск, 1997.

**Самерсова, Н. В**. Воспитание в процессе экологической деятельности : пособие для педагогов соц., кл. рук., воспитателей, специалистов системы внешк. воспитания и обучения / Н. В. Самерсова. - Минск : Белоруская наука, 2005. - 231 с.

**Самерсова, Н. В.** Использование педагогического потенциала социально-культурной деятельности в процессе формирования экологической культуры личности / Н. В. Самерсова. – Минск : БГУКИ, 2012.

**Самерсава, Н. У.** Метадычны аспект дзейнасці клубных устаноў Рэспублікі Беларусь / Н. У. Самерсава. – Мінск : БГУКИ, 2016.

**Самерсова, Н. В**. Научно-педагогические основы экологического туризма / Н. В. Самерсова. –Минск : БГУКИ, 2017.

**Самерсава, Н. У.** Сацыякультурнае праектаванне і псіхолага-педагагічная рэабілітацыя асобы / Н. У. Самерсава. – Мінск : БГУКИ, 2003.

**Самерсава, Н. У.** Сацыякультурная дзейнасць экалагічнага напрамку / Н. У. Самерсава. – Мінск : БГУКИ, 2005.

**Самерсова, Н. В.** Экологическая культура личности: социокультурный аспект: [монография] / Н. В. Самерсова; Министерство культуры Республики Беларусь, Белорусский государственный университет культуры и искусств. – Минск: Белорусский государственный университет культуры и искусств, 2011. – 282, [1] с.: ил., табл.

**Самерсава, Н. У.** Станаўленне і развіццё метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці / Н. У. Самерсава. – Мінск : БГУКИ, 2017.

**Самерсова, Н. В.** Теория и практика связей с общественностью / Н. В. Самерсова. – Минск : БГУКИ, 2017.

**Самерсава, Н. У.** Тэарэтыка-метадалагічныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці / Н. У. Самерсава [і інш.]. – Мінск : БГУКИ, 2008.

**Самерсова, Н. В.** Экологическая культура личности в контексте становления духовных основ социокультурной устойчивости общества / Н. В. Самерсова. – Минск : БГУКИ, 2011.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Пашкович, Л.** Сладко пахнут праздники... / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2018. — 1 жніўня. — С. 5.

Уроженка д. Дивин Н. Самерсова — профессор, кандидат педагогических наук, доцент Белорусского государственного университета культуры и искусств.

**Самерсова Надежда Владимировна** [Электронный ресурс] // Человек и мир. – Режим доступа:http://human-world.narod.ru/koordinatory.htm. – Дата доступа: 13.08.2018.

**Беларускі** дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці. – Рэжым доступу: http://www.buk.by/process/fakultet%201/Pedagogy%20and%20socio-cultural%20activities/. – Дата доступу: 24.10.2020.

# САЎЧУК ТАЦЦЯНА МІКАЛАЕЎНА

**САЎЧУК Таццяна Мікалаеўна** – прафесар, доктар філалагічных навук.



Нарадзілася Таццяна Саўчук у 1970 годзе ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці.

Закончала Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «руская мова і літаратура».

Галіны мовазнаўства, у якіх працуе і можа выступаць у якасці эксперта, апанента: камунікатыўная лінгвістыка, прагмалінгвістыка, лінгвістыка тэксту, культура мовы, стылістыка.

У 1996 годзе Таццяна Мікалаеўна абараніла кандыдацкую дысертацыю «Речевой этикет в русских и белорусских народных сказках».

У 2020 годзе абараніла доктарскую дысертацыю «Аргументация в дискурсе гуманитарных наук (на материале русско- и белорусскоязычных текстов».

Працуе на кафедры прыкладной лінгвістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

***Працы***

**Савчук, Т. Н.** Риторика : учебно-методическое пособие для студентов юридических специальностей / Т. Н. Савчук. – Минск : Изд-во МИУ, 2003. – 59 с.

**Савчук, Т. Н.** Риторика : методические указания по изучению дисциплины для студентов заочной формы обучения / Т. Н. Савчук. - Минск: Изд-во МИУ, 2003. – 27 с.

**Савчук, Т. Н.** Логика : методические указания по изучению дисциплины для студентов заочной формы обучения / Т. Н. Савчук. – Минск : Изд-во МИУ, 2003. – 19 с.

**Савчук, Т. Н.** Логика : учебно-методический комплекс / Т. Н. Савчук. – Минск : Изд-во МИУ, 2004. – 145 с.

**Савчук, Т. Н.** Логика : учебное пособие (с грифом) / Т. Н. Савчук. - 3-е изд. – Минск : БГПУ, 2010. – 160 с.

**Савчук, Т. Н**. Оперирование понятиями как логическая основа эффективного обучения языку и речи / Т. Н. Савчук // Русский язык и литература. - 2012. - № 5. – С. 3-13.

**Савчук, Т. Н**. Приемы речевого дизайна / Т. Н. Савчук // Фокус. - 2011. - № 3. – С. 28-33.

**Савчук, Т. Н.** Доказать - значит убедить? / Т. Н. Савчук // Русский язык и литература. - 2010. – № 4. - С. 9-19.

**Саўчук, Т. М.** Канструкцыі нязгоды ў тэкстах рускіх і беларускіх народных казак / Т. М. Саўчук // Веснік БДУ. - Серыя 4. - 1995. - № 2. - С. 36-40.

**Саўчук, Т. М.** Моўныя формулы прывітання і развітання ў рускіх і беларускіх народных казках / Т. М. Саўчук // Веснік БДУ. - Серыя 4. - 1994. - № 3. - С. 38-43.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Саўчук Таццяна Мікалаеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Саўчук Таццяна Мікалаеўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 119.

**50 гадоў** з дня нараджэння Т. М. Саўчук (1970) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 148.

# СВІДУНОВІЧ АЛЯКСАНДР ФЁДАРАВІЧ

**СВІДУНОВІЧ Аляксандр Фёдаравіч** (1938-2008) - кандыдат багаслоўя.



Нарадзіўся Аляксандр Свідуновіч 7 студзеня 1938 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага павета (цяпер Кобрынскага раёна). Бацькі Фёдар Сільвестравіч і Ганна Сцяпанаўна назвалі яго Аляксандрам у гонар рускага князя Аляксандра Неўскага. Дзяцінства хлопчыка праходзіла ў нялёгкі час.

На ўсё жыццё ў памяці Аляксандра засталіся ўспаміны пра тое, як іх сям'і прыходзілася галадаць, хавацца ў лесе ад немцаў. Але прыйшла доўгачаканая перамога, і Саша ідзе ў першы клас сельскай школы, навучанне ў якой праходзіла на роднай беларускай мове. У 1956 годзе ён закончыў Дзівінскую школу.

Адсылае дакументы ў Гродзенскі педагагічны інстытут, але бацька раіць паступаць у духоўную семінарыю. Сям'я Свідуновіч была праваслаўнай, і сам Аляксандр часта наведваў царкву.

Такім чынам, педагогам ён не стаў. Забраўшы дакументы з пединстытута, у 1956 годзе паступае ў Мінскую духоўную семінарыю, якая знаходзілася пры Свята-Успенскім Жыровіцкім мужчынскім манастыры. Валодаючы выдатным музычным слыхам і моцным прыродным голасам, ужо ў першы год навучання студэнт Свідуновіч звяртае на сябе ўвагу выкладчыка царкоўных спеваў, і яго прызначаюць рэгентам (кіраўніком) царкоўнага хору. У гэтыя гады фарміруецца характар і светапогляд будучага святара.

У Ленінградскую духоўную акадэмію яго залічваюць без уступных экзаменаў. Закончыў акадэмію Аляксандр Свідуновіч у 1964 годзе са ступенню кандыдата багаслоўя, якой быў удастоены за курсавую работу па кананічнаму праву «Родство и свойство, как препятствие к браку».




Служыў у Смаленску (Расія), Днепрапятроўску (Украіна).

З 1988 года Аляксандр Свідуновіч - настаяцель Свята-Мікалаеўскага сабора, благачынны цэркваў г. Днепрадзяржынска (Украіна).

Царкоўны працоўны стаж першага настаяцеля Свята-Мікалаеўскага сабора складае пяцьдзясят два гады, за час якога яго заслугі былі адзначаны мноствам царкоўных і дзяржаўных узнагарод.

8 снежня 2008 года Аляксандр Фёдаравіч Свідуновіч памёр. Але памяццю пра яго застаўся адроджаны ім Свята-Мікалаеўскі сабор, на тэрыторыі якога і пахаваны мітрафорны протаіерэй айцец Аляксандр Свідуновіч.

### *Аб жыцці і дзейнасці*


**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** // Памяць, Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Гапанович, А. Н.** Александр Федорович Свидунович / Афанасий Гапанович // Дивин - древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 76. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні **:** гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 46.

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 120-121.

**80 гадоў** з дня нараджэння А. Ф. Свідуновіча (1938) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 72-73.

**Слоневский, А.** Протоиерей Александр Федорович Свидунович / Александр Слоневский [Электронный ресурс] // Українська православна Церква. Храм преподобного Сергія Радонєжського – Режим доступа: http://stsergiydndz.-wixsite. com/library/slonevsky-prot-a-svidunovich. – Дата доступа: 04.10.2017.

**Імі ганарацца** землякі. Свідуновіч Аляксандр Федаравіч [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: https://ikobrin.by/kobrin-139.php. – Дата доступу: 05.09.2018.

# СВІДУНОВІЧ МІКАЛАЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ



**СВІДУНОВІЧ Мікалай Аляксандравіч** - вучоны ў галіне металургіі, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі.

Нарадзіўся 29 красавіка 1940 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і работнікаў гандлю. Закончыўшы дзесяць класаў Дзівінскай школы, хацеў паступаць у ваенна-марское вучылішча, але па парадзе ўрача-афтальмолага адмовіўся ад ваеннай прафесіі, паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут на спецыяльнасць «Машыны і тэхналогіі ліцейных вырабаў».

У гады вучобы быў удзельнікам студэнцкага тэатра «Студыйны маладзёжны», наведваў творчыя сустрэчы з пісьменнікамі, музыкантамі, бываў на праглядах шэдэўраў сусветнага кінематографа. На другім курсе пачаў займацца навукова-даследчай дзейнасцю.

Пасля заканчэння інстытута ў 1962 годзе Мікалай Свідуновіч працаваў інжынерам на Мінскім трактарным заводзе. У 1964–1967 гадах вучыўся ў аспірантуры пры БПІ. У 1967 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю «Исследование ввода в чугун присадок на основе окиси магния с целью десульфурации чугуна и сфероидизации графита». З 1968 года працуе ў Беларускім тэхналагічным інстытуце імя С. Кірава (з 1993 года Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт): асістэнт, дацэнт, намеснік дэкана.

У 1980 годзе ў Кіеўскім інстытуце праблем ліцця абараніў доктарскую дысертацыю «Легирование и модифицирование сплавов с применением низкотемпературной плазмы». З 1980 года – загадчык кафедры матэрыялазнаўства і тэхналогіі металаў, з 2007 года – прафесар гэтай кафедры. Чытаў лекцыі ў вядучых універсітэтах свету ў ЗША, Францыі, Вялікабрытаніі і іншых краінах. Падрыхтаваў 15 кандыдатаў навук. У 1996 годзе абраны сапраўдным членам Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі.

М. А. Свідуновіч – аўтар 15 замежных патэнтаў, у тым ліку такіх краін, як ЗША, Японія, ФРГ, Італія, Швецыя, Вялікабрытанія, 60 аўтарскіх пасведчанняў СССР, 200 апублікаваных прац, з іх 2 манаграфій. Сумесна з беларускім навукоўцам у вобласці распрацоўкі новых матэрыялаў, тэхналогій і машынабудавання, акадэмікам НАН Беларусі, прафесарам П. А. Віцязем ім упершыню ў Рэспубліцы Беларусь выдадзены вучэбны дапаможнік «Основы нанотехнологий и наноматериалов».

Навуковыя інтарэсы М. А. Свідуновіча: высокатэмпературныя тэхналогіі: плазма-фурменны і дуплексфурменны працэсы (запатэнтаваны ў 15 краінах Захаду, паспяхова выкананы 2 міжнародныя кантракты, устаноўкі працуюць у Расіі, Украіне, Балгарыі), высока-тэмпературная перапрацоўка адходаў (выкарыстоўваецца ў Рэспубліцы Беларусь); нанатэхналогіі і нанаматэрыялы: распрацавана ўнікальная тэхналогія выкарыстання фулерэнзмяшчальных матэрыялаў для атрымання спецыяльных сталей і сплаваў. Выканаў шэраг праектаў, якія звязаны з высокатэмпературнай перапрацоўкай металазмяшчальных адходаў, адкрыў новы напрамак па ўплыву фулеронаў на ўласцівасці спецыяльных сталей і сплаваў.

М. А. Свідуновіч – прэзідэнт Расійска-Беларускай навукова-тэхнічнай асацыяцыі «Сумесныя праекты», віцэ-прэзідэнт асацыяцыі «Чарнобыль і экалогія» (ЗША), член Савета фонда фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь, старшыня секцыі «Атрыманне і выкарыстанне плазмы» Савета НАН Беларусі.

Узнагароджаны медалём СССР «За працоўную доблесць» (1979), граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР (1980), Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2000), Сусветным медалём Свабоды (The World Medal of Freedom) Амерыканскага біяграфічнага

інстытута (2006). 2 кастрычніка 2015 года М. А. Свідуновічу прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь».

### *Працы*

**Свидунович, Н. А.** Легирование и модифицирование сплавов с применением низкотемпературной плазмы : автореферат диссертации ... доктора технических наук : 05.16.04 / Свидунович Николай Александрович. – Киев, 1980.

**Свидунович, Н. А**. Исследование ввода в чугун присадок на основе окиси магния с целью десульфурации чугуна и сфероидизации графита : диссертация ... кандидата технических наук : 05.16.02 / Н. А. Свидунович ; Белорусский политехнический институт. – Минск, 1967. – 154 с. : ил.

**Свидунович, Н. А.** Взаимодействие компонентов в сплавах / Н. А. Свидунович, В. Н. Глыбин, Л. К. Свирко. – Москва : Металлургия, 1993. – 156 с.

**Свидунович, Н. А.** Методы исследования материалов : лабораторный практикум по курсу «Материаловедение и технология конструкционных материалов» для студ. вузов / Н. А. Свидунович, Г. П. Окатова, Д. В. Куис. – Минск : БГТУ, 2014. – 126 с.

**Свидунович, Н. А.** Плазмофурменный процесс / Н. А. Свидунович. – Минск : Вышэйшая школа, 1991. - 100 с.

**Витязь, П. А.** Наноматериаловедение : учебное пособие / Витязь П. А., Свидунович Н. А., Куис Д. В. – Минск : Вышэйшая школа, 2015. – 511 с.

**Жарский, И. М.** Коррозия и защита металлических конструкций и оборудования: учеб. пособие / Жарский И. М., Иванова Н. П., Куис Д. В., Свидунович Н. А. – Минск : Вышэйшая школа, 2012. – 303 с.

**Жарский, И. М**. Материаловедение : учебное пособие / Жарский И. М., Иванова Н. П., Куис Д. В., Свидунович Н. А. – Минск : Вышэйшая школа, 2015. – 557 с.

**Материаловедение.** Термическая обработка : лабораторный практикум по курсу «Материаловедение» для студ. вузов / [сост.: Н. А. Свидунович, Д. В. Куис, Г. П. Окатова]. – Минск : БГТУ, 2014. – 67 с.

**Свидунович, Н. А.** Влияние фуллеренсодержащих материалов на свойства сплавов Fe-C / Н. А. Свидунович, Д. В. Куис, Г. П. Окатова // Литье и металлургия. – 2008. - № 3.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Міляшкевіч, Я. Г.** Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч / Я. Г. Міляшкевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2002. - Т. 14. - С. 257.

**Гапанович, А. Н.** Николай Александрович Свидунович / Афанасий Гапанович // Дивин – древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 76. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Свидунович Николай Александрович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск, 2008. - Т. 6. - С. 589.

**Свидунович Николай Александрович** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. - Минск, 2009. - Т. 1, кн. 1. - С. 334.

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** // Хто ёсць хто ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. - Мінск. 2010. - С. 58.

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2017. - С. 121–123 : фат.

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2016. - С. 47–49.

**Да 80-годдзя** з дня нараджэння М. А. Свідуновіча // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 148–149.

**Свідуновіч Мікалай Александравіч** // Новыя кнігі : на старонках беларускага друку. - 2019. - № 8. - С. 21.

**Свидунович, Н. А.** Студенты литейщики… / Н. А. Свидунович // Литье и металлургия. - 2019. - № 3. - С. 31.

Воспоминания выпускника БПИ.

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля (№ 29). - С. 5.

Кобринская центральная районная библиотека начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны.

**Свидунович Николай Александрович** [Электронный ресурс] // База данных Ученые Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/scient/pls-/dict.prn_ref?tu=e&tq=v0&name_view=va. – Дата доступа: 04.10.2018.

# СВЯНЦІЦКІ СІГІЗМУНД КАРЛАВІЧ

**СВЯНЦІЦКІ Сігізмунд Карлавіч** (1836–1910) - беларускі ўрач, адзін з заснавальнікаў унутрыполасцевай хірургіі на Беларусі, доктар медыцыны (1864).



Сігізмунд Свянціцкі нарадзіўся 20 кастрычніка 1836 года ў маёнтку Красцінава Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сям'і небагатага памешчыка.

Сярэднюю адукацыю атрымаў у Пінскім дваранскім вучылішчы і Мінскай гімназіі, якую закончыў з сярэбраным медалём. Сігізмунду не было і шаснаццаці гадоў, калі ён паступіў на медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. У тыя гады перадавая моладзь нярэдка выбірала прафесію ўрача, каб зблізіцца з народам, які цярпеў галечу і пакуты. Ва ўніверсітэце існавалі тайныя палітычныя гурткі, тут вучыліся будучыя рэвалюцыянеры-шасцідзясятнікі. Безумоўна, такое асяроддзе аказала ўплыў на фарміраванне поглядаў Свянціцкага. Ён цікавіўся сацыяльнымі праблемамі і прымаў удзел у студэнцкім руху. Царская ахранка не пакінула па-за ўвагай грамадска-палітычную дзейнасць студэнта і прымусіла яго пакінуць універсітэт.

Сігізмунд Свянціцкі працягнуў адукацыю ў Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі, якая ў той час была лепшай навучальнай установай Расіі па падрыхтоўцы ўрачоў. Колькасць жадаючых паступіць у яе ў пяць разоў перавышала набор. Высокія патрабаванні да навучэнцаў захоўваліся на працягу ўсёй вучобы. У 1861 годзе Свянціцкі з залатым медалём закончыў акадэмію і атрымаў званне лекара. Адразу ж ён заняўся навуковай дзейнасцю і праз тры гады абараніў доктарскую дысертацыю (1864). Здавалася, што будучыня здольнаму маладому вучонаму забяспечана і перад ім адкрыецца шлях да прафесуры. Аднак становішча ў краіне пасля паўстання 1863 года змянілася, і ён не мог ужо разлічваць на навуковую кар'еру. Давялося пакінуць акадэмію і пайсці на ваенную службу.

У 1870 годзе С. К. Свянціцкі быў прызначаны старшым урачом Мінскага ваеннага шпіталя, і з таго часу ўсё яго жыццё, грамадская і навуковая дзейнасць звязаны з Беларуссю. У Мінск ён прыехаў вопытным ўрачом, поўным творчых сіл і задумак.

Смела ўкараняў у практыку такія навейшыя прынцыпы і метады, як абязбольванне, антысептыка, затым асептыка, цікавіўся пытаннямі пералівання крыві, сканструяваў арыгінальны прыбор для лячэння пералому касцей і падкожных сасудаў, адзін з першых прымяніў хірургічныя метады лячэння ва ўмовах сельскай бальніцы і быў пачынальнікам унутрыполасцевай хірургіі ў Мінску. Свянціцкі займаўся таксама пытаннямі эпідэміялогіі, тэрапіі, дэрматалогіі, курарталогіі, арганізацыі аховы здароўя. У час эпідэміі халеры ў 1872 годзе ён прапанаваў новыя формы барацьбы з ёю, падмеціў неўспрымальнасць некаторых людзей да захворвання (з'яву імунітэту). Да барацьбы з эпідэміяй Сігізмунд Карлавіч далучыў шырокую грамадскасць. У 1884 годзе ён прапанаваў стварыць у Мінску санітарную камісію, а ўвесь горад падзяліць на асобныя ўчасткі, што дазволіла палепшыць санітарны кантроль і абмежаваць распаўсюджванне эпідэмій.

Але асноўная заслуга С. К. Свянціцкага заключаецца ў арганізацыі пазабальнічнай дапамогі насельніцтву. Паліклінік тады не было, і хворыя абслугоўваліся прыватна практыкуючымі ўрачамі, недаступнымі для беднаты. Яшчэ ў 1870 годзе Сігізмунд Карлавіч прапанаваў Таварыству мінскіх урачоў стварыць бясплатную амбулаторыю і падрыхтаваў яе статут. Аднак ажыццявіць сваю ідэю ён змог толькі праз дзевяць гадоў. 18 снежня 1879 года ў Мінску на Петрапаўлаўскай вуліцы (цяпер вул. Энгельса) была адкрыта першая ў горадзе паліклініка – лячэбніца для прыходзячых хворых. Дырэктарам і адным з яе кансультантаў быў С. К. Свянціцкі. Акрамя яго, у ёй працавала яшчэ пятнаццаць урачоў і дзесяць фельчараў. Амбулаторыя аказвала бясплатную кваліфікаваную медыцынскую дапамогу па шасці спецыяльнасцях, а таксама праводзіла нескладаныя аперацыі. Рэцэпты выпісваліся на адмысловых бланках, па якіх аптэкі горада адпускалі медыкаменты ніжэй іх кошту або бясплатна. Аднак лячэбная ўстанова ў 1881 годзе была зачынена, бо Гарадская дума адмовіла працягваць субсідыю на яе ўтрыманне. У 1899 годзе грамадскасці ўдалося зноў адкрыць бясплатную амбулаторыю.

Лячэбную дзейнасць Свянціцкі спалучаў з актыўнай грамадскай працай. Усе, хто ведаў Сігізмунда Карлавіча, адзначалі яго высокую культуру, эрудыцыю і align разнабаковасць інтарэсаў. Ён добра ведаў літаратуру, гісторыю, захапляўся мастацтвам, музыкай, добра спяваў, валодаў рознымі мовамі. Вядомая пісьменніца Эліза Ажэшка з захапленнем гаварыла пра лінгвістычныя здольнасці Сігізмунда Карлавіча і з яго дапамогай вывучыла лацінскую мову. Эрудыцыя і абаяльнасць Свянціцкага аказалі ўплыў на творчасць пісьменніцы. Адзін з яе раманаў называецца «Апошняе каханне» (вобраз галоўнага героя выведзены з доктара Свянціцкага). Пісьменніца ўклала ў раман шмат асабістага, інтымнага, таму лёс гераіні і падзеі, якія там апісаны, маюць шмат падобнага з жыццём аўтара.

Сігізмунд Свянціцкі памёр 21 мая 1910 года. Пахаваны ў Мінску на Кальварыйскіх могілках.

**Свентицкий, С. К.** Анатомические разыскания о мышце, сжимающей мочеиспускательный канал у мужчин : дис. / С. К. Свентицкий. - СПб, 1864.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Свянціцкі Сігізмунд Карлавіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1973. – Т. 9. – С. 451, 452.

**Свянціцкі Сігізмунд Карлавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 14. – С. 270.

**Свянціцкі Сігізмунд Карлавіч** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1981. – Т. 5 : біяграфічны даведнік. – С. 345.

**Свянціцкі Сігізмунд Карлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 123-124.

**Свенцицкий Сигизмунд Карлович** // История медицины Беларуси в биографиях ее врачей XVII – I пол. XX вв. : биобиблиографический справочник от А до Я : 2000 биографий врачей / Кульпанович О. А. - Минск, 2011. - С. 332.

**Жылы** дом : [вул. К. Маркса, 30 – вул. Леніна, 13] / А. Ю. Пятросава // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінск. - Мінск, 1988. - С. 153–154.

**Крючок, Г. Р**. Очерки истории медицины Белоруссии / Григорий Романович Крючок. – Минск : Беларусь, 1976. – 265 с.

См. на с.121, 140, 149, 176, 184, 189, 194, 212.

**Малчанаў, А. П.** Бясплатная лячэбніца / А. П. Малчанаў // Памяць. Мінск : гісторыка-дакументальная хроніка : у 4 кн. - Мінск, 2002. - Кн. 2. - С.47–48.

**Малчанаў, А.** Сябра Элізы Ажэшка — наш знакаміты зямляк / А. Малчанаў // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Драгічынскага раёна. – Мінск, 1997. – С. 102, 103, 104. – (Ад часоў першабытных – 1917).

**Мельнікава, З. П.** Эліза Ажэшка і берасцейскае Палессе : [узгадваецца С. К. Свянціцкі] / З. П. Мельнікава // Гісторыка-тэарытычныя актуаліі сучаснай філалогіі : матэрыялы рэспубл. навук.-практыч. канф., прысвеч. 70-годдзю з дня нарадж. вучонага-літаратуразнаўцы, педагога, прафесара А. А. Майсейчыка. - Брэст, 2008. - С. 69–72.

**Ожешко, Э**. Последняя любовь ; В провинции : [романы] / Элиза Ожешко ; пер. с польск. – Москва : Вече, 1993. – 496 с. – (Каприз. Женские любовные романы).

**180 гадоў** з дня нараджэння С. К. Свянціцкага (1836) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 16.

**20 октября** 1836 г. [род. Сигизмунд Свентицкий] : Этот день в истории // Советская Белоруссия. - 2016. - 20 октября. - С. 16.

**20 кастрычніка 1836 г**. [нар. Сігізмунт Свянціцкі] : Даты. Падзеі. Людзі // Звязда. - 2016. - 20 кастрычніка. - С. 16.

**Ярота, Р.** Людзі з сярэбранага кутка. Асоба, сэрцу мілая / Расціслаў Ярота // Полымя. – 2011. - № 11. - С. 153-154.

У раздзеле «Асоба, сэрцу мілая» ідзе размова пра ўзаемаадносіны Алізы Ажэшкі з урачом Сігізмундам Свянціцкім.

**Крючок, Г. Р.** Доктор медицины С. К. Свентицкий (1936–1910) / Г. Р. Крючок // Здравоохранение Белоруссии. - 1957. - № 7. - С. 67–68.

# СЕМЯНЮК УЛАДЗІМІР АНДРЭЕВІЧ

**СЕМЯНЮК Уладзімір Андрэевіч** - беларускі філосаф, палітолаг, доктар філасофскіх навук (1990), прафесар (1993).



Нарадзіўся 16 лістапада 1940 года ў вёсцы Залессе Кобрынскага раёна. У 1958 годзе закончыў Залескую сярэднюю школу і паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў настаўнікам у Глыбоцкім раёне.

У 1964-1967 гадах Уладзімір Семянюк - аспірант Інстытута філасофіі і права АН БССР, потым малодшы навуковы супрацоўнік гэтага інстытута.

У 1969 годзе У. А. Семянюк абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Хрысціянскае вучэнне аб сэнсе і мэце чалавечага жыцця».

З 1968 года Уладзімір Андрэевіч - дацэнт кафедры філасофіі Беларускага інстытута фізічнай культуры.

У 1978-1981 гадах чытаў лекцыі ў Вышэйшай інжынернай школе г. Зялёна-Гура (Польшча). У 1989-1993 гадах ён дацэнт, прафесар кафедры сацыялогіі і медыцынскай этыкі Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў. З 1994 года - прафесар кафедры філасофіі Беларускай політэхнічнай акадэміі.

У. А. Семянюк – прафесар кафедры «Философские учения» факультэта тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Галоўныя навуковыя працы: «Хрысціянскі гуманізм» (1969), «Сіянізм у палітычнай стратэгіі імперыялізму» (1981), «Сучасны сіянізм: курсам палітычных і ваенных авантур» (1986) і інш.

***Працы***

**Семенюк, В. А.** Сионизм в антикоммунистической и неоколониалистикой стратегии империализма (социально-политический анализ) : диссертация ... доктора философских наук : 09.00.02 : защищена 00.00.0000 : утверждена 31.08.1990 / Семенюк Владимир Андреевич. — Минск, 1986.

**Семенюк, В. А**. Зловещий альянс / В. А. Семенюк. – Мінск, 1972.

**Семенюк, В. А.** Преступления сионизма на Ближнем Востоке : материал в помощь лектору / В. А. Семенюк ; Правление общества «Знание» Белорусской ССР, Координационный совет по политическому обличению империализма. - Минск, 1972.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 440-441 : фота. – (Імі ганарацца земляки).

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 125-126.

**80 гадоў** з дня нараджэння У. А. Семянюка (1940) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 150.

**Семенюк**, **Владимир Андреевич** [Электронный ресурс] // База данных Ученые Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/scient/pls/. – Дата доступа: 05.10.2017.

# СІЗЮК ВАЛЕРЫЙ АЛЯКСЕЕВІЧ

**СІЗЮК Валерый Аляксеевіч** – вучоны, кандыдат фізіка-матэматычных навук.



Нарадзіўся ў 1966 годзе ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці.

Выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Фізік, спецыяліст у вобласці фізічнай электронікі. Старшы навуковы супрацоўнік НАН Беларусі.

Валерый Аляксеевіч - асацыіраваны прафесар Purdue University, ЗША, штат Індыяна, г. Уэст-Лафейетт.

**Сизюк, В. А.** Исследование плазменных неустойчивостей и переноса заряда в полупроводниковых микроструктурах : автореферат дис. ... кандидата физико-математических наук : 01.04.04. / В. А. Сизюка. - Минск, 1997. - 20 с. : ил.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Сізюк Валерый Аляксеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 441. – (Імі ганарацца землякі).

**Сізюк Валерый Аляксеевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 126.

**50 гадоў** з дня нараджэння В. А. Сізюка (1966) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 16.

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2017. – 20 июля. – С. 5.

Центральная районная библиотека ГУК «Кобринская районная централизован-ная библиотечная система» начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны», первый этап которого – база данных «Людзі навукі нашага краю».

**Імі ганарацца** землякі. **Сізюк Валерый Аляксеевіч** [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: https://ikobrin.by/kobrin-139.php. – Дата доступу: 05.09.2017.

**Valeryi Sizyuk** Research Associate Professor [Электронный ресурс] // Сайт «Purdue University». – Режим доступа: https://engineering.purdue.edu/NE/People/ptProfile? id=39520. – Дата доступа: 05.09.2018.

# СІНКАВЕЦ АЛЯКСАНДР УЛАДЗІМІРАВІЧ

**СІНКАВЕЦ Аляксандр Уладзіміравіч** – вучоны-фізіёлаг, кандыдат біялагічных навук, дацэнт.



Нарадзіўся Аляксандр Сінкавец 4 красавіка 1973 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1990 годзе закончыў з залатым медалём Дзівінскую сярэднюю школу.

Паступіў у Віцебскі ветэрынарны інстытут. У 1995 годзе закончыў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны (ВДАВМ) па спецыяльнасці «Ветэрынарыя».

З лістапада 1995 года па лістапад 1998 года Аляксандр Уладзіміравіч - аспірант кафедры нармальнай і паталагічнай фізіялогіі.

У красавіку 1999 года А. У. Сінкавец абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата біялагічных навук.

У 2000 годзе назначаны на пасаду дацэнта кафедры нармальнай і паталагічнай фізіялогіі ВДАВМ.

Апублікаваны 22 навуковыя працы, у тым ліку 7 вучэбна-метадычных. Па тэме навуковых даследаванняў у 1997 годзе Аляксандр Уладзіміравіч атрымаў патэнт на вынаходніцтва, а ў 1999 годзе зацверджаны абласныя рэкамендацыі.

А. У. Сінкавец з'яўляецца суаўтарам вучэбных дапаможнікаў: «Асновы фізіялогіі сельскагаспадарчых жывёл», «Практыкум па фізіялогіі сельскагаспадарчых жывёл», «Вучэбная праграма па фізіялогіі сельскагаспадарчых жывёл для вышэйшых сельска-гаспадарчых вучэбных устаноў».

Аляксандр Уладзіміравіч праводзіў навуковыя даследаванні па тэме «Рэзістэнтнасць і мінеральны абмен у птушак».

Сёння А. У. Сінкавец з'яўляецца кіраўніком вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскі завод ветэрынарных прэпаратаў».

**Синковец, А. В.** (ученый-физиолог) Активность пищеварительных ферментов и естественная резистентность кур при использовании пикумина : дис. на соиск. учен. степ. канд. биол. наук : 03.00.13 : 23.04.1999 : 23.06.1999 / А. В. Синковец ; Витеб. гос. акад. вет. медицины. – 1999.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Гапанович, А. Н.** Александр Владимирович Синковец / Афанасий Гапанович // Дивин - древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 77. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Сінкавец Аляксандр Уладзіміравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 127-128.

**Сінкавец Аляксандр Уладзіміравіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 51-52.

**45 гадоў** з дня нараджэння А. У. Сінкаўца (1973) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 73-74.

# СІНЧУК АЛЕГ ВІКТАРАВІЧ

**СІНЧУК Алег Віктаравіч** – навуковец-біёлаг, аспірант, асістэнт кафедры заалогіі біялагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ).



Алег Сінчук нарадзіўся 21 мая 1990 года ў вёсцы Верхалессе Кобрынскага раёна. Першымі лабараторыямі для будучага маладога навукоўца сталі наваколлі сяла, дзе разам з аднагодкамі ён на практыцы вывучаў жыццё прыроды. Асновы біялогіі Алег спасцігаў за школьнай партай: быў удзельнікам прадметных алімпіяд па любімаму прадмету, удзельнічаў у конкурсах даследчых работ, яшчэ падлеткам стаў слухачом Беларускай лясной малой завочнай акадэміі пры Рэспубліканскім экалагічным цэнтры дзяцей і юнацтва ў Мінску.

Прафесію выкладчыка хіміі і біялогіі атрымаў у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна, які закончыў у 2013 годзе.

У 2014 годзе А. Сінчуком абаронена магістарская дысертацыя на тэму «Повышение приживаемости эксплантов и регенерации растений ремонтантных сортов малины красной (Rubus idaeus L.)».

З 2014 года Алег Віктаравіч праходзіў навучанне ў аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «энтамалогія», дзе выконваў дысертацыйнае даследаванне па тэме «Инвазивные виды грызущих членистоногих-фитофагов – вредителей декоративных зеленых насаждений Беларуси».

Выкладаў прадмет «Асновы інфармацыйнай біялогіі - лабараторны практыкум». Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам у навукова-даследчай лабараторыі «Прыкладныя праблемы біялогіі», старшым выкладчыкам кафедры заалогіі біялагічнага факультэта БДУ. Студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя «Структуры і дынамікі біяразнастайнасці», якую ўзначальваў Алег Сінчук, была прызнана адной з лепшых ва ўніверсітэце.

Сапраўды сімвалічным для нашага земляка, навукоўца-біёлага Алега Сінчука стаў 2017 год - Год навукі. Малады аспірант і асістэнт кафедры заалогіі БДУ быў удастоены стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Сёння Алег Віктаравіч з'яўляецца начальнікам аддзела арганізацыі і суправаджэння інавацыйнай дзейнасці - намеснікам начальніка Галоўнага ўпраўлення навукі (ГУН), якое забяспечвае арганізацыю, каардынацыю і ажыццяўленне навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці БДУ, падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі ў аспірантуры і дактарантуры.

Вобласць навуковых інтарэсаў А. Сінчука: фаўна, біялогія і экалогія расліннаедных і грамадскіх насякомых (Insecta: Hymenoptera: Formicidae) Беларусі, асновы біятэхналогіі.

.

### *Працы*

**Синчук, О. В.** Практические занятия по биометрии : метод. указания для студентов научн.-пед. специальностей : в 2 ч. / О. В. Синчук, А. П. Колбас, С. Н. Волосюк ; Брест. гос. ун-т имени А. С. Пушкина. – Брест : БрГУ, 2015. – Ч. 1. – 60 с.

**Синчук, О. В.** Определитель муравьев (Hymenoptera: Formicidae) Беларуси : учеб. материалы / О. В. Синчук. – Минск : БГУ, 2015. – 50 с.

**Синчук, О. В.** Трофобиотические связи инвазивных видов тлей (Sternorrhyncha: Aphidoidea) с представителями аборигенной мирмекофауны Беларуси / О. В. Синчук, Д. Г. Жоров, С. В. Буга // Труды БГУ. – 2015. – Т. 10, ч. 1. – С. 377–380.

**Синчук, О. В.** Forming the basis of research activities of primary school students on the lessons of «Man and the world» / О. В. Синчук. Е. К. Синчук // Иностранные языки и современный мир: сб. материалов междунар. конф., Брест, 17 апреля 2015 г. / Брест. гос. ун-т имени А. С. Пушкина ; редкол. : Л. М. Максимук [и др.]. - Брест : БрГУ, 2015. – Ч. 2. – С. 183–185.

**Sinchuk, A. V.** Features of ecology and biology Lasius (Dendrolasius) fuliginosus // Содружество наук. Барановичи-2013: матер. IX Междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, 23–24 мая 2013 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь : в 2 кн. / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, Ю. В. Башкирова (отв. ред.) [и др.]. – Барановичи : РИО БарГУ, 2013. – Кн. 1. – С. 320–321.

**Буга, С. В.** Подготовка и оформление квалификационных работ : методические рекомендации к лабораторным занятиям по курсу «Основы информационной биологии» / С. В. Буга, О. В. Синчук. – Минск : БГУ, 2015. – 40 с.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Елизарова, Ж.** Профессия – энтомолог / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2017. – 23 верасня. – С. 9.

В Год науки молодой аспирант и ассистент кафедры зоологии БГУ О. Синчук, уроженец д. Верхолесье, был удостоен стипендии Президента Республики Беларусь.

**Руководство** ГУН БГУ. Синчук Олег Викторович // Главное управление науки. - Режим доступа: http://research.bsu.by/about-gds/management/. – Дата доступа: 23.10.2020.

**Персоналии** кафедры зооогии. Синчук Олег Викторович [Электронный ресурс] // Биологический факультет БГУ. – Режим доступа: http://www. bio.bsu.by/ zoology/sinchuk_ru.html. – Дата доступа: 19.10.2018.

**Результаты** Республиканского конкурса научных работ студентов. Синчук Олег Викторович [Электронный ресурс] // Режим доступа: http://www.brsu.by/div/rezultaty-respublikanskogo-konkursa-nauchnyh-rabot-studentov. – Дата доступа: 14.10.2018.

# СІНЧУК ІВАН ІВАНАВІЧ

**СІНЧУК Іван Іванавіч** - гісторык, археолаг і нумізмат, аўтар навуковых прац па нумізматыцы і археалогіі.



Нарадзіўся 8 сакавіка 1956 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці.

У 1981 годзе Іван Сінчук закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт са спецыялізацыяй «дапаможныя гістарычныя дысцыпліны». Спецыяльную падрыхтоўку атрымаў у аддзеле нумізматыкі Дзяржаўнага гістарычнага музея (г. Масква) у 1983-1984 гадах.

Да паступлення ў аспірантуру Іван Сінчук – супрацоўнік, вядучы археолаг Інстытута «Белспецпраект-рэстаўрацыя», кіраўнік работ па шэрагу аб’ектаў: даследаваў архітэктурна-археалагічныя помнікі на тэры-торыі Мазыра, Магілёва, Мінска, Быхава, Нясвіжа, Кобрына. Прымаў удзел у археалагічных раскопках Роўна, Гродна, Вільні, Тракая, Калінінграда, Ленборка, Навагрудка і інш.

У 1989-1991 гадах вучыўся ў аспірантуры Інстытута гісторыі НАН (аддзел феадалізму). Даследуе гісторыю грашовага звароту, тэхніку манетнай справы IX–XX стст., гісторыю матэрыяльнай культуры XVI–XX стст., праблемы этнічнай антрапанімікі Беларусі. З 1995 года супрацоўнічае з Інстытутам археалогіі і этналогіі Польскай АН, вывучаў манетныя зборы ў музеях Польшчы.

Ён працаваў у розных навуковых і адукацыйных установах: у 1985-1991 гадах быў вядучым археологам навукова-даследчага інстытута «Белспецпраектрэстаўрацыя», у 1995-1998 гадах выкладаў у Беларускім універсітэце культуры. З 2008 па 2014 год - вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. І ў кожнай з пералічаных устаноў трымаў планку па колькасных і якасных параметрах навуковай дзейнасці.

Выканаў індывідуальныя навукова-даследчыя праграмы «Тэхніка манетнай справы XVII ст.» і «Анамастыка беларускай эліты». Даследуе гісторыю грашовага абарачэння, тэхніку манетнай справы IX-XX стст., гісторыю матэрыяльнай культуры XVI-XX стст., праблемы этнічнай антрапанімікі Беларусі.

Сінчук І. І. - аўтар больш за 400 навуковых прац і 200 энцыклапедычных артыкулаў. Аўтар навуковых прац па нумізматыцы і археалогіі, адзін з аўтараў дапаможніка «Некаторыя пытанні вывучэння гісторыі, эканамічнай тэорыі і культуралогіі ў ВНУ» (1997).

Іван Іванавіч упэўнена лідзіруе сярод айчынных аўтараў па колькасці нумізматычных артыкулаў у энцыклапедычных выданнях. І. Сінчуком напісана звыш двух з паловай сотняў артыкулаў для энцыклапедыі «Археалогія і нумізматыка Беларусі», «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (у 6 т.), «Беларускай энцыклапедыі» (у 18 т.), «Энцыклапедыі Вялікага княства Літоўскага» (у 2 т.), энцыклапедыі «Рэспубліка Беларусь» (у 6 т.). Ён падрыхтаваў таксама праграму вузаўскага навучальнага курса нумізматыкі.



Вучоны вырашыў шэраг праблем, звязаных з рэстаўрацыяй Мірскага замка, удзельнічаў у стварэнні шэрагу экспазіцый, удзельнік міжнародных канферэнцый. Сінчук з’яўляецца спецыялістам па выкарыстанні матэматычных і фізіка-хімічных метадаў у гістарычных даследаваннях, адным з першых у беларускай гістарычнай навуцы стаў выкарыстоўваць колькасныя метады ў гістарычных даследаваннях.

У 2000 годзе І. Сінчук стаў пераможцам расійскага конкурсу на знак рубля (дызайн сімвала). Беларускі гісторык першым знайшоў згадкі выявы знака рубля, датаваныя XVII-XIX стагоддзямі. Гэтай выявай былі напісаны скорапісам надрадковыя літары «р» і «у».

Іван Іванавіч мае прызнанне далёка за межамі Бацькаўшчыны. Паспявае ён перакладаць і працы замежных калег. І. І. Сінчук - член Расійскай асацыяцыі «Гісторыя і камп'ютар», міжнароднай Асацыяцыі нумізматаў Балтыі.

Сфера навуковых інтарэсаў вучонага : нумізматыка; архітэктурная археалогія; археалагічная кераміка; археалагічнае шкло; прымяненне матэматычных метадаў у гістарычных даследаваннях.

### *Працы*

**Синчук, И. И.** История одной фальшивой монеты : [монография] / И. И. Синчук ; науч. ред. Ю. М. Бохан. - Минск : Минсктиппроект, 2006. - 37, [2] с. : ил., табл.

**Синчук, И. И.** Итоги – 50 / И. И. Синчук – Мінск, 2007 – 60 с. : ил.

Брошюра содержит список научных работ Синчука И. И. за 1984 -2006 гг., перечень намеченных к публикации в виде книг работ юбиляра и очерк о знаке рубля.

**Синчук, И. И.** Клады Беларуси: законодательство и практика / Синчук И. И. - Минск : Минсктиппроект, 2003. -54, [1] с.

**Синчук, И. И.** Монетные дары в Фонд Народной Обороны жителей Кобринского повета в мае-апреле 1939 г. / И. И. Синчук // Десятая Всероссийская нумизматическая конференция. Псков, 15-20 апреля 2002 г. : тезисы докладов и сообщений. - М., 2002. – С. 304-307.

**Синчук, И. И.** Находки единичных монет в г. Кобрине / И.И. Синчук, С.М. Янюк. - Минск : Технопринт, 2000. - 27 с. : ил.,табл.; библиогр.: с. 24.

**Синчук, И. И.** Находки единичных монет в г. Кобрине Брестской обл. Республики Беларусь / И. И. Синчук, С. М. Янюк // Седьмая Всероссийская нумизматическая конференция.- Ярославль, 19-23 апреля 1999 г. : тезисы докладов и сообщений. - Москва, 1999. - С.183-187.

**Сінчук, І. І .** Ордэн / І. І. Сінчук // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2000. – Т. 11. - С. 444 - 447.

**Сінчук, І. І.** Узнагародныя медалі Расійскай імперыі 19 - пачатку 20 ст. / І. І. Сінчук. - Мінск, 2002 – 48 с.

**Синчук, И. И.** Экспертное заключение о кладе монет 17-18 вв. из д. Гладково Чаусского раёна Могилевской обл. Беларуси / И. И. Синчук. – Мінск : ПКФ «Арти-фекс», 1994. - 13 с.

**Синчук, И.** Многоликий знак рубля / І. Сінчук // Нумизматика. – 2006. - № 12.

**Синчук, И. И.** Первая белорусская нумизматическая энциклопедия «Археалогія і нумізматыка Беларусі» / И. И. Синчук // Берасцейскі хранограф. Вып. 3. - Брэст, 2002. – С. 338-353.

**Синчук, И. И.** Деньги в исторической ретроспективе / И. И. Синчук // Белорусский банковский бюллетень.- 1999. - № 33. - С. 34-43 ; № 34. - С. 33-40.

**Синчук, И. И.** Деньги: историческая ретроспектива / И. И. Синчук // Нумизматический альманах. - 1997. - № 2. - С. 2-11, № 3-4. - С. 10-16.

**Синчук, И. И.** Деньги в исторической ретроспективе / И. И. Синчук // Банковский бюллетень. - 1996. - № 16. - С. 69-89.

**Сінчук І.** Нешчаслівае шчасце нумізмата / І. І. Сінчук // Мастацтва Беларусі. - 1991.- № 1.- С. 65-69.

**Сінчук І**. Erbe – значыць спадчына / І. Сінчук // Мастацтва Беларусі. - 1990. - № 2. – С. 68-70.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Сінчук Іван Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 441. – (Імі ганарацца землякі).

**Стралец, М.** Сінчук Іван Іванавіч / Міхаіл Стралец // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі **:** у 6 т. – Мінск, 2001. – Т. 6, кн. 1. - С. 302.

**Сінчук Іван Іванавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 130-132.

**60 гадоў** з дня нараджэння І. І. Сінчука (1956) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 16.

**Стралец, М.** Нястомны працаўнік навукі / Міхаіл Стралец // Кобрынскі веснік. - 2016. - 16 сакавіка. - С. 3.

**Яскевич, С.** И у российской валюты есть свой знак / Светлана Яскевич // Заря. – 2001. – 16 июня.

Историк И. Синчук (уроженец г. Кобрина) предложил использовать для обозначения российского рубля знак из рукописных документов XVII-XIX вв.

**8 сакавіка** – 60 гадоў з дня нараджэння Івана Івановіча Сінчука [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Рэжым доступу: http://kb.brl. by/index. – Дата доступу: 12.09.2016.

**Синчук, Иван Иванович** [Электронный ресурс] // База данных «Ученые Беларуси». – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/scient/pls/dict.prn_ref?tu=e&tq-=v0& name_view. – Дата доступа: 05.10.2017.

**Известному** белорусскому историку И. И. Синчуку – 55 лет [Электронный ресурс]. - Режим доступа: http://old-moneta.ru/ numismatics/ izvestnomu-belorusskomu-istoriku-i-i-sinchuku-55-let.html. – Дата доступа: 13.08.2017.

# СКІРМУНТ АЛЯКСАНДР ІЗІДАР

**СКІРМУНТ Аляксандр Ізідар Сымонавіч** (1799-1870) - вынаходнік, першы беларус, які атрымаў афіцыйны патэнт на вытворчасць (1830), дзяржаўны і гаспадарчы дзеяч, прамысловец, прадпрымальнік.

Нарадзіўся 1(21?) студзеня 1799 года ў вёсцы Моладава Кобрынскага павета (цяпер Іванаўскі раён) і з юнацтва адрозніваўся вельмі дапытлівым і практычным розумам. Бацьку яго звалі Сымон, маці – Эльжбета (яна – з сям'і Ажэшкаў). Род Скірмунтаў вельмі старажытны. Сярод дынастый прадпрымальнікаў Беларусі XIX – пачатку XX ст. ганаровае месца па праве належыць Скірмунтам.

Закончыўшы ў 1818 годзе фізіка-матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта са ступенню магістра, ён адправіўся для працягу вучобы ў Германію і Францыю, дзе правёў некалькі гадоў, вывучаючы хімію і яе практычнае прымяненне ў вытворчасці. К 30 гадам ён атрымаў ад бацькі ў поўнае распараджэнне ўсю маёмасць і задумаў у палескай глушы прамысловую рэвалюцыю з размахам, якога тутэйшыя месцы яшчэ не ведалі.




Аляксандр з энтузіязмам узяўся за справу і арганізаваў у 1830 годзе ў Моладава новую па тых часах галіну вытворчасці – цукрова-рафінадны завод, адзін з першых у Беларусі. Сваю ролю тут адыграла не толькі знаёмства з перадавым заходнееўрапейскім вопытам, але і тое, што ў год адкрыцця завода Аляксандр Скірмунт атрымаў дзяржаўны прывілей (патэнт) на ўласнае вынаходніцтва апарата з выкарыстаннем пару для паскоранага выпарэння цукровага сіропу (прывілей тэрмінам на 10 гадоў за № 61 ад 10 снежня 1830 года «на снаряд для выпаривания сахарных растворов посредством паров на плоских покато-устроенных поверхностях»).

Сутнасць вынаходніцтва заключалася ва ўжыванні так званага пракату – металічнай паверхні з невялікім нахілам, па якой цёк тонкім пластом цукровы сіроп, які награваўся знізу парам. Пракат дазваляў значна паскорыць тэхналагічны працэс: замест звычайных 4-5 гадзін пры агнявым награванні на пракаце выпарванне доўжылася толькі 3-4 хвіліны. Тут выпускалі рафінад вельмі высокай ступені ачысткі. Гэта была першая ў сусветнай практыцы ўстаноўка бесперапыннага дзеяння па атрыманні цукру. Атрымаўшы 10 снежня 1830 года дзяржаўны прывілей тэрмінам на 10 гадоў Аляксандр Сымонавіч Скірмунт стаў першым афіцыйна прызнаным беларускім вынаходнікам.

У 1836 годзе ў Парэччы запрацавала новае дзецішча Скірмунта – суконная фабрыка. Аляксандр сам распрацаваў усю тэхналогію. На той час яшчэ фабрык на тэрыторыі Беларусі ўвогуле амаль што не было. Фабрыка стала адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў не толькі Мінскай губерні, але і ўсёй Беларусі. Таксама ў Парэччы былі пабудаваныя паравы млын і сыраварны завод.

22 ліпеня 1870 года ў 72-гадовым узросце заснавальнік дынастыі беларускіх прадпрымальнікаў Аляксандр Скірмунт памёр у Германіі ў г. Кастэль Гесінскага герцагства, куды ён выехаў на лячэнне.

***Аб жыцці і дзейнасці***


**Вяроўкін-Шэлюта, У. М.** Скірмунты [Аляксандр Ізідар] / У. М. Вяроўкін-Шэлюта // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск, 2002. — Т. 14. — С. 457.

**Вяроўкін-Шэлюта, У.** Скірмунты [Аляксандр Ізідар] / Уладзімір Вяроўкін-Шэлюта // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 2001. - Т. 6, кн. 1. - С. 321, 322.

**Крэйдзіч, А. М.** «Наш раён славіцца сваёй літаратурнай біяграфіяй» / [Анатоль Мікалаевіч Крэйдзіч ; гутарыў] Аляксандр Лагвіновіч // Заря. – 2018. – 18 августа. – С. 15.

Першы беларускі вынаходнік Аляксандр Скірмунт нарадзіўся ў Моладаве Гродзенскай губерні Кобрынскага павету.

**Кирьянов, А.** Последний Скирмунт. Взлет и падение полесского рода / Артем Кирьянов // Советская Белоруссия. – 2016. – 24 июня.

**Дзейнасць** Скірмунтаў на Палессі [Электронны рэсурс] // Беларускі гістарычны партал. – Рэжым доступу: http://www.belhistory.com/skirmunt.html. – Дата доступу: 12.10.2020.


# СМЯХОВІЧ МІКАЛАЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ

**СМЯХОВІЧ Мікалай Уладзіміравіч** – педагог, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык цэнтра гісторыі новай і навейшай гісторыі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.



Нарадзіўся 18 студзеня 1952 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна ў вялікай сялянскай сям'і. У цяжкія пасляваенныя гады атрымаць добрую адукацыю было вельмі складана. І таму для вясковага хлопчыка, якога з дзяцінства вабілі кнігі, накіраванне ў 1959 годзе на вучобу ў Дзівінскую школу-інтэрнат было сапраўдным шчасцем. Да 9 класа Мікалай ужо дакладна вызначыўся з будучай прафесіяй: ён марыў быць гісторыкам.

У 1970 годзе паступіў вучыцца ў Мінскі педагагічны інстытут. На жаданне М. Смяховіча стаць прафесійным гісторыкам-навукоўцам паўплывалі выкладчыкі Інстытута: доктар гістарычных навук Вера

Гарамыкіна, якая кіравала яго курсавой работай па гісторыі старажытнага часу, і доктар гістарычных навук Аляксей П'янкоў, які выкладаў гісторыю СССР.

Атрымаўшы дыплом з адзнакай (1974), малады спецыяліст з 1974 па 1978 год працаваў у Пухавіцкім раёне дырэктарам Слабадской няпоўнай сярэдняй школы. Пасля заканчэння службы ў арміі з лістапада 1979 года Мікалай Уладзіміравіч - настаўнік гісторыі 116-й сярэдняй школы г. Мінска.

У 1980 годзе М. Смяховіч выбраны адказным сакратаром Фрунзенскай раённай арганізацыі Добраахвотнага таварыства аматараў кнігі БССР. На гэтай пасадзе шмат часу надаваў вывучэнню літаратуры, у першую чаргу гістарычнай.

У 1985 годзе перайшоў на працу ў Мінскі кааператыўны тэхнікум, дзе выкладаў грамадскія дысцыпліны.

З 1987 года М. Смяховіч працаваў на розных пасадах у БДПУ імя М. Танка.

У 1992 годзе Мікалай Уладзіміравіч абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Работа дзяржаўных, палітычных і грамадскіх арганізацый Беларусі па жыццяўладкаванні і выхаванні дзяцей, якія засталіся без бацькоў (1943-1950 гг.)». Кандыдат гістарычных навук.

М. Смяховіч плённа спалучаў выкладчыцкую і навуковую дзейнасць і ў верасні 1997 года за шэраг навуковых прац па гісторыі Беларусі стаў лаўрэатам прэміі БДПУ імя М. Танка.

У 2002 годзе М. Смяховіч перайшоў на выкладчыцкую работу ў Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва.

З верасня 2005 года Мікалай Уладзіміравіч працуе ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, дзе ўзначаліў аддзел гісторыі беларускай дзяржаўнасці, у 2006 годзе - цэнтр гісторыі індустрыяльнага грамадства. Як кіраўнік цэнтра, М. У. Смяховіч надае шмат увагі арганізацыі навуковых даследаванняў, гістарычнай распрацоўцы нацыянальна-дяржаўных канцэпцый асноўных этапаў развіцця беларускай дзяржаўнасці, эвалюцыі ідэі самавызначэння беларускага народа ў XIX ст. - пачатку XX ст., яе ўвасаблення ў жыццё на працягу XX стагоддзя. Са студзеня 2016 года - загадчык цэнтрам новай і найноўшай гісторыі Беларусі.

Мікалай Уладзіміравіч Смяховіч папоўніў скарбонку беларускай гістарыяграфіі цікавымі арыгінальнымі даследаваннямі, што атрымалі прызнанне як у рэспубліцы, так і па-за яе межамі. Ён з'яўляецца аўтарам больш як 100 навуковых публікацый, якія прысвечаны вывучэнню актуальных праблем айчыннай гісторыі і метадалогіі гісторыі, у тым ліку адной індывідуальнай работы «История и метод», якая пабачыла свет у 2004 годзе, і пяці калектыўных манаграфій («Беларусь: Народ. Государство. Время» (Минск, 2009); «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII - пачатку XX ст.» (у 2 кн., кн. 1) (Мінск, 2011) і інш.).

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускай дзяржаўнасці, сацыяльна-палітычная гісторыя Беларусі канца XVIII ст. - пачатку XXI ст., тэарэтыка-метадалагічныя праблемы гістарычнага пазнання.

### *Працы*

**Смехович, Н. В.** Исторические истоки, этапы становления и развития белорусской государственности (теоретико-методологическое эссе) / Н. В. Смехович // Российские и славянские исследования : научый сборник / Белорус. государственный университет ; А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Минск, 2008. – Вып. 3. – С. 9-25.

**Смехович, Н. В.** Методологические школы и направления философии истории / Н. В. Смехович // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. / адк. рэд. С. М. Ходзін. – Мінск, 2002. - Вып. 1. – С. 77-81.

**Смехович, Н. В.** Сопротивление колхозного крестьянства Беларуси сталинской аграрной политике: формы и направления (1946-1952 гг.) / Н. В. Смехович // Октябрьская революция в исторических судьбах белорусской государственности : сборник статей. – Минск, 2020. - С. 114-121.

**Смехович, Н. В.** История советского государства в зеркале «новой» исторической науки России (конец XX — начало XXI века) / Николай Смехович // Беларуская Думка. - 2020. — № 10. — С. 56 – 62.

**Смяховіч, М. У.** Вырашэнне праблемы дзіцячага сіроцтва на Беларусі ў паршыя пасляваенныя гады / М. У. Смяховіч // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы) : усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў : тэзісы дакладаў і паведамленняў, Мінск, 3-5 лютага 1993 г. – Мінск, 1993. – С. 211-213.

**Смяховіч, М. У.** Праявы супраціву беларускага калгаснага сялянства сталінскай аграрнай палітыцы (1946—1952 гг.) / Мікалай Уладзіміравіч Смяховіч // Беларускі гістарычны часопіс. - 2017. — № 12. — С. 4-16.

**Смехович, Н.** Белорусская государственность: истоки и формы / Николай Смехович // Беларуская думка. – 2013. - № 11. – С.74-81**.**

**Смяховіч, М. У.** Нацыянальная ідэя беларусаў у XX стагоддзі: гістарычны аналіз праблемы / М. У. Смяховіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1998. - № 3. – С. 20-25.

**Смяховіч, М. У.** Узаемаадносіны самадзяржаўя з каталіцкай царквой на Беларусі / М. У. Смяховіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. - № 1. – С. 45-50.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 441. – (Імі ганарацца землякі).

**Корзенко, Г. В.** Смехович Николай Владимирович / Г. В. Корзенко // Историки Беларуси в начале XXI столетия : библиограф. справ. / Г. В. Корзенко. – Минск, 2007. – С. 357-358.

**Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 132-134.

**Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч**. Вядомыя людзі, ураджэнцы в. Дзівін // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 27-28.

**65 гадоў** з дня нараджэння М. У. Смяховіча (1952) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 46-47.

**Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч** // Беларускі гістарычны часопіс. - 2017. - № 12. – С. 4.

**Яноўская, В.** Міхась Восіпавіч Біч (1936-1999) : жыццё і навуковая дзейнасць : да 80 годдзя з дня нараджэння / Валянціна Яноўская // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – 8 жніўня. – С. 29 – 33.

Гл. на с. 30-31.

**Даніловіч, В.** З гісторыяй у працы і жыцці / Вячаслаў Даніловіч, Міхаіл Касцюк // Веды. – 2012. – 16 студзеня. – С. 7.

Жыццёвы і навуковы шлях кандыдата гістарычных навук, дацэнта Мікалая Уладзіміравіча Смяховіча, ураджэнца в. Дзівін.

**Даніловіч, В.** З гісторыяй у працы і жыцці / Вячаслаў Даніловіч, Міхаіл Касцюк // Веды. – 2012. – 16 студзеня. – С. 7.

Сваё 60-годдзе адзначыў загадчык цэнтра гісторыі Інстытута гістарыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук М. У. Смяховіч, ураджэнец в. Дзівін.

# СОЎПЕЛЬ ІГАР ВАСІЛЬЕВІЧ



**СОЎПЕЛЬ Ігар Васільевіч** - беларускі вучоны, спецыяліст у вобласці тэхнічнай кібернетыкі і інфарматыкі. Доктар тэхнічных навук (1991), прафесар (1994).

Нарадзіўся 8 красавіка 1949 года ў вёсцы Гарадзец Кобрынскага раёна. Выпуснік 1966 года Гарадзецкай сярэдняй школы. Закончыў матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1971).

Працаваў у Інстытуце матэматыкі АН БССР.

У 1976-1978 гадах - аспірант кафедры матэматычнага забеспячэння аўтаматычнай сістэмы кіравання (АСК) БДУ.

У 1980 годзе І. В. Соўпель абараніў кандыдацкую дысертацыю, з 1981 года ён дацэнт. У 1991 годзе навуковец абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Аўтаматызаваная перапрацоўка тэксту на аснове ўзнаўленчага мадэліравання лінгвістычных аб’ектаў і працэсаў». Навуковае званне прафесара прысвоена ў 1994 годзе.

З 1997 года Ігар Васільевіч - загадчык кафедры матэматычнага забеспячэння АСК факультэта прыкладной матэматыкі БДУ.

І. В. Соўпель з’яўляецца навуковым кіраўніком лабараторыі інтэлектуальных інфармацыйных сістэм. Ён сфармуляваў і развіў канцэпцыю новага навуковага напрамку ў галіне штучнага інтэлекту - узнаўленчага мадэліравання лінгвістычных аб’ектаў і працэсаў. Яго навуковыя і прыкладныя інтарэсы цесна звязаны з праектаваннем, распрацоўкай і ўкараненнем сістэм аўтаматычнай апрацоўкі тэкстаў, уключаючы сістэмы лінгвістычных баз ведаў, семантычнага аналізу тэкстаў, аўтаматычнага рэферыравання, машыннага перакладу, інтэлектуальных інтэрфейсаў карыстальніка, інжынерыі ведаў, інтэлектуалізацыі інфармацыйных сістэм.

Навуковец з’яўляецца аўтарам шэрагу вынаходніцтваў у галіне штучнага інтэлекту, якія запатэнтаваны ў міжнародных патэнтных фондах. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны такія знакамітыя ў сучаснай інфарматыцы інтэлектуальныя інфармацыйныя сістэмы, як Cobrain, Knowledgist, Vedy, Goldfive Intelligence, а таксама шэраг сістэм у межах важнейшых рэспубліканскіх навукова-тэхнічных праграм, якія забяспечваюць і развіваюць камп’ютарную форму існавання беларускай мовы. Стварыў камп’ютарную сістэму беларуска-рускага і руска-беларускага машыннага перакладу тэкстаў.

Ігар Васільевіч з’яўляецца членам Навукова-метадычнага савета Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У 1999 годзе ўзнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».

### *Працы*

**Совпель, Игорь Васильевич**. Автоматизированная переработка текста на основе воспроизводящего моделирования лингвистических объектов и процессов : диссертация … доктора технических наук : 05.25.05 : защищена 25.12.1991 : утверждена 24.01.1992 / И. В. Совпель. — Минск, 1991.

**Совпель, Игорь Васильевич**. Вопросы реализации систем автоматического анализа текстов естественных языков : автореферат диссертации ... кандидата физико-математических наук : 01.01.10 / И. В. Совпель. - Киев, 1980.

**Совпель, И. В.** Автоматизированная система ведения словарей и карточек АСВС / И. В. Совпель // Математические обеспечение ЕС ЭВМ. - Минск, 1979.

**Совпель, И. В.** Инженерно-лингвистические принципы, методы и алгоритмы автоматической переработки текста / И. В. Совпель. - Минск, 1991. – 116 с.

**Совпель, И. В.** Информационно-поисковая система пословно-оборотного перевода текстов / И. В. Совпель // Математическое обеспечение ЕС ЭВМ. - Минск, 1981.

**Совпель, И. В.** Автоматизация обработки текста / И. В. Совпель. – Минск : БГУ, 2016.
**Sovpel, I. V.** Development and application of corpus of a virtual texts in MM-system / I. V. Sovpel // Вестник БГУ. Серия 1, Физика. Математика. Информатика. — Минск, 1996. — № 3. — С. 74—79.

***Аб жыцці і дзейнасці І. В. Соўпеля***

**Соўпель Ігар Васільевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 15. – С. 91.
**Совпель Игорь Васильевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 2. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 279.
**Совпель Игорь Васильевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 7. - С. 16–17.
**Совпель Игорь Васильевич** // Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, 1921-2001 : 80 год. - Мінск, 2001. - С. 260.
**Соўпель Ігар Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 442.
**Соўпель Ігар Васільевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 134-135.
**70 гадоў** з дня нараджэння І. В. Соўпеля (1949) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 108 .
**Совпель, Игорь Васильевич** [Электронный ресурс] // База данных «Ученые Беларуси». – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/scient/pls/-dict.prn_ref?tu=e&tq=. – Дата доступа: 05.02.2019.

# СТРАЛЬЧОНАК АЛЕГ АНАТОЛЬЕВІЧ

**СТРАЛЬЧОНАК *Алег Анатольевіч*** (1947-2010) – вучоны ў галіне біяарганічнай хіміі і біяхіміі гармонаў, акадэмік НАН Беларусі, доктар хімічных навук (1983), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988).



Алег Анатольевіч Стральчонак нарадзіўся 18 кастрычніка 1947 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. У 1970 годзе паспяхова закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У. І. Леніна і быў рэкамендаваны для паступлення ў аспірантуру. У 1970-1973 гадах праходзіў падрыхтоўку ў аспірантуры Інстытута арганічнай хіміі імя М. Д.Зялінскага АН СССР.

А. А. Стральчонак быў накіраваны на працу ў аддзел біяарганічнай хіміі Інстытута фізіка-арганічнай хіміі АН БССР. Пасля пераўтварэння аддзела ў Інстытут біяарганічнай хіміі ў 1974 годзе Алег Анатольевіч працягнуў працу ў інстытуце, дзе ён прайшоў шлях ад малодшага навуковага супрацоўніка да дырэктара, ад кандыдата навук (1974) да акадэміка (1994). У 1973–1974 гадах А. А. Стральчонак – старшы інжынер Інстытута фізіка-арганічнай хіміі АН БССР, у 1974–1979 гадах – старшы інжынер, малодшы, старшы навуковы супрацоўнік, з 1979 года – загадчык лабараторыяй. У 1983 годзе становіцца доктарам хімічных навук.

Напачатку 1980-х гадоў А. А. Стральчонак пачынае ўкараненне сваіх распрацовак. Яму разам з групай навукоўцаў-энтузіястаў атрымоўваецца стварыць навуковыя і тэхнічныя асновы, распрацаваць тэхналогіі, арганізаваць серыйны выпуск і ўкараніць у медыцынскую дыягнастычную практыку набора рэагентаў для радыёімуннага аналізу. Гэта праца была ўдастоена Дзяржаўнай прэміі БССР за 1988 год, а накірунак у імунадыягнастычнай індустрыі атрымаў далейшае развіццё і існуе па цяперашні дзень.

У 1988 годзе А. А. Стральчонак становіцца дырэктарам Інстытута біяарганічнай хіміі. У гэты перыяд пачаліся радыкальныя змены ў савецкім грамадстве, атрымалі развіццё негатыўныя тэндэнцыі, у сувязі з якімі ўпаў прэстыж навукі ў цэлым. Аднак выключная цярплівасць, далікатнасць і вера ў будучыню інстытута дазволілі Алегу Анатольевічу не толькі не дапусціць яго распаду, але і мабілізаваць супрацоўнікаў на рашэнне важных для рэспублікі задач – стварэнне новых лекавых прэпаратаў і сродкаў абароны раслін у сельскай гаспадарцы.

З 1988 па 2000 год А. А. Стральчонак з'яўляўся дырэктарам Інстытута біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У 1989 годзе яго выбіраюць членам-карэспрандэнтам АН БССР, у 1994 годзе – акадэмікам НАН Беларусі. У 2000-2010 гадах працаваў у Швецыі, быў кіраўніком даследаванняў і распрацовак фармацэўтычнай фірмы «Oasmia» (Швецыя).

А. А. Стральчонак апублікаваў больш за 170 навуковых прац, зрабіў 35 вынаходстваў. Пад яго кіраўніцтвам дзесяць чалавек абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Алег Анатольевіч меў рэдкую здольнасць прадбачання таго, што заўтра стане актуальным і будзе запатрабаваным грамадствам. Навуковец здолеў выявіць новыя носьбіты біялагічнай інфармацыі. Ён праводзіў даследаванні ў вобласці хіміі гармонаў і гарманальнай рэцэпцыі, даследаваў структурную арганізацыю і заканамернасці функцыянавання мембранных сістэм пазнавання гармон-глікапратэінавых комплексаў; вырашыў праблему стварэння комплексу сродкаў імунахімічнага мікрааналізу для ацэньвання функцыянальнага стану органаў і сістэм арганізма чалавека.

Шматграннай і актыўнай была грамадская дзейнасць Алега Анатольевіча Стральчонка. Ён удзельнічаў у рабоце Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, Рэспубліканскага навуковага савета па праблемах прагназавання навукова-тэхнічнага прагрэсу пры камісіі Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь, уваходзіў у склад рэдакцыйнай калегіі часопіса «Весці НАН Беларусі», серыя «Хімічныя навукі».

А. А. Стральчонак памёр 5 сакавіка 2010 года.

### *Працы*

**Стрельчёнок, А. А.** Исследование специфических стероидсвязывающих гликопротеинов крови человека : автореферат диссертации… доктора химических наук : 02.00.10 / О. А. Стрельчёнок ; Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т биоорган. химии. – Минск, 1983. – 40 с.

**Стрельчёнок, А. А.** Масс-спектрометрическое исследование серусодержащих аналогов кортикостероидов: автореферат диссертации... кандидата химических наук : 02.00.03 / О. А. Стрельченок ; науч. рук.: О. С. Чижов, А. А. Ахрем, офиц. оппоненты: Л. А. Яновская, В. Н. Бочкарев ; Институт органической химии им. Н. Д. Зелинского РАН, Институт биоорганической химии им. М. М. Шемякина АН СССР. – Москва, 1974. – 28 с.

**Стрельчёнок, А. А.** О ранее неизвестном свойстве нормального иммуноглобулина М человека способности специфически связывать тиреоидные гормоны / А. А. Стрельчёнок // Доклады АН Беларуси. - 1992. - Т. 36. - № 3-4.

**Стрельчёнок, А. А**. Роль стероидсвязывающих гликопротеинов крови человека в передаче гормонального сигнала в клетке / А. А. Стрельчёнок // Физиологический журнал СССР им. И. М. Сеченова. - 1990. - Т. 76. - № 9.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Мешечко, Е. Н.** Стрельчонок Олег Анатольевич / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Немана, Западного Буга и Припяти: путеводитель / Е. Н. Мешечко. - Брест, 2012.- С. 228.

**Стральчонак Алег Анатольевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 15. - С. 198.

**Стрельчёнок Олег Анатольевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 7. - С. 133.

**Стрельчёнок Олег Анатольевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 387.

**Стрельчёнок Олег Анатольевич** // Национальная академия наук Беларуси : энциклопедический справочник. – Минск, 2017. - С. 508.

**Стральчонак Алег Анатольевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 136-138.

**70 гадоў** з дня нараджэння А. А. Стральчонка (1947 // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 47.

**18 октября** 1947 г. [род. О. Стрельченок] : Этот день в истории // Советская Белоруссия. - 2017. - 18 октября. - С. 16.

**18 кастрычніка** 1947 г. [нар. А. А. Стральчонак] : Даты. Падзеі. Людзі // Звязда. - 2017. - 18 кастрычніка. - С. 8.

**Памяти** академика Олега Стрельчёнка / Президиум Национальной академии наук Беларуси, Отделение химии и наук о земле НАН Беларуси, Институт биоорганической химии НАН Беларуси // Веды. - 2010. - 15 марта (№ 11). - С. 7.

**Памяти** учёного О. А. Стрельчёнок [Электронный ресурс] // Национальная академия наук Беларуси. – Режим доступа: http://nasb.gov.by/rus/members/ memoriam/strelchyonok.php. – Дата доступа: 06.02.2016.

**Стрельченок Олег Анатольевич** [Электронный ресурс] // Институт биоорганической химии НАН Беларуси. - Режим доступа: http://iboch.bas-net.by/rus/index.php/ ru/ home?id. – Дата доступа: 07.09.2017.

# СТРАЧУК МІХАІЛ СЦЯПАНАВІЧ

**СТРАЧУК Міхаіл Сцяпанавіч** – кандыдат гістарычных навук (1986), дацэнт (1991). Спецыяліст у галіне педагогікі.



Нарадзіўся ў 1948 годзе ў вёсцы Мінянка ў сялянскай сям'і. Бацька Сцяпан Міхайлавіч – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ардэнаносец, дайшоў да Берліна.

Пасля заканчэння школы Міхаіл паступаў у Мінскі радыётэхнічны ўніверсітэт, але не прайшоў па конкурсе і ўладкаваўся на працу настаўнікам фізікі ў Барысаўскую школу.

Закончыў Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт. Пасля службы ў арміі працаваў інструктарам райкама камсамола і райкама партыі.

З 2003 года Міхаіл Сцяпанавіч – дацэнт кафедры педагогікі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. У 1986-2002 гадах - старшыня прафсаюзнага камітэта выкладчыкаў і супрацоўнікаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Працы*

**Строчук, М. С.** Комсомол Белоруссии - активный помощник партии в культурном строительстве : 1971-1975 гг. : автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. истор. наук : 07.00.01 / Строчук Михаил Степанович ; Ин-т истории партии при ЦК КП Белоруссии - фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск, 1985. – 23 с.

**Наследие** А. С. Макаренко и педагогические приоритеты современности : материалы межфакультетской научно-практической конференции (Брест, 29 апреля 2009 года) / [редколлегия: М. С. Строчук, М. П. Михальчук]. – Брест, 2009.

**Педагогические** идеи прошлого и их использование в современной практике обучения и воспитания : сборник материалов межфакультетского научно-практического семинара, Брест, 6 апреля 2012 года / [редколлегия: М. С. Строчук, М. П. Михальчук]. – Брест, 2013.

**Словарь** понятий и терминов по сравнительной педагогике и истории педагогической мысли / Учреждение образования «Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина» ; [авторы-составители : М. С. Строчук, Л. М. Максимук ; под общей ред. М. А. Добрынина]. – Брест, 2007.

**Сравнительная** педагогика в условиях международного сотрудничества и европейской интеграции : сборник материалов VII Международной научно-практической конференции, Брест, 15—16 мая 2015 года / [редколлегия : Т. А. Ковальчук, Л. М. Максимук, М. С. Строчук]. – Брест, 2015.

*Аб жыцці і дзейнасці*

**Страчук Міхаіл Сцяпанавіч** // Прафесарска-выкладчыцкі калектыў Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна : бібліяграфічны даведнік, 1945–2005 : 60 год. — Брэст, 2005.

**Они** возглавляли профсоюзную организацию работников. Строчук Михаил Степанович [Электронный ресурс] // Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина. – Режим доступа: http://www.brsu.by/div/istoriya-v-litsah. – Дата доступа: 16.03.2020.

**Строчук, Михаил Степанович** [Электронный каталог] // Сводный электронный каталог библиотек Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/opac/pls/dict.prn_ref?tu=r&tq=v0&name_ view=va. – Дата доступа: 16.03.2020.

**Страчук Міхаіл Сцяпанавіч** : інфармацыя Мінянскай публічнай бібліятэкі. – Мінянка, 2010.

# СТРОК ЯЎГЕНІЙ ЯКАЎЛЕВІЧ

**СТРОК Яўгеній Якаўлевіч** - кандыдат тэхнічных навук, дацэнт.

Закончыў з залатым медалём СШ № 1 г. Кобрына.

Культ ведаў заўсёды панаваў у сям'і Строкаў, і менавіта бацькі Яўгенія, Марыя Сцяпанаўна і Якаў Сямёнавіч, сарыентавалі свайго сына на машынабудаванне, так як яшчэ ў 1970-я гады разумелі, што за гэтай сферай будучыня.

Шлях у навуку Яўгенія Строка пачаўся ў 1965 годзе, калі ён стаў студэнтам Беларускага політэхнічнага інстытута. Атрымаўшы ў 1970 годзе дыплом інжынера-механіка па спецыяльнасці «Тэхналогія машынабудавання», Я. Строк звязаў сваё жыццё з навукай і тэхнікай.

У 1980 годзе Яўгеній Якаўлевіч абараніў кандыдацкую дысертацыю «Разработка и исследование средств автоматического регулирования положения навесных орудий колесных тракторов». Атрымаўшы навуковую ступень, усур'ёз заняўся распрацоўкай праекта па ўкараненні ў беларускую прамысловасць аўтаэлектронікі і гідраўлікі айчыннай вытворчасці.

У цяперашні час працуе загадчыкам лабараторыі электрагідраўлічных сістэм кіравання Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Беларусі.

***Працы***

**Строк, Е. Я.** Анализ схем и параметров систем управления навесными орудиями колесных тракторов : (оперативно-информационные материалы) / Академия наук БССР, Институт проблем надежности и долговечности машин ; [разработали: Е. Я. Строк, В. С. Шевченко]. – Минск, 1982.

**Строк, Е. Я.** Моделирование систем автоматического регулирования режимов работы исполнительных механизмов колесных тракторов на ЭЦВМ : оперативно-информ. материалы / Акад. наук БССР, Ин-т проблем надежности и долговечности машин ; [разраб.: Е. Я. Строк]. – Минск, 1978.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Строк Яўгеній Якаўлевіч** // Самая «першая» : інфармацыйна - бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 33. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Елизарова, Ж.** Легким нажатием джойстика / Жанна Елизарова // Кобрин- информ. – 2011. – 13 января – С. 30.

В далёком 1965 году начался путь в науку кобринчанина Е. А. Строка.

**Легким** движением джойстика // Советская Белоруссия. – 2010. – 12 марта.

Совместно с другими учеными заведующий лабораторией электро-гидравлических систем управления Объединенного института машиностроения НАН Беларуси Е. Строк занимается внедрением новых разработок в производство.

# СУЗІН АДАМ ДАМІНІКАВІЧ

**СУЗІН Адам Дамінікавіч** (1800–1879) - магістр філасофіі, этнограф, падарожнік, даследчык-натураліст.



Адам Сузін нарадзіўся 10 студзеня 1800 года ў маёнтку Кулігоўшчына Кобрынскага павета Гродзенскай губерні. Маёнтка таго даўно няма, а месца гэта цяпер ля вёскі Басяч Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Бацькі – капітан Дамінік і Аўгіння Сузіны.

Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, якая за кароткі тэрмін (1806–1851) выхавала шмат патрыётаў: Кастусь і Віктар Каліноўскія, Рамуальд Траўгут, Напалеон Орда, Каэтан, Юзаф і Люцыян Крашэўскія, Кароль Нямцэвіч і многія інш.

У 1816 годзе гімназіст Адам Сузін выступіў з рэфератам супраць антынапалеонаўскай брашуры былога касцюшкаўца Пятра Багурскага. Крытыкаваў агрэсіўную палітыку Расійскай імперыі, аднак у цэлым добразычліва адзываўся аб Аляксандры І.

Гімназію закончыў у 1819 годзе і паступіў у Віленскі ўніверсітэт. Тут пазнаёміўся і пасябраваў з Адамам Міцкевічам, геніем польскага рамантызму. Па заканчэнні ўніверсітэта ў 1823 годзе А. Сузін атрымаў вучоную ступень магістра філасофіі.

Адам Сузін быў актыўным філаматам, сакратаром тайнага Зялёнага, а інакш матэматычнага Саюза. Несумненна, яго заслуга ў тым, што невялікі паўмасонскі асветніцкі гурток філаматаў пераўтварыўся ў дастаткова сур’ёзную палітычную арганізацыю філарэтаў. Быў добры знаёмы з Тамашам Занам і Янам Чачотам. Вясной 1823 года разам з іншымі філаматамі арыштаваны па справе філаматаў. Ён быў адным з першых, хто трапіў за краты, лічыўся адным з самых небяспечных «дзяржаўных злачынцаў».

14 жніўня 1824 года А. Сузін быў прыгавораны да ссылкі ў Арэнбургскую губерню, прытым першыя паўгода павінен быў правесці ў турме Орскай крэпасці, затым знаходзіўся пад наглядам паліцыі.

У сакавіку 1829 года А. Сузін атрымаў дазвол пераехаць у Арэнбург, дзе ён пасяліўся разам з Тамашам Занам. Служыў пазаштатным чыноўнікам у Арэнбургскай памежнай камісіі, казначэем, архіварыусам, у 1832 годзе – бухгалтарам. Быў зноў арыштаваны восенню 1833 года разам з Т. Занам, Я. Віткевічам і В. Івашкевічам і абвінавачаны ў падрыхтоўцы захопу Арэнбурга з дапамогай салдат, сярод якіх было шмат рэпрэсіраваных і высланых з Польшчы. Аднак з-за адсутнасці доказаў арыштаваныя праз месяц былі вызвалены.

Адам Сузін з дыпламатычнымі даручэннямі летам 1834 года выязджаў да казахскага султана Бай-Мухамеда, сустракаўся са старэйшынамі казахскіх родаў. Яму даручылі высветліць абстаноўку, што склалася пасля ўзвядзення на беразе Каспійскага мора ўмацавання Нова-Аляксандраўск, якое выклікала абурэнне хівійскага хана. У 1871 годзе Адам Дамінікавіч апублікаваў успаміны пра гэтыя свае падарожжы ў некалькіх нумарах варшаўскага часопіса «KronikaRodzinna» («Сямейная хроніка»).

З 1837 года жыў на Валыні ў маёнтку Млынаў у свайго сябра графа Кароля Хадкевіча, дзе са студзеня 1838 года быў гувернёрам у яго пляменнікаў, але нядоўга.

Зноў быў арыштаваны 20 ліпеня 1838 года, на гэты раз па справе падпольнай арганізацыі «Саюз польскага народа» Шымона Канарскага. Спачатку яго прывезлі ў Луцк, потым – у Кіеў, затым быў перавезены ў следчую камісію ў Вільні. З-за адсутнасці доказаў высланы ў Кіеў пад нагляд паліцыі. Да лютага 1839 года знаходзіўся ў Кіеўскім астрозе, а пасля вызвалення жыў у Млынаве.

У 1841 годзе Адам Дамінікавіч вярнуўся ў Вільню, неўзабаве перасяліўся ў Варшаву. Звестак пра яго варшаўскае жыццё не захавалася.

Адам Дамінікавіч Сузін памёр 11 снежня 1879 года.

Вядомы паэт Адам Міцкевіч увекавечыў А. Сузіна пад уласным імем у трэцяй частцы паэмы «Дзяды», а таксама ў вершы «Адаму Сузіну». Польская пісьменніца Марыя Канапніцкая таксама трапятліва адносілася да сямейства Сузіных, на старонках яе твораў часта сустракаецца прозвішча Сузін, а Паўлу Сузіну прысвечана апавяданне «Як загінуў Сузін». У беларускую свядомасць гэту неардынарную асобу вярнуў гісторык Валянцін Пятровіч Грыцкевіч. Пра Адама Сузіна можна гаварыць не толькі як пра рэвалюцыянера, але як падарожніка, даследчыка-натураліста, этнографа.

### *Аб жыцці і дзейнасці*


**Грыцкевіч, А**. Сузін Адам / Анатоль Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 2001. - Т. 6, кн. 1. - С. 443.

**Грицкевич, А. П.** Сузин Адам / А. П. Грицкевич // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 391.

**Грицкевич, В. П.** В степи за Илеком / В. П. Грицкевич // От Немана к берегам Тихого океана / В. П. Грицкевич. – Минск, 1986. – С. 132-148.

**Коровин, П. С.** Сузин Адам / П. С. Коровин // Орская биографическая энциклопедия / под ред. Л. Н. Большакова. - Оренбург, 2005.

**Марціновіч, А.** Адам Сузін / Алесь Марціновіч // Гісторыя праз лёсы. Т 8 / Алесь Марціновіч. – Мінск, 2020. – Кн. 1. - С. 8-29.

**Міцкевіч, А.** Адаму Сузіну : [верш; пер. К. Цвіркі] / Адам Міцкевіч // Выбраныя творы / Адам Міцкевіч. - Мінск, 2003. - С. 65. - (Беларускі кнігазбор).

**Яновіч, М.** Адам Сузін : падарожнік па казахскім стэпе / Міхась Яновіч // Народная воля. - 2004. - 26 сакавіка. - С. 3.

**220 гадоў** з дня нараджэння А. Д. Сузіна (1800) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук. – Кобрын, 2018. – С. 151.

**Сузін Адам Дамінікавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 139-141.

**Ильин, А**. Берестейские и свислочские страницы дела № 632 / Александр Ильин // Гістарычная Брама. - 2001. - № 1 (18).

О деле филаретов 1823 г., в т. ч. про Адама Сузина.

**10 студзеня 2015 г.** – 215 гадоў з дня нараджэння Адама Дамінікавіча Сузіна [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Рэжым доступу: http://kb.brl.by/index.php/heritage/item/. – Дата доступу: 12.09.2018.

# СУПРУНОВІЧ РЫТА МІХАЙЛАЎНА

**СУПРУНОВІЧ Рыта Міхайлаўна** – беларускі вучоны-эканаміст, эксперт, нацыянальны эксперт, кансультант, перакладчык.



Нарадзілася ў 1978 годзе ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці.

У 2000 годзе закончыла Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт са спецыялізацыяй «Эканоміка і кіраванне», у 2004 годзе - аспірантуру Інстытута эканомікі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Вучылася ў Парыжскай Вышэйшай школе сацыяльных навук - навуковым цэнтры EHES - CEM (2001-2005). Паспяхова завяршыла курс па бізнес-планаванню, які фінансуецца МВФ і Брытанскім фондам «Know How», курс менеджменту Канадскай школы бізнэсу Richard Ivey School of Business (University of Western Ontario-Canada).

Працоўную дзейнасць Рыта Міхайлаўна пачала ў 2000 годзе ў Цэнтры даследавання сусветнай эканомікі Інстытута эканомікі НАН Беларусі. З 2004 па 2006 год Супруновіч - эканаміст, менеджэр-кансультант у прыватных фірмах. З 2006 года - навуковы супрацоўнік аддзела сусветнай эканомікі і знешнеэканамічных даследаванняў Інстытута эканомікі НАН Беларусі.

Р. М. Супруновіч атрымала вопыт і практыку работы кансультантам, навуковым супрацоўнікам, памочнікам Нацыянальнага каардынатара, удзельнічала ў распрацоўцы Нацыянальнай праграмы развіцця экспарту Рэспублікі Беларусь на 2006-2010 гады, Нацыянальнай праграмы развіцця турызму Рэспублікі Беларусь на 2001-2005 гады. У 2007-2009 гадах з'яўлялася кіраўніком уласнага навукова-даследчага праекта пры фінансаванні Беларускага Фонду фундаментальных даследаванняў.

Рыта Міхайлаўна Супрунюк - аўтар звыш 30 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій. Дасканала валодае англійскай, французскай мовамі.

Сфера навуковых інтарэсаў: рэгуляванне міжнароднай працоўнай міграцыі, міжнародны рынак працы, міжнародныя эканамічныя адносіны ў сферы рынку працы, працоўнай міграцыі.

***Працы***

**Супрунович, Рита Михайловна.** Трудовая миграция в мировой экономике / Р. М. Супрунович; под науч. ред. В. Ф. Медведева.- Минск : Право и экономика, 2006. - 197 с. - (Мировая экономика)

**Супрунович, Р. М.** Модернизация рынка труда в условиях глобализации мировой экономики / Р. М. Супрунович, В. В. Почекина ; под науч. ред. В. Ф. Медведева, Институт экономики НАН Беларуси. - Минск : Право и экономика, 2010. - 312 с.

**Почекина, В. В.** Рынок труда в мировой экономике / В. В. Почекина, Р. М. Супрунович. – Минск : Право и экономика, 2006 – 326 с.

**Супрунович**, **Р. М.** Установка на переселение : системная конфигурация социально-экономических факторов международной миграции / Рита Супрунович // Беларуская думка. - 2013. – № 9. - С. 77-83.

**Супрунович, Р. М.** Оценка доходов от международной трудовой миграции в Республике Беларусь / Р. М. Супрунович // Экономический бюллетень НИЭИ Министерства экономики Республики Беларусь. - 2008. - № 1. – С. 19-26.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Супрунович Рита Михайловна** : об авторе // Беларуская думка. – 2013. - № 9. – С. 77-83.

**Супрунович Маргарита Михайловна** [Электронный ресурс] // Экономика by. – Режим доступа: http://ekonomika. by/ekonomisty/ suprunovich-margarita-mikhajlovna. – Дата доступа: 22.03.2017.

# ТРАФІМУК АНДРЭЙ АЛЯКСЕЕВІЧ

**ТРАФІМУК Андрэй Аляксеевіч** (1911–1999) - расійскі вучоны-геолаг, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, акадэмік АН СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі (1994), Герой Сацыялістычнай Працы (1944).



Нарадзіўся 16 жніўня (3 жніўня) 1911 года ў сялянскай сям'і ў вёсцы Федзькавічы Рагазнянскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Жабінкаўскі раён Брэсцкай вобласці). Праз чатыры гады ў сувязі з пачаткам Першай сусветнай вайны бацькі эвакуіруюцца ў Ніжняўдзінск (цяпер Іркуцкая вобласць). У сем гадоў хлопчык застаўся без маці і разам з бацькам, які працаваў на рамонце чыгунак, вандраваў па Омску, Слаўгараду і іншых гарадах Заходняй Сібіры. Да 1927 года Андрэй вучыўся ў школе-інтэрнаце ў Слаўгарадзе, дзе закончыў 7 класаў, у 1929 годзе – сярэднюю школу ў Казані.

Атрымаўшы атэстат сталасці, паступіў на геалагічны факультэт Казанскага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Адначасова з 1930 года ў якасці начальніка навукова-даследчай партыі займаўся вывучэннем жалезных руд і баксітаў Урала.

У 1933 годзе абараніў дыплом на тэму «К познанию Алапаевских железорудных месторождений». У гэтыя ж гады ім падрыхтавана зводка матэрыялаў па нафтаноснасці пермскіх адкладаў Татарстана.

Пасля заканчэння ўніверсітэта завочна навучаўся ў аспірантуры і працаваў тэхнічным кіраўніком Татарскага геалагічнага бюро Маскоўскага геолага-разведачнага трэста Народнага камісарыята цяжкай прамысловасці СССР. З 1934 года – старшы геолаг, з 1937 года – навуковы кіраўнік Цэнтральнай навукова-даследчай лабараторыі трэста «Усходнафта». Узначальваючы вывучэнне нафтаносных вапняковых масіваў Ішымбаеўскага раёна, Андрэй Аляксеевіч прадставіў асноўныя вынікі даследаванняў у шэрагу навуковых публікацый і ў сваёй кандыдацкай дысертацыі «Нефтеносные известняки Ишимбаево», якую абараніў у 1938 годзе.

У 1940 годзе А. Трафімук назначаны галоўным геолагам трэста «Ішымбайнафта», які з'яўляўся ў той час вядучым прадпрыемствам па здабычы нафты ва Уралапаволжы. З 1942 да 1950 год Андрэй Трафімук узначальваў геалагічную службу аб'яднання «Башнафта», дабіўся правядзення комплексу работ, якія забяспечылі адкрыццё вялікай дэвонскай нафты.

У гады Вялікай Айчыннай вайны, калі краіна адчувала вострую патрэбу ў нафце, пад кіраўніцтвам Трафімука ў 1943 годзе ў Прыўраллі адкрыта ўнікальнае нафтавае радовішча – Кінзебулатаўскае, якое забяспечыла бесперабойную дастаўку гаручага арміі і тылавым прамысловым рэгіёнам СССР.

За адкрыццё новага радовішча і ўкараненне прагрэсіўных метадаў здабычы нафты 32-гадоваму Андрэю Аляксеевічу Трафімуку, першаму сярод савецкіх геолагаў, 24 студзеня 1944 года было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля «Серп і Молат».

За адкрыццё радовішчаў дэвонскай нафты Трафімуку Андрэю Аляксеевічу ў 1946 годзе была прысуджана Сталінская прэмія I ступені, у 1950 годзе яму паўторна прысуджана Сталінская прэмія I ступені за распрацоўку і ажыццяўленне законтурнага заваднення Туймазінскага нафтавага радовішча.

У 1949 годзе Трафімук абараніў доктарскую дысертацыю «Нефтеносность палеозоя Башкирии» і з 1950 года працаваў на пасадзе галоўнага геолага «Глаўнафтагазразведкі» Міністэрства нафтавай прамысловасці СССР, займаўся праблемамі пошукаў нафты і газу ў Сібіры. У 1951 годзе ўзначаліў Урадавую камісію па ацэнцы перспектыў нафтагазаноснасці паўночных раёнаў Краснаярскага краю і Якуціі. Адначасова ён працягваў навуковыя даследаванні і ў 1953 годзе выбраны членам-карэспандэнтам Акадэміі навук СССР, з 1958 года – сапраўдны член Акадэміі навук СССР.

З 1953 года Андрэй Трафімук – намеснік дырэктара, з 1955 па 1957 год – дырэктар Усесаюзнага нафтагазавага Навукова-даследчага інстытута ў Маскве. У 1953-1954 гадах узначальваў буйную навуковую экспедыцыю ў Кітай па просьбе ўрада КНР, дзе правёў вялікі комплекс навуковых прац і выявіў прамысловы нафтавы раён.

Калі ў 1957 годзе было прынята рашэнне аб стварэнні Сібірскага аддзялення (СА) Акадэміі навук СССР, Андрэй Аляксеевіч, які ўжо стаў вучоным з сусветным імем, пераехаў жыць і працаваць у Новасібірск і стаў арганізатарам і дырэктарам Інстытута геалогіі і геафізікі Сібірскага аддзялення Акадэміі навук СССР, узначальваў інстытут да 1988 года (з 1988 – ганаровы дырэктар). За гады працы ў Новасібірску акадэмік Трафімук абгрунтаваў методыку пошукаў радовішчаў нафты і газу ў адносінах да ўмоў Сібіры і Далёкага Усходу, адкрыў тры найбуйнейшыя нафтагазаносныя правінцыі, дзясяткі радовішчаў нафты і газу. У 1960 годзе ўпершыню ў свеце навукова абгрунтаваў наяўнасць нафты ў пародах дакембрыйскага перыяду, пры яго ўдзеле ў 1980-х гадах гэта адкрыццё пацверджана практыкай – нафта ў такіх пародах знойдзена ва Усходняй Сібіры і Рэспубліцы Саха (Якуція), за што ў 1994 годзе яму прысуджана Дзяржаўная прэмія Расійскай Федэрацыі, грошы ад якой ён перадаў для дапамогі дзецям Беларусі, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы.

З 1958 па 1961 год Трафімук з'яўляўся намеснікам, а ў 1961-1988 гадах – першым намеснікам старшыні Сібірскага аддзялення Акадэміі навук СССР і членам Прэзідыума АН СССР (1988-1999 – саветнік Прэзідыума АН СССР); у 1962-1973 гадах – прафесар і загадчык кафедры карысных выкапняў геолага-геафізічнага факультэта Новасібірскага дзяржаўнага ўніверсітэта; у 1973-1988 гадах – старшыня Навуковага савета СА АН СССР па праблемах Байкала.

Андрэй Трафімук – суаўтар двух значных навуковых адкрыццяў: аб уласцівасці прыродных газаў знаходзіцца ў цвёрдым стане ў зямной кары (1969), што адкрыла чалавецтву новыя вялікія рэсурсы энергетычнай сыравіны, і аб пераўтварэнні арганічнага рэчыва асадкавых парод пад дзеяннем тэктанічных працэсаў зямной кары (1986). Ён распрацаваў аб'ёмна-генетычны метад ацэнкі прагнозных рэсурсаў нафты і газу. Адным з першых прымяніў матэматычныя метады даследаванняў у геалогіі. Асабіста і ў суаўтарстве напісаў больш за 500 навуковых прац, у тым ліку дзясяткі буйных манаграфій.

Разам з навуковай дзейнасцю Андрэй Аляксеевіч вёў вялікую дзяржаўную і грамадскую працу: быў дэпутатам Вярхоўнага Савета РСФСР (1963-1990), дэлегатам XXIV і XXVI з'ездаў КПСС, членам Новасібірскага абкама КПСС (1963-1986), дэпутатам Новасібірскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных (1967-1972), галоўным рэдактарам часопіса «Геология и геофизика» (1960-1988), членам рэдкалегіі часопісаў «Геология нефти и газа», «Геология СССР», членам рэдкалегіі «Горной энциклопедии».

Шматгранная і плённая дзейнасць вучонага высока ацэнена: ён узнагароджаны шасцю ордэнамі Леніна (1944, 1948, 1967, 1975, 1981, 1986), двума ордэнамі Працоўнага

Чырвонага Сцяга (1959, 1961), ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971), ордэнам «За заслугі перад Айчынай» IV ступені (1998, адмовіўся прыняць ордэн ад Прэзідэнта Расіі Б. М. Ельцына ў знак пратэсту супраць палітыкі, якую ён праводзіў), шматлікімі медалямі. Ён заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР (1957), Ганаровы нафтавік Міннафтапрама СССР (1971), лаўрэат прэміі АН СССР І. М. Губкіна (1974), Заслужаны дзеяч навукі Якуцкай, Башкірскай, Бурацкай АССР (1981), Ганаровы работнік газавай прамысловасці СССР і Ганаровы разведчык нетраў (1981), Ганаровы грамадзянін Новасібірска (1983), Ганаровы акадэмік АН Башкартастана (1991) і Акадэміі прыродазнаўчых навук Расійскай Федэрацыі (1997), Ганаровы член Расійскай экалагічнай акадэміі.

Пайшоў з жыцця Андрэй Аляксеевіч Трафімук 24 сакавіка 1999 года, пахаваны ў Новасібірску.

У 2000 годзе вучоны ўдастоены ганаровага звання «Грамадзянін XX стагоддзя Новасібірскай вобласці». У гэтым жа годзе Аб'яднанаму інстытуту геалогіі, геафізікі і мінералогіі СА РАН прысвоена імя Героя Сацыялістычнай Працы Андрэя Аляксеевіча Трафімука, і на будынку інстытута ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Яго імем названы адна з вуліц Новасібірскага Акадэмгарадка, вучэбная аўдыторыя ў Новасібірскім дзяржаўным універсітэце і кафедра ў Казанскім федэральным універсітэце, заснаваны прэмія імя акадэміка А. А. Трафімука для маладых навукоўцаў СА РАН, стыпендыя імя акадэміка А. А. Трафімука для студэнтаў НДУ і Сібірскай дзяржаўнай геадэзічнай акадэміі.

16 жніўня 2010 года ў музеі Інстытута нафтагазавай геалогіі і геафізікі СА РАН адбылася ўстаноўка бюста заснавальніка інстытута акадэміка Андрэя Аляксеевіча Трафімука. Да 100-гадовага юбілею вучонага з сусветным імем Андрэя Трафімука кінастудыяй «Азія-фільм» падрыхтаваны дакументальны фільм «Жизнь в борении». У Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі адкрыта экспазіцыя аб знакамітым земляку.

### *Працы*

**Трофимук А. А.** Сорок лет борения за развитие нефтегазодобывающей промышленности Сибири / А. А. Трофимук. - Новосибирск : СО РАН, НИЦ ОИГГМ, 1997. - 369 с.

**Трофимук, А. А.** Принципы районирования нефтегазоносных бассейнов в аспекте цикличности седиментогенеза / А. А. Трофимук, Ю. Н. Карогодин // Геология и геофизика. – 1974. – № 3. – С. 12-19.

**Трофимук, А. А.** Перспективы нефтеносности верхнедевонских и более древних отложений западной Башкирии / А. А. Трофимук // Советская геология. – 1948. – № 28. – С. 64-68.

**Трофимук, А. А.** К методике разведки структур туймазинского типа в Западной Башкирии / А. А. Трофимук // Нефтяное хозяйство. – 1948. – № 8. – С. 30-41.

**Трофимук, А. А.** 15 лет нефтяной промышленности Башкирии / А. А. Трофимук // Башкирская нефть. – 1947. – № 2. – С. 7-17.

**Трофимук, А. А.** Задачи поисков разведки и разработки нефтяных месторождений Башкирии / А. А. Трофимук // Башкирская нефть. – 1946. – № 1/2. – С. 6-12.

**Трофимук, А. А.** Где и как искать нефть в Башкирии? / А. А. Трофимук // Восточная нефть. – 1940. – № 5/6. – С. 11-16.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Бензярук, Р.** Зазірнуць у глыбіні зямлі : Трафімук Андрэй Аляксеевіч / Расціслаў Бензярук, Анатоль Бензярук // Сорак дарог / Расціслаў Бензярук, Анатоль Бензярук. – Брэст, 2007. – С.43-45.

**Грецкая, Т. А**. Трофимук Андрей Алексеевич / Т. А. Грецкая // Большая советская энциклопедия : в 30 т. - Масква, 1977. – Т. 26. - С. 250.

**Гумённая, Н. И.** Андрей Алексеевич Трофимук / Н. И. Гумённая // Золотые имена Новосибирска : почетные граждане и жители города : [сборник очерков] / Новосибирская гос. обл. науч. б-ка. – Новосибирск : НГОНБ, 2008. – С. 64-71 : портр.

**Куперштох, Н. А.** Академик А. А. Трофимук – организатор и первый директор Института геологии и геофизики / Н. А. Куперштох // Очерки о лидерах академической науки Сибири / Н. А. Куперштох. – Новосибирск : Гео, 2011. – С. 140-150 : ил.

**Ломов, В.** Три провинции Трофимука / Виорель Ломов // 100 великих научных достижений России / [Виорель Ломов]. – Москва : Вече, 2011. – 432 с.

**Трофимук Андрей Алексеевич** : учёный в области геологии и разведки нефтяных и газовых месторождений // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биографический справочник. – Минск, 2014. – С. 221 : ил.

**105 гадоў** з дня нараджэння А. А. Трафімука (1911) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 17.

**Трафімук Андрэй Аляксеевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 142-144.

**Осмоловский, А.** Белорус Андрей Трофимук, открывший крупнейшие нефтегазовые месторождения России, говорил: «Сибирь буквально на нефти плавает» / Андрей Осмоловский // Комсомольская правда. – 2020. – 18 февраля (№ 32). – С.10, 11.

**Беларускі** каляндар. 2021 год. **Трафімук** Андрэй Аляксеевіч // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. - 2020. - № 9. - С. 9 (дадатак).

**Оптимист** в поисках нефти // Наука из первых рук. – 2011. - № 4 (40).

**Нефть:** герои не нашего времени. Академик Трофимук: Сибирь плавает на нефти // Наука из первых рук. – 2007. - № 3 (15). – С. 16-25.

**Трофимук Андрей Алексеевич** [Электронный ресурс] // ИНГГ СО РАН. – Режим доступа: http://www.ipgg.sbras.ru/ru/person/ipgg-trofimukaa# Default. - Дата доступа: 10.10.2017.

# ТРУНІН ЯЎГЕНІЙ ГЕНАДЗЬЕВІЧ

**ТРУНІН Яўгеній Генадзьевіч** – кандыдат эканамічных навук. Генеральны дырэктар федэральнай аўтаномнай установы (ФАУ) «Расійскі Рачны Рэгістр».



Нарадзіўся ў 1960 годзе ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці.

Закончыў Армавірскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў войскаў СПА краіны, Марскую дзяржаўную акадэмію імя адмірала Ф. Ф. Ушакова, Расійскую акадэмію дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі.

З 1977 па 1991 год Я. Трунін служыў ва Узброеных сілах СССР (у цяперашні час палкоўнік запасу).

У 1992-1996 гадах Я. Г. Трунін - дырэктар навукова-вытворчага аб'яднання «Кондар» у г. Краснадары. З 1996 па 2006 год - намеснік начальніка па эканоміцы і фінансах Марской адміністрацыі порта Наварасійск, намеснік начальніка Марской адміністрацыі порта Туапсэ, начальнік Марской адміністрацыі порта Наварасійск, намеснік генеральнага дырэктара Федэральнага дзяржаўнага ўнітарнага прадпрыемства «Росморпорт» - дырэктар Азова-Чарнаморскага філіяла.

З 2006 па 2008 год - намеснік кіраўніка Федэральнага агенцтва марскога і рачнога транспарту Мінтранса Расіі.

З 2008 года Я. Г. Трунін - генеральны дырэктар ФАУ «Расійскі Рачны Рэгістр».

Я. Г. Трунін мае шэраг дзяржаўных узнагарод. Узнагароджаны нагрудным знакам «Ганаровы работнік воднага транспарту Рэспублікі Саха (Якуція)» за 2010 год.

***Працы***

**Трунин, Е. Г.** Совершенствование государственного регулирования развития морских портов России : автореферат дис. ... кандидата экономических наук : 08.00.05 / НИИ морского транспорта. - Москва, 2002. - 33 с.

**Трунин, Е. Г.** Прогнозирование загрязнения окружающей среды при управлении природопользованием в речных портах / Е. Г. Трунин // Вестник Государственного университета морского и речного флота имени адмирала С. О. Макарова. - 2014. - № 5 (27). - С. 122-126.

**Трунин, Е. Г.** Концепция построения локальных систем управления природопользованием в речных портах/ Е. Г. Трунин // Транспортное дело России. - 2013. - № 2. - С. 99-100.

**Трунин, Е. Г.** Эколого-экономический подход к определению целевых показателей управления природопользованиемв речных портах / Е. Г. Трунин // Вестник Государственного университета морского и речного флота имени адмирала С. О. Макарова. - 2013. - № 1 (20). - С. 104-107.

**Трунин, Е. Г**. Экологизация хозяйственной деятельности речных портов / Е. Г. Трунин // Транспортное дело России. - 2012. - № 5.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Трунин Евгений Геннадьевич** [Электронный ресурс] // Официальный сайт Администрации Санкт-Петербурга. – Режим доступа: https://www.gov.spb.ru/gov/morsovet/sostav/. – Дата доступа: 08.11.2018.

**Трунин Евгений Геннадьевич** [Электронный ресурс] // Генеральный Директор. – Режим доступа: https://rating.gd.ru/profile/trunin-evgeniy-gennadjhevich/. – Дата доступа: 08.11.2018.

**Трунин Евгений Геннадьевич** [Электронный ресурс] // Центр военно-политических исследований. – Режим доступа: http://eurasian-defence.ru/?q=node/28416. – Дата доступа: 31.10. 2018.

# ФІЛІМОНЕНКАВА РАІСА МІКАЛАЕЎНА

**ФІЛІМОНЕНКАВА (Кукіна) Раіса Мікалаеўна** – вучоны, кандыдат тэхнічных навук (1982) , дацэнт (1991).



Нарадзілася Раіса Кукіна 25 лютага 1948 года ў горадзе Дуброўна Віцебскай вобласці.

Пражывала ў Кобрыне з 1960 па 1968 год. Закончыла сярэднюю школу № 2 г. Кобрына і паступіла ў Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці.

У 1973 годзе Р. Філімоненкава выдатна закончыла інстытут лёгкай прамысловасці па спецыяльнасці «Тэхналогія швейных вырабаў». Падчас навучання атрымлівала стыпендыю імя У. І. Леніна, у 1971 годзе была дэлегіравана на І Усесаюзны злёт студэнтаў СССР (Масква).

З 1973 года Раіса Мікалаеўна пачала працу асістэнтам на кафедры «Тэхналогія швейных вырабаў» Віцебскага тэхнала-гічнага інстытута лёгкай прамысловасці.

З 1977 па 1980 год вучылася ў аспірантуры Маскоўскага тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці. У 1982 годзе Раіса Мікалаеўна абараніла кандыдацкую дысертацыю.

З 1983 па 2005 год працавала намеснікам дэкана завочнага факультэта УА «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт». У 1987 годзе выбрана дацэнтам кафедры «Тэхналогія швейных вырабаў» Віцебскага тэхналагічага інстытута лёгкай прамысловасці.

Удзельнічала ў распрацоўцы адукацыйнага стандарту ОСРБ 1-500102-2008 для першай ступені вышэйшай адукацыі.

Р. М. Філімоненкава мае больш за 120 навуковых і звыш 50 метадычных публікацый, у тым ліку адзін падручнік і тры вучэбныя дапаможнікі з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, некалькі выдадзеных канспектаў лекцый.

Раіса Мікалаеўна падрыхтавала тры магістры тэхнічных навук. Чытае курсы лекцый па дысцыплінах «Тэхналогія швейных вырабаў», «Тэхналогія швейнай вытворчасці».

### *Працы*

**Филимоненкова, Р. Н.** Исследование процесса формообразования деталей одежды с целью его совершенствования : диссертация… кандидата технических наук : 05.19.04 : защищена 06.01.1982 : утверждена 21.07.1982 / Р. Н. Филимоненкова. – Москва, 1981.

**Филимоненкова, Р. Н.** Автоматизация процесса разработки и анализа технологических схем швейных потоков / Р. Н. Филимоненкова, Д. К. Панкевич, А. П. Прохоров // Новое в технике и технологии текстильной и легкой промышленности : материалы международной научной конференции, Витебск, ноябрь 2009 г. : в 2 ч. / УО «ВГТУ». – Витебск, 2009. – Ч. 1. – С. 276–278.

**Филимоненкова, Р. Н.** Исследование ниточного способа соединения деталей с криволинейными срезами при изготовлении изделий из отходов / Р. Н. Филимоненкова, Н. П. Гарская, М. А. Шайдоров // Тезисы докладов 37 научно-технической конференции преподавателей и студентов университета / УО «ВГТУ». – Витебск, 2004. – С. 74.

**Филимоненкова, Р. Н.** Подготовительно-раскройное производство швейных предприятий: курс лекций / Р. Н. Филимоненкова, Н. Н. Бодяло ; УО «ВГТУ». – Витебск, 2016. – 103 с.

**Филимоненкова, Р. Н.** Повышение эффективности использования отходов на ОАО «Полесье», г. Пинск / Р. Н. Филимоненкова, Н. П. Гарская, Н. Н. Бодяло // Переработка отходов текстильной и легкой промышленности: теория и практика : материалы докладов Международной научно-практической конференции, Витебск, 30 ноября 2016 г. / УО «ВГТУ». – Витебск, 2016. – С. 113–115.

**Филимоненкова, Р. Н.** Пути повышения эффективности обработки швейных изделий / Р. Н. Филимоненкова, Н. Н. Бодяло, Н. П. Гарская // Тезисы докладов 44 научно-технической конференции преподавателей и студентов университета / УО «ВГТУ». – Витебск, 2011. – С. 113–114.

‘

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Кукіна Раіса Мікалаеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 436. – (Імі ганарацца землякі).

**Филимоненкова Раиса Николаевна** // Кафедре конструирования и технологии одежды 45 лет / Витебский государственный технологический университет. — Витебск, 2013. — С. 26.

**Філімоненкава** (Кукіна) Раіса Мікалаеўна // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 144-146.

**70 гадоў з дня нараджэння Р. М. Філімоненкавай (1948)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 74-75.

**Филимоненкова, Раиса Николаевна** [Электронный ресурс] // База данных Ученые Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/scient. Дата доступа: 08.11.2017.

**Филимоненкова, Раиса Николаевна** [Электронный ресурс] // Библиотека Витебского государственного технологического университета. – Режим доступа: http://library.vstu.by/2017/05/25. – Дата доступа: 08.11.2017.

**Филимоненкова Раиса Николаевна** [Электронный ресурс] // УО «Витебский государственный технологический университет». – Режим доступа: http://kito.vstu.by/staff/filimonenkova-raisa-nikolaevna/. – Дата доступа: 03.11.2017.

# ХВОРЫК НАТАЛЛЯ ВАЛЕР'ЕЎНА

**ХВОРЫК Наталля Валер'еўна** – кандыдат медыцынскіх навук, беларускі спецыяліст у галіне акушэрства і гінекалогіі, дацэнт.



Нарадзілася ў 1978 годзе ў горадзе Кобрыне. Выпускніца сярэдняй школы № 7.

У 2001 годзе закончыла Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Пасля заканчэння ўніверсітэта Наталля паехала ўслед за мужам, урачом-дэрмата-венеролагам, у Мінск. З 2002 па 2005 год працавала ўрачом акушэрам-гінеколагам ЛПУ «20-я гарадская паліклініка» г. Мінска.

Потым сям'я вярнулася зноў у Гродна, на радзіму мужа. З 2005 па 2014 год Наталля Валер'еўна - урач акушэр-гінеколаг установы аховы здароўя «Гродзенскі абласны клінічны перынатальны цэнтр».

З 2007 года - асістэнт кафедры акушэрства і гінекалогіі.

У 2013 годзе Н. В. Хворык абараніла кандыдацкую дысертацыю «Неинфекционная патология печени у беременных: клинико-лабораторные критерии, влияние на течение беременности и исходы родов», ёй прысвоена вучоная ступень кандыдата медыцынскіх навук.

З 2017 года Наталля Валер'еўна займае пасаду дацэнта кафедры акушэрства і гінекалогіі. З'яўляецца куратарам дадатковай клінічнай базы кафедры акушэрства і гінекалогіі УАЗ «Гарадская клінічная бальніца хуткай медыцынскай дапамогі г. Гродна».

Урач вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

Аўтар больш за 50 навуковых прац, 8 вучэбна-метадычных дапаможнікаў у суаўтарстве, аднаго патэнта на карысную мадэль, адной інструкцыі па ўжыванні, 15 рацпрапаноў, 10 укараненняў. З'яўляецца кіраўніком шэрагу студэнцкіх работ.

Член Беларускай Асацыяцыі акушэраў-гінеколагаў. Член Беларускага медыцынскага грамадскага аб'яднання «Рэпрадуктыўнае здароўе».

Узнагароджана Ганаровымі граматамі ГрДМУ і Адміністрацыі Ленінскага раёна г. Гродна (2014).

### *Працы*

**Хворик, Н. В.** Неинфекционная патология печени у беременных: клинико-лабораторные критерии, влияние на течение беременности и исходы родов : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата медицинских наук : специальность 14.01.01 Акушерство и гинекология / Хворик Наталья Валерьевна ; Учреждение образования «Белорусский государственный медицинский университет». - Минск, 2013. - 22 с.

**Хворик, Н. В**. Лекции по гинекологии : пособие / Н. В. Хворик [и др.]. — Гродно, 2008.

**Акушерство** и гинекология : пособие для обучающихся на 2-й ступени высшего образования (магистратура) / [Л. В. Гутикова, Н. В. Хворик и др.] ; Министерство здравоохранения Республики Беларусь, Гродненский государственный медицинский университет, Кафедра акушерства и гинекологии. - Гродно : ГрГМУ, 2017. - 363 с. : табл.

**Гинекология** : пособие для студентов учреждений высшего образования / Министерство здравоохранения Республики Беларусь, Учреждение образования «Гродненский государственный медицинский университет» , Кафедра акушерства и гинекологии ; [Л. В. Гутикова, Н. В. Хворик и др.] - Гродно : ГрГМУ, 2016. - 230 с. : ил., табл.

**Фетоплацентарная** недостаточность : учебно-методическое пособие для студентов лечебного, педиатрического, медико-психологического, медико-диагностического факультетов и факультета иностранных учащихся, обучающихся на русском языке / Министерство здравоохранения Республики Беларусь, Учреждение образования «Гродненский государственный медицинский университет», Кафедра акушерства и гинекологии ; [Л. В. Гутикова, Н. В. Хворик и др.]. - Гродно : ГрГМУ, 2015. - 74 с. : ил., табл.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Бакун, Е.** Женщина… Звучит гордо / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2020. – 17 кастрычніка (№ 81). – С. 9 : фот.

Уроженка г. Кобрина Н. В. Хворик — практикующий врач высшей квалификационной категории, доктор медицинских наук.

**Хворик Наталья Валерьевна** [Электронный ресурс] // Гродненский государственный медицинский университет. – Режим доступа: http://www.grsmu.by/ru/university/ structure/ chairs/cafedry_7/sostav/97/. – Дата доступа: 28.10.2020.

**Хворик, Наталья Валерьевна** [Электронный ресурс] // Сводный Электронный Каталог библиотек Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/opac/pls/dict.prn_ref?tu - Дата доступа: 28.10.2020.

# ЧАРОТА ІВАН АЛЯКСЕЕВІЧ

**ЧАРОТА Іван Аляксеевіч** – вядомы беларускі літаратуразнавец, крытык, перакладчык. Доктар філалагічных навук (1998), прафесар (1999), акадэмік Сербскай Акадэміі навук і мастацтваў, акадэмік Міжнароднай Славянскай Акадэміі навук, адукацыі, мастацтва і культуры, загадчык кафедры славянскіх літаратур Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ). Член Саюза пісьменнікаў СССР, Беларусі (1985), Сербіі.



Лёс вядучага славіста краіны, напэўна, быў вызначана першапачаткова. Нарадзіўся ён 16 верасня 1952 года ў вёсцы Лышчыкі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці, якая размяшчаецца на мяжы Беларусі, Украіны і Польшчы. Будучы вучоны з маленства асвойваў беларускую, рускую, украінскую і польскую мовы. Вучыўся ў Лышчыкаўскай пачатковай і васьмігадовай школах. Сярэднюю адукацыю атрымаў у СШ № 2 г. Кобрына.

З 1969 па 1974 год вучыўся на аддзяленні рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Асабліва схільнасць і здольнасці да моў раскрыліся ў Івана Чароты менавіта ў часы вучобы ў БДУ, калі ён поруч з іспанскай мовай вывучаў сербскую. У тыя часы ў галоўнай вышэйшай навучальнай установе рэспублікі была магутная філалагічная школа, ля вытокаў якой стаялі прафесар А. Супрун і славуты балгарыст У. Карпаў.

Пасля заканчэння ўніверсітэта І. Чарота тры гады працаваў настаўнікам у Паляцкішскай сярэдняй школе Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці.

З 1977 года - у Беларускім дзяржаўным універсітэце: выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт. Апошнім часам загадвае кафедрай славянскіх літаратур.

Першую навуковую ступень І. Чарота здабыў у Ленінградзе, абараніўшы дысертацыю па рэцэпцыі творчасці М. Шолахава ў літаратурах Югаславіі (1987). Сур'ёзнае навуковае даследаванне, абароненае ў культурнай сталіцы Расіі, сведчыла пра тое, што ў навуку прыйшоў сапраўдны вучоны з уласным бачаннем сутнасці і спецыфікі літаратуры ў эпоху глабалізацыі. З 1991 па 1994 год вучыўся ў дактарантуры. Праца «Беларуская літаратура XX стагоддзя і працэсы нацыянальнага самавызначэння» (1998) стала яго доктарскай дысертацыяй.

Іван Чарота - самы кампетэнтны славіст у Беларусі ў сферы літаратуразнаўства. На працягу звыш чвэрці стагоддзя ён з'яўляецца галоўным навуковым кансультантам выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» па ўсіх пытаннях, звязаных з паўднёваславянскімі народамі і іх культурамі, ім упершыню складзена поўная бібліяграфія беларуска-югаслаўскіх літаратурных сувязяў, надрукаваная ў бялградскім часопісе «Мостови» і ў дапаможніку для беларускіх студэнтаў «Югаславянскія літаратуры і культуры». Ён галоўны рэдактар шматлікіх альманахаў «Славянскія постаці», член рэдкалегій 9 перыядычных выданняў (3 замежных).

Кола навуковых інтарэсаў І. А. Чароты ўключае пытанні літаратуры і культуры славянскіх народаў. Вядучы славіст нашай краіны, ён больш за дзесяць гадоў узначальвае бюро секцыі мастацкага перакладу і літаратурных сувязяў Саюза беларускіх пісьменнікаў. Займаецца літаратуразнаўствам, крытыкай, перакладам з сербскай, славенскай, македонскай, польскай і іншых моў на беларускую і рускую, а таксама з беларускай на сербскую.

Іван Аляксеевіч актыўна выступае ў друку як літаратуразнавец, крытык, эсэіст, публіцыст. Ён аўтар звыш 500 навуковых, навукова-метадычных і літаратурных прац, сярод якіх «Беларуская савецкая літаратура за мяжой» (1988), «Савецкая літаратура ў сувязях і ўзаемадзеяннях. Пачаткі параўнальнага і сістэмнага аналізу» (1989) і інш. Аўтар «Анталогіі беларускай паэзіі», выдадзенай у 1993 годзе ў Югаславіі, укладальнік зборнікаў «Сербская паэзія» (1987) і «Сербская Праваслаўная Царква» (1998), выдадзеных у Мінску. На пераломе стагоддзяў І. А. Чарота здзейсніў унікальны праект, калі ў 2000 годзе выдаў на чатырох мовах «Антологию лирики восточных славян». Сапраўднай энцыклапедыяй жыцця паўднёваславянскіх братоў стала грунтоўнае даследаванне «Народ сербскі: яго абрады і звычаі, святы і святыні» (2006), дзе вучоны глыбока і разам з тым з любоўю паказаў, чым вылучаецца гэты люд сярод братоў-славян.

Менавіта І. Чарота стаў ініцыятарам і арганізатарам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці «Сербская мова і літаратура», для паспяховай падрыхтоўкі якіх склаў адукацыйныя стандарты па гэтай спецыяльнасці, «Праграму асноўных і спецыяльных курсаў па гісторыі славянскіх літаратур» (2000), шэраг дапаможнікаў.

Шмат гадоў вучоны займаецца перакладамі. Яшчэ з пачатку 1980-х гадоў выдавецтвы актыўна прыцягвалі яго да працы над перакладамі мастацкай літаратуры. У перакладзе Івана Аляксеевіча выйшлі кнігі Б. Зупанчыча. Б. Нушыча, Ё. Юрчыча, П. Воранца, Д. Янчара і інш. Дзякуючы нашаму земляку па-беларуску загаварылі І. Андрыч, Б. Нушыч, Д. Чосіч, Д. Максімавіч. Сапраўдным святам для дзяцей стаў выхад зборніка сербскіх народных казак «Мовы ўсяго жывога» (2007) і кнігі «Югаславянскія казкі» (1999).

Іван Чарота - складальнік і рэдактар зборніка «Православие в славянских культурных традициях» (Мінск, 1996), рэдактар і перакладчык рускамоўнай версіі міжканфесійнага часопіса «Самарянин» (Беласток, 1996 - 2000), рэдактар кніг «Уния. Сборник документов» (1977), «Полоцкая епархия» (1997), «Плакид Янковский. Записки сельского священника» (2004), «Архіепіскап Афанасій (Мартас)», «Матэрыялы да Гісторыі Праваслаўнай Беларускай Царквы» (2004). Яго надзвычай хвалюе тое, на якой мове трэба звяртацца славянам да Бога, менавіта таму з-пад яго пяра выйшла кніга «Беларуская мова і царква»

(2000). Ён - заснавальнік, укладальнік і перакладчык серыі «Сербскае багаслоўе XX стагоддзя», у якой ужо выйшла два дзясяткі кніг. Іван Аляксеевіч выдаў дзве адметныя кнігі, дзе сабраны паэтычныя і празаічныя ўвасабленні Слова Божага ў беларускай нацыянальнай традыцыі: «Насустрач Духу. Анталогія беларускай хрысціянскай паэзіі» (2001), «Насустрач Духу. Анталогія беларускай хрысціянскай прозы» (2002), без якіх цяпер цяжка ўявіць развіццё рэлігійнай думкі ў нашым краі. Шмат часу І. Чарота аддае працы на пасадах сакратара Біблейскай камісіі Беларускага Экзархата РПЦ, якая ажыццяўляе пераклад Святога Пісання і богаслужбовых тэкстаў на беларускую мову, і выканаўчага рэдактара часопіса «Праваслаўе».

Прафесар Чарота вядзе вялікую асветніцкую работу. Наш зямляк шмат працуе на ніве духоўнага асветніцтва, многае робіць для збліжэння славянскіх культур і народаў, за што неаднаразова адзначаны. За падзвіжніцкую дзейнасць Іван Аляксеевіч Чарота ўзнагароджаны ордэнам Прападобнага Сергія Раданежскага III ступені, ён лаўрэат міжнароднай прэміі імя К. Астрожскага (Польшча), заснаванай Фондам князя Канстанціна Астрожскага і польскім часопісам «Przeglad pravoslawny», лаўрэат прэміі Рэспублікі Беларусь «За духоўнае Адраджэнне».



Іван Аляксеевіч Чарота - лаўрэат прэміі Саюза пісьменнікаў Сербіі за 2000 год, прэміі часопіса «Збиља /Reality» (СРЮ, Бялград) за 2000 год і 2006 год, Міжнароднай прэміі імя Дастаеўскага (Сербія) за 2007 год, Усеправаслаўнай літаратурнай прэміі «Багародзіца Траеручыца» (сербскі Фонд імя Іванкі Мілошэвіч (Чыкага, ЗША) за 2011 год. Ён кавалер ордэнаў прападобнага Сергія Раданежскага III ступені (2002), святога Савы Сербскага III ступені (Сербія, 2004), Святога Кірылы Тураўскага II ступені (2012). Узнагароджаны памятным медалём Саюза славацкіх пісьменнікаў (2003), Залатым знакам Культурна-асветніцкага таварыства Сербіі (2008), знакам «За вялікі ўнёсак у літаратуру» (Беларусь, 2012), сярэбраным медалём «За заслугі» (Сербія, 2013).

Выхадзец з вёскі Лышчыкі Тэвельскага сельсавета, вядомы вучоны і грамадскі дзеяч Іван Чарота памятае і пра сваіх землякоў, прымае ўдзел у духоўным жыцці Кобрыншчыны, падараваў бібліятэкам Кобрынскага раёна шмат кніг.

### *Працы*

**Чарота, І.** Беларуская мова і царква / І. Чарота. - Мінск, 2000. - 176 с.

**Чарота, І. А.** Беларуская літаратура XX стагоддзя і працэсы нацыянальнага самавызначэння : аўтарэф. дыс. на атрым. навук. ступ. д-ра філал. навук / БДУ ; І. А. Чарота. - Мінск, 1998. – 50 с.

**Чарота, І. А**. Гісторыя сербскай літаратуры : практыкум для студэнтаў спец. «Славян. філалогія» / І. А. Чарота. - Мінск : БДУ, 2006. - 84, [2] с.

**Чарота, І. А.** Пошук спрадвечнай існасці : беларуская літаратура XX стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння / І. А. Чарота, БДУ ; рэд. А. А. Лойка. - Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 157 с.




**Чарота, І. А.** Тэорыя і практыка мастацкага перакладу : дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў / І. А. Чарота. - Мінск : БДУ, 2011. - 122, [2] с.

**Насустрач** Духу. Анталогія беларускай хрысціянскай паэзіі / уклад. і прадмова І. А. Чароты. - Мінск : Ураджай, 2001. - 238 с.

**Слово** и Дух. Антология русской духовной поэзии (X-XX вв.) / составление, подготовка текстов, вступительная статья и комментарии И. Чароты. - Минск : Свято-Елисаветинский монастырь, 2003. - 527 с.

**Чарота, И. А.** Не прятаться от истины / Иван Чарота // Беларуская думка. - 2019. — № 7. — С. 50-56 ; № 8. – С. 37 – 43.

Статья профессора И. А. Чароты (уроженца д. Лыщики Кобринского района) о состоянии исследований жизни и деятельности Ф. Скорины.

**Чарота, И. А.** Колыбель сербской духовности ... / Иван Александрович Чарота // Неман. - 2018. — № 1. — С. 141-152.

**Чарота, І.** Легендарная асоба славянскага свету XIII стагоддзя: Міхаіл (Мануіл) Казачынскі / І. Чарота // Полымя. – 2017. - № 9. – С. 42-51.

**Чарота, И**. О «закате» славянства … Без рассвета? / Иван Чарота // Беларуская думка. – 2007. – № 6. – С. 186-191.

**Чарота, І.** Брацiслава – гэта дзе братэрства славяць / Іван Чарота // Літаратура і мастацтва . – 2005. – 28 студзеня. – С. 5.

**Чарота, И.** Славянская литературная общность — прошлое без будущего? / Иван Чарота // Неман. - 2004. – № 11. – С. 115-123.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Бовтрель, И. Г**.Чарота Иван Алексеевич / И. Г. Бовтрель // Республика Беларусь: энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 7. - С. 494.

**Ляшук, В. Я.** [Іван Чарота] / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко // Літаратурная Берасцейшчына / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. - Мінск, 2008. - С. 15, 271, 302.

**Трус, М. В.** Чарота Іван Аляксеевіч / М. В. Трус // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2003. – Т. 17. – С. 245 : фота.

**Чарота** Иван.Алексеевич // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 453.

**Чарота** Іван Аляксеевіч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 444. – (Імі ганарацца землякі).

**Чарота Іван** // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. І. Мальдзіса. - Мінск, 1995. - Т. 6. - С. 275-277.

**Іван Чарота** // Літаратурная карта Берасцейшчыны. - Брэст, 2008. - С. 316-317.

**Ляшук, В. Я.** [Іван Чарота] / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко // Літаратура Берасцейшчыны / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. - Брэст, 1999. - С. 368.

**Чарота І. А.** // Філалагічны факультэт (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт) : даведкавае выданне. - Мінск, 1999. - С. 27.

**Чарота, И.** Дорожки памяти – дорожки радости / Иван Чарота // За мостом моего детства. - Минск, 2011. - С. 24-28.

Автор – о себе и своих корнях, своей деревне Лыщики Кобринского района.

**Чарота Іван Аляксеевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 146-152.

**65 гадоў** з дня нараджэння І. А. Чароты (1952) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 48.

**Шычко, С**. Новая беларуская кніга – у Сербіі / Сяргей Шычко // Звязда. – 2020. - 13 мая (№ 91). – С. 5.

Прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук І. А. Чарота выступіў укладальнікам зборніка беларускіх народных казак.

**Кавачэвіч, В.** Цеплыня сустрэч / Велька Кавачэвіч // Полымя. - 2017. - № 9. – С. 3.

Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь В. Кавачэвіч упамінае пра значны ўклад прафесара І. Чароты ў сяброўскія адносіны паміж Сербіяй і Беларуссю.

**Курачук, С.** Вядучы славіст краіны / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. – 2017. – 28 кастрычніка. – С. 4.

У рамках праекта «Людзі навукі нашага краю» – артыкул пра доктара філалагічных навук, прафесара, вядучага славіста нашай краіны, вядомага беларускага літаратуразнаўца, крытыка, перакладчыка І. А. Чароту.

**Шевченко, К. В.** Балканский компас / Кирилл Шевченко // Беларуская думка. - 2017. — № 5. — С. 65-68.

В 2016 году в Сербии была опубликована книга И. А. Чароты, посвященная белорусско-сербским культурным и научным связям.

**Сабінавіч, М.** Струны пявучыя душы беларускай : словы на прэзентацыі кнігі «Антологија белоруске поезије» 13 чэрвеня 2012 г., Бялград, Нацыянальная бібліятэка Сербіі / М. Сабіновіч // Полымя. – 2013. - № 6. - С. 169-175.

Значны ўклад І. Чароты ў папулярызацыю і развіцце сербскай літаратуры.

**Штэйнер, І**. Прафесар з душою паэта / Іван Штэйнер // Роднае слова. - 2012. – № 9. – С. 3-6.

**Шыбкоўская, К.** Паліглот Іван Чарота / Кацярына Шыбкоўская // Беларусь. - 2010. – № 1. – С. 22-23.

**Литературовед** и переводчик : ими гордится Кобрин // Кобрин-информ. - 2009. - 17 сентября. - С. 26.

**Рублевская, Л.** Звёзды и кометы книжных полок / Людмила Рублевская // Советская Белоруссия. - 2009. - 13 декабря. - С. 12.

Среди рейтинга книг, вышедших в 2009 г., профессор И. Чарота назвал книгу сербского историка Д. Анджелковича «История Беларуси».

**Чарота, И.** «Ухо открывается», затем рот… / Иван Чарота // Рэспубліка. - 2009. - 1 снежня. - С. 4.

**Чарота, И.** Дорожки памяти – дорожки радости / И. Чарота // Советская Белоруссия. - 2009. - 12 сентября. - С. 21.

**Чарота, І.** «Інтэлігенцыя не ўзяла ад візіту таго, што павінна была і магла» : гутарка з І. Чарота, размаўляла В. Мядзведзева / І. Чарота // Звязда. - 2009. - 14 кастрычника. - С. 7.

**Чарота, І.** «Гістарычны лёс славянства – фенаменальны» / Іван Чарота ; [гутарыла] Таццяна Сцешыца // Беларускі час. – 2007. – 12-19 кастрычніка.

**Чарота, И.** «Сейчас у славян есть два выбора…» / И. Чарота // Рэспубліка. - 2007. - 24 мая.

**Наумчик, Е.** Наш земляк Иван Чарота о времени и о себе / Е. Наумчик // Вечерний Брест. - 2005. - 7-8 января. - С. 4.

**Особенности** национальной философии // Советская Белоруссия. - 2005. - 2 февраля. - С. 12-13.

Известные люди, в их числе зав. кафедрой славистики И. Чарота, об исторической философии Беларуси.

**Цімафееў, А.** «Ацэньваць не бяруся…» / А. Цімафееў // ЛіМ. - 2005. - 8 красавіка.

**Чарота, И.** «Если уже начал служить слову» : Иван Чарота о времени и о себе / И. Чарота ; [беседовала] Елена Наумчик // Вечерний Брест. - 2005. - 7-8 января.

**[І. Чарота]** // Кобрынскі веснік. - 2005. - 3 верасня.

**Высокая** ўзнагарода земляку // Кобрынскі веснік. - 2004. - 14 студзеня. - С. 1.

Прафесар І. Чарота атрымаў прэмію «За духоўнае адраджэнне».

**Иван** Чарота : «Самое страшное сегодня – испытание бездумностью» // Белорусская нива. - 2004. - 20 января. - С. 4.

**Чэмер, М.** «Змяніць тое, што змяніць магу…» / М. Чэмер // Настаўніцкая газета. - 2004. - 10 лютага. - С. 4.

Прафесар И. Чарота атрымаў у 2003 г. прэмію «За духоўнае адраджэнне».

**Падарунак** роднаму гораду // Кобрынскі веснік. - 2003. - 2 жніўня.

Прафесар І. Чарота перадаў у дар шэраг кніг для бібліятэкі.

**Высокая** ўзнагарода // ЛіМ. - 2002. - 28 чэрвеня. - С. 3.

Патрыярх Маскоўскі і Усея Русі Алексій II узнагародзіў Ордэнам Прападобнага Сергія Раданежскага III ступені пісьменніка і філолага І. Чароту.

**Кукос, Е.** Во имя веры и дружбы / Е. Кукос // Кобрынскі веснік. - 2002. - 31 жніўня. – С. 3.

16 сентября исполнилось 50 лет нашему земляку, уроженцу д. Лыщики, И. А. Чароте, доктору философских наук, профессору.

**Чарота, І**. «Калі мы ўсе разам ляцім…, і пакуль што не да зор» / Іван Чарота // ЛіМ. - 2002. - 30 жніўня. - С. 4-5.

Гутарка з прафесарам; да 50-годдзя пісьменніка.

**Чарота, І.** На якой мове лепш маліцца богу / І. Чарота // Воскресение. - 2002. - № 11. - С. 5.

Гутарка з загадчыкам кафедры славянскай літаратуры БДУ І. Чаротам.

**Шурховецкий, В**. Иван Чарота : «Мои увлечения – это моя работа, а работа – мои увлечения» / В. Шуховецкий // Во славу Родины. - 2002. - 24 сентября, 25 сентября.

**Сущук, А**. Профессор Иван Чарота / А. Сущук // Кобрынскі веснік. - 2001. - 24 кастрычніка. - С. 2.

**Сербы** шануюць Чароту // ЛіМ. - 2000. - 3 лістапада.

«**Служэнне** слову і служэнне словам» (Іван Аляксеевіч Чарота) : творчая праца ў рамках раённага этапу конкурсу «Гонар і слава маёй Бацькаўшчыны» / пошукава-даследчая група школьнага музея «Спадчына», Астроміцкая сярэдняя школа ; кіраўнік: Т. Тунчык. – Астромічы, 2015. – 68 с.

# ШВАЙКО ВАЛЯНЦІНА ФЁДАРАЎНА

**ШВАЙКО Валянціна Фёдараўна** – вучоны, кандыдат філасофскіх навук.



Нарадзілася ў 1948 годзе ў вёсцы Астромічы Кобрынскага раёна.

Валянціна Фёдараўна - дацэнт Нацыянальнага інстытута адукацыі, загадчык кафедры методыкі выхавання Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі.

### *Працы*

**Швайко, В. Ф**. Роль сельской интеллигенции в коммунистическом воспитании молодежи в условиях развитого социализма (на материалах Белорусской ССР) : автореферат диссертации ... кандидата философских наук / В. Ф. Швайко. - Минск, 1986.

**Швайко, В. Ф.** Молодежный центр : Основные направления социальной работы / науч. ред. Швайко В. Ф. – Минск, 1999.

**Швайко, В. Ф.** Молодежный центр: основные направления социальной работы : [метод. пособие] / В. Ф. Швайко, Т. И. Сахащик, В. Г. Литвинович [и др.]. – Минск, 1999.

**Вопросы** ученического самоуправления в профтехучилище : методические материалы / Белорусский филиал ВНИИ профтехобразования ; [подготовили: Р. С. Пионова, В. Ф. Швайко ; под ред. Р. С. Пионовой]. – Минск, 1989.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Швайко Валянціна Фёдараўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 444. – (Імі ганарацца землякі).

**Швайко Валянціна Фёдараўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 152-153.

**70-гадоў** з дня нараджэння В. Ф. Швайко (1948**)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 76.

**Да 65-годдзя** з дня нараджэння В. Ф. Швайко // Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2013 год / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2013. – С. 41.

**Они были** первыми [Электронный ресурс] // ПТО70. – Режим доступа: http://pto70.ripo.unibel.by/RIPO/RIPO2.html. – Дата доступа: 09.10.2017.

**Імі ганарацца** землякі. Швайко Валянціна Фёдараўна [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: https://ikobrin.by/kobrin-139.php. – Дата доступу: 05.09.2017.

# ШЫДЛОЎСКІ АНТОН КАЗІМІРАВІЧ

**ШЫДЛОЎСКІ Антон Казіміравіч** –малады вучоны, магістр гістарычных навук, аўтар навуковых артыкулаў.



Нарадзіўся Антон Шыдлоўскі ў 1987 годзе. Выпускнік сярэдняй школы № 2 г. Кобрына.

У 2010 годзе закончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы па спецыяльнасці «выкладчык гісторыі і нямецкай мовы», у 2011 годзе - магістратуру па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя».

У 2010-2011 гадах працаваў журналістам у газеце «Слова Жыцця». З 2011 па 2014 год выкладаў у Кобрынскім політэхнічным каледжы.

З 2014 года працуе ў СТАА «ВП Палессе».

Антон Шыдлоўскі распрацоўвае наступныя тэмы: хрысціянскія канфесіі ў Беларусі ў паўстанні 1863-1864 гадоў, польская навуковая перыёдыка (1945-1965), гісторыя кобрынскай зямлі ў XIX - першай палове XX стагоддзя. Аўтар пяці навуковых артыкулаў па гэтых тэмах.

### *Працы*

**Шидловский, А. К.** Из истории Свято-Петропавловской церкви г. Кобрина / А. К. Шидловский // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зборнік навуковых артыкулаў : у 2 ч.– Гродна, 2009. - Ч. 2. - С. 336 - 340.

**Шидловский, А. К.** Бои за Кобрин в сентябре 1939 года / А. К. Шидловский // Наука-2009 : сборник научных статей : в 2 ч. - Гродно, 2009. - Ч. 1. - С. 92-93.

**Шидловский, А.** Бои за Кобрин в сентябре 1939 года / Антон Шидловский // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова XX стагоддзя. - Брэст , 2017. – С. 60-65.

**Антон Казіміравіч Шыдлоўскі** // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова XX стагоддзя. - Брэст , 2017 – С. 174.

**Итоги** республиканской выставки «Я – грамадзянін Беларусі» [Электронный ресурс] // Учреждение образования «Кобринский государственный политехнический колледж». – Режим доступа: http://kgpk.by/component/content/article/1-materials/132-itogi-gram. – Дата доступа: 12.10.2017.

# ШЭЛЕСТ ТАЦЦЯНА АНАТОЛЬЕЎНА

**ШЭЛЕСТ Таццяна Анатольеўна** – кандыдат геаграфічных навук, дацэнт.



Нарадзілася 1 студзеня 1979 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. У 2001 годзе з адзнакай закончыла Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна па спецыяльнасці «Геаграфія. Біялогія».

З 2001 года - асістэнт кафедры фізічнай геаграфіі і аховы прыроды.

У 2007 годзе паступіла ў аспірантуру Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2010).

У 2014 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Оценка пространственно-временных колебаний дождевого паводочного стока рек Беларуси в современных условиях».

З 2015 года - старшы выкладчык, з 2016 года - дацэнт кафедры геаграфіі і прыродакарыстання, адначасова намеснік дэкана геаграфічнага факультэта па навуковай рабоце.

У снежні 2017 года пастановай Прэзідыума ВАК Беларусі Т. А. Шэлест прысвоена вучонае званне дацэнта.

Аўтар больш за 50 навуковых публікацый.

***Працы***

**Шелест, Т. А.** Моделирование стока дождевых паводков на реках Белорусского Поозерья в зависимости от гидрографических характеристик / Т. А. Шелест // Молодежь в науке – 2009 : приложение к журналу «Весці Нац. акад. навук Беларусі». Серия химических наук / Нац. акад. наук Беларуси, Совет молодых ученых НАН Беларуси ; редкол.: Н. П. Крутько (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2010. – Ч. 1. – С. 161–164.

**Шелест, Т. А.** Практикум по географии почв с основами почвоведения / Т. А. Шелест, С. М. Токарчук. – Брест : БрГУ им. А. С. Пушкина, 2017. – 83 с.

**Шелест, Т. А.** Изменения максимального стока рек Белорусского Полесья в современных условиях / Т.А. Шелест // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. – Серыя 5. Хімія. Біялогія. Навукі аб зямлі. – 2017. – № 1. – С. 125–134.

**Шелест, Т. А.** Выдающиеся дождевые паводки на реках Беларуси / Т. А. Шелест // Вучоныя запіскі Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя прыродазнаўчыя навукі. – 2016. – Вып. 11. – Ч. 2. – С. 130–141.

**Логинов, В. Ф.** Анализ и моделирование гидрографов дождевых паводков рек Беларуси / В. Ф. Логинов, А. А. Волчек, Т. А. Шелест // Водные ресурсы. – Т. 42. – № 3. – 2015. – С. 268–278.

**Волчек, А. А.** Моделирование гидрографов дождевых паводков рек Беларуси при отсутствии данных гидрометрических наблюдений / А. А. Волчек, Т. А. Шелест // Вестник Брестского государственного технического университета. Серия Водохозяйственное строительство, теплоэнергетика и геоэкология. – 2013. – № 2 (80). – С. 3–7.

**Волчек, А. А.** О превышении максимальных расходов воды дождевых паводков над расходами весеннего половодья на реках Беларуси / А. А. Волчек, Т. А. Шелест // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. – Серыя 5. Хімія. Біялогія. Навукі аб зямлі. – 2013. – № 1. – С. 43–51.

**Волчек, А. А.** Пространственно-временные колебания дождевых паводков на реках Белоруссии / А. А. Волчек, Т. А. Шелест // Известия РАН. Серия географическая. – 2012. – № 1. – С. 68–80.

**Волчек, А. А.** Формирование зимних паводков на реках Беларуси / А. А. Волчек, Т. А. Шелест // Ученые записки Российского государственного гидрометеорологического университета. – 2012. – № 25. – С. 5–19.

**Волчек, А. А.** Влияние гидрографических факторов на величину дождевых паводков рек Беларуси / А. А. Волчек, Т. А. Шелест // Мелиорация. – 2010. – № 1 (63). – С. 36–48.

**Изменение** климата: последствия, смягчение, адаптация: электронное учебное издание / сост.: Т. А. Шелест, И. В. Абрамова [Электронный ресурс]. – Текст., графич. данные, тесты (33,8 Мб). – Брест, 2017. – – 1 электрон. опт. диск (DVD-R): зв., цв., 12 см. Рег.№ 78/2017 от 11.12.2017 (в УМО рег.№68/2017 от 30.11.2017)

**Шелест Татьяна Анатольевна** [Электронный ресурс] // Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина. – Режим доступа: http://www.brsu.by/div/shelest-tatyana-anatolevna. – Дата доступа: 13.11.2019.

# ЭНГЕЛЬГАРТ ВАСІЛІЙ ПАЎЛАВІЧ

**ЭНГЕЛЬГАРТ Васілій Паўлавіч** (1828–1915) - астраном і мецэнат, доктар астраноміі, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1890).



Васілій Энгельгарт нарадзіўся 17(29) ліпеня 1828 года ў вёсцы Кустовічы Гродзенскай губерні. Паходзіў са знакамітага шляхецкага роду Энгельгартаў.

Закончыў Пецярбургскае вучылішча правазнаўства. У 1872-1879 гадах пабудаваў каля Дрэздэна (Германія) астранамічную абсерваторыю, якая лічылася адной з лепшых у Еўропе па абсталяванні, прыладах і памерах (*будынак знішчаны ў 1945 годзе падчас бамбардзіроўкі Дрэздэна амерыканскай авіяцыяй).*

Праводзіў сістэматычныя астранамічныя назіранні камет, малых планет і падвоеных зорак, туманнасцяў і зоркавых скопішчаў. Склаў каталог звыш 600 туманнасцяў. Сумесна з астраномам З. І. Дубягам выканаў даследаванні арбіты і руху планеты Дыяны.

Яго працы друкаваліся ў вядучых тагачасных астранамічных часопісах і з вялікаю цікавасцю разглядаліся навуковай грамадскасцю. У 1886-1895 гадах на ўласныя сродкі В. П. Энгельгарт выдаў матэрыялы сваіх амаль 20-гадовых астранамічных даследаванняў («Назіранні», т. 1-3, 1886, 1890, 1895).

У снежні 1889 года Васіль Паўлавіч Энгельгарт быў удастоены звання «Ганаровы доктар Казанскага ўніверсітэта». Уручэнне дыплома адбылося ў Дрэздэне.

1 снежня 1890 года Васілій Паўлавіч быў абраны членам-карэспандэнтам Пецярбургскай Акадэміі навук па разраду матэматычных навук фізіка-матэматычнага аддзялення.



У 1897 годзе ён перадаў Казанскаму ўніверсітэту інструменты, абсталяванне астранамічнай абсерваторыі і навуковую бібліятэку, што дазволіла пабудаваць у 1899 годзе каля Казані новую абсерваторыю. Сам Васілій Паўлавіч прымаў актыўны ўдзел у яе будаўніцтве. У 1903 годзе Казанскай абсерваторыі было афіцыйна нададзена імя В. П. Энгельгарта.

Энгельгарт меў выдатныя музычныя здольнасці, быў піяністам і арганістам высокага класа. Ён быў добра знаёмы з М. І. Глінкам, М. А. Балакіравым, А. С. Даргамыжскім, У. В. Стасавым, прымаў удзел у іх хатніх музычных канцэртах. Васілій Паўлавіч вядомы як шчыры прыхільнік і прапагандыст музыкі М. І. Глінкі. Ён перадаў у Публічную бібліятэку Пецярбурга сабраную і захаваную ім аўтаграфічную калекцыю твораў кампазітара, у тым ліку партытуру оперы «Іван Сусанін».

Ва ўзросце 70 гадоў В. П. Энгельгарт захапіўся вайсковай гісторыяй Расійскай імперыі, дасканала вывучыў матэрыялы знакамітага швейцарскага паходу А. В. Суворава, прайшоў па мясцінах, звязаных з імем палкаводца. На ўласныя грошы ўстанавіў помнікі і мемарыяльныя дошкі на шляху паходу праз Альпы. Збіраў калекцыю прыватных рэчаў Суворава, дакументаў. Матэрыялы, якія атрымалі назву «Сувораўскі зборнік», - ядры, зброя, знойдзеныя на месцах баёў, медалі, гравіраваныя партрэты паплечнікаў і ворагаў Суворава, мэбля з месцаў, дзе рабіў прыпынкі палкаводзец, узоры альпійскіх мінералаў, фотаздымкі тых мясцін (13 скрыняў агульнай вагой 955 кг) - былі перададзены ў 1902 годзе В. Энгельгартам у Сувораўскі музей у Пецярбургу (цяпер Дзяржаўны мемарыяльны музей А. В. Суворава) і сталі адной з трох вялікіх калекцый музея.

Выдатны навуковец і грамадскі дзеяч Васілій Паўлавіч Энгельгарт памёр 6 мая 1915 года і быў пахаваны ў нямецкім горадзе Дрэздэне на могілках Святой Тройцы (Trinitatisfriedhof). Але яшчэ гадоў за дзесяць да гэтага Васілій Паўлавіч казаў, што хоча быць пахаваным на тэрыторыі абсерваторыі, стваральнікам якой ён быў.



У 1980-1990 гадах упершыню ў астранамічных колах было ўзнята пытанне пра перапахаванне В. П. Энгельгарта. Цырымоніі перапахавання і закладка каменя пад будучы помнік заснавальнікам Астранамічнай абсерваторыі Казанскага ўніверсітэта В. П. Энгельгарту і Д. І. Дубягі былі прымеркаваны да дня заснавання абсерваторыі і да 210-годдзя Казанскага ўніверсітэта (2014).

У 1970 годзе рашэннем XIV з'езду Міжнароднага астранамічнага саюза імя В. П. Энгельгарта было прысвоена кратару на Луне.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Гапоненка, В. А**. Энгельгарт Васіль Паўлавіч / В. А. Гапоненка // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2004. – Т. 18, кн. 1. – С. 123.

**Энгельгардт Васіль Паўлавіч** // 250 асоб з Беларусі у дыялогах культур : даведачнае выданне / рэд.: Т. Л. Пісарэнка, Л. У. Языковіч. – Мінск, 2008. – С. 105, 106.

Астраном, мецэнат, доктар астраноміі Казанскага ўніверсітэта, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН В. Энгельгардт нарадзіўся ў в. Кустовічы Кобрынскага раёна.

**Энгельгарт Васілій Паўлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 154-156.

**120 гадоў** з дня нараджэння В. П. Энгельгардта (1898) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 76.

**Белов, Д.** Судьбы переплелись в Кустовичах / по информации историко-краеведческого музея Октябрьского детского сада - средней школы подготовил Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2020. – 2 верасня (№ 68). – С. 6.

Биографии древнего род баронов Энгельгардтов и великого украинского поэта Тараса Шевченко тесно связаны с деревней Кустовичи Кобринского района.

**Дорошкевич, Н**. КФУ исполнил последнюю волю Василия Павловича Энгельгардта [Электронный ресурс] / Наталья Дорошкевич // Казанский федеральный университет. – Режим доступа: http://kpfu.ru/news/perezahoronenie-engelgardta-94473.html. – Дата доступа: 19.04.2017.

**Церемония** перезахоронения основателя Астрономической обсерватории Василия Павловича Энгельгардта [Электронный ресурс] // Казанский федеральный университет. – Режим доступа: http://kpfu.ru/ceremoniya-perezahoroneniya-engelgardta.html. – Дата доступа: 19.04.2017.

# ЮРЭНЯ АЛЯКСАНДР СТАНІСЛАВАВІЧ

**ЮРЭНЯ Аляксандр Станіслававіч** (1946–2010) – кандыдат сельскагаспадарчых навук.



Нарадзіўся 11 лютага 1946 года ў вёсцы Колбавічы Баранавіцкага раёна. У 1952 годзе пайшоў у Колбавіцкую пачатковую школу. У 1956-1962 гадах вучыўся ў Падгорненскай сярэдняй школе.

Працоўны шлях пачаў з 17 гадоў рабочым на Кобрынскім інструментальным заводзе. З 1963 па 1969 год - электрык кампрэсарнай станцыі г. Кобрына.

З 1970 па 1971 год – служба ў Савецкай Арміі.

У 1970 годзе Аляксандр Юрэня закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут. З 1970 па 1979 год працаваў галоўным заатэхнікам калгаса «Савецкая Беларусь».

З 1979 па 2000 год А. С. Юрэня - дырэктар племзавода «Дружба». Дзякуючы Аляксандру Станіслававічу прадпрыемства наладзіла цесную сувязь з навукоўцамі Беларускага навукова-даследчага інстытута жывёлагадоўлі, з шэрагам вопытных станцый і эксперыментальных баз рэспублікі. Трывалая сувязь з навукай давала свае вынікі. Племянны завод у той час быў адзіным у рэспубліцы, які займаўся племянной жывёлагадоўляй і спецыялізаваўся на вырошчванні бычкоў і кароў французскіх парод.

З 2000 года А. С. Юрэня - у апараце Упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, з сакавіка 2002 па 2004 год - начальнік упраўлення Кобрынскага райвыканкама, з 2004 года па люты 2007 года - намеснік начальніка сельгасупраўлення Кобрынскага райвыканкама.

У 1994 годзе абараніў дысертацыю і атрымаў вучонае званне кандыдата сельскагаспадарчых навук. З'яўляючыся старшым навуковым супрацоўнікам Беларускага навукова-даследчага інстытута жывёлагадоўлі, Аляксандр Станіслававіч да апошняга дня працягваў кансультаваць па пытаннях росту прадукцыйнасці жывёлагадоўлі, укараненні новых тэхналогій і перадавога вопыту ў сельскагаспадарчую вытворчасць.

У 1986 годзе А. С. Юрэня ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і Залатым медалём ВДНГ, ганаровымі граматамі Міністэрства сельскай гаспадаркі, Падзячным пісьмом Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка.

16 студзеня 2010 года жыццё Юрэні Аляксандра Станіслававіча абарвалася.

**Юреня, Александр Станиславович**. Совершенствование и использование шаролезской породы скота в Республике Беларусь : автореферат дис. ... кандидата сельскохозяйственных наук : 06.02.01.- Жодино, 1994.- 22 с.: ил.

### *Аб жыцці і дзейнасці*

**Ардэнаносцы. Юрэня Аляксандр Станіслававіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 85 : фат.

**Часовитина, Н.** Объединенные «Дружбой» / Наталья Часовитина // Сельская газета. - 2019. — 26 января. — С. 28-29.

Директор племзавода «Дружба» А. С. Юреня защитил диссертацию, стал кандидатом сельхознаук.

**Александр Юреня**: «Наши планы строились не на пустом месте» / Александр Юреня // Белорусская нива. – 2003. – 27 февраля.

Александр Станиславович Юреня – кандидат сельскохозяйственных наук.

**Сацук, А.** Тут зноў курлычуць жураўлі / А. Сацук // Кобрынксі веснік. – 1999. – 11 верасня.

Па ініцыятыве дырэктара племзавода А. С. Юрэні ля вёскі Лука на тэрыторыі племзавода створана штучнае возера**.**

**Юрэня Аляксандр Станіслававіч** // Кобрынскі веснік. – 1995. – 6 мая. – С. 2.

Аб кандыдаце ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР А. С. Юрэні, яго прадвыбарчая праграма.

**Юреня Александр Станиславович :** информация Лукской публичной интегрированной библиотеки. – Лука, 2019.

**Давидович, В.** Настоящий хозяин [Электронный ресурс] / Виктория Давидович // Переходной возраст. – Режим доступа: http://www.pvz.by/?p =43450. – Дата доступа: 12.11.2020.

# ЮШЧУК МІКАЛАЙ ДЗМІТРЫЕВІЧ

**ЮШЧУК Мікалай Дзмітрыевіч** - доктар медыцынскіх навук, прафесар, акадэмік Расійскай акадэміі медыцынскіх навук (РАМН), лаўрэат прэміі Урада Расійскай Федэрацыі, заслужаны дзеяч навукі Расіі.



Нарадзіўся Мікалай Юшчук 22 снежня 1940 года ў вёсцы Авады Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і сельскіх працаўнікоў. Вучыўся ў Гайкоўскай пачатковай школе. Дарэчы, першы клас ён закончыў лепш за ўсіх, настаўнікі часта ставілі ў прыклад заўсёды акуратнага і працавітага вучня.

Бацькам Мікалая па сямейных абставінах прыйшлося з'ехаць у Іркуцкую вобласць, дзе ў г. Чаромхава ён закончыў сярэднюю школу. З выбарам прафесіі выпускнік даўно вызначыўся: ён хацеў стаць урачом-анколагам. Аднак, нават маючы добрыя веды па школьных прадметах і моцнае жаданне стаць урачом, паступіць вясковаму хлопцу ў медыцынскую ВНУ ў канцы 1950-х было вельмі складана. Падрыхтоўка для здачы экзаменаў на круглыя пяцёркі ў Іркуцкі дзяржаўны медыцынскі інстытут у юнака займе два гады. Рыхтаваўся да паступлення і працаваў малатабойцам, слесарам па рамонту падземнага транспарту ў шахцёрскім горадзе Чаромхава.

У 1960 годзе Мікалай Юшчук паступіў ў Іркуцкі дзяржаўны медыцынскі інстытут, дзе зарэкамендаваў сябе як выдатны арганізатар моладзі і быў выбраны сакратаром камітэта ВЛКСМ, з'яўляўся нязменным старастам групы. Вучобу ў інстытуце сумяшчаў з працай медбрата, санітара. Пасля заканчэння ў 1966 годзе інстытута вучыўся ў клінічнай ардынатуры на кафедры інфекцыйных хвароб Іркуцкага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. У 1968 годзе Мікалай Дзмітрыевіч узначаліў інфекцыйную бальніцу г. Іркуцка. Практычную медыцынскую дзейнасць сумяшчаў з навуковай, працуючы на пасадзе стажора-даследчыка, а потым малодшага навуковага супрацоўніка ў Цэнтральным навукова-даследчым інстытуце эпідэміялогіі.

Маладога вучонага чакала вялікая будучыня, якая была звязана з Маскоўскім дзяржаўным стаматалагічным інстытутам (цяпер - Маскоўскі дзяржаўны медыка-стаматалагічны ўніверсітэт, МДМСУ). Больш за сорак гадоў працоўнай дзейнасці М. Д. Юшчука звязана з гэтым універсітэтам, дзе ён прайшоў шлях ад асістэнта, дацэнта, прафесара, загадчыка кафедры, дэкана, прарэктара да рэктара і прэзідэнта МДМСУ, вядомага вучонага, педагога і клініцыста. Свой інтэлект, энергію, талент вучонага і арганізатара Мікалай Дзмітрыевіч цалкам прысвяціў ўмацаванню аўтарытэту вядучага ў

Расіі ВНУ па стаматалагічнай адукацыі, клопаце аб паляпшэнні жыцця студэнтаў і супрацоўнікаў.

У 1980 годзе М. Д. Юшчук абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Функционально-морфологическое состояние кишечника при сальмонеллезной инфекции», прысвоена званне прафесара. У 1991 годзе ён абраны членам-карэспандэнтам, у 1999 годзе - акадэмікам РАМН.

Мікалай Дзмітрыевіч - аўтар больш за 800 навуковых прац, шэраг работ апублікаваны за мяжой. Выдадзены такія важныя манаграфіі і падручнікі, як «Сальмонеллезы», «Бактериальная дизентерия», «Инфекционные болезни», «Диагностика и дифференциальная диагностика острых кишечных инфекций», «Проблемы ВИЧ-инфекции в стоматологии», «Эпидемиология», «Инфекционные болезни», «Заразные болезни человека», «Иерсиниозы», «Диагностика и лечение диффузных заболеваний печени», «Поражение нервной системы при герпетических инфекциях», «Краткий курс эпидемиологии», «Справочник по эпидемиологии», «Лекции по инфекционным болезням», «Военная эпидемиология» і інш.

М. Д. Юшчук унёс вялікі ўклад у вывучэнне патафізіялогіі і распрацоўцы метадаў тэрапіі розных інфекцыйных хвароб. Пад кіраўніцтвам вучонага праводзілася вывучэнне малекулярна-біялагічных тэхналогій у дыягностыцы вірусных гепатытаў. Навуковая дзейнасць М. Д. Юшчука сканцэнтравана на праблемах дыягностыкі, лячэння, прафілактыкі інфекцыйных захворванняў. Асаблівая ўвага ў гэтай працы надаецца вывучэнню патагенезу і патогенетычных метадаў лячэння інфекцыйных хвароб на аснове функцыянальна-марфалагічных і імуналагічных падыходаў.

Наш зямляк з'яўляецца не толькі вядомым вучоным, але і бліскучым педагогам, высокакваліфікаваным урачом, прызнаным аўтарытэтам у галіне інфекцыйнай паталогіі, сістэме медыцынскай адукацыі. Ён - член праўлення Міжнароднага таварыства інфекцыяністаў і мікрабіёлагаў, член спецыялізаванага савета па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, старшыня Экспертнага савета ВАК Расійскай Федэрацыі. У 2009 годзе М. Д. Юшчук абраны членам Грамадскай палаты Расійскай Федэрацыі ад агульнарасійскіх грамадскіх арганізацый. Прафесар Юшчук мае шмат вучняў, пад яго кіраўніцтвам абаронена 60 кандыдацкіх і 15 доктарскіх дысертацый.

Шматгранная дзейнасць акадэміка М. Д. Юшчука адзначана высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі і ганаровымі званнямі. Прызнаннем навуковых заслуг стала атрыманне ім звання «Заслужаны дзеяч навукі Расійскай Федэрацыі» (1997). За вялікі ўклад у развіццё расійскай навукі і медыцыны Мікалай Дзмітрыевіч стаў лаўрэатам прэміі Урада Расійскай Федэрацыі ў галіне навукі і тэхнікі. Ён - лаўрэат прэміі «Прафесія - Жыццё» ў намінацыі «Выдатны настаўнік» - адзінай міжнароднай прэміі, лаўрэаты якой заахвочваюцца за ўвасабленне сваёй мары стаць навукоўцам, урачом, педагогам, бізнесменам - сапраўднай асобай, чыё жыццё цалкам прысвечана служэнню прафесіі, а прафесія стала сэнсам жыцця. Узнагароджаны ордэнам «За заслугі перад Айчынай» III і IV ступеняў, ордэнам Дружбы, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Нягледзячы на сваю занятасць, Мікалай Дзмітрыевіч ніколі не забываў пра сваю малую радзіму. З сям'ёй бываў на Кобрыншчыне. Падтрымліваў цёплыя адносіны са сваім аднакласнікам, заслужаным настаўнікам БССР А. В. Букачам, тэлефанаваў і перапісваўся з ім, пасылаў яму свае самыя каштоўныя навуковыя працы.

М. Д. Юшчук прайшоў шлях ад малатабойца на шахце да акадэміка Расійскай акадэміі медыцынскіх навук, стаў вядомым навукоўцам у нашай краіне і за яе мяжой, пры непасрэдным удзеле якога распрацоўваюцца праграмы, навучальныя планы, выдаецца літаратура па інтэграцыі медыцынскай адукацыі на міжнародным узроўні.

**Ющук, Н. Д.** Инфекционные болезни : учебник / Николай Дмитриевич Ющук. – М. : Медицина, 2003.

**Ющук, Н. Д.** Инфекционные болезни : учебник для студентов мед. колледжей и училищ / Николай Дмитриевич Ющук. – М. : Медицина, 2007.

**Ющук, Н. Д.** Краткий курс эпидемиологии : учебное пособие / Николай Дмитриевич Ющук. – М. : Медицина, 2005.

**Ющук, Н. Д.** Лекции по инфекционным болезням : учебное пособие / Николай Дмитриевич Ющук. – М. : Медицина, 2007.

**Ющук, Н. Д**. Эпидемиология : учебное пособие / Николай Дмитриевич Ющук. – М. : Медицина, 2003.

**Ющук, Н. Д**. Военная эпидемиология. Противоэпидемическое обеспечение в военное время и при чрезвычайных ситуациях : учебное пособие / Н. Д. Ющук, Ю. В. Мартынов. – М., 2007. – 150 с.

**Ющук, Н. Д**. Инфекционные болезни : учебник для мед. училищ и колледжей / Н. Д. Ющук, Г. Н. Кареткина, Л. И. Мельникова. – 5-е изд., испр. – М., 2015. – 497 с. : ил.

**Ющук, Н. Д**. Краткий курс эпидемиологии : учебное пособие / Н. Д. Ющук, Ю. В. Мартынов. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Медицина, 2005. – 200 с. : табл.

**Ющук, Н. Д**. Лекции по инфекционным болезням : в 2 т. / Н. Д. Ющук, Ю. Я. Венгеров. – 4-е изд., перераб. и доп. – М. : ГЭОТАР-Медия, 2016. – Т. 1. – 656 с.

**Ющук, Н. Д.** Острые кишечные инфекции: диагностика и лечение / Н. Д. Ющук, Л. Е. Бродов. – М. : Медицина, 2001. – 304 с. : ил.

**Ющук, Н. Д.** Эпидемиология : учебное пособие / Н. Д. Ющук, Ю. В. Мартынов. – М. : Медицина, 2003. – 448 с. : ил.

**Ющук, Н. Д.** Функционально-морфологическое состояние кишечника при сальмонеллезной инфекции : автореферат диссертации ... доктора медицинских наук / Н. Д. Ющук. – М., 1980. – 29 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Заслужаны** дзеяч навукі Расійскай Федэрацыі. **Юшчук Мікалай Дзмітрыевіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 143-144 : фат.

**Юшчук Мікалай Дзмітрыевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 156-158.

**80 гадоў** з дня нараджэння М. Д. Юшчука (1940) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 153.

**Савчук, М.** Дело всей жизни ученого Ющука / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2010. – 28 января. – С. 6.

Около 40 лет жизни Н. Д. Ющук (уроженец д. Овады) посвятил Московскому государственному медико-стоматологическому университету и подготовке на его базе высококвалифицированных специалистов.

**Юбилей** академика РАМН Николая Дмитриевича Ющука : к 70-летию со дня рождения // Российский журнал Гастроэнтерологии, Гепатологии, Колопроктологии. – 2010. – Т. 20. - № 6. – С. 86-87.

**Академик** из д. Оводы // Кобрин-информ. – 2009. – 17 сентября. – С. 26.

Академик Российской академии медицинских наук Н. Д. Ющук - уроженец д. Оводы Кобринского района.

**Николай Дмитриевич Ющук** : к 65-летию со дня рождения // Российский журнал Гастроэнтерологии, Гепатологии, Колопроктологии. – 2006. – Т. 16. - № 1. – С. 93.

# АРТЫКУЛЫ АБ НАВУКОЎЦАХ КОБРЫНСКАГА КРАЮ Ў СМІ

**Курачук, С. Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2017. – 20 июля. – С. 5.**

Центральная районная библиотека ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система» начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны», первый этап которого – база данных «Людзі навукі нашага краю».

## Кобринское слово сказано и в науке

***Центральная районная библиотека ГУК «Кобринская районная централизованная библиотечная система» начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны».***

Богата талантами кобринская земля, богата на людей, ставших её гордостью и славой. Их жизнь и деятельность вошла в историю малой Родины как яркий пример самоотверженного труда, преданного служения людям и верности гражданскому долгу. В рамках проекта «Славутыя імёны Кобрыншчыны» мы предполагаем создать электронный ресурс, в который войдут материалы, включающие сведения о людях, оставивших заметный след в истории Кобрина и Кобринского района, проявивших себя в разных областях науки, культуры, литературы и искусства, общественной деятельности. Пользователи найдут здесь очерки жизни и деятельности, фрагменты мемуаров, библиографию и избранные труды наших известных земляков, фотоматериалы.

2017 в Республике Беларусь - Год науки. Мы живём в мире, духовная и материальная среда которого буквально пронизана наукой, и решение большинства животрепещущих экономических и политических проблем тесно связываем с её достижениями. Ведь именно благодаря научным достижениям мир движется вперед. «Наука – вот истинное преимущество человека», - заявлял великий немецкий поэт и учёный-натуралист Иоганн Вольфганг Гёте. Развитие научной сферы является одним из приоритетов нашей страны и во многом предопределяет рост благосостояния и интеллектуальное развитие нации, обеспечивает укрепление социально-экономического потенциала государства и его авторитет на международной арене.

Неслучайно первый этап нашего проекта, который мы уже начали реализовывать, – создание краеведческой полнотекстовой базы данных (БД) *«Людзі навукі нашага краю».* Приятно осознавать, что на кобринской земле рождаются и вырастают люди, которые становятся известными учеными, настоящими авторитетами в той или иной области науки. Всех их объединяет большое трудолюбие и ответственность, умение работать на перспективу, любовь к работе, которую они делали и делают для блага своей страны, своей малой Родины. Это люди разных профессий и даже разных эпох, которых объединяет то, что все они - уроженцы земли кобринской. Их имена навсегда останутся в истории Кобринщины, в истории Беларуси, а некоторые - и всего мира.

База данных представляет собой систематизированный свод информации о людях, проявивших себя в разных областях науки, имеющих ученые степени кандидата наук, доктора наук, являющихся заслуженными деятелями науки, академиками, профессорами. Это фактографический информационный ресурс, в котором дана информация о лицах, имеющих ученые звания, научных работниках и преподавателях вузов, авторах научных публикаций. Предоставление пользователям достоверной и актуальной информации об ученых обеспечивается разработанной технологией сбора и актуализации данных. Отбирая материал, сотрудники библиотеки стремятся дать как можно полную информацию по теме.

О каждом ученом представлены биографические сведения, информация о научных интересах, отраслях научной деятельности, должностях, наградах, почетных званиях и др. В базу данных включены отдельные издания, статьи, помещённые в книгах, справочниках, сборниках, журналах и газетах, краеведческих папках. Библиографами библиотеки просматриваются справочные и энциклопедические издания, электронные каталоги, базы данных. Источниками выявления материалов являются биобиблиографические словари, архивные материалы, интернет-ресурсы.

Многие населенные пункты нашего района могут «похвастаться» учёными-земляками.



На Кобринщине родились такие известные деятели науки, как: **С. И. Гопасюк** - доктор физико-математических наук, астрофизик, заслуженный деятель науки и техники Украины, именем которого названа одна из недавно открытых планет (уроженец д. Легаты);



**Г. П. Давидюк** - белорусский социолог, основоположник белорусской социологической школы, доктор философских наук (уроженец д. Октябрь);



**М. И. Демчук** - ученый в области приборо- и машиностроения, член-корреспондент Национальной академии наук (НАН) Беларуси, заслуженный деятель науки, профессор, лауреат Государственной премии БССР, именем которого названа одна из улиц нашего города (уроженец д. Девятки);

**В. Г. Иванюк -** учёный в области защиты и иммунитета растений, член-корреспондент НАН Беларуси, Академии аграрных наук Беларуси, доктор биологических наук, профессор (уроженец д. Мефёдовичи);



**В. И. Ивченков** - доктор филологических наук, профессор (уроженец д. Ходыничи);



**В. И. Кочурко** - доктор сельскохозяйственных наук, профессор, ректор Барановичского государственного университета (уроженец д. Стрии);
**И. П. Панасюк** - кандидат философских наук, предприниматель, общественный деятель, благотворитель, меценат (уроженец д. Леликово);



**И. А. Чарота** - ведущий славист страны, доктор филологических наук, профессор (Лыщики);
**Н. Д. Ющук** - академик Российской академии медицинских наук (уроженец д. Оводы) и др.

Город Кобрин – малая родина многих учёных. Назову некоторых: **Бармуцкая Алиция Збигневна** - кандидат медицинских наук,



доцент кафедры хирургической стоматологии Белорусского государственного медиц
**Бовбель Евгений Иванович** – кандидат физико-математических наук; почётный профессор Лионского университета;



**Оскар Зарисский** – гениальный математик, лауреат престижных премий в области математики;

**Мартынова Мария Алексеевна** – кандидат химических наук;



**Омельянюк Георгий Георгиевич** - кандидат биологических наук, доктор юридических наук, профессор;

**Сизюк Валерий Алексеевич** – кандидат физико-математических наук, старший научный сотрудник НАН Беларуси;

**Синчук Иван Иванович** – историк, нумизмат;

**Стрельчёнок Олег Анатольевич** - химик, академик НАН Беларуси, доктор химических наук;

**Строк Евгений Яковлевич** – кандидат технических наук, доцент.

Деревня Мацы может гордиться многими своими знаменитыми земляками, среди которых есть и учёные:

**Г. А. Антонюк** - белорусский философ, доктор философских наук, профессор,

**М. М. Макарук** – кандидат военных наук, генерал-майор авиации,

**М. А. Макарук** - кандидат ветеринарных наук, доцент Витебской ордена «Знак почёта» государственной академии ветеринарной медицины,



**В. Ю. Малаховский** - талантливый инженер-изобретатель, создатель прототипа «Кодака»,

**И. П. Примачук** – белорусский учёный, кандидат исторических наук, доцент, профессор Международного гуманитарно-экономического института, автор более 40 работ по истории Беларуси,

**Л. П. Примачук** - учёный-математик, доцент кафедры теории функций БГУ.

Агрогородок Дивин Кобринского района дал Беларуси таких известных учёных,



как **С. А. Гордун** - профессор Минской духовной академии, кандидат богословия,

**В. В. Курашик** - академик Белорусской инженерной академии, Почетный доктор Международной кадровой академии,

**Н. А. Свидунович** - доктор технических наук, профессор, академик Международной академии наук Евразии,

**А. Ф. Свидунович** - кандидат богословия.

В государстве Израиль существуют десятки разных премий, но самая престижная из них – Государственная премия Израиля. Именно этой премии первым был удостоен видный ученый-историк из Кобрина **Гдалий Аллон (Рогозницкий).** В деревне Великий Лес Кобринского повета в 1853 г. родился историк, филолог-славяновед, магистр филологии **Владимир Васильевич Качановский.** На Кобринщине начинал свой жизненный путь белорусский политический деятель, поэт, драматург и историк **Петр Антонович Кречевский.** В 1840 г. в д. Озяты Кобринского повета родился **Юлиан Фомич Крачковский** - белорусский историк, археограф, этнолог, президент Рады Белорусской Народной Республики. Кобринчан заинтересует уроженец г. Кобрина, физик и метеоролог, профессор Петербургского и Харьковского университетов **Евгений Александрович Роговский** (1855-1923 гг.).

На данный момент библиографами центральной библиотеки собран материал о 70 учёных-земляках, но работа продолжается. Хотим обратиться к историкам, краеведам, уроженцам и просто жителям Кобрина и Кобринского района и пригласить всех к сотрудничеству. Мы по мере своих возможностей будем расширять первоначальный список известных людей Кобринского края, пополнять базу данных об этих личностях. Однако будем рады любой информации, имеющей отношение к теме нашего проекта. Всех, приславших хоть какую-то информацию, мы с благодарностью занесём в перечень участников проекта. Приглашаем к сотрудничеству! Контактный телефон для справок: 54104, библиографы. E-mail: kobrinlib@gmail.com Сайт: www.krcls.by.

*К сведению! К Всемирному дню науки (World Science Day), который ежегодно отмечается 10 ноября, библиографы центральной районной библиотеки планируют подготовить и издать биобиблиографический указатель, посвященный учёным Кобринского края.*

***Светлана Курачук,** главный библиограф*
*отдела обслуживания и информации*
*центральной районной библиотеки.*

**Курачук, С. Людзі навукі нашага краю / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2017. – 5 красавіка. – С. 3.**

Цэнтральная раённая бібліятэка пачынае працу над чарговым праектам «Славутыя імёны Кобрыншчыны», першы этап якога – стварэнне краязнаўчай паўнатэкставай базы даных «Людзі навукі нашага краю».

## Людзі навукі нашага краю

***2017 год у Рэспубліцы Беларусь аб'яўлены Годам навукі. Гэты год - добрая нагода падзяліцца сваімі ідэямі і распрацоўкамі. Цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» пачынае працу над чарговым праектам «Славутыя імёны Кобрыншчыны».***

Гарады як людзі: іх гісторыі падобныя на лёсы людзей. Калі кажуць пра дасягненні горада, раёна, то маюць на ўвазе жыхароў, дзякуючы працаздольнасці, таленту якіх той ці іншы рэгіён развіваецца, становіцца вядомым не толькі ў сваёй краіне, але і за мяжой.

Багатая талентамі кобрынская зямля, багатая на людзей, якія з'яўляюцца яе гонарам і славай. Іх жыццё і дзейнасць увайшлі ў гісторыю малой Радзімы як яркі прыклад самаадданай працы, вернасці служэнню людзям і грамадзянскаму абавязку.

У межах праекта «*Славутыя імёны Кобрыншчыны*» мы мяркуем стварыць электронны рэсурс, у які ўвойдуць матэрыялы пра людзей, што пакінулі прыкметны след у гісторыі Кобрына і Кобрынскага раёна, якія выявілі сябе ў розных галінах навукі, культуры, мастацтва, грамадскай дзейнасці. Карыстальнікі знойдуць тут біяграфічныя матэрыялы, фрагменты мемуараў, працы нашых вядомых землякоў, бібліяграфію, фотаматэрыялы.

Развіццё навуковай сферы з'яўляецца адным з прыярытэтаў нашай краіны і шмат у чым прадвызначае рост дабрабыту і інтэлектуальнае развіццё нацыі, забяспечвае ўмацаванне сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу дзяржавы і яго аўтарытэт на міжнароднай арэне. Невыпадкова першы этап нашага праекта, які мы ўжо пачалі рэалізоўваць, - стварэнне краязнаўчай паўнатэкставай базы даных «*Людзі навукі нашага краю*». Прыемна ўсведамляць, што на кобрынскай зямлі нараджаюцца і вырастаюць людзі, якія становяцца вядомымі навукоўцамі, сапраўднымі аўтарытэтамі ў той ці іншай галіне навукі. База даных змяшчае інфармацыю пра землякоў, якія маюць навуковыя ступені кандыдата навук, доктара навук, працуюць выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў і маюць навуковыя публікацыі. Сабраны матэрыял пра больш за 60 навукоўцаў. Па кожнай персоне прадстаўлены біяграфічная даведка і спіс крыніц са свежымі, аператыўна дапаўняемымі матэрыяламі; у шматлікіх даведках ёсць фотаздымкі.

Работа працягваецца. Мы будзем па меры сваіх магчымасцяў пашыраць першапачатковы спіс вядомых людзей Кобрыншчыны, але заклікаем чытачоў «Кобрынскага весніка» да супрацоўніцтва і просім па магчымасці дапаўняць наш матэрыял. Дарэчы, у планах бібліятэкі выданне біябібліяграфічнага паказальніка, прысвечанага навукоўцам нашага краю.

***Святлана Курачук*,**
*галоўны бібліёграф*
*цэнтральнай раённай бібліятэкі*
*УК «Кобрынская раённая*
*цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»*

**Курачук, С. Портреты интеллекта. Учёные Кобринщины : Знакомьтесь - biобиблиографический справочник об ученых нашего края / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2017. – 9 ноября. – С. 33.**

Ко Всемирному Дню науки было приурочено издание библиографами Кобринской центральной районной библиотеки биобиблиографического справочника «Людзі навукі нашага краю» из серии «Імёны на карце Кобрыншчыны».

## Портреты интеллекта. Учёные Кобринщины

### Знакомьтесь - биобиблиографический справочник об ученых нашего края

*10 ноября – Всемирный День наук*

*Всемирный день науки (World Science Day) или более официально - Всемирный день науки за мир и развитие (World Science Day for Peace and Development) отмечается ежегодно 10 ноября с целью повысить осознание общественностью во всем мире пользы науки. Этот день служит напоминанием международному сообществу о необходимости использования научно-технических достижений в интересах мира и развития на благо человеческой цивилизации, способствует популяризации роли науки в качестве инструмента, находящегося на службе общества.*

Именно к этому дню было приурочено издание сотрудниками Кобринской центральной районной библиотеки биобиблиографического справочника об ученых нашего края из серии «Імёны на карце Кобрыншчыны».

В 2017 году, который объявлен в Республике Беларусь Годом науки, библиографы центральной библиотеки начали работу над первым этапом проекта под общим названием «Славутыя імёны Кобрыншчыны» - «Людзі навукі нашага краю». В течение года шла интенсивная работа по поиску, сбору и оцифровке материалов об ученых-земляках, устанавливалась контакты, завязывалась переписка с самими учеными, их родственниками.

Мы очень благодарны всем тем, кто сотрудничал с нами в этом направлении. Среди людей, которые с благодарностью зачислены участниками нашего проекта, отличник образования, мастер ФИДЕ, автор книг по шахматам С. И. Давыдюк, учительница и руководитель музейной экспозиции СШ № 1 г. Кобрина Н. В. Рогачук, директор Минянской средней школы Г. И. Молчан, бывшая учительница истории Батчинскай школы, краевед М. В. Осийчук, участники поисково-исследовательской группы школьного музея «Спадчына» ГУО «Остромичская средняя школа» (руководитель учитель истории Т. А. Тунчик) и многие другие.

Мы также искренне благодарны героям нашего проекта – учёным-современникам, которые по телефону, электронной почте, лично передавали нам необходимую информацию. Это Александр Александрович Волчек, Павел Павлович Кужир, Мария Алексеевна Мартынова, Иван Александрович Посвенчук и др.




Логичным подведением итогов работы над проектом библиотеки стало издание биоблио-графического справочника «**Люди науки нашего края**». Этот указатель - своего рода мини-энциклопедия с информацией о целом ряде ученых кобринской земли, людях, которые проявили себя в различных областях науки. Каждый из них достиг успехов: кто-то добился известности в своей стране, кто-то - далеко за ее пределами. Каждый прошёл своей

дорогой, у каждого свой жизненный путь: одни достигли самих вершин - стали академиками, настоящими авторитетами в той или иной области науки, другим была суждена жизнь, насыщенная научным поиском и открытиями. В издании представлены имена, имеющие мировое и общебелорусское значение. Есть информация о молодых учёных, которые только начинают свой путь в науку.

Безусловно, издание не претендует на полноту, но это значительный по объему и содержанию указатель, который содержит сведения о 89 персоналиях. Составлен он на основе фондов Кобринской центральной районной библиотеки и включает отдельные издания, статьи, помещенные в книгах, сборниках, журналах и газетах, краеведческих папках, материалы, опубликованные в книге «Память. Кобринский район», библиографическом бюллетене «Новые книги: по страницам белорусской печати». Также использовались архивные материалы, информационные ресурсы: справочные и энциклопедические, электронные каталоги, базы данных «Ученые Беларуси» (национальный проект в рамках мировой системы информации о научных работниках), «Кто есть кто в Республике Беларусь», сайты школ города и района. Включены материалы, предоставленные нашими земляками-учеными, краеведами. Источником информации для составления справочника являлась и местная периодика, в том числе статьи газеты «Кобрин-информ», которая неоднократно помещала на своих страницах материал об учёных Кобринщины.

Материал размещён в алфавитном порядке персоналий. О каждом учёном представлены биографические сведения, фотографии, информация о научных интересах, отраслях научной деятельности, библиографические списки источников о жизни и деятельности ученых и списки их научных публикаций.

К биобиблиографическому изданию составлен справочный аппарат, который включает именной и географический указатели, алфавитный список периодических изданий, материалы из которых использовались в нем (их более 50), что значительно облегчает поиск материалов об ученых.

Наше издание ставит своей целью познакомить с историей кобринского края в лицах, помочь припомнить людей, судьбы которых связаны с наукой, знаниями, интеллектом. Оно рассчитано на самый широкий круг читателей - жителей и гостей нашего города и района, всех, кто интересуется историей родного края; будет полезно краеведам, историкам, экскурсоводам, библиотекарям, пользователям всех возрастов и занятий.

Более подробную информацию об издании – биобиблиографическом справочнике «Людзі навукі нашага краю» - вы сможете получить на сайте Кобринской РЦБС (www.krcls.by), а также в историко-краеведческом центре библиотеки.

***Светлана Курачук,***
*главный библиограф отдела обслуживания и*
*информации центральной районной библиотеки.*

**Курачук, С. Імёны на карце Кобрыншчыны / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2017. – 11 лістапада. – С. 3.**

Да Сусветнага дня навукі было прымяркавана выданне супрацоўнікамі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі біябібліяграфічнага даведніка «Людзі навукі нашага краю» з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны».

## Імёны на карце Кобрыншчыны

***У Год навукі***

*Сусветны дзень навукі адзначаецца штогод 10 лістапада. Да гэтага дня было прымяркавана выданне супрацоўнікамі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі*

*біябібліяграфічнага даведніка пра навукоўцаў нашага краю з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны».*

У 2017 годзе, які аб'яўлены ў Рэспубліцы Беларусь Годам навукі, бібліёграфы цэнтральнай бібліятэкі пачалі работу над першым этапам праекта пад агульнай назвай «Славутыя імёны Кобрыншчыны» – «Людзі навукі нашага краю». На працягу года ішла інтэнсіўная работа па пошуку, зборы і алічбоўцы матэрыялаў пра навукоўцаў-землякоў, устанаўлівалася кантакты, завязвалася перапіска з самымі навукоўцамі, іх сваякамі. Мы вельмі ўдзячны усім тым, хто супрацоўнічаў з намі ў гэтым напрамку. Сярод людзей, якія залічаны ўдзельнікамі нашага праекта, выдатнік адукацыі, майстар ФІДЭ, аўтар кніг па шахматах Сцяпан Давыдзюк, настаўніца і кіраўнік музейнай экспазіцыі СШ № 1 г. Кобрына Наталля Рагачук, дырэктар Мінянскай СШ Галіна Молчан, былая настаўніца гісторыі Батчынскай школы, краязнаўца Марыя Асійчук, удзельнікі пошукава-даследчай групы школьнага музея «Спадчына» ДУА «Астроміцкая сярэдняя школа» (кіраўнік настаўнік гісторыі ТаццянаТунчык) і многія іншыя. Мы таксама шчыра ўдзячны героям нашага праекта – навукоўцам-сучаснікам, якія па тэлефоне, электроннай пошце, асабіста перадавалі нам неабходную інфармацыю. Гэта Аляксандр Волчак, Павел Кужыр, Марыя Мартынава, Іван Пасвянчук і інш.

Лагічным падвядзеннем вынікаў работы над праектам бібліятэкі стала выданне біябібліяграфічнага даведніка «Людзі навукі нашага краю». Гэты паказальнік – свайго рода міні-энцыклапедыя з інфармацыяй пра цэлы шэраг навукоўцаў кобрынскай зямлі, людзей, якія выявілі сябе ў розных галінах навукі, якія сваёй працай, талентам заслужылі гонар і памяць нашчадкаў.

Выданне змяшчае звесткі аб 89 персаналіях. Крыніцамі выяўлення матэрыялу былі асобныя выданні, артыкулы, змешчаныя ў кнігах, даведніках, зборніках, часопісах і газетах, краязнаўчых папках, інтэрнэт-рэсурсы. Выкарыстоўвалася база даных «Навукоўцы Беларусі», якая з'яўляецца нацыянальным праектам у рамках сусветнай сістэмы інфармацыі пра навуковых работнікаў, сайты школ горада і раёна.

Выданне прадстаўляе імёны, якія маюць сусветнае і агульнабеларускае значэнне. Ёсць інфармацыя пра маладых навукоўцаў, якія толькі пачынаюць свой шлях у навуку. Матэрыял у даведніку размешчаны ў алфавітным парадку персаналій. Пра кожнага навукоўца прадстаўлены біяграфічныя звесткі, фотаздымкі, інфармацыя пра навуковыя інтарэсы, галіны навуковай дзейнасці, звесткі пра пасады, узнагароды, ганаровыя званні і інш. Таксама шырока прадстаўлена бібліяграфія: спісы крыніц аб жыцці і дзейнасці і спісы прац навукоўцаў.

Значна аблягчае знаходжанне матэрыялаў даведачны апарат да біябібліяграфічнага выдання, які ўключае імянны і геаграфічны паказальнікі, алфавітны спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх выкарыстоўваліся ў ім.

Біябібліяграфічны даведнік разлічаны на самае шырокае кола чытачоў – жыхароў і гасцей нашага горада і раёна, усіх, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю; будзе карысны краязнаўцам, гісторыкам, экскурсаводам, супрацоўнікам бібліятэк, карыстальнікам усіх узростаў і заняткаў.

Больш падрабязную інфармацыю аб выданні вы зможаце атрымаць на сайце Кобрынскай РЦБС (www.krcls.by), а таксама ў гісторыка-краязнаўчым цэнтры бібліятэкі.

*Святлана КУРАЧУК,*
*галоўны бібліёграф*
*цэнтральнай раённай бібліятэкі*
*УК «Кобрынская раённая*
*цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»*

# *Сумесныя артыкулы з карэспандэнтам «Кобрынскага весніка»*

**Курачук, С. Астрафізік з сусветным іменем / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. – 2018. – 27 студзеня. – С. 4.**

У рамках праекта «Людзі навукі нашага краю», да Дня беларускай навукі – артыкул пра ўраджэнца в. Лягаты навукоўца Сцяпана Ільіча Гапасюка.

*Заўтра – Дзень беларускай навукі*

## Астрафізік з міравым іменем

Нарадзіўся Сцяпан Гапасюк 7 ліпеня 1930 года ў в. Лягаты ў сялянскай сям'і. Скончыў СШ № 1 г. Кобрына.



У гады Вялікай Айчыннай вайны з 1942 па 1944 гг. Сцяпан Гапасюк знаходзіўся ў партызанскай брыгадзе імя Чапаева і ўдзельнічаў у ваенных аперацыях. Па канчатку вайны быў узнагароджаны ордэнам «За мужнасць».

Вучыўся Сцяпан Гапасюк ва Львоўскім універсітэце на фізічным факультэце. У 1954 годзе пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў у Крымскай астрафізічнай абсерваторыі Акадэміі навук СССР. У 1963 годзе Сцяпан Ільіч абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Развитие вспышек и магнитные поля на Солнце», а ў 1975 годзе – доктарскую «Магнитные поля и движения в атмосфере Солнца».

З 1967 года С. І. Гапасюк з'яўляўся членам Міжнароднага астранамічнага саюза (МАС), двойчы выбіраўся членам прэзідыума камісіі 12 МАС, быў членам Навуковай рады па праблеме «Астраномія» аддзялення фізікі і астраноміі НАН Украіны.

У 1987-1989 гг. Сцяпан Ільіч узначальвае лабараторыю фізікі Сонца, а з 1989 года стаў галоўным навуковым супрацоўнікам Крымскай астрафізічнай абсерваторыі. Сцяпану Ільічу давялося сустракацца і з канструктарам Сяргеем Каралёвым, і з першым касманаўтам Юрыем Гагарыным. Усе касманаўты перад палётам на нейкім этапе праходзілі падрыхтоўку ў Крымскай абсерваторыі. Сцяпан Ільіч быў знаёмы практычна з усімі: ён чытаў ім лекцыі.

Сцяпан Гапасюк апублікаваў больш за 200 навуковых работ, якія прызнаны сусветнай грамадскасцю. Ім напісаны агляд па сонечнай электрадынаміцы і манаграфія па фізіцы Сонца (у суаўтарстве). Навуковая дзейнасць Сцяпана Гапасюка была накіравана на рашэнне фундаментальных праблем фізікі Сонца. Яго работы ўнеслі вялікі ўклад у разуменне фізічных працэсаў, якія праходзяць на Сонцы і ў касмічнай прасторы. Ён надаваў вялікую ўвагу мадэрнізацыі наглядальных прылад абсерваторыі, укараненню новай тэхнікі.

Сцяпан Гапасюк быў актыўна працуючым астрафізікам высокага сусветнага ўзроўню. З вялікай упэўненасцю можна сказаць пра яго значны ўклад у сусветную навуку. Шматлікія яго работы пацверджаны даследнікамі іншых краін.

Сцяпан Ільіч падрыхтаваў шэсць кандыдатаў навук з Украіны, Расіі, Узбекістана і Венгрыі. Ён кіраваў навуковымі праектамі Міністэрства адукацыі і навукі Украіны і быў аўтарам двух касмічных праектаў.

Навуковая дзейнасць Сцяпана Гапасюка атрымала прызнанне і высокую адзнаку. Яму прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі Украіны.

У кнізе «500 асоб Крыма» з цыклу «Жыццё выдатных людзей Крыма» яму прысвечана частка старонак. Іменем С. І. Гапасюка названа адна з планет.

8 жніўня 2005 года Сцяпан Ільич Гапасюк памёр. Працу над незавершанымі навуковымі даследаваннямі працягнула дачка навукоўца Вольга, кандыдат фізіка-матэматычных навук.

*Святлана Курачук,*
*галоўны бібліёграф цэнтральнай раённай бібліятэкі*
*УК «Кобрынская раённая*
*цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;*
*Ксенія Пальто,*
*Карэспандэнт.*

**Курачук, С. Таленты роднага краю. М. І. Дзямчук / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. - 1 ліпеня. – С. 10.**

У рамках праекта «Людзі навукі нашага краю» – артыкул пра М. І. Дземчука.

ГОД НАВУКІ

## Таленты роднага краю

***У межах першага этапа праекта аб славутых людзях Кобрыншчыны «Людзі навукі нашага краю» бібліёграфы Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі разам з карэспандэнтам «КВ» прапануюць шэраг публікацый пра навукоўцаў - ураджэнцаў Кобрыншчыны.***



Мала хто ведае, але Кобрыншчына даволі багатая на таленавітых людзей. І каб даведацца пра гэта, дастаткова прайсціся па кобрынскіх вуліцах, якія названы імёнамі менавіта нашых землякоў. Напрыклад, адна з вуліц была названа ў гонар вядомага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Міхаіла Іванавіча Дземчука.

Нарадзіўся ён 28 мая 1946 года ў вёсцы Дзявяткі Кобрынскага раёна ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў школе ў в. Рынкі, потым - у СШ № 2 г. Кобрына, якую скончыў з залатым медалём. Паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на фізіка-матэматычны факультэт і скончыў яго з адзнакай. Сваю працоўную дзейнасць пачаў малодшым навуковым супрацоўнікам БДУ ў 1970 годзе.

У розныя гады Міхаіл Іванавіч быў загадчыкам аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ, міністрам народнай адукацыі БССР, рэктарам Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі, намеснікам прэм'ер-міністра. З 2001 года Міхаіл Дзямчук - дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу БДПА, з 2002 па 2014 год - рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, з 2014 года ўзначальваў інфармацыйна-аналітычную работу інстытута.

Сфера навуковых інтарэсаў Міхаіла Дземчука - прыбора- і машынабудаванне, сістэмны аналіз і арганізацыйнае праектаванне. Ён развіў новы напрамак у эксперыментальнай і тэхнічнай фізіцы, быў кіраўніком шэрагу праектаў і праграм, накіраваных на фарміраванне ў рэспубліцы высокаэфектыўнай сістэмы трансферу тэхналогій, арганізацыю эканамічных зон высокай інавацыйнай актыўнасці і навукова-вытворчых комплексаў і прадпрыемстваў высокай тэхналагічнай культуры. Створаныя ім прыборы і сістэмы ёсць больш чым у 30 навуковых цэнтрах Беларусі, Расіі, Германіі, ЗША і іншых краін.

Міхаіл Іванавіч - аўтар больш 300 навуковых прац, у тым ліку 40 вынаходстваў і 3 манаграфій. Ён падрыхтаваў 10 кандыдатаў і дактароў навук. Вялікая частка працоўнай біяграфіі вучонага злучана з педагагічнай дзейнасцю ў вядучых вузах краіны. Шматлікія яго вучні займаюць сёння адказныя пасады ў органах дзяржаўнага кіравання і арганізацыях сацыяльна-эканамічнай сферы.

У апошнія гады ў сферы навуковых інтарэсаў Міхаіла Дземчука былі праблемы адукацыі і развіцця навукі ў рэспубліцы, тэорыя і практыка стварэння сучасных навукаёмістых, канкурэнтаздольных вытворчасцяў і тэхналогій. Міхаіл Іванавіч - аўтар работ па праблемах будаўніцтва нацыянальнай сістэмы адукацыі, новых адукацыйных тэхналогій і навучальных устаноў інтэграванага тыпу - сучасных ліцэяў, гімназій, каледжаў, рэфармавання прафесіянальна-тэхнічнай і вышэйшай школы рэспублікі ў рыначных адносінах, аптымізацыі кіруючых структур у галіне адукацыі.

Навуковыя дасягненні Міхаіла Дземчука атрымалі шырокае прызнанне. Ён лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі 1979 года і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне навукі і тэхнікі 1986 года. Дзяржаўная прэмія БССР 1986 года прысуджана Міхаілу Дземчуку за распрацоўку і ўкараненне ў практыку оптыка-фізічных даследаванняў статыстычных метадаў часавага аналізу хуткапераменных патокаў светлавога выпраменьвання.

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Рэспублікі Беларусь. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1986-1990), Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1989-1991).

Міхаіл Дзямчук пайшоў з жыцця 26 ліпеня 2016 года. Пахаваны ён на ўсходніх могілках у Мінску. І акрамя навуковых дасягненняў, ён запомніўся жыццёвай разважлівасцю, вострым розумам, чалавечнасцю, велізарным асабістым абаяннем. Ён на кожнай ступені росту і прызнання заставаўся чалавекам, не забываў пра родны кут, сваю малую радзіму.

***Святлана КУРАЧУК,***
*галоўны бібліёграф*
*цэнтральнай раённай бібліятэкі УК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;*
***Ксенія ПАЛЬТО,*** *карэспандэнт.*
***НА ЗДЫМКУ: Міхаіл Дзямчук.***

**Курачук, С. Таленты роднага краю. Г. П. Давідзюк / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. - 5 жніўня. – С. 4.**

Чарговы сумесны з карэспандэнтам «КВ» артыкул у межах першага этапа праекта цэнтральнай раённай бібліятэкі аб славутых людзях Кобрыншчыны «Людзі навукі нашага краю» - пра беларускага сацыёлага, доктара філасофскіх навук, прафесара Г. П. Давідзюка.

У ГОД НАВУКІ

## Таленты роднага краю

***Працягваем сумесныя з карэспандэнтам «КВ» публікацыі пра навукоўцаў-ураджэнцаў Кобрыншчыны, падрыхтаваныя бібліёграфамі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі ў межах першага этапа праекта аб славутых людзях Кобрыншчыны «Людзі навукі нашага краю».***

На гэты раз размова пойдзе пра чалавека, які стаяў ля вытокаў беларускай сацыялагічнай школы, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны кіраваў партызанскім атрадам.



Георгій Давідзюк нарадзіўся 5 ліпеня 1923 года ў вёсцы Камень-Шляхецкі Кобрынскага павета (цяпер Акцябр Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Скончыў 2 класы гімназіі ў г. Кобрыне. А пасля была вайна... Юнак пайшоў на фронт. У 1942 годзе Георгій Пятровіч узначаліў адзяленне партызанаў, атрымаў першае раненне ў адкрытым баі з нямецкай ротай пад Ганцавічамі. У маі 1943 года быў прыняты ў партыю. У гэтым жа годзе стаў камандзірам партызанскага атрада імя Мікалая Шыша Пінскага злучэння. У 1944 годзе ў час штурму пераправы ў в. Зарэчча атрымаў сур'ёзнае раненне і быў спісаны з фронту.

Затым былі гады вучобы і пошуку месца ў жыцці, свайго прызвання. Георгій Давідзюк працаваў у адміністрацыйных установах, у тым ліку быў загадчыкам аддзела культуры Брэсцкага гарвыканкама і адначасова вучыўся ў вячэрняй школе ў педінстытуце.

Пасля паспяховага заканчэння Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага ў 1952 годзе Георгій Пятровіч працаваў у партыйных структурах Брэсцкай вобласці, ЦК КП Беларусі. Затым прадоўжыў адукацыю ў Акадэміі грамадскіх навук у Маскве, працаваў у Інстытуце філасофіі і права АН БССР. У 1959 годзе Георгій Пятровіч абараніў кандыдацкую дысертацыю, а праз дзесяць гадоў атрымаў ступень доктара філасофскіх навук. З 1970 года- прафесар.

Георгій Давідзюк па праве лічыцца роданачальнікам беларускай сацыялагічнай школы. У 1968 годзе арганізаваў сектар, а затым - аддзел сацыяльных даследаванняў у Інстытуце філасофіі і права АН БССР, які стаў базай для стварэння ў будучым (1990 г.) Інстытута сацыялогіі АН БССР. У 1962-1973 гг. Георгій Давідзюк займаў пасаду загадчыка аддзела сацыялагічных даследаванняў Інстытута філасофіі і права АН БССР.

Новы этап у яго жыцці пачынаецца з пераходам у 1973 годзе ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (БДУ). Тут Георгій Давідзюк у розныя гады ўзначальваў кафедру філасофіі гуманітарных факультэтаў, кіраваў Праблемнай навукова-даследчай лабараторыяй сацыялагічных даследа- ванняў. У апошнія гады ён быў прафесарам кафедры сацыялогіі. У 1989 годзе ва ўніверсітэце было адкрыта аддзяленне сацыялогіі.

Пад навуковым кіраўніцтвам Георгія Пятровіча 48 аспірантаў абаранілі кандыдацкія, а 12 з іх - доктарскія дысертацыі па сацыялогіі. У розныя гады ён чытаў лекцыі ў Іенскім і Білефельдскім (Германія), Люблінскім (Славенія), Кракаўскім (Польшча) універсітэтах. Прымаў удзел у міжнародных сацыялагічных канферэнцыях.

Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны і выдадзены ў 1975 годзе «Метадычныя ўказанні па распрацоўцы плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця Мінска на 1976-1980 гады». За гэтую працу наш зямляк узнагароджаны залатым медалём ВДНГ СССР. На аснове багатага фактычнага матэрыялу, атрыманага ў час шматлікіх даследаванняў, пад рэ- дакцыяй прафесара Георгія Давідзюка была падрыхтавана цэлая серыя кніг па актуальных праблемах развіцця грамадства, выдадзены шэраг кніг, падручнікаў і дапаможнікаў для ВНУ. Усяго Георгій Пятровіч надрукаваў 150 навуковых прац, у тым ліку 13 – у замежных выданнях.

Навуковая добрасумленнасць, высокая адказнасць за свае рэкамендацыі, адвага ў адстойванні навуковых высноў набылі Георгію Пятровічу заслужаны аўтарытэт сярод навуковай грамадскасці краіны.

У сярэдзіне 1990-х гадоў Георгій Давідзюк завяршыў сваю актыўную навуковую і педагагічную дзейнасць і пайшоў на пенсію, аднак не страціў сувязі з родным універсітэтам і

кафедрай сацыялогіі. Першым на факультэце ён быў удастоены высокага звання - «Заслужаны работнік БДУ».

***Святлана КУРАЧУК,***
*галоўны бібліёграф цэнтральнай раённай бібліятэкі*
*УК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная*
*бібліятэчная сістэма»;*
***Ксенія ПАЛЬТО,** карэспандэнт.*

**Курачук, С. Лінгвіст, сацыёлаг, журналіст. В. І. Іўчанкаў / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. – 2017. – 20 верасня. – С. 5.**

У рамках праекта «Людзі навукі нашага краю» – артыкул пра доктара філалагічных навук, прафесара, лінгвіста, педагога, журналіста В. І. Іўчанкава.

ЛЮДЗІ НАВУКІ НАШАГА КРАЮ

## Лінгвіст, сацыёлаг, журналіст

***Прапаноўваем вашай увазе сумесныя з карэспандэнтам «КВ» публікацыі пра навукоўцаў - ураджэнцаў Кобрыншчыны, падрыхтаваныя бібліёграфамі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі ў межах першага этапа праекта аб славутых людзях Кобрыншчыны «Людзі навукі нашага краю». На гэты раз размова пойдзе пра доктара філалагічных навук, прафесара, лінгвіста, педагога, журналіста ў адной асобе.***



Віктар Іванавіч Іўчанкаў нарадзіўся 28 чэрвеня 1962 года ў вёсцы Хадынічы Кобрынскага раёна. З 1980 года па 1983 год ён працаваў настаўнікам у Бельскай васьмігадовай школе Кобрынскага раёна. У 1985 годзе Віктар Іванавіч скончыў вучобу на філалагічным факультэце ў Брэсцкім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. С. Пушкіна па спецыяльнасці «Руская мова і літаратура». Там жа працаваў выкладчыкам да 1985 года. Пасля ў гэтай жа пасадзе перайшоў ў Мінскі педагагічны інстытут выкладчыкам кафедры агульнага, славянскага і рускага мовазнаўства. У 1988 г. датэрмінова закончыў аспірантуру пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук БССР. З 1989 года Віктар Іўчанкаў працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Пачынаў з пасады дацэнта, з 1996 года ўсталяваўся загадчыкам кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Універсітэтамі Віктара Іўчанкава сталі рэдакцыі амаль усіх рэспубліканскіх друкаваных СМІ, тэле- і радыёканалаў, дзе на працягу дзевятнаццаці гадоў (з 1992 па 2011), выконваючы абавязкі саветніка міністра адукацыі са СМІ і грамадскасцю, ён падрыхтаваў тысячы паведамленняў, інтэрв'ю, артыкулаў, радыйных выступленняў, вёў прамыя эфіры на тэлебачанні. Павышаў кваліфікацыю за мяжой: у ЗША, Польшчы, Швецыі, Францыі.

Віктар Іўчанкаў - аўтар больш як 360 навуковых і метадычных прац, у тым ліку сямі манаграфій. Ён лічыцца заснавальнікам навуковай школы дыскурснага аналізу СМІ ў Беларусі. Асоба Віктара Іўчанкава, прафесара з Беларусі, займае ў медыялінгвістыцы годнае месца побач з вядомымі еўрапейскімі навукоўцамі.

Віктар Іванавіч вядзе актыўную асветніцкую працу па прапагандзе роднага слова. Змясціў на старонках друку больш за 200 публіцыстычных матэрыялаў па праблемах адукацыі, навукі і выхавання. З 1990 г. актыўна друкуецца ў прэсе па праблемах правапісу. Займаецца стылістыкай беларускай і рускай моў, лінгвістыкай публіцыстычнага тэксту, рыторыкай.

Прафесар Віктар Іўчанкаў стаў адным з асноўных распрацоўшчыкаў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (2008), а пасля яго прыняцця актыўна тлумачыў палажэнні беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, прапагандаваў у сродках масавай інфармацыі асноўныя змены.

Прафесар Віктар Іўчанкаў распрацоўвае і праблемы медыярыторыкі, чытае адпаведны курс лекцый на выпускным курсе Інстытута журналістыкі БДУ. Навучальны дапаможнік па медыярыторыцы Віктара Іванавіча - адзіны ў беларускай вышэйшай школе. Лекцыі прафесара выклікаюць вялікую цікавасць у студэнтаў, бо праходзяць у дыялагічнай форме з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій.

Віктар Іўчанкаў - член Беларускага саюза журналістаў, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, выдатнік друку Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі імя У. Пічэты за цыкл навукова-адукацыйных дапаможнікаў па гісторыі і тэорыі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў за лепшую журналісцкую работу ў рэспубліканскім творчым конкурсе «Залатое пяро». У навукоўца шмат ганаровых грамат, падзяк, а таксама прэмія спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***Святлана КУРАЧУК,*** *галоўны бібліёграф*
*аддзела абслугоўвання і інфармацыі*
*цэнтральнай раённай бібліятэкі*
*ДУК «Кобрынская раённая*
*цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;*
***Ксенія ПАЛЬТО,***
*карэспандэнт.*

**Курачук, С. Вядучы славіст краіны. І. А. Чарота / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. – 2017. – 28 кастрычніка. – С. 4.**

У рамках праекта «Людзі навукі нашага краю» – артыкул пра доктара філалагічных навук, прафесара, вядучага славіста нашай краіны, вядомага беларускага літаратуразнаўца, крытыка, перакладчыка І. А. Чароту.

ЛЮДЗІ НАВУКІ НАШАГА КРАЮ

## Вядучы славіст краіны

***Ёсць людзі, жыццём і дзейнасцю якіх можна і захапляцца, і ганарыцца. Менавіта да такіх адносіцца выхадзец з вёскі Лышчыкі Кобрынскага раёна, вядучы у рэспубліцы вучоны-славіст, які займае адметнае месца ў беларускай культуры і літаратуры, Іван Аляксеевіч Чарота, якому сёлета споўнілася 65 гадоў.***

Напэўна, лёс вядучага славіста краіны быў вызначана першапачаткова. Нарадзіўся ён 16 верасня 1952 года ў вёсцы Лышчыкі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Яшчэ да школы вучыўся самастойна чытаць адначасова па Евангеллі на стараславянскай мове, польскаму буквару, украінскаму «Кабзару», рускай «Праўдзе» і беларускай «раёнке» «Камуністычная праца» (цяперашні «Кобрынскі веснік»).

Закладзеная ў сям'і любоў да кнігі і асабістыя здольнасці прывялі Івана Чароту ў 1969 годзе на аддзяленне рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. На занятках ён паказваў бліскучыя вынікі і быў нават рэкамендаваны ў гіды-перакладчыкі ў Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спадарожнік».



Перакладчыцкай і навуковай дзейнасцю Іван Аляксеевіч займаецца больш за 40 гадоў. Чарота ўзначальвае Бюро секцыі мастацкага перакладу і літаратурных сувязяў Саюза пісьменнікаў, займаецца перакладам з сербскага, харвацкага, македонскага, славенскага, польскага і іншых моваў на рускую і беларускую мовы, а таксама з беларускай і рускай на сербскую. Ён - аўтар 1000 перакладзеных твораў багаслоўскай і мастацкай літаратуры на беларускай  і рускай мовах, у тым ліку звыш 60 кніжных выданняў. Трэба адзначыць, што Іван Аляксеевіч – сапраўдны паліглот, ён валодае больш чым 10 мовамі.

Іван Чарота - самы кампетэнтны славіст у Беларусі ў сферы літаратуразнаўства. Ён з'яўляецца галоўным навуковым кансультантам выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» па ўсіх пытаннях, звязаных з паўднёваславянскімі народамі і іх культурамі. Дарэчы, Чарота - галоўны рэдактар шматлікіх альманахаў «Славянскія постаці», член рэдкалегій 9 перыядычных выданняў, у тым ліку 3 замежных.

Іван Аляксеевіч з'яўляецца аўтарам 500 навуковых і літаратурна-крытычных прац. Менавіта ён стаў ініцыятарам і арганізатарам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці «Сербская мова і літаратура».

Прафесар вядзе вялікую грамадскую дзейнайсць. Ён акадэмік Сербскай акадэміі навук і мастацтв, акадэмік Міжнароднай Славянскай акадэміі навук, адукацыі, мастацтв і культуры, старшыня Экспертнага савета вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, навуковы кансультант Беларускага Экзархата па комплексе пытанняў, якія адносяцца да Сербіі, Югаславіі і славянства ўвогуле, сакратар Біблейскай камісіі Беларускага Экзархата па выпрацоўцы беларускай багаслоўскай тэрміналогіі, удзельнік перакладу Новага Запавета на беларускую мову, кансультант і аўтар артыкулаў «Праваслаўнай Энцыклапедыі», выканаўчы рэдактар журнала «Праваслаўе».

У 1999 годзе плённая праца прынесла Івану Аляксеевічу яго першую літаратурную прэмію - Міжнародную прэмію імя Канстанціна Астрожскага (Польша). Далейшая навуковая, перакладчыцкая і грамадская дзейнасць Чароты адзначаны шматлікімі ганаровымі ўзнагародамі, сярод якіх: Ордэн Сергія Раданежскага III ступені, прэмія Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», памятны медаль Саюза славацкіх пісьменнікаў, Ордэн Святога Савы III ступені ( 2004), Залаты знак Культурна-асветніцкага таварыства Сербіі, Ордэн свяціцеля Кірыла Тураўскага, прэміі за лепшую кнігу Беларусі ў галіне перакладу і інш.

Нястомны працаўнік, аўтарытэтны і паважаны даследчык, наш зямляк Іван Чарота знаходзіцца ў росквіце творчых сіл. На пытанне, чым, акрамя працы, ён захапляецеся, паважаны прафесар адказвае: «*Мае захапленні - гэта мая праца, мая праца - гэта мае захапленні… Я шчаслівы, таму што займаюся тым, што мне падабаецца*». У гэтай высакароднай дзейнасці яго падтрымліваюць і жонка-філолаг, і сыны, якія звязалі жыццё са словам, з літаратурай.

***Святлана Курачук,***
*галоўны бібліёграф*
*цэнтральнай раённай бібліятэк;*
***Ксенія Пальто**, карэспандэнт*

# СПІС ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ,
## МАТЭРЫЯЛЫ З ЯКІХ УКЛЮЧАНЫ Ў ПАКАЗАЛЬНІК

Адукацыя і выхаванне
Астравецкая праўда
Башкирская нефть
Беларуская думка
Беларуская мова і літаратура ў школе
Беларускі гістарычны часопіс
Белорусская нива
Беларускі час
Беларусь
Биржа информации
Большевик
Брестская газета
Брестский калейдоскоп
Веды
Вестник гос универ. морского и речного флота им. адмирала С. О. Макарова
Вечерний Брест
Витебские вести
Владивосток
Во славу Родины
Водныя рэсурсы
Водоснабжение и санитарная техника
Волат
Вопросы философии
Воскресение
Вышэйшая школа
Геология и геофизика
Гістарычная Брама
Голас Радзімы
Дзеяслоў
Дзянніца
Заря
Защита и карантин растений
Звязда
Здравоохранение Беларуси
Земледелие
Земледелие и защита растений
Земляробства і ахова раслін
Известия Белорусской Инженерной Академии
Известия Крымской астрофизической Обсерватории
Импульс
Кардиология
Кардиология в Беларуси
Кинематика и физика небесных тел
Кобрынскі веснік
Кобрин-информ
Комсомольская правда
Красная звезда
Краязнаўчая газета
Крыніца
Літаратура і мастацтва
Литьё и металлургия
Маладзік
Маладосць
Мастацтва Беларусі
Мая Радзіма
Международная деловая газета
Мелиорация и водное хозяйство
Народная воля
Настаўніцкая газета
Наука из первых рук
Наша слова
Неман
Нефтяное хозяйство
Новости хирургии
Новыя кнігі: па старонках беларускага друку
Педагогика, психология и медико-биологические проблемы физического воспитания и спорта
Полымя
Прыродныя рэсурсы
5-е колесо
Радиотехника
Радиотехника и электроника
Рецепт
Родная прырода
Роднае слова
Российская газета
Рэспубліка
Рязанские ведомости
Сельская праўда
7 дней
Советская Белоруссия
Советская геология
Солнечно-земная физика
Социология
Социологические исследования
Спадчына
Стоматологический журнал
Теория и практика судебной экспертизы
Философские науки
Фокус
Химико-фармацевтический журнал
Царкоўнае слова
Экология

# ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК


**А**лон Гедалія 5
Амельянюк Георгій Георгіевіч 6
Антанюк Георгій Аляксандравіч 8

**Б**армуцкая Аліцыя Збігнеўна 9
Барысюк Мікалай Андрэевіч 10
Бельскі Аляксей Якімавіч 12
Боўбель Яўгеній Іванавіч 13
Брэн Келясцін Іванавіч 14
Буйноўская Ангеліна Анатольеўна 16

**В**айткоўская Ала Аляксандраўна 17
Верхавец Людміла Якаўлеўна 18
Віславух Севярын 19
Волчак Аляксандр Аляксандравіч 20
Воўк Аляксей Арсенцьевіч 22
Воўк Яўген Арсенцьевіч 22

**Г**апасюк Сцяпан Ільіч 23
Гардун Сяргей Аляксеевіч 25
Гержа Мікалай Паўлавіч 27
Горскі Станіслаў Батыс 28
Гулюк Георгій Рыгоравіч 29
Гуцаў Сяргей Анатольевіч 31

**Д**авідзюк Георгій Пятровіч 31
Дарошак Любоў Васільеўна 34
Дзем'янюк Фама Сямёнавіч 35
Дзмітрук Аляксандр Андрэевіч 37
Дзямчук Міхаіл Іванавіч 38

**Ж**ук Мікалай Фёдаравіч 41
Жуковіч Платон Мікалаевіч 42

**З**апарожчанка Раіса Георгіеўна 44
Зарыскі Оскар 45
Зінчук Сцяпан Дзмітрыевіч 48

**І**аўчук Міхаіл Трыфанавіч 49
Іванюк Уладзімір Рыгоравіч 51
Іўчанкаў Віктар Іванавіч 53

**К**абата Збігнеў 55
Казлоў Леў Раманавіч 57
Казюк Мікалай Васільевіч 59
Карпук Андрэй Андрэевіч 61
Касачук Васіль Міхайлавіч 63
Кастко Уладзімір Сямёнавіч 64
Катовіч Іван Антонавіч 65
Качаноўскі Уладзімір Васільевіч 67
Качурка Васілій Іванавіч 69
Кірычук Сцяпан Міхайлавіч 72
Колбас Наталья Юр'еўна 74
Краснапрошын Віктар Уладзіміравіч 75
Крачкоўскі Юльян Фаміч 76
Крачэўскі Пётр Антонавіч 79
Крусь Павел Паўлавіч 82
Кудзіна Галіна Васільеўна 83
Кужыр Павел Рыгоравіч 84
Кульчыцкі Андрэй Міхайлавіч 85
Купрыянюк Валянціна Аляксееўна 87
Курашык Віталій Уладзіміравіч 87

**Л**аганчук Леанід Міхайлавіч 90
Лапскі Астап Васільевіч 90
Левы Сямён Васільевіч 92
Лісковіч Віктар Андрэевіч 93
Лукашук Аляксандр Алегавіч 95

**М**акарук Міхаіл Маркавіч 97
Макарук Міхаіл Арсенцьевіч 98
Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч 99
Мартынава Марыя Аляксееўна 102
Меярэвіч Канстанцін Мікалаевіч 103
Міхайлаў Павел Аляксандравіч 105
Міхута Ігар Юр'евіч 106
Міцкевіч Юльян Аляксандр 109

**П**адпалаў Уладзіслаў Паўлавіч 111
Панасюк Іван Паўлавіч 113
Пасвянчук Іван Аляксандравіч 116
Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч 117
Прымачук Віктар Іванавіч 121
Прымачук Іван Платонавіч 121
Прымачук Леанід Платонавіч 122

**Р**агоўскі Яўгеній Аляксандравіч 123

**С**амерсава Надзея Уладзіміраўна 126
Саўчук Таццяна Мікалаеўна 127
Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч 128
Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч 130
Свянціцкі Сігізмунд Карлавіч 132
Семянюк Уладзімір Андрэевіч 134
Сізюк Валерый Аляксеевіч 135
Сінкавец Аляксандр Уладзіміравіч 136
Сінчук Алег Віктаравіч 137
Сінчук Іван Іванавіч 139
Скірмунт Аляксандр Ізідар 141
Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч 142

Соўпель Ігар Васільевіч 145
Стральчонак Алег Анатольевіч 146
Страчук Міхаіл Сцяпанавіч 148
Строк Яўгеній Якаўлевіч 149
Сузін Адам Дамінікавіч 150
Супруновіч Маргарыта Міхайлаўна 152

**Т**рафімук Андрэй Аляксеевіч 153

Трунін Яўгеній Генадзьевіч 156

**Ф**ілімоненкава Раіса Мікалаеўна 157

**Х**ворык Наталля Валер'еўна 159

**Ч**арота Іван Аляксеевіч 160

**Ш**вайко Валянціна Фёдараўна 165
Шыдлоўскі Антон Казіміравіч 166
Шэлест Таццяна Анатольеўна 167

**Э**нгельгарт Васіль Паўлавіч 168

**Ю**рэня Аляксандр Станіслававіч 170
Юшчук Мікалай Дзмітрыевіч 171

# ГЕАГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК


**А**вады 171
Азяты (Кобрынскі павет) 76,77
Акцябр 31,61,85
Алжыр 122
Армавір 156
Арэнбург 151
Арэнбургская вобласць 58
Астравец (Гродзенская вобл.) 93
Астромічы 48,82,165
Аўстралія 56

**Б**алгарыя 67
Байканур 10
Баранавічы 69
Барысава (Кобрынскі раён) 80
Барысаў 92,148
Батчы 27,84
Беласток 123
Бельск 53
Берлін 5,28
Бостан 45
Басяч (Кобрынскі раён) 150
Брацк 121
Брэст 14,20,21,27, 28,31,37,53,61,63,64,69,72,74,82,83,87,92, 105,108,113,116,137,167
Буховічы 87
Бяроза (Кобрынскі раён) 70

**В**анкувер 56
Варонеж 121
Варшава 67,90,118,150
Вена 5
Верхалессе 137
Вільня 19,28,42,43,65, 77,79,99,100,109,118,141,150
Віцебск 18,98,111,136, 157
Волагда 29
Вроцлаў (Польшча) 19,90
Вялікабрытанія 55,130
Вялікі Лес (Кобрынскі павет) 67
Вялікія Лепясы 61

**Г**айкоўка 171
Гарадзец 51,61,145
Гвінея 98
Германія 32,35,75,141
Гомель 18
Горкі 29,69
Гродна 28,93,159, 166,170
Грэцыя 67
Гуцкі 90

**Д**анбас 87
Дворац (Кобрынскі павет) 28
Дзявяткі 38
Дзівін 25,42,87,88, 126,128,130,136,142
Дзямідаўшчына 72
Днепрадзяржынск 129
Дрэздэн (Германія) 168
Дуброўна (Віцебская вобл.) 157

**Е**ўпаторыя 87

**Ж**ыровічы 14,76,118

**З**авужоўе 49
Залессе 134
ЗША 130,135

**І**зраіль 5,6
Іерусалім 5,6
Імянін 111
Індыя 56,97
Іркуцк 171
Іспанія 75
Італія 45,67

**К**азань 67,153
Камень-Шляхецкі (Кобр. павет) 31
Канада 56
Кастрама 86
Кіеў 18,45,64, 103,109,118,130

Кітай 86
Кобрын 5,6,9, 13,14,16,17,20,23,31,34,42,45,55,57, 65,66,69,74,75,82,83,84,85,87,90,92, 93,95,102,103,105,108,116,123,127, 135,139,146,149,152,156,157,159, 160,166,167,170
Колбавічы (Баранавіцкі раён) 170
Корчыцы 58
Краснадар 103,156
Краснаярск 82
Красцінава (Кобрынскі павет) 132
Крым 23,24,87, 88,124
Крычаў 69
Куба 97
Кулігоўшчына (Кобр. павет) 150
Кустовічы 168
Кызыл (Тувінская АССР) 113

**Л**елікава 105,113,114
Ленінград (Пецярбург) 9,12,18,31, 43,65,82,86,99,100,103,109,124,132,161
Літва 43,80,85
Літвінкі 18,41,57
Лодзь (Польшча) 90
Лондан 100
Лука 116
Лунінец 87
Львоў 23,37,55
Лышчыкі 160
Лягаты 23

**М**агілёў 8,69,139
Мазыр 139
Мазуры 72
Маладзечна 76
Маларыта 29
Малайзія 97
Манголія 113
Масква 7,20,25,27, 30,32,49,58,87,97,98,102,109,132,139,157
Мацы 8, 97,98,99, 121,122
Мінск 9,13,16,25,31,33,34, 38,48,51,53,58,75,80,84,87,102,113,121,122, 126,127,128,132,137,139,142,146,148,149, 150,159,160
Мінянка 29,63,64,69,148
Моладава (Кобр. павет) 141
Моніна (Расія) 58
Мухаўлокі 48
Мярніца 22,44
Мяфёдавічы 51

**Н**авагрудак 109
Навасібірск 114,154,155
Наварасійск 156
Нежын (Чарніг. губерня) 67
Ніжняудзінск (Іркуц. вобл.)153
Новачаркаск 90
Нью-Ёрк (ЗША) 34,45

**О**мск 153
Осаўцы (Кобр. павет) 117

**П**арыж 124,152
Паставы 28
Пескі 35,82
Піза 45
Пінск 132
Полацк 43,86
Польшча 32,45,53,139
Пружаны 42
Пярковічы (Кобр. павет) 19

**Р**агачоў 118
Разань 104
Румынія 67
Рым 45
Рынкі 38,97
Рэчыца (Кобрынскі раён)10

**С**віслач 28
Сачковічы (Пінскі раён) 20
Славенія 32
Слаўгарад 153
Смаленск 58,129

Стары Корнін 14,15
Стрыгава 97,122
Стрыі 12,63,69,70

**Т**урцыя 67

**У**збекістан 27
Украіна 118
Уладзівасток 121
Урал 49
Уфа 153
Ушкавіца 37,105

**Ф**едзькавічы (Кобр. павет) 153
Фінляндыя 75
Францыя 53,67,74,130,141

**Х**абараўск 121
Хадынічы 53
Харкаў 109,124
Хельсінкі 34
Хідры 31

**Ц**юмень 72

**Ч**аравачыцы 65,66
Чарнігаў 97
Чырвоны Прамень (Украіна) 87
Чэхаславакія 16,80

**Ш**атландыя 55
Швецыя 53,147
Шыповічы (Кобрынскі раён) 95

**Я**каўчыцы (Жабінкоўскі раён) 27
Якуція 153,157
Ялта 124
Яромічы 20,29,55,64

# ЗМЕСТ

**ПРАДМОВА** 3

**НАВУКОЎЦЫ КОБРЫНСКАГА КРАЮ** 5

**ПУБЛІКАЦЫІ Ў МЯСЦОВЫХ СМІ АБ НАВУКОЎЦАХ КОБРЫНСКАГА КРАЮ** 174

**СПІС ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ, МАТЭРЫЯЛЫ З ЯКІХ УКЛЮЧАНЫ Ў ПАКАЗАЛЬНІК** 190

**ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК** 191

**ГЕАГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК** 193

Даведачнае выданне

Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»

# Людзі навукі нашага краю

*Біябібліяграфічны даведнік*

Складальнік
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп’ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Камп’ютарны дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

На беларускай, рускай, польскай мовах

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка дзяржаўнай установы культуры
«Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».
E-mail: kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by